Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

*Культурны імідж Беларусі*

*А. І. Смолік*

# *Беларуская культуралогія: гісторыя і сучаснасць*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2014

УДК 71(4Беи)
ББК 008(476)
С512

*Серыя заснавана ў 2013 г.*

Р э ц э н з е н т ы :
*Я. М. Бабосаў,* акадэмік НАН Беларусі,
доктар філасофскіх навук, прафесар;
*А. М. Нечухрын,* загадчык кафедры
ўсеагульнай гісторыі ГрДУ імя Янкі Купалы,
доктар гістарычных навук, прафесар

*Рэкамендавана Саветам па правядзенні экспертызы
навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх
і вопытна-тэхнічных работ (пратакол № 1 ад 15.07.2013 г.)*

**Смолік, А. І.**
С512 Беларуская культуралогія : гісторыя і сучаснасць / А. І. Смолік ; Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2014. – 276 с.
ISBN 978-985-522-092-4.

Разглядаюцца працэсы станаўлення і развіцця імпліцытных і экспліцытных культуралагічных ведаў аб дынамічных культурных працэсах у Беларусі. Інтэрпрэтацыя ідэі культуры падаецца ў кантэксце канцэпцый замежнай культуралогіі.
Для навукоўцаў, аспірантаў і магістрантаў устаноў вышэйшай адукацыі.

**УДК 71(4Беи)**
**ББК 008(476)**

*Выданне ажыццёўлена пры фінансавай падтрымцы
Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь*

**ISBN 978-985-522-092-4**
© Смолік А. І., 2014
© Афармленне. УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», 2014

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЗМЕСТ

**Вытокі і здабыткі.** *Ю. П. Бондар* .................................. 8

**Уводзіны** ........................................................................ 12

**Раздзел 1. Фарміраванне ў грамадскай свядомасці паняцця «культура»** ........................................................ 16
1.1. Гістарычныя і сацыяльныя перадумовы станаўлення імпліцытных ведаў аб культуры ........................................ 16
1.2. Уяўленні аб культуры як культу тварэння ў эпоху Сярэднявечча .................................................................. 19

**Раздзел 2. Рэнесансава-гуманістычныя ідэі мысліцеляў і асветнікаў Беларусі** .............................................. 32
2.1. Агульная характарыстыка эпохі Адраджэння .......... 32
2.2. Канцэпцыі культурна-гістарычнага працэсу эпохі Адраджэння .................................................................. 34
2.3. Увасабленне ідэалу свабоды суб'екта культуры ў творах беларускіх гуманістаў ........................................... 46

**Раздзел 3. Пераасэнсаванне сутнасці культуры беларускімі асветнікамі ў XVII–XVIII стст.** ....................... 48
3.1. Сацыяльна-культурныя адметнасці фарміравання культуралагічных поглядаў у эпоху Асветніцтва ............ 48
3.2. Сутнасць культуры ў метафізічнай карціне свету ..... 52
3.3. Рацыянальна-тэхнічны ідэал культуры Асветніцтва ... 53

**Раздзел 4. Уплыў дэмакратычнай ідэалогіі на развіццё эксплiцытных культуралагічных ведаў у XIX ст.** ... 67
4.1. Узнікненне новых навуковых дысцыплін і галін даследавання культуры ........................................................ 67
4.2. Спецыфічныя асаблівасці сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства ................................................ 68
4.3. Канцэпцыя народнасці і яе ўвасабленне ў літаратурнай спадчыне .................................................................. 69

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4.4. Асэнсаванне адметнасцей карціны свету і ментальнасці беларусаў ........................................................ 75
4.5. Праблема самасвядомасці культуры ў беларускай філасофіі XIX ст. ........................................................ 79
4.6. Развіццё фалькларыстыкі і этнакультуралогіі апісальнага кірунку ........................................................ 85

**Раздзел 5. Разнастайнасць культурных практык і іх канцэптуальнае асэнсаванне ў XX ст.** ........................ 103
5.1. Асноўныя тэндэнцыі сацыякультурнага развіцця ..... 103
5.2. Спецыфіка актаў самапазнання і самасвядомасці беларускай культуры ........................................................ 107
5.3. Навуковыя канцэпцыі культуры першай паловы XX ст. ........................................................ 110
5.3.1. Асэнсаванне дэтэрмінантаў нацыянальна-адраджэнскага руху Антонам і Іванам Луцкевічамі ..... 111
5.3.2. Выяўленне сэнсафарміруючай ролі беларускай мовы Язэпам Лёсікам ........................................ 114
5.3.3. Культуралагічны дыскурс у творчай спадчыне Якуба Коласа ........................................................ 116
5.3.4. Культурна-антрапалагічная сутнасць мастацка-публіцыстычнай творчасці Янкі Купалы ............. 124
5.3.5. Канцэпцыя Беларускага адраджэння Максіма Багдановіча ........................................................ 130
5.3.6. Сістэматызацыя культурна-гістарычнага шляху беларусаў ........................................................ 133
5.3.7. Мадэль культурнай аўтаноміі Цішкі Гартнага ... 136
5.4. Метадалагічныя прынцыпы вывучэння беларускай культуры ........................................................ 139
5.4.1. Разнастайнасць канцэпцый культуры ............... 139
5.4.2. Метафізічнае вымярэнне беларускага шляху І. У. Канчэўскім (І. Абдзіраловічам) ......................... 142
5.4.3. Інтэрпрэтацыя канцэпцыі заходнерусізма А. І. Цвікевічам ........................................................ 145
5.4.4. Філасофія культуры М. А. Лоскага .................. 147
5.5. Развіццё тэарэтычнай этнакультуралогіі ў першай палове XX ст. ........................................................ 149
5.5.1. Канцэпцыя этнакультурагенезу Я. Ф. Карскага ........................................................ 149

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5.5.2. Выяўленне самабытнасці нацыянальнай культуры беларускага этнасу Е. Р. Раманавым ................ 151
5.5.3. Канцэпцыя культурна-гістарычнага развіцця М. В. Доўнар-Запольскага ........................................ 153
5.5.4. Аналіз этнакультурных працэсаў А. Я. Багдановічам ........................................................................ 155
5.5.5. Прынцыпы даследавання этнарэгіянальных культур Беларусі ...................................................... 157
5.5.6. Лінгвакультуралагічны аспект у даследаваннях культуры А. К. Сержпутоўскага ......................... 158

**Р а з д з е л 6. Беларуская культуралогія другой паловы XX – пачатку XXI ст.** ...................................................... 160
6.1. Адметнасці сацыякультурных працэсаў інфармацыйнага грамадства ........................................................... 160
6.2. Сацыядынаміка беларускай культуры на мяжы тысячагоддзяў ........................................................................ 163
6.3. Распрацоўка тэарэтыка-метадалагічных праблем беларускай культуры ....................................................... 165
6.4. Нацыянальная эстэтыка: спецыфіка станаўлення ..... 172
6.5. Інтэрпрэтацыя этнакультурных поглядаў асветнікаў Беларусі .................................................................... 176

**Р а з д з е л 7. Сучасная культуралагічная школа Беларусі** .......................................................................... 180
7.1. Фундаментальныя даследаванні артэфактаў беларускай культуры ............................................................ 180
7.1.1. Герменеўтыка культуры як метагістарычны тэкст ......................................................................... 181
7.1.2. Уяўленне ідэі культуры як касмапланетарнага феномена ........................................................................... 183
7.1.3. Выяўленне этнічнай шматграннасці мастацкай культуры ........................................................................... 184
7.1.4. Асэнсаванне праблем дынамікі беларускай культуры ў кантэксце гуманітарных і тэхнагенных катастроф ............................................................................ 186

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Р а з д з е л   8 . Вывучэнне феноменаў культуры на сумежжы гуманітарных навук** ............................................ 189
8.1. Каляндарна-абрадавая культура беларусаў у навуковых даследаваннях ........................................................ 189
8.2. Этнаканфесіянальны аспект культуралагічных даследаванняў ................................................................... 191
8.3. Аналіз акмеалагічных асноў інкультурацыі асобы ... 193
8.4. Сацыялагічны падыход да вывучэння беларускай культуры ............................................................................ 195

**Р а з д з е л   9 . Рост навуковага патэнцыялу беларускай культуралагічнай школы** ....................................... 197
9.1. Вызначэнне канцэптуальных асноў камунікатыўнай практыкі ......................................................................... 197
9.2. Рэканструкцыя культуралагічных поглядаў рускіх культурфілосафаў ........................................................ 205
9.3. Тыпалагізацыя хрысціянскіх канцэпцый культуры .. 209
9.4. Культурная спадчына Беларусі як аб’ект культуралагічнага даследавання ................................................... 214
9.5. Эксплікацыя сацыяльнага механізма працэсу інкультурацыі на фарміраванне асобы ................................ 224
9.6. Культуралагічнае абгрунтаванне сацыякультурнай значнасці мастацкай творчасці ......................................... 230
9.7. Адлюстраванне працэсаў субкультурызацыі грамадства ў тэорыі культуры ................................................... 240
9.8. Аналіз дэтэрмінантаў крызісу культуры беларускімі культуролагамі ............................................................... 245
9.9. Станаўленне музейнай культуралогіі ........................ 250

**Заключэнне** ............................................................... 256

**Бібліяграфічны спіс** ....................................................... 260

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Светлай памяці продкаў прысвячаю*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Вытокі і здабыткі



Культуралагічныя веды шматаспектныя і разнастайныя: яны складаюцца з узаемадапаўняльных тэорый і канцэпцый, якія з'яўляюцца вынікам навукова-тэарэтычнай дзейнасці многіх пакаленняў замежных і беларускіх даследчыкаў культуры. Гісторыя і сучаснасць культуралагічнай думкі Беларусі ў сукупнасці даследаванняў беларускіх мысліцеляў грунтоўна разглядаюцца ў прадстаўленай манаграфіі доктара культуралогіі А. І. Смоліка.

Культуралогія лічыцца самай маладой сярод сацыяльна-гуманітарных навук, але вывучэннем сутнасці, зместу культуры вучоныя свету займаліся на працягу развіцця цывілізацыі. Станаўленне і эвалюцыя культуралогіі ў Беларусі звязаны з далучэннем да каштоўнасцей агульначалавечай культуры. Імпліцытныя культуралагічныя веды прасочваюцца ў беларускіх філосафаў і гісторыкаў з даўніх часоў. Найбольш мэтанакіравана займаліся выяўленнем прызначэння культуры, яе месца і ролі ў грамадстве мысліцелі Сярэднявечча. Кірыла Тураўскі, Аўрамій Смаленскі, Клімент Смаляціч і інш. дакладна вызначылі маральную сутнасць культуры. У агіяграфічнай літаратуры ўвасоблены аксіялагічны аспект – ідэалы і каштоўнасці не толькі боскай, але чалавечай эстэтычнай прыгажосці.

Культуралагічнай праблемай беларускіх мысліцеляў эпохі Адраджэння была праблема чалавека як творца культуры. У рэфлексіі Ф. Скарыны, С. Буднага, А. Волана, М. Літвіна і інш. заўважаецца накіраванасць мыслі са сферы трансцэндэнтальнага да рэальных праяў жыцця. Культура разглядаецца беларускімі гуманістамі як гістарычная з'ява, якая існуе ў рэальнай прасторы. Гістарызм і гуманізм з'яў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ляюцца сэнсаўтваральнымі дэтэрмінантамі культуры. Нягледзячы на адыход ад тэалагічных уяўленняў ідэі культуры, падкрэслівае аўтар, думка філосафаў яшчэ не вызвалілася ад натуралізму – сутнасць культуры гуманісты інтэрпрэтавалі згодна з законамі прыроды.

Перад чытачом разгортваецца панарама імпліцытных культуралагічных ідэй і поглядаў беларускіх асветнікаў – С. Полацкага, Г. Каніскага, Б. Дабшэвіча, Л. Залускага, К. Нарбута і інш. Па меркаванні асветнікаў, уяўленне аб механізмах дынамікі культуры, яе сутнасці вызначалася не асобным індывідам, а калектыўнымі формамі жыццядзейнасці. У навуковым ужытку беларускімі філосафамі шырока выкарыстоўваецца паняцце «цывілізацыя», функцыю якой яны бачылі ў стварэнні развітога, высокамаральнага грамадства.

Асаблівасцямі манаграфіі з'яўляюцца паслядоўнасць выкладання думкі аўтара і пацвярджэнне яе фрагментамі з твораў славутых папярэднікаў. Аналіз тэкстаў мысліцеляў дазволіў А. І. Смоліку акрэсліць адметнасці ўяўленняў асветнікаў аб феномене культуры як пэўным выніку эвалюцыі прыроды, а не асобнага віду быцця. Такі падыход да культурагенезу не зніжае высокай культуралагічнай ацэнкі навуковай спадчыны беларускіх асветнікаў, якімі ў якасці важнейшых дэтэрмінантаў дынамікі культуры вылучаліся адукацыя і выхаванне, рацыянальныя адносіны да пазнання артэфактаў.

Галоўнай прычынай няшчасцяў людзей было і застаецца невуцтва, таму актуальнейшым клопатам з'яўляецца развіццё сістэмы адукацыі ў Беларусі. Большая частка манаграфіі прысвечана станаўленню і развіццю ў краіне экспліцытных культуралагічных ведаў. А. І. Смолік вызначае рамкі складвання ў Беларусі навукі аб культуры як самастойнай галіны гуманітарнага пазнання – канец XIX – пачатак XX ст. Аналізуючы дзейнасць беларускіх этнолагаў, філосафаў, літаратараў, гісторыкаў, аўтар манаграфіі канстатуе, што імі былі створаны першыя завершаныя культуралагічныя канцэпцыі. Асноўныя палажэнні канцэпцый заходнерусізма і нацыянальна-культурнага адраджэння ўтрымлі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваюцца ў працах К. Гаворскага, М. Каяловіча, І. Канчэўскага, М. Багдановіча, М. Гарэцкага, Я. Коласа, Я. Купалы і інш.

Безумоўнай вартасцю кнігі, на нашу думку, з'яўляецца вывучэнне сучаснай культуралагічнай прасторы краіны. А. І. Смолік разглядае постаці і працы прадстаўнікоў старэйшага пакалення беларускай культуралагічнай школы. Я. М. Бабосаў, Э. К. Дарашэвіч, У. М. Конан, М. І. Крукоўскі, А. С. Майхровіч і многія іншыя вучоныя, якія сваімі працамі заклалі тэарэтыка-метадалагічны падмурак сучаснай культуралогіі, складаюць частку гісторыі, гонар беларускай навукі. Пад іх кіраўніцтвам здзяйсняліся першыя ўласна культуралагічныя навуковыя праекты маладымі беларускімі даследчыкамі.

Надзвычай важнымі, на наш погляд, уяўляюцца раздзелы манаграфіі, дзе даецца сістэмны аналіз сучаснага этапу культурагенезу ў кантэксце дынамікі беларускай культуры. А. І. Смолік першым у нашай краіне распрацаваў метадалогію культуралагічнага даследавання сацыякультурных з'яў і працэсаў, якія адбываліся ў постсавецкі перыяд. Дадзеная метадалогія была апрабавана на першым пасяджэнні савета па абароне доктарскіх дысертацый па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры» ў 1999 г.

Аб'ектыўна паказана ў манаграфіі навукова-тэарэтычная дзейнасць навуковых культуралагічных цэнтраў, якія сфарміраваліся ў Беларусі за апошнія два дзесяцігоддзі. Справядліва, па нашым меркаванні, пальма першынства аддаецца Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту культуры і мастацтваў, дзе вядзецца падрыхтоўка студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і дактарантаў па спецыяльнасці «фундаментальная культуралогія». Па выніках навуковага асэнсавання канцэптуальных пытанняў дынамікі сацыяльных і культурных рэалій сучаснасці і тэарэтычных праблем нацыянальнай і сусветнай культуры шэрагу навукоўцаў універсітэта прысвоены вучоныя ступені і званні ў галіне культуралогіі. Не пакідае без увагі аўтар манаграфіі навуковай дзейнасці вучоных-культуролагаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Янкі Купалы і інш., у якіх вядзецца даследаванне функцый культуры, яе сацыяльных механізмаў, рухаючых грамадскіх фактараў.

Аналізуюцца ў даследаванні работы тэарэтыка-метадалагічнага і прыкладнога характару сучасных беларускіх культуролагаў. Можна пагадзіцца з меркаваннем А. І. Смоліка аб тым, што здабыткі маладой нацыянальнай культуралагічнай школы ўнушальныя: падрыхтаваны і выдадзены фундаментальныя працы, прысвечаныя паказу ролі духоўнай культуры ў рэгуляцыі розных сфер сацыяльнага быцця ва ўмовах сістэмнай трансфармацыі грамадства, дзейнасці сацыякультурных інстытутаў, якія забяспечваюць функцыянаванне культуры і фарміраванне светапогляду асобы. У той жа час аўтар акрэслівае шмат праблемных пытанняў, якія стрымліваюць развіццё айчыннай культуралогіі, і абазначае магчымыя шляхі іх вырашэння.

Выхад у свет разглядаемай манаграфіі, на наш погляд, – знакавая падзея. Гэтай працай абагульняецца шматаспектная навукова-тэарэтычная дзейнасць беларускіх вучоных па выяўленні і даследаванні фундаментальных і прыкладных праблем нацыянальнай культуры. Іх маштабнасць і тэарэтыка-метадалагічная значнасць сведчаць аб існаванні ў нашай краіне нацыянальнай культуралогіі.

*Ю. П. Бондар*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УВОДЗІНЫ

Айчынная фундаментальная культуралогія адносна нядаўна набыла статус сацыяльна-гуманітарнай навуковай дысцыпліны, але за чвэрць стагоддзя дасягнула сталага ўзроўню развіцця і характарызуецца пэўнай сістэмнасцю, што дазваляе шматбакова разгледзець і асэнсаваць шэраг праблем, якія ў сумежных навуках да гэтага часу не атрымалі глыбокага асвятлення. Паходжанне тэрміна «культуралогія» пачынаецца з працы амерыканскага антраполага Леслі Алвіна Уайта (1900–1975) «Навука аб культуры» (1949) [164], у якой культуралогія разглядаецца як самастойная навука. Па Л.-А. Уайту, культуралогія вывучае не ўзаемадзеянне індывідаў (як сацыялогія), а элементы культуры. Даследчык сцвярджаў, што менавіта культура стварае ў людзей ілюзію іх усёмагутнасці, усёведання, дае ім пачуццё ўпэўненасці, пераконвае ў існаванні сэнсу жыцця, надзяляе духоўнымі сіламі для падтрымання жыццядзейнасці. Л.-А. Уайт прапаноўваў аналізаваць феномены культуры зыходзячы з чатырох падыходаў: часавага і пазачасавага, абагульняльнага і ўдакладняльнага.

Прадметнай галіной культуралогіі з’яўляецца тэарэтычнае пазнанне феномена культуры, распрацоўка катэгарыяльнага апарату і метадаў даследавання.

Этымалогія дэфініцыі cultura ўзыходзіць да часоў Антычнасці, калі яе змястоўнасць абмяжоўвалася адлюстраваннем меры ўдзелу чалавека ў асваенні прыроды. Да XVII ст. такое разуменне датычылася вызначэння ўплыву чалавека на навакольны свет.

Мысліцелі эпохі Асветніцтва тэрміну «культура» надаюць каштоўнасную афарбоўку. Нямецкі правазнаўца Самуэль фон Пуфендорф у XVII ст. упершыню ўжывае яго ў якасці самастойнага паняцця. Культурай вучоны называў стан грамадства, супрацьлеглы натуральнаму (цывілізацыя), усё тое, што існуе дзякуючы чалавеку і яго дзейнасці. Ж.-Ж. Русо разглядаў культуру як самастойную з’яву сацыяльнага жыцця, якая патрабуе і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заслугоўвае навуковага даследавання, але аддаляе чалавека ад натуральнай прыроды. Культура, па Ж.-Ж. Русо, асабліва ў форме навукі, – вораг прыроды і ўсяго, што ёсць у чалавека натуральнага, духоўнага, маральна прыгожага.

Найбольш глыбока ідэя культуры была распрацавана нямецкім асветнікам І.-Г. Гердэрам (1744–1803). «Радавое жыццё» чалавецтва, па меркаванні І. Гердэра, заключаецца ў тым, што кожны асобны індывід мноствам нітак звязаны з іншымі людзьмі, залежыць ад іх. У працы «Ідэі да філасофіі гісторыі чалавецтва» [36] філосаф адзначае выразнае праяўленне гэтай сувязі ў адукацыі і выхаванні, якія абумоўліваюць як бы другое нараджэнне чалавека, што, на думку І. Гердэра, і ёсць культура. Чалавек дзякуючы культуры не выключаецца з прыроды, а стварае яе вышэйшае і заключнае звяно. І. Гердэр трактаваў культуру як ступень удасканалення чалавека і перш за ўсё развіцця навук і асветы, як змест, характарыстыку сацыяльнага прагрэсу.

У канцэпцыях XIX ст. культура разглядаецца ў асноўным як духоўная сфера грамадскага жыцця, каштоўнасны аспект духоўнага складніка чалавека. Напрыклад, для І.-Г. Фіхтэ культура – гэта незалежнасць і свабода духу. Вельмі шырокае разуменне культуры ў Э.-Б. Тайлара, які разглядаў культуру як складанае цэлае, што ўключае веды, вераванні, мастацтва, мараль, законы, звычаі, здольнасці і прывычкі, засвоеныя чалавекам як членам грамадства. К. Маркс пашырыў межы паняцця. Ён улічвае не толькі духоўныя, але і матэрыяльныя складнікі, абгрунтоўвае сувязь культуры з усімі сферамі сацыяльнага жыцця.

У XX ст. грамадская думка вызвалілася ад абмежаванага, вузкага разумення культуры, якое мела рамантычнае, суб'ектыўнае адценне. Рэфлексія перамясцілася ў сферу пазнання ўсяго свету створанай чалавекам «другой прыроды», выкарыстоўваючы ў гэтым пазнанні агульнапрынятыя ў навуцы метады. О. Шпенглер уяўляў культуру як пэўную дынамічную сістэму. У працы «Заняпад Еўропы» філосаф бачыў культурную сутнасць сістэмы ва ўнутраным ладзе душы таго альбо іншага народа [178; 179]. Такім чынам, О. Шпенглер ствараў сваю канцэпцыю ў межах псіхалагічнай трактоўкі сутнасці культу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ры. З. Фрэйд, К.-Г. Юнг таксама лічылі, што ў рамках псіхалагічнай антрапалогіі адбываецца ўключэнне асобы ў культуру. А. Р. Рэдкліф-Браўн і Б. Маліноўскі вылучылі ў прыродзе культуры яе дзейнасную сутнасць. Яны звязвалі культуру, яе функцыянаванне з задавальненнем дзейнасных патрэбнасцей. У гэты перыяд адбываецца асэнсаванне таго, што культура – такі змест грамадскага жыцця, які забяспечвае цэласнасць і жыццядзейнасць грамадства. М. Херсковіц выступае з тэорыяй культурнага рэлятывізму, у рамках якой фарміруецца ўяўленне аб тым, што ў аснове культуры знаходзіцца сістэма каштоўнасцей, якія вызначаюць адносіны «чалавек – свет».

Узбагачэнне тэорыі і гісторыі культуры ў ХХ ст. звязана з ідэямі герменеўтыкі, семіётыкі, структуралізму, фенаменалогіі, якія адначасова з'яўляюцца і навуковымі кірункамі, і метадалогіяй даследавання з'яў і працэсаў культуры. Дасягненні ў галіне фундаментальнай культуралогіі звязаны з такімі імёнамі замежнай думкі, як Р. Барт, М. Бахцін, Р. Бергсан, Р. Бенядзікт, М. Бярдзяеў, Г. Гадамер, Ж. Дэлёз, Ж. Дэрыда, А. Кробер, Ю. Крысцева, М. Мід, Ю. Лотман, Д. Мацумота, Дж. Пірс, П. Сарокін, Ж. Сартр, П. Рыкёр, М. Фуко, М. Хайдэгер, М. Шэлер, У. Эка, К. Юнг і інш.

Такім чынам, сучасны культуралагічны дыскурс уяўляе шырокі спектр аналізу культуры, прадстаўлены шматлікімі тэорыямі і канцэпцыямі. Больш за тое, сёння культуролагі абапіраюцца і на ўласна культуралагічныя метады аналізу, якія выкарыстоўваюцца не толькі ў спецыялізаваных даследаваннях культуры, але і ў іншых галінах ведаў.

Нельга не заўважыць значнай актывізацыі культуралагічнай даследчай і навукова-метадычнай працы ў другой палове ХХ ст. у Беларусі. Працы Я. М. Бабосава, Я. Д. Грыгаровіч, П. Р. Ігнатовіча, Ч. С. Кірвеля, М. І. Крукоўскага, М. А. Мажэйкі, А. С. Майхровіча, А. І. Мальдзіса, І. В. Марозава, У. Ф. Мартынава, В. У. Пазнякова, У. П. Скараходава, А. І. Смоліка, Э. А. Усоўскай, Ю. В. Чарняўскай, І. М. Шумскай, І. Я. Ыршова, В. Р. Языковіча, Я. С. Яскевіч і іншых раскрываюць тэарэтычныя асновы, сутнасць і марфалогію культуры. Абапіраючыся на тэарэтычную спадчыну мысліцеляў мінулых стагоддзяў, сучасныя беларускія культуролагі даследуюць спецыфіку



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фарміравання нацыянальнай культуры, яе функцыянаванне ва ўмовах трансфармацыйных працэсаў, якія адбываюцца ў XXI ст. У рамках беларускай культуралагічнай школы створаны працы па гісторыі станаўлення і развіцця культурфіласофскай думкі на землях Беларусі. Сярод іх вылучаюцца манаграфіі У. М. Конана «Антон Луцкевіч: філасофія і эстэтыка нацыянальнага Адраджэння» [79], «Нарыс гісторыі эстэтычнай думкі Беларусі» [81]. Развіццё філасофскіх поглядаў у Беларусі ў эпоху Асветніцтва даследаваў Э. К. Дарашэвіч. У прыватнасці, яму належыць праца «Анёл Доўгірд – мысліцель эпохі Асветніцтва» [48]. Пошуку беларускімі асветнікамі сэнсу быцця і чалавека прысвяціў даследаванне А. С. Майхровіч [109]. Пэўную каштоўнасць для культуролагаў мае праца А. І. Смоліка «Культура Беларусі XI–XIX стст.» [149], у якой шмат увагі надаецца поглядам мысліцеляў мінулых эпох пра сутнасць і змест культуры. На жаль, сёння няма комплекснай працы, у якой з пазіцый сучасных дасягненняў у галіне культуралогіі былі б прааналізаваны станаўленне і развіццё імпліцытных і эксплiцытных культуралагічных ведаў у Беларусі. У дадзенай манаграфіі робіцца першая спроба сістэмна падаць працэс фарміравання беларускай гісторыі культуралогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 1

# ФАРМІРАВАННЕ Ў ГРАМАДСКАЙ СВЯДОМАСЦІ ПАНЯЦЦЯ «КУЛЬТУРА»

## 1.1. Гістарычныя і сацыяльныя перадумовы станаўлення імпліцытных ведаў аб культуры

Гісторыя айчыннай культуралагічнай думкі ўяўляе непарыўны працэс спасціжэння духоўных з'яў як часткі быцця беларускага этнасу. Вытокі асэнсавання аб'ектыўнай ісціны ў галіне духоўнага асваення рэчаіснасці неабходна шукаць у культурным вопыце старажытнаславянскіх народаў, якія пачалі засяляць тэрыторыю сучаснай Беларусі ў першыя стагоддзі новай эры. Як паказалі даследаванні археолагаў, у слаях, што адносяцца да VI–VIII стст., на тэрыторыі Паўночнай і Сярэдняй Беларусі паўсюдна заўважаны сінтэз культуры балтаў і славянскіх плямён. У курганах і гарадзішчах знойдзены шматлікія творы скульптуры (язычніцкія ідалы) і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: ювелірныя ўпрыгожванні, мастацкая кераміка, разьба па косці. У VIII–X стст. усходнеславянскі этнас ужо стварыў адметную культуру, якая ўвабрала ў сябе элементы культуры балтаў і іншых суседніх супольнасцей. Культура гэтага перыяду – складаная і багатая з'ява, шматграннасць якой у значнай ступені абумоўлена своеасаблівасцю культуры асобных княстваў. Полацкае і Тураўскае старажытныя дзяржаўныя ўтварэнні з'яўляліся не толькі палітычнымі і эканамічнымі цэнтрамі Заходняй Русі, але і асяродкамі духоўнай і матэрыяльнай культуры. Княствы знаходзіліся ў цеснай сацыякультурнай камунікацыі з Візантыяй і з тагачаснымі заходнееўрапейскімі дзяржавамі.

Культурныя кантакты ўсходніх славян, якія пражывалі на тэрыторыі сучаснай Беларусі, значна ўзмацніліся пасля прыняцця ўсходнеславянскімі дзяржавамі хрысціянства. Распаўсюджванне хрысціянства на землях Заходняй Русі паклала пачатак працягламу перыяду панавання новага светапогляду, які

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абвясціў прынцыпова новае ў параўнанні з язычніцкім уяўленне аб сутнасці быцця, гісторыі, чалавека, яго месца ў свеце, адносінах да сябе і іншых людзей. Старажытныя княствы, якія прынялі новую рэлігію ад Візантыі, адчулі яе магутнае духоўна-культурнае ўздзеянне, дапоўненае дабратворным старабалгарскім уплывам. Дзякуючы балгарскім кніжнікам Кірылу і Мяфодзію ўсходнія славяне атрымалі пісьменнасць і пераклады значнай колькасці самых разнастайных кніг пераважна рэлігійнага зместу. Да іх адносіліся Свяшчэннае Пісанне, багаслужэбныя, тэалагічныя кнігі, хронікі, гістарычныя апавяданні, прыродазнаўча-навуковыя сачыненні, зборнікі выказванняў. Перакладзеная літаратура знаёміла нашых продкаў з культурнымі дасягненнямі іншых народаў, перш за ўсё з дасягненнямі і каштоўнасцямі грэка-візантыйскай цывілізацыі і старабалгарскай кніжнай культуры.

Уплыў на працэс фарміравання імпліцытных культуралагічных ведаў аказала антычная філасофія як вышэйшае дасягненне старажытных грэкаў і рымлян. Іх філасофія асэнсоўвала не толькі культурны вопыт Грэцыі і Рыма, але і досвед усяго тагачаснага свету, абмежаванага міжземнаморскім рэгіёнам, і мела на той час высокую ступень усеагульнасці. У антычны перыяд ужо адбываюцца паступовае зніжэнне ролі міфа, крызіс міфалагічнага светасузірання. Міфалагічныя сюжэты ў пэўнай ступені набываюць сімвалічную, умоўную, паэтычную форму. У суб’ектаў антычнай культуры назіраецца ўзмацненне этычнага аспекту светаразумення. Аналіз літаратуры, якая была вядома ў ранні перыяд гісторыі беларускага этнасу, сведчыць, што нашым продкам дастаткова шырока былі вядомы перакладзеныя і нават арыгінальныя творы грэчаскіх аўтараў. Вытрымкі шэрагу антычных літаратараў нярэдка групаваліся ў разнастайныя зборнікі. Таму ёсць усе падставы меркаваць, што ўжо ў пачатку першага тысячагоддзя пісьменныя людзі старажытнабеларускіх княстваў былі знаёмы з некаторымі імпліцытнымі культуралагічнымі ведамі антычных філосафаў і гісторыкаў. Антычныя аўтары выказалі мноства цікавых думак наконт прыроды гісторыка-культурнага прагрэсу і рэгрэсу, фактараў, якія абумоўліваюць паходжанне і разнастайнасць культур, аб карысці міжкультурных камунікацый і інш. Усходнія славяне, якія пражывалі на землях сучаснай Беларусі, вельмі хутка далучыліся да багацця візантыйскай і стараславянскай літарату-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ры і культуры і самі пачалі займацца творчасцю ў розных галінах духоўнай культуры. Так, даволі рана ўзнікае і афармляецца славянская летапісная традыцыя. Высокую ступень адметнасці маюць такія летапісныя творы, як «Слова аб палку Ігаравым», «Аповесць мінулых гадоў», зборнікі «Пчала», «Чэцці-Мінеі» і інш.

Уплыў на светапогляд мысліцеляў Сярэдніх вякоў аказала візантыйская культура, якая была спадкаемніцай антычнай культуры. Яе архітэктура, жывапіс, філасофія, тэалогія, навука выступалі ў якасці недасягальнага ўзору (прынамсі да XII–XIII стст.) для народаў як мусульманскага, так і хрысціянскага свету. У перыяд існавання Візантыйскай імперыі культура перажывала сапраўдны росквіт.



*Трыумфальная арка*

Паколькі Візантыйская імперыя знаходзілася на перакрыжаванні Захаду і Усходу, то яе культура ўяўляла своеасаблівы сінтэз грэка-рымскай і ўсходняй культур, прычым дамінавалі ў ёй відавочныя антычныя традыцыі, рысы. Асобныя элементы візантыйскай культуры нагадвалі антычную (найперш рымскую) культуру, напрыклад, адміністрацыйная сістэма, ваенная магутнасць, моцная армія, хрысціянская рэлігія, рымскае права, дзяржаўная лацінская мова (пазней яе замяніла грэчаская мова), іпадромы. У эпоху Сярэднявечча візантыйская цывілізацыя і культура займалі (разам з кітайскай) вядучае месца ў сусветным цывілізацыйна-культурным працэсе.

Да крыніцы фарміравання культуралагічнай думкі, на наш погляд, варта аднесці народныя міфапаэтычныя ўяўленні ўсходніх славян, прадстаўленыя вуснай народна-паэтычнай творчасцю. У вуснай паэтычнай творчасці, музыцы, танцы, тэатры, выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве адлюстроўваюцца працоўная дзейнасць, грамадскі і бытавы ўклад жыцця, культы і вераванні, рэлігійныя і сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці этнасу. Як ранняя форма ідэйнай свядомасці наогул, фальклор меў для іх велізарнае значэнне. Фальклор, як сінтэза-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваная шматаспектная сфера ў культурнай самарэалізацыі і камунікацыі этнасу, уплывае на розныя аспекты анта- і філагенезу, уздзейнічае на культурную кампетэнцыю суб'ектаў этнічнай культуры. Менавіта ў ім выяўляецца мадэль светабачання чалавека, фарміруецца этнічная самасвядомасць этнафору. На прыроду пераносіліся сутнасныя сілы чалавека, якія надзяляліся атрыбутам бязмежнай магутнасці.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што ў міфе адбываўся працэс надзялення навакольнага асяроддзя якасцямі чалавека. Міфалогія развівала ў суб'ектаў старажытнай культуры ўяўленні і тым самым садзейнічала іх духоўнаму развіццю. У розных жанрах фальклору адзначаліся зачаткі культуралагічных ведаў.

## 1.2. Уяўленні аб культуры як культу тварэння ў эпоху Сярэднявечча

Сярэднявечча – назва эпохі паміж старажытнасцю (Антычнасцю) і Адраджэннем. Гэта паняцце ўведзена ва ўжытак італьянскімі гуманістамі XV–XVI стст., якія імкнуліся супрацьпаставіць свой час папярэднім стагоддзям, што трактаваліся імі як перыяд заняпаду культуры. Сярэднія вякі ахопліваюць перыяд ад V да XV ст. Асноўнымі прыкметамі Сярэднявечча прынята лічыць існаванне васальна залежнай сістэмы і феадалізму як асаблівага тыпу грамадскага ладу. Эпоху характарызавалі панаванне натуральнай гаспадаркі і падзеленасць свету на мноства малых, практычна аўтаномных гаспадарчых рэгіёнаў, а таксама перавага рэлігійнага светапогляду.


*Фама Аквінскі*

У сацыяльным плане сярэдневяковае грамадства складалася з духавенства, дваранства (рыцарства) і трэцяга саслоўя (народа). Узаемаадносіны паміж людзьмі былі заснаваны на падначаленасці ніжэйшых саслоўяў вышэйшым. Нярэдка адбывалася барацьба за вяршэнства паміж свецкай і духоўнай уладамі. Найбольш вядомыя багасловы і філосафы Аўрэлій Аўгусцін, Фама Аквінскі даказвалі прымат духоўнай улады над свецкай. Грамадзяне сярэднявечных краін належалі найперш да пэўнай сацыяльнай групы – саслоўя, абшчыны, гільдыі, цэха, карпарацыі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

партыі, роду. Тады калектыўны пачатак відавочна дамінаваў над індывідуальным.

Культура еўрапейскага Сярэднявечча ўзнікла на руінах Рымскай імперыі. Аслабленне і распад цэнтральнай імперскай улады суправаджаліся смутамі, войнамі, разрухай. Тры сілы сутыкнуліся ў барацьбе, ад зыходу якой залежала яе будучыня.

Першая – гэта традыцыі старэючай грэка-рымскай культуры. Яны засталіся ў нямногіх культурных цэнтрах, дзе яшчэ існавала жыццё, – у антычных храмах, бібліятэках і майстэрнях. Зберагалі гэтыя традыцыі высокаадукаваныя людзі, але авалодаць новымі ідэямі, што маглі б заваяваць шырокае прызнанне на аснове элінізму, яны ўжо не маглі. Калі б гэтая сіла, тым не менш, змагла выстаяць і зноў усталявацца ў грамадстве, тады вектар далейшага культурнага жыцця Еўропы быў бы звернуты ў мінулае.

Другой сілай быў дух варварства. Пераносчыкамі яго былі розныя народы, што жылі на тэрыторыі Рымскай імперыі і пранікалі ў яе. Варвары былі мужнымі і суровымі, ідэалы і каштоўнасці антычнага свету былі ім не зразумелымі. Духоўны свет варварскіх народаў быў вельмі бедны. Яны не маглі супрацiўляцца больш развітым формам духоўнага жыцця, якія нёс Рым.

Хрысціянства было трэцяй і самай моцнай з усіх сіл, якія характарызавалі культурнае развіццё Еўропы. Ад іўдаізму яно ўвабрала не толькі ідэю адзінабожжа (манатэізму) і ветхазапаветнага Свяшчэннага Пісання, але і элементы старажытных культаў, што адлюстроўваліся ў ім. Такім чынам, хрысціянства з’яўлялася свежай плынню, якая змагла ўдыхнуць новае жыццё ў культуру Еўропы.

У духоўнай культуры Сярэднявечча галоўная роля належыць хрысціянскай рэлігіі. Яна з’яўлялася дамінантай духоўнага жыцця сярэдневяковага грамадства, выконвала функцыі аднаго з найважнейшых інстытутаў культуры. Яе светапоглядн ай асновай з’яўляецца сувязь адзінаверцаў, іх духоўна-маральных пошукаў. У гэтых умовах прыроду маральнага ідэалу хрысціянскай ідэалогіі можна ўявіць як адзінства веры, надзеі і любві. У гэтай трыядзе вера выступае як асаблівы стан духу, як святая прастата, што вядзе да Бога. Надзея ўвасабляла ідэю выратавання ад граху з дапамогай Бога праз замагільную адплату, шлях да якой – пакорлівасць, прытрымліванне прыкла-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даў асвечаных царквою паводзін. Любоў разумеецца як любоў да Бога, як сувязь, імкненне чалавека да Бога.

Сутнасць культуры любой эпохі перш за ўсё адлюстроўваецца праз уяўленні чалавека аб самім сабе, сваіх мэтах, магчымасцях, інтарэсах. У сярэднявечнай культуры гэтыя ўяўленні шмат у чым фарміравалі дзеячы царквы. Яны імкнуліся грамадскія адносіны тлумачыць на прыкладзе адносін чалавека і Бога. Падпарадкаванне, пакорлівасць становяцца галоўнымі каштоўнасцямі грамадскага жыцця, якія прапаведуе хрысціянскае духавенства. Яно ідэйна апраўдвае саслоўную арганізацыю жыцця грамадства, яго іерархічнасць, калі кожны чалавек ведае сваё месца ў свеце і жыве ў строгай адпаведнасці з гэтым парадкам размяшчэння сацыяльных груп.

Рэлігійнасць як галоўная асаблівасць духоўнага жыцця Сярэднявечча абумовіла ролю царквы як найважнейшай арганізацыі культуры. Царква выступае і як свецкая сіла, якая ў асобе папства імкнецца да панавання над хрысціянскім светам. Задача царквы была выключна цяжкай. Праводзіць сваю культуру ў жыццё царква мела магчымасць, толькі «акунаючыся» ў людскія справы, а развіваць гэтую культуру можна было шляхам паглыблення ў яе рэлігійнасць. Каб развіваць сваё «нябеснае жыццё» ў вышэйшых формах рэлігійнасці, царква павінна была спусціцца ў свет і перайначваць яго, але ў той жа час жыць зямным жыццём.

Для абаронцаў хрысціянскай веры культура першапачаткова атаясамлівалася з антычным – язычніцкім – светапоглядам. З умацаваннем хрысціянства з культурай пачалі звязваць старажытную філасофію. Больш таго, саму філасофію атаясамлівалі з традыцыяй, ад якой неабходна было ці вызваліцца, ці паставіць на службу царквы. Так, Клімент Александрыйскі пераконваў, што культуру міран неабходна выкарыстоўваць, але не затрымлівацца на ёй і не губляць на яе час. Культура, на яго думку, ёсць ніжэйшая ступень на шляху рэлігійнага пераўтварэння.

Антычную ідэю культуры адмаўляў таксама Амвросій Македонскі. Філасофію грэкаў і рымлян ён называе ілжывай і пустой, таму што яна ўстаноўлена не сілай Божай, а ад бяссілля чалавечага розуму, якое прыніжае Божую сілу ў сваім пазнанні. Месца антычнай культуры як традыцыі заняў культ тварэння, аднакратнасці свету, яго ўнікальнасці і навізны. Амвросій

Македонскі пераносіць на Боскі свет тэрміны, вытворныя ад слова «культура». Бога-Тварца ён называе «Cultrix», веруючых у Яго – «cultor». Для сярэдневяковых хрысціянскіх мысліцеляў культура – заўсёды культура міран, і прадстаўлена яна перш за ўсё ў язычніцкай культуры Антычнасці.



*Аўрэлій Аўгусцін*

Такім чынам, галоўнай рысай духоўнай культуры Сярэднявечча з’яўляецца яе рэлігійнасць. Яна выступае як новая светапоглядная аснова свядомасці чалавека, выяўленне запыту на святое, чыстае жыццё, якое ўзнікае ў таго чалавека, што стомлены грубасцю позняй рымскай Антычнасці. Язычніцкія рэлігіі не былі падрыхтаваны да гэтага, але і вялікія масы людзей таксама не былі здольнымі стаць аскетамі, практычна адмовіцца ад радасцей зямнога жыцця. Хрысціянства было свайго роду залатой сярэдзінай, кампрамісам духу і плоці, бо пры ўсёй сваёй духоўнасці Хрыстос уваскрасае як цялесная істота, якая мае плоць і кроў, да якой можна дакрануцца. Акрамя таго, адзін Бог лепш зразумелы для чалавека, які мае аднаго гаспадара. Таму асноўнай асаблівасцю культуры Сярэдніх вякоў з’яўляецца яе відавочны тэацэнтрызм – такі светапогляд, дзе ў цэнтры ўвагі знаходзіцца Бог.

Менавіта на светапоглядным падмурку хрысціянства ўзніклі культура і філасофская думка на раннесярэдневяковых беларускіх землях. Хрысціянскі гуманізм, пазбаўлены саслоўных абмежаванняў, абумовіў яго духоўную ўплывовасць. Асветнікі гэтай эпохі імкнуцца да філасофскага, рацыяналістычнага асэнсавання рэчаіснасці. Адметнасцю іх філасофскіх вучэнняў з’яўляецца вера ў магчымасці чалавечага розуму як надзейнага сродку пазнання свету. Маральны пафас хрысціянскага гуманізму дастаткова хутка пранікае ў старажытнабеларускую літаратуру і набывае адзнакі ўстойлівай нацыянальнай традыцыі, вызначае яе ўзнёслы ўнутраны пафас.

***Светапоглядныя ўяўленні Ефрасінні Полацкай*** (каля 1104?–1173). Е. Полацкая была адной з першых асветніц. Прадслава (свецкае імя) з’яўлялася дачкой Святаслава (у хрышчэнні Георгія), малодшага сына Усяслава Чарадзея.

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ



У юнацтве стала манашкай, прыняўшы імя Ефрасінні. Пачатак свайго манаскага жыцця Ефрасіння правяла ў келлі Полацкага Сафійскага сабора, дзе займалася перапіскай царкоўных кніг. Па ініцыятыве Ефрасінні была пабудавана царква Спаса – унікальны помнік мураванага дойлідства Беларусі.

Потым яна заснавала каля Полацка жаночы манастыр Св. Спаса, пры якім адкрыла школу для навучання дзяцей грамаце. Ефрасіння заснавала і мужчынскі Багародзіцкі манастыр. Гэтыя манастыры сталі асяродкамі асветы ў Полацкім княстве, пры якіх працавалі вучылішчы, бібліятэкі, іканапісная і ювелірная майстэрні. Сама Ефрасіння складала і запісвала малітвы і дыдактычныя пропаведзі. Пад канец жыцця яна адправілася ў паломніцтва да Гроба Гасподняга ў Іерусалім. Там і памерла ў 1173 г. Пасля смерці Ефрасінні невядомы аўтар склаў «Жыціе Ефрасінні Полацкай» [55]. Гэта адзін з вельмі нямногіх помнікаў літаратуры агіяграфічнага жанру старажытнага Полацка, які дайшоў да нас. Ён зарадзіўся ў Рымскай імперыі як апавяданні аб хрысціянскіх пакутніках. Дадзены жанр прайшоў даволі доўгі шлях і стаў своеасаблівай ідэалагічна-мастацкай формай услаўлення духоўных і свецкіх асоб, кананізаваных хрысціянскай царквой. Стварэнне ў Полацку свайго «Жыція...» з’яўляецца сведчаннем самастойнасці, палітычнай і культурнай незалежнасці княства. Аўтар услаўляе настойлівую і самаахвярную жанчыну, яе імкненне да ведаў і духоўнай дасканаласці. «Жыціе...» прасякнута пафасам сцвярджэння хрысціянскіх светапоглядных уяўленняў і імкненнем да праўдзівасці. Актыўным суб’ектам сцвярджэння праўдзівасці выступае ў творы Ефрасіння. У «Жыціі Ефрасінні Полацкай» выразна прасочваецца аксіялагічны кантэкст, важнейшае значэнне набывае сцверджанне ідэі сапраўднага чалавечага жыцця, якое заключаецца ў адданасці ідэі, абранаму шляху і якое, безумоўна, прадугледжвае выбар, гэта значыць асэнсаваную пазіцыю ў адносінах да рэчаіснасці. Ефрасіння Полацкая, паказвае аўтар, свядома выбірае паміж вышэйшым мірскім (багацце, слава) і цяжарам манаскага быцця. Гэты выбар заснаваны на супрацьпастаўленні зямнога (рэальнага) і духоўнага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значнай культурнай каштоўнасцю, якая адлюстроўваецца ў дадзеным агіяграфічным творы, з'яўляюцца веды. Змястоўная арыгінальнасць «Жыція...» – у паказе любві да кнігі, ведаў, у імкненні да духоўнага самаўдасканалення. Аўтар твора адзначае, што ў Ефрасінні вельмі рана праявіўся інтарэс да ведаў і шырока разышліся чуткі аб яе мудрасці і прыгажосці. У жыццеапісанні звяртаецца асаблівая ўвага менавіта на ўнутраныя духоўныя якасці Ефрасінні Полацкай, перш за ўсё на яе інтэлектуальную адоранасць.

У «Жыціі...» скандэнсаваны таксама важнейшыя эстэтычныя каштоўнасці. У творы ўвасоблены ідэал духоўнай і фізічнай прыгажосці чалавека, як ён уяўляўся мысліцелямі Сярэдніх вякоў. Аўтар разважае аб хуткацечным характары прыгажосці бачанага чалавекам свету і аб нятленнай прыгажосці падзвіжніцтва.

Аналіз тэксту «Жыція...» сведчыць, што ў ім увасоблены шэраг маральных каштоўнасцей. Так, аўтар паведамляе, што Ефрасіння займалася маральным выхаваннем дзяўчат і жанчын Полаччыны. Такім чынам, у вышэйпрыведзеных радках сфармуляваны сутнасць і змест маральнай культуры, як яна ўяўлялася ў Сярэднявеччы. Духоўны ўплыў беларускай асветніцы Ефрасінні Полацкай адчуваўся на ўсіх землях старажытнай Русі. Яе імя і справы, вобраз падзвіжніцы сталі шырокавядомыя ў XVI ст., калі мітрапаліт Макарый уключыў яе «Жыціе...» у «Чэцці-Мінеі». Найпрападобнейшую Ефрасінню Полацкую глыбока шануюць ва ўсім хрысціянскім свеце.

***Праблема чалавека ў творчай спадчыне Кірылы Тураўскага.*** Культуралагічныя ўяўленні ранняга Сярэднявечча ў Беларусі вельмі выразна адлюстраваны ў літаратурнай спадчыне аднаго з самых таленавітых пісьменнікаў і красамоўцаў таго часу Кірылы Тураўскага (1130 –1182?).



Вядомы беларускі пісьменнік, прапаведнік, царкоўны дзеяч нарадзіўся і выхоўваўся ў г. Тураве. Сын заможных бацькоў. Атрымаў добрае хатняе выхаванне, пазней спасціг вышэйшыя тагачасныя навукі ад грэчаскіх настаўнікаў. Добра валодаў народнай вобразнай і стараславянскай мовамі, глыбока ведаў візантыйскую культуру, асабліва паэзію і красамоўства. Рана стаў паслушнікам аднаго з тураў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

скіх манастыроў. У 1169 г. прыняў епіскапства. Сваю пасаду разглядаў як нялёгкі абавязак хрысціяніна і асветніка.

На думку даследчыкаў, да літаратурнай спадчыны Кірылы Тураўскага адносіцца больш за 70 твораў розных жанраў. Захаваліся 8 слоў-казанняў, 2 прытчы, 2 казанні, 2 пасланні да Васіля – ігумена Пячорскага, 2 каноны і каля 30 спавядальных малітваў. Яго творы набылі вялікую папулярнасць на Русі. У іх ён тлумачыў сімволіку біблейскіх кніг. Ён прапаведаваў евангельскую Боскую ласку, радасць адчування духоўнага нараджэння ў Хрысце. Для хрысціянскай культуры таго часу багаслоўская паэтычная, красамоўніцкая і асветніцкая творчасць Кірылы Тураўскага была сапраўдным адкрыццём красы і мастацкай выяўленчай сілы роднай мовы.

Творы Кірылы Тураўскага набылі вялікую папулярнасць на Русі і распаўсюджваліся ў спісах на працягу многіх стагоддзяў. Пазней яго малітвы, казанні, прытчы неаднойчы друкаваліся рознымі выдаўцамі. Філасофскія і маральна-этычныя погляды пісьменніка раскрываюцца ў яго творах у форме прытчаў, з выкарыстаннем мастацкіх вобразаў і сімвалаў. Так, у спавядальных малітвах, створаных К.Тураўскім, яскрава адчуваецца шчырае лірычнае самараскрыццё душы чалавека перад Богам. Мудрасць вучонага, прамоўцы, пісьменніка, ва ўяўленні К. Тураўскага, зыходзяць ад Бога: ён неаднаразова падкрэсліваў, што піша і прапаведуе не ад свайго розуму, а просіць дара слова ў Бога. «Яко же бо и по ногу вязящи птице нест мощно а анерьскую възлетети высоту, тако и мне в телесных вязащю похотех, не возможно о духовных беседовати» [160, с. 343]. Як і Ефрасіння, ён прапаведаваў каштоўнасць ведаў; у чытанні кніг і практыкаваннях розуму мысліцель бачыў шлях да маральнага ўдасканалення і інтэлектуальнага развіцця. Розум для яго быў вышэйшай каштоўнасцю зямнога жыцця. У адной з яго прытчаў гаворыцца: «Гора будзе ўсім тым, хто не трымаўся кніжнай мудрасці і наказаў духоўных бацькоў; гора тым, хто пад гульні і скокі апіваўся вінам; гора будзе жалейнікам і гора тым, хто іх слухаў, бо ўзвялічвае д’ябла – губіць усіх хрысціян» [122, с. 627].

Для светапогляду Кірылы Тураўскага характэрны пазітыўныя адносіны да прыгажосці пачуццёвага свету, але ў адпаведнасці з артадаксальным хрысціянствам ён бачыў у прыгажосці зямной водбліск Боскай прыгажосці: «Ибо если цепь златая,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

унизанная жемчугом и драгоценными камнями, приятна для очей, на нее взирающих, тем более приятны красоты духовные – святые праздники, веселящие сердце верующих и освящающие их души». Ідэалам прыгажосці, да якой павінен імкнуцца чалавек, паводле меркаванняў К. Тураўскага, з’яўляюцца Боскія анёлы.

Праблема чалавека як суб’екта культуры ў яго грамадскім быцці сімвалічна раскрываецца ў некаторых прытчах. Шэраг твораў К. Тураўскага прысвечаны раскрыццю сацыяльна-этычнага сэнсу манаскага жыцця. Духоўная місія манахаў, лічыў К. Тураўскі, заключаецца ў тым, каб даць чалавеку і грамадству ўзоры быцця з Богам, жыцця ў чысціні і ў адпаведнасці з Боскай праўдай.

У асобных творах красамоўніцкага жанру выкрываецца недасканаласць дзяржаўнага ладу, зямной улады, якая служыць грахоўнай прыродзе чалавека, а не яго духоўнаму ўдасканаленню.



***Ідэя антрапацэнтрычнасці Клімента Смаляціча*** (?–пасля 1164?). Клімент Смаляціч вядомы як пісьменнік і царкоўны дзеяч. Верагодна, што адукацыю ён атрымаў у Канстанцінопалі. Быў спачатку манахам Зарубскага манастыра непадалёку ад Кіева, сем гадоў з’яўляўся мітрапалітам Кіеўскім і ўсяе Русі. Даследчыкі сведчаць, што Клімент Смаляціч грунтоўна вывучаў антычную культуру, дасканала ведаў творы Арыстоцеля, Гамера, Платона і інш. У Іпацьеўскім летапісе пра яго сказана, што ён «быў кніжнік і філосаф, якіх у рускай зямлі не бывала». Гэтая характарыстыка, бясспрэчна, вельмі справядлівая. Клімент Смаляціч – пладавіты пісьменнік, але да нашага часу захаваўся толькі адзін яго твор – «Пасланне Фаме прэсвітару». Гэтае «Пасланне...» раскрывае кругагляд і інтарэсы вучонага, царкоўнага дзеяча. З паслання бачна, што К. Смаляціч дазваляў іншасказальнае тлумачэнне Свяшчэннага Пісання. Паводле меркаванняў К. Смаляціча, важныя не толькі літаральнае, але і сімвалічнае разуменне біблейскіх тэкстаў, іх творчая інтэрпрэтацыя. Для распрацоўкі і выкладання сваіх думак ён шырока выкарыстоўваў працы антычных мысліцеляў. Значнае месца ў светапоглядзе К. Смаляціча належыць ідэі антрапацэн-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

трызму. Разглядаючы чалавека як вянец тварэння, як асноўны цэнтр Сусвету, створаны па ўзоры і падабенстве Боскім, Смаляціч падкрэслівае, што чалавеку належыць імкнуцца да маральнага ўдасканалення, услаўляць Бога і дзякаваць яму. У «Пасланні...» ён адзначае духоўна-маральную прыроду чалавека. К. Смаляціч адстойвае маральную чысціню думак і ўчынкаў, падтрымлівае духоўнае памкненне да найвышэйшых каштоўнасцей быцця. Ён заклікаў людзей сканцэнтраваць сваю дзейнасць на духоўным, вечным, адмовіцца ад матэрыяльных даброт, уключаючы царкоўную маёмасць.

Вышэйшы сэнс чалавечага існавання К. Смаляціч бачыць у разуменні пабудовы свету, Боскай арганізацыі быцця. Зразумеўшы гэта, чалавек становіцца, такім чынам, на шлях пазнання Бога і сваімі ўчынкамі можа далучыцца да Творца ці, наадварот, аддаліцца ад яго.



***Прапаведаванне маральных прынцыпаў Аўраміем Смаленскім*** (сярэдзіна XII ст. – 1224). Асветнік, рэлігійны і грамадскі дзеяч нарадзіўся ў Смаленску. З дзяцінства выхаваны ў духу строгай хрысціянскай маралі і прывучаны да сістэматычных кніжных заняткаў.

У сталым узросце ён вырашыў прысвяціць сябе справе рэлігійнага служэння і асветы. Раздаў усю сваю маёмасць манастырам, цэрквам і бедным, а сам пайшоў у манастыр, размешчаны ў ваколіцах Смаленска. Тут ён старанна вывучаў творы Іаана Златавуста, Яфрэма Сірына, жыціі святых і займаўся зборам і перапісваннем кніг. Пасля 30 гадоў манаскага служэння ў 1198 г. ён прыняў сан прэсвітара і стаў шырока вядомы як прапаведнік і настаўнік не толькі манаскай брацііі, але і свецкіх асоб. Да яго прыходзілі за духоўнай парадай і настаўленнем баяры і простыя людзі, багатыя і жабракі. Аўрамій раіў ім няўхільна прытрымлівацца маральных прынцыпаў хрысціянства, клапаціцца пра духоўнае ўдасканаленне жыцця, увесь час памятаць пра Бога, маліцца дзень і ноч, каб не быць асуджаным на Судзе потым. Памёр ён прыкладна ў 1224 г., пражыўшы у манастве 50 гадоў. Пасля смерці, як і пры жыцці, Аўрамія шанавалі смаляне як нястомнага прапаведніка рэлігійнага пакаяння і непазбежнасці Страшнага Суда. За актыўнае прапаведа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ванне хрысціянства і ўзорнае жыццё праваслаўная царква кананізавала яго. «Жыціе прападобнага Аўрамія Смаленскага», якое склаў яго вучань Яфрэм, распавядае пра падзвіжніцкую дзейнасць асветніка.



*Кіпрыян і Юстына*

***Культуратворчасць Кіпрыяна*** (каля 1330–1406). Па паходжанні Кіпрыян серб або балгарын. Некаторыя даследчыкі называюць яго ўраджэнцам Літвы. Займаў пасаду іераманаха пры Канстанцінопальскім патрыярху. З 1373 г. знаходзіўся ў Вялікім Княстве Літоўскім у якасці ўпаўнаважанага прадстаўніка патрыярха. Быў прыхільнікам незалежнасці Літоўскай мітраполіі ад маскоўскага рэлігійнага цэнтра. Па прапанове вялікага князя Альгерда заняў кафедру Літоўскага мітрапаліта і ўзначальваў мітраполію да 1389 г. Ім было шмат зроблена па ўмацаванні ролі Літоўскай мітраполіі ў рэлігійным жыцці ўсходніх славян. Мітрапаліт Кіпрыян як мага стрымліваў экспансію каталіцкай царквы, шмат увагі надаваў духоўнай асвеце насельніцтва ВКЛ. Культуратворчасць Кіпрыяна была накіравана на пераклады богаслужэбных кніг на старабеларускую мову і асветніцтва. У сваіх бліскучых прамовах і пасланнях мітрапаліт заклікаў народ ВКЛ да маральнага і рэлігійнага ўдасканалення, падкрэсліваў веліч і выратавальную сілу хрысціянскай веры.

Даследчыкі лічаць Кіпрыяна аўтарам «Летапісу аб пачатку зямлі Рускай». У гэтым творы ён паказаў гісторыю Маскоўскага княства з пункту гледжання адзінства ўсіх славян. У летапісе ёсць звесткі па гісторыі ВКЛ. Адзначаецца ваенны талент Альгерда.

Кіпрыян напісаў таксама «Жыціе св. мітрапаліта Пятра», «Зводную кормчую», некалькі пасланняў Сергію Раданежскаму, шэраг грамат і малітваў.

***Цамблак Грыгорый – абаронца праваслаўнай культуры*** (1364?–1450?). Па паходжанні балгарын. У канцы XIV ст. вёў прапаведніцкую дзейнасць у манастырах Візантыі, Сербіі, Малдавіі. У 1406 г. пасяліўся ў Вялікім Княстве Літоўскім. Па прапанове вялікага князя Вітаўта ў 1415 г. быў абраны мітрапалітам на Наваградскім саборы епіскапаў без згоды патрыярха.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Будучы мітрапалітам Літоўскім і Кіеўскім, Цамблак працягваў і развіваў традыцыі ўрачыстага красамоўства, закладзеныя К. Тураўскім. Ён з'яўляўся аўтарам больш за 40 твораў. Яго пропаведзі, дыдактычна-панегірычныя словы, павучанні, жыцці напісаны вобразнай мовай, насычаны метафарамі, параўнаннямі. У сваіх працах Г. Цамблак узнімаў пытанні шырокага грамадскага значэння, абараняў праваслаўную веру і культуру, услаўляў нацыянальна-культурных дзеячаў.

Пропаведзі і жыцціі, складзеныя Г. Цамблакам, распаўсюджваліся ў беларускіх манастырах, з'яўляліся ўзорам для мясцовых кніжнікаў і духоўна ўзбагачалі чытачоў ВКЛ. Яго літаратурная спадчына станоўча паўплывала на развіццё беларускай літаратуры, а творы ўключаліся ў шматлікія рукапісныя зборнікі XV−XIX стст.

***Летапісанне як крыніца ведаў аб культуры.*** Зачаткі культурна-гістарычных ведаў, акрамя агіяграфічнай літаратуры, утрымліваюцца таксама і ў летапісах. Летапісанне на беларускіх землях узнікла ў перыяд, калі пасля працяглай барацьбы з язычніцтвам хрысціянства ўжо стала афіцыйнай рэлігіяй. Яно было выражэннем новага тыпу свядомасці, якое пераадолела язычніцкую міфалагізацыю рэчаіснасці ў яе агульнаабстрактным узаемапранікненні сённяшняга і мінулага.

У адрозненне ад эпасу, легенд і паданняў, дзе дзеянне і час заключаны ў межах адной сітуацыі, у летапісах час становіцца адносна самастойным, набывае ўніверсальны характар. У летапісных творах адлюстроўваліся важнейшыя тэндэнцыі грамадска-палітычнага і культурнага жыцця сярэднявечнай беларускай супольнасці. У тэкстах старажытнабеларускіх летапісаў (Супрасльскі летапіс, Слуцкі летапіс, Полацкі летапіс, «Хроніка літоўская і жамойцкая», Летапіс Рачынскага, «Хроніка Быхаўца» і інш.) значнае месца займае кірунак індывідуальнага, асобаснага развіцця – сфера духоўных, хрысціянска-ідэалагічных імкненняў з яе ідэальным чалавечым вобразам падзвіжніка і аскета, з ідэямі чыстай, абсалютнай духоўнасці, унутранага маральнага ўзвышэння і бескарыслівага служэння грамадству.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ



*Беларуска-літоўскі летапіс*

У летапісах шырока трактуецца сутнасць дабра як дамінантнай каштоўнасці эпохі Сярэднявечча. З увядзеннем хрысціянства рэальнасць, якая акружае чалавека, стала ўспрымацца ў кантэксце супрацьстаяння дабра і зла, дабрадзейнасці і грэху. Так, з пункту гледжання аўтара Супрасльскага летапісу, агульнае шчасце – ёсць дабро ўсёй дзяржавы, яно заключаецца ў адзінстве беларускага і літоўскага пачатку. Аналагічнай думкі прытрымліваецца і складальнік Летапісу Рачынскага, – гэта перш за усё дабро абсалютнага і вярхоўнага літоўскага ўтварэння. Гэтыя ўяўленні займалі дамінуючае становішча ў сістэме ацэнак, ключавых каштоўнасных арыентацый. Сапраўднымі «святымі» аўтары летапісаў лічылі тых князёў, чыя дзейнасць садзейнічала росквіту дзяржавы, яе культуры, сцвярджэнню ідэі Бога.

Такім чынам, старажытныя беларускія землі мелі багатую літаратурную спадчыну, у якой утрымліваліся важнейшыя каштоўнасныя ўстаноўкі хрысціянскай культуры. Ключавая з іх – фарміраванне асобы праз самаўдасканаленне і самавыхаванне. Дадзеная мэта выхавання вынікала з хрысціянскай этычнай дактрыны, якая стала распаўсюджвацца на беларускіх землях з канца Х ст. Хрысціянскія мысліцелі меркавалі, што самаўладдзе душы, свабода чалавека – рашаючыя фактары ў маральным удасканаленні асобы, у выяўленні яго творчых задаткаў.

У поглядах аўтараў разнажанравай старажытнабеларускай літаратуры на змест працэсу духоўна-маральнага развіцця чалавека ў якасці галоўнага элемента выступае пазнавальная дзейнасць у сферы маралі. Паводле іх меркавання, менавіта ў ходзе пазнавальнай дзейнасці індывід спасцігае сэнс маральных каштоўнасцей і патрабаванняў маралі, набывае ўменні суадносіць іх з унутраным светам, выдзяляць у жыцці этычныя праблемы. Старажытныя беларускія гарады мелі школы, у якіх грунтоўна вывучаліся грэчаская і лацінская мовы, дзе можна было атрымаць шырокую адукацыю. Сапраўдныя літаратурна-асветніцкія школы існавалі і ў манастырах, якія выхавалі славутых мысліцеляў і асветнікаў.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Мысліцелі Сярэдніх вякоў, ставячы чалавека ў цэнтр зямнога быцця, вызначылі шэраг кірункаў узаемадзеяння асобы і свету. Гэта ўзаемадзеянне паміж людзьмі, адносіны чалавека да самога сябе, адносіны чалавека і грамадства. Асаблівая ўвага ў канцэпцыях тагачасных асветнікаў надавалася чалавекалюбству, дабратворчасці, сумленнасці, свабодзе і актыўнасці чалавека. Беларускія кніжнікі лічылі, што працэс фарміравання высокамаральнай асобы павінен ажыццяўляцца на аснове асветніцтва.

Літаратурная дзейнасць беларускіх мысліцеляў высока ацэньвалася ў Старажытнай Русі. Багатая літаратура Полацкай, Тураўскай, Смаленскай і Наваградскай зямель садзейнічала станаўленню і развіццю беларускай мовы як ядра культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 2

# РЭНЕСАНСАВА-ГУМАНІСТЫЧНЫЯ ІДЭІ МЫСЛІЦЕЛЯЎ І АСВЕТНІКАЎ БЕЛАРУСІ

## 2.1. Агульная характарыстыка эпохі Адраджэння

У сучаснай навуцы тэрмін «адраджэнне» разумеецца ў шырокім і вузкім значэннях. У шырокім значэнні гэты тэрмін абазначае этнакультурны пад'ём, рост нацыянальнай свядомасці, актывізацыю развіцця нацыянальнай культуры. У вузкім сэнсе гаворка ідзе аб перыядзе развіцця сусветнай, у першую чаргу еўрапейскай, культуры з канца ХІІ ст. (Італія) да пачатку XVII ст.



*«Мысліцель» Радэна*

Тэрмін «адраджэнне» для характарыстыкі эпохі XIV–XVI стст. быў уведзены яе сучаснікамі – італьянскімі гуманістамі. Генетычна звязаны з рэлігійна-этычным паняццем «аднаўленне», гэты тэрмін набывае ў азначаны перыяд прынцыпова іншы сэнс: аднаўленне культуры, пад'ём літаратуры, мастацтва, навукі пасля іх заняпаду ў Сярэднія вякі, а таксама як паняцце «эпоха пасярэдзіне» (між Антычнасцю і Рэнесансам).

Эпоха Адраджэння – перыяд у гісторыі культуры Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XIV–XVI стст., асноўным зместам якога было станаўленне новай, «зямной» па сваёй сутнасці карціны свету, кардынальна адрознай ад сярэднявечнай. Новая карціна свету знайшла ўвасабленне ў гуманізме, вядучай ідэйнай плыні эпохі, і натурфіласофіі, выявілася ў мастацтве і навуцы. Метафізічная карціна свету ў перыяд Рэнесансу пастуова замяняецца гістарычнай. Калі мысліцель Сярэдніх вякоў быў паглыблены ў пазачасавыя – абсалютныя і вечныя – каштоўнасці, то гуманісты імкнуліся пазнаць кожнае слова антычных аўтараў у яго сапраўдным значэнні, у яго своеасаблівасці і спецыфіцы, у яго адрозненні ад тагачаснай думкі. Гуманісты ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чалавечай дзейнасці імкнуліся разгледзець праваобраз усяго Сусвету.

Такім чынам, будаўнічым матэрыялам для новай культуры паслужыла Антычнасць, да якой звярнуліся праз эпоху Сярэднявечча і якая адраджалася да новага жыцця, адсюль назва эпохі – Адраджэнне, або Рэнесанс. У выніку сінтэзу італьянскай і мясцовых нацыянальных традыцый нараджаецца новая культура – культура Паўночнага Адраджэння. У эпоху Адраджэння новая рэнесансавая культура суіснавала з культурай позняга Сярэднявечча, што асабліва характэрна для краін, якія знаходзіліся на поўнач ад Італіі і Альп. Гэты перыяд у гісторыі еўрапейскай культуры адметны пераносам культурных інтарэсаў са сферы вышэйшага (нябеснага) Сусвету, з краю сакральнага да матэрыяльнага праяўлення жыцця, стварэння культуры антрапацэнтрызму (ад грэч. anthropos – *чалавек*). Эпоха Адраджэння характарызуецца ўсплескам мастацкай дзейнасці, у першую чаргу пластычнага мастацтва (жывапіс, скульптура), з'яўленнем нацыянальных моў на аснове царкоўнай латыні і мясцовых народных гаворак, станаўленнем нацыянальных дзяржаў на аснове феадальных уладанняў, эканамічным развіццём, а на яго аснове развіццём гарадоў і звязанай з імі цывілізацыі, духоўнай секулярызацыяй і ростам індывідуалістычных тэндэнцый у грамадскім жыцці.

Беларусь у канцы XV – на працягу ўсяго XVI ст. перажывала ў галіне культуры заметную трансфармацыю. У гэты час на беларускіх землях адбываўся працэс фарміравання народнасці, станаўлення і развіцця беларускай мовы, пісьменнасці і літаратуры. Беларускае мастацтва XIV–XVI стст. адчувала адбітак праблем і супярэчнасцей грамадска-палітычнага жыцця дзяржавы. Яго развіццё было хуткім і бурлівым.

У гэты час наглядалася актыўнае засваенне традыцыйнай рэнесансавай культуры, якая ўзбагачалася нацыянальнымі рысамі. Вялікую ролю адыграла багатая спадчына старажытнабеларускіх княстваў. Пашырэнне ўзаемасувязей з заходнееўрапейскімі краінамі, у першую чаргу ў рэлігійных справах, спрыяла распаўсюджанню раманскага і гатычнага стыляў. Іх ужыванне абумовілі ўнутрыдзяржаўныя фактары.

На развіццё беларускай мастацкай культуры аказаў уплыў рэфармісцкі рух (XVI ст.). Адмоўнае ўздзеянне прадстаўнікоў гэтай плыні на творы выяўленчага мастацтва істотна не закра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нулі жывапіс, скульптуру і графіку, але ўздзеянне Рэфармацыі ўсё ж было адчувальным. Супрацьлеглую пазіцыю займалі лідары Контррэфармацыі, якія лічылі мастацтва важным сродкам у засваенні ідэй каталіцкай царквы. Яны не былі абыякавыя да распаўсюджвання адукацыі. Адукацыйныя ўстановы, якія ствараліся ордэнамі езуітаў, пашырыліся ў 1570-я гг. (у 1570 г. – Віленскі езуіцкі калегіум, у 1581 г. – Полацкі, у 1584 г. – Нясвіжскі езуіцкі калегіум).

У процівагу каталіцкай царкве былі адкрыты пратэстанцкія вучылішчы, а ў 1590-я гг. узніклі праваслаўныя брацтвы ў Магілёве, Вільні, Менску, Брэсце, Гародні. Яны аб'ядноўвалі праваслаўнае насельніцтва дзяржавы. Брацтвы адкрывалі вучылішчы, тыпаграфіі, шпіталі; вялі дзейнасць, накіраваную на захаванне культурнай спадчыны ў рамках патрабаванняў праваслаўнай царквы. Культурнае жыццё ў Беларусі XIV–XVI стст. было азнаменавана гуманістычнай дзейнасцю асветнікаў Францыска Скарыны, Міколы Гусоўскага, Яна Вісліцкага, Лаўрэнція Зізанія, Андрэя Рымшы. У гэты час былі створаны «Летапіс Аўраамкі» (2-я палова XV ст.), «Хроніка Быхаўца» (XVI ст.), «Хроніка ВКЛ, Рускага і Жамойцкага» (1520-я гг.), «Летапіс вялікіх князёў літоўскіх» (1420-я гг.), зборнікі законаў («Судзебнік Казіміра IV», 1468 г.; Статуты ВКЛ – 1529, 1566, 1588 гг.).

## 2.2. Канцэпцыі культурна-гістарычнага працэсу эпохі Адраджэння

Адметнасцю гуманізму была сувязь з гістарызмам. У супрацьлегласць прыродзе культура ўяўлялася прадстаўнікам гуманізму як з'ява, якая жыве ў часе, мае гістарычнае вымярэнне. Межы культуры, паводле іх прадстаўнікоў, не нязменныя, а гістарычна рухомыя. Імі з'яўляецца ўся чалавечая гісторыя ад пачатку і да яе магчымага канца. Гісторыя як адзінства мінулага, сённяшняга і будучага і ёсць сапраўдны маштаб культуры, найбольш агульная адзінка яе вымярэння. Такім чынам, побач з гуманізмам гістарызм быў яшчэ адным структурна-ўтваральным элементам мадэлі культуры. Аднак неабходна заўважыць, што, нягледзячы на разрыў з тэалогіяй, гістарызм яшчэ знаходзіўся пад уплывам натуралізму, які трактаваў гістарычныя законы па аналогіі з законамі прыроды. Гуманісты не праводзілі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

размежаванняў паміж навукамі аб прыродзе і навукамі аб чалавеку. У выніку трактоўка культуры заставалася ў межах свайго натуралістычнага абгрунтавання.

Гуманізм і гістарызм знаходзіліся паміж сабой у пэўнай лагічнай сувязі. У адпаведнасці з гэтым культура разумелася як сфера існавання чалавека ў якасці свабоднай і разумнай істоты, якая гістарычна развіваецца. Такое ўяўленне аб культуры звязвала два важнейшыя працэсы, якія адбываліся на мяжы Сярэднявечча і Адраджэння, – з аднаго боку, аддзяленне культуры ад культу, яе секулярызацыю, з другога – яе аддзяленне ад прыроды ў выніку развіцця гуманітарных і гістарычных ведаў. Яны і акрэслілі тэрыторыю культуры, што падуладна толькі чалавечаму розуму. Рэнесанс узвялічваў чалавека, надзяляў яго неабмежаванымі магчымасцямі, якія дазвалялі яму пры жаданні падняцца да ўзроўню істот духоўных і анёлаў.

Ідэі гуманізму і гістарызму знайшлі сваю трактоўку і ў творчай спадчыне беларускіх асветнікаў-гуманістаў. «Адкрыццё чалавека» адчуваецца ў разнажанравых творах мысліцеляў эпохі Адраджэння.



***Аксіясфера творчай спадчыны Францыска Скарыны.*** Значнай з’явай культурнага жыцця Беларусі пачатку XVI ст. стала дзейнасць беларускага і ўсходнеславянскага мысліцеля-гуманіста, асветніка, вучонага, пісьменніка эпохі Адраджэння Ф. Скарыны (1490?–1551).

Ён нарадзіўся ў Полацку. Вучыўся ў Полацку і Вільні, на філасофскім факультэце Кракаўскага ўніверсітэта. У Падуанскім універсітэце яму былі прысуджаны вучоныя ступені доктара медыцыны і вольных навук. У 1521 г. малады вучоны, вярнуўшыся на радзіму, засноўвае ў Вільні беларускае выдавецтва, дзе пракаменціраваў і надрукаваў на беларускай мове 23 кнігі Бібліі, а таксама ажыццявіў некалькі выданняў пад агульным загалоўкам «Малая падарожная кніжка». Ф. Скарына стаяў ля вытокаў новых жанраў беларускай літаратуры: прадмоў, пасляслоўяў, публіцыстыкі, анатацый, а таксама сілабічнай сістэмы вершаскладання ў паэзіі. У яго літаратурных творах спалучаюцца традыцыйная тэалогія з характэрным для эпохі Адраджэння вальнадумствам, а каментарыі да старажытных тэкстаў перарастаюць ва ўзнёслае красамоўства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Характар філасофска-этычных поглядаў Скарыны выявіўся ў сінтэзе хрысціянскіх, антычных і рэнесансава-гуманістычных ідэй. Ён разглядаў і вырашаў пытанні сэнсу жыцця, духоўнага свету, годнасці чалавека, паходжання маральных уяўленняў, агульнага і індывідуальнага дабра.

У спецыфічнай форме яго думкі блізкія ў той ці іншай ступені да ідэй знакамітых гуманістаў Заходняй Еўропы. У сваіх творах ён не вылучаў спецыяльнай навукі аб духоўнай культуры, яго дзейнасная натура тычыцца шэрагу канкрэтных навук (граматыкі, логікі, рыторыкі, музыкі і інш.). І тым не менш каштоўнасна-нарматыўныя адносіны да свету – знешняга і ўнутранага – знітаваны непарыўна з усёй дзейнасцю Скарыны, з усёй яго творчасцю, з цэльным яго характарам і асобай. Духоўнае для яго не выдзелена як нешта асаблівае, хутчэй выступае як цэльныя адносіны да свету з мерай дабрыні і прыгажосці; яно праяўляецца ў яго светапоглядзе, у яго культуратворчасці. Светапогляд Скарыны па прыродзе сваёй глыбока духоўны, пранікнуты эстэтыкай Адраджэння, ён гарманічны, ураўнаважаны, спакойны і ў той жа час дзейнасны. У яго прадмовах, каментарыях і пасляслоўях да выданняў выразна адчуваецца культуралагічны кантэкст. Найбольш ярка ў творах увасоблена аксіясфера беларускай культурнай прасторы. На першым плане ў мысліцеля-гуманіста такая каштоўнасць, як патрыятызм. Скарына – заснавальнік нацыянальна-патрыятычнай традыцыі ў гісторыі беларускай культуры і грамадскай думкі. Для мысліцеля на першы план выступалі інтарэсы свайго народа і айчыны, пачуццё абавязку перад радзімай. Гэта важны кампанент погляду на свет, пачуццё цэльнае, зразумелае, крыштальна яснае ў сваёй ідавочнасці: «Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птици, летающие по возъдуху, ведають гнезда своя; рибы, плывающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, – тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены суть по Бозе, к тому месту великую ласку имають» [146, с. 94].

У іерархіі маральных каштоўнасцей «вера» ў Скарыны стаіць пасля «любві». У адпаведнасці з хрысціянскай этыкай найважнейшай маральнай дабрачыннасцю чалавека Скарына лічыў любоў. Ён пашыраў прынцып любві не толькі на прадстаўнікоў хрысціянскага веравызнання, але і на ўсякага чала-



РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

века незалежна ад яго становішча ў грамадстве, веравызнання, этнічнага паходжання.

Справядлівасць, на думку Скарыны, таксама з'яўляецца дамінантнай каштоўнасцю і боска-прыродным маральным паняццем. На базе справядлівасці і чалавекалюбства ён фармулюе свой маральны імператыў, на якім павінны будавацца маральныя ўзаемаадносіны паміж людзьмі, выпрацоўвацца законы правасуддзя, грунтавацца дзяржаўны і сацыяльны лад.

Паводле Скарыны грамадскай і духоўнай каштоўнасцю з'яўляецца родная (беларуская) мова. Менавіта разуменне духоўнага патэнцыялу беларускай мовы дало яму штуршок на пераклад 23 кніг Біблii на мову, набліжаную да мовы беларускага пісьменства. Біблію Скарына разглядаў як вынік шматвяковага духоўнага вопыту чалавецтва, крыніцу мудрасці, навукі, тэарэтычнай і практычнай філасофіі.

Каштоўнасць дабра таксама ўласціва для поглядаў Скарыны. Ён вылучаў дзве катэгорыі дабра – індывідуальнае і агульнае. З яго этычнага вучэння вынікае, што мысліцель аддае перавагу агульнаму дабру перад індывідуальным. Сваё разуменне агульнага дабра Скарына сфармуляваў у прадмове да кнігі «Эсфір»: «Не толико бо сами народихомся на свет, но более ко службе Божией и посполитого доброго» [122, с. 134].

Іерархія каштоўнасцей, якая ўвасоблена ў творах Францыска Скарыны, адметная тым, што знакаміты гуманіст сцвярджае перавагу духоўных каштоўнасцей над матэрыяльнымі патрэбамі.

У тэкстах разнажанравых скарынінскіх твораў выяўляецца змястоўная семіясфера. Скарына, як бачна з аналізу твораў, шырока карыстаўся паняццем сімвала, абазначыўшы яго тэрмінамі «знамя», «знаменаваць», «знаменаванне» і вытворнымі ад іх. Аднак даследаванне пэўнага кантэксту, у рамках якога Скарына карыстаўся гэтым паняццем, дае падставы адзначыць мастацка-эстэтычны і этычны аспект катэгорыі сімвала. Так, у прадмове да Псалтыра ён пазбег паняцця сімвала, аднак у наяўнай форме разглядаў яго як гранічна абагульненае сімвалічнае выяўленне маральных, пазнавальных, эстэтычных і тэалагічных каштоўнасцей Біблii. Гуманіст першы ў беларускім літаратуразнаўстве звярнуў увагу на сімвалічна-пераносны сэнс прытчаў. З гэтай нагоды Скарына пісаў: «всегда иную мудрость и науку знаменують и иначей ся разумеють, нежели

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

молвены бывають, и болши в собе сокритых тайн замыкають, нежели словами пишуть» [122, с. 130]. Можна меркаваць, што культура ўяўлялася Скарыне ў двух аспектах: вонкавым, які адлюстроўваў паверхневы гістарычны пласт быцця, і ўнутраным, які накіроўвае чалавека на пазнанне яго скрытага, духоўнага, этычнага і эстэтычнага сэнсу.

Такім чынам, Скарына паўстае перад намі як асветнік, настаўнік, грамадскі дзеяч і папулярызатар айчыннай і агульначалавечай культурнай спадчыны. Яго па праву можна лічыць заснавальнікам нацыянальна-патрыятычнай традыцыі ў гісторыі беларускай культуры і грамадскай думкі, у той час як для большасці сярэдневяковых мысліцеляў быў уласцівы касмапалітызм.

***Наватарскія ідэі Сымона Буднага*** (1530–1593). Мысліцель быў прадаўжальнікам культурна-асветніцкай, нацыянальна-патрыятычнай і філасофскай традыцыі Ф. Скарыны. Яго метадалагічныя і гнасеалагічныя погляды адлюстроўвалі ўзровень развіцця культуры і думкі эпохі Адраджэння.




Гуманітарную і багаслоўскую адукацыю Сымон Будны атрымаў у Кракаўскім універсітэце. Мяркуюць, што пэўны час ён слухаў лекцыі ў Базельскім пратэстанцкім універсітэце. Вярнуўшыся на радзіму ў 1558 г., працаваў настаўнікам у Вільні. У гэты час у заснаванай ім у Нясвіжы друкарні выдае на беларускай мове «Катэхізіс» і напісаныя ім працы «Об оправдании грешного человека перед Богом», «Про светскую власть» і інш.

У 1573 г. беларускі магнат Я. Кішка запрашае С. Буднага ў Лоск, прапаноўвае пасаду прапаведніка і засноўвае для яго друкарню. У гэтай друкарні С. Будны выдае Новы Запавет з прадмовай і каментарыямі. Тут жа былі выдадзены некалькі яго твораў на лацінскай мове. У 1576 г. у Лоску надрукаваны галоўны рэлігійна-філасофскі твор С. Буднага «Пра найважнейшыя палажэнні хрысціянскай веры».

Даследчыкі яго спадчыны (У. Конан, Г. Мерчынг, С. Падокшын і інш.) лічаць, што С. Будны належаў да памяркоўнай рэлігійна-рэфармацыйнай плыні, блізкай да кальвінізму. Будучы прыхільнікам тэалогіі, ён у той жа час не ігнараваў філасофію і імкнуўся выкарыстаць яе ў творчай дзейнасці. Так, пры аналізе тэкстаў Біблії С. Будны абапіраўся на метад інтэрпрэтацыі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вызначаўся сваім герменеўтычным майстэрствам. «Паводле Сымона Буднага, Ісціна знаходзіцца ў Свяшчэнным Пісанні ў згорнутым выглядзе і яе адтуль неабходна здабыць і адэкватна перадаць» [122, с. 57]. Справіцца з гэтай задачай можа толькі суб'ект высокай культуры, адукаваны. Пры даследаванні свяшчэнных тэкстаў ён абапіраўся на рацыяналістычны метад, што дазволіла гуманісту праводзіць лагічны, філалагічны, гістарычны і натуралістычны аналізы. Рацыяналістычна-натуралістычны спосаб выяўлення ісціны, выкарыстаны перш за ўсё ў адносінах да біблейскіх сюжэтаў, адкрываў магчымасць такой інтэрпрэтацыі прыроды, грамадства і чалавека. Такім чынам, можна сцвярджаць, што задоўга да рамантычнай герменеўтыкі Ф. Шлеермахера наш суайчыннік вызначыў псіхалагічныя працэдуры тлумачэння тэксту.

Натуралістычная інтэрпрэтацыя С. Будным шэрагу біблейскіх сюжэтаў дазволіла яму перагледзець пэўныя палажэнні артадаксальнага вучэння пра Бога ў духу дэізму. Так, ён не пагаджаўся з традыцыйным вучэннем пра Тройцу і лічыў сапраўдным богам толькі Бога Айца. «Дух», паводле мысліцеля, не з'яўляецца самастойнай і раўназначнай субстанцыяй, а ёсць атрыбут «Айца», яго творчая сіла, Боская свядомасць і воля. З надсусветнага пачатку ім выключаўся і Хрыстос. На аснове вялікай колькасці лагічных, гістарычных і філалагічных аргументаў С. Будны адмаўляў Боскае паходжанне і звышнатуральнае нараджэнне Хрыста. На яго думку, Хрыстос не з'яўляўся Богам, а быў самаадданым прапаведнікам, высокамаральным чалавекам, за што і быў надзелены Боскімі ўшанаваннямі, здольнасцю тварыць цуды. Не падтрымліваў ён і вучэнне аб бессмяротнасці душы і існаванні замагільнага свету. У трактаце «Пра найважнейшыя палажэнні хрысціянскай веры» яе аўтар пісаў: «Памылковай з'яўляецца агульнапрынятае ўяўленне людзей пра душы, быццам яны жывуць пасля смерці, пераносяць пакуты ці маюць асалоду. Душа – гэта не што іншае, як чалавечае жыццё» [122, с. 57]. Такія погляды былі сапраўднай інавацыяй і не мелі прэцэдэнту ў еўрапейскай думцы.

С. Будны ўзбагаціў новымі ідэямі традыцыйную хрысціянскую маральную дактрыну, узгадніўшы яе з філасофска-этычнымі вучэннямі Адраджэння і Рэфармацыі. Адной з такіх ідэй была ідэя свядомай і шчырай веры, якая выкладзена ім у «Катэхізісе». Ён лічыў, што ў каталіцтве адбылося скажэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

веры і маралі, іх першапачатковая сутнасць падменена фармальнай і паказной. Асновай веры, паводле меркавання С. Буднага, з'яўляецца не дагматыка, абрады і літургія, а этыка, якая змяшчаецца ў Біблii. Вера, паводле гуманіста, можа быць абгрунтавана рацыяналістычным спосабам, аднак у выпадку канфлікту паміж розумам і верай вырашальнае слова належыць розуму.

Новай для таго часу была ідэя маральна-духоўнай свабоды чалавека, сацыяльна-палітычнага ідэалу, якую С. Будны абгрунтоўваў у «Катэхізісе». Мысліцель адстойваў думку, што поўнае самавыяўленне асобы, росквіт яе здольнасці магчымы толькі на аснове свабоды. Ён быў прыхільнікам сацыяльнай гармоніі, мірнага суіснавання ўсіх саслоўяў феадальнага грамадства. Яго палітычны ідэал – адукаваны манарх, які павінен акружаць сябе мудрымі і вучонымі людзьмі. Гуманіст заклікаў магнатаў клапаціцца аб развіцці культуры, адукацыі, роднай мовы. «Абы ваши княжацкие милости, – звяртаўся ён да князёў Радзівілаў у «Катэхізісе», – не только в чужоземских языцех кохали, але бы ся теж… и того здавна славного языка словенского розмиловати и оным ся бавити рачили» [122, с. 59]. Сам С. Будны, займаючы пасаду катэхізіста (настаўніка) Віленскай пратэстанцкай суполкі, выкладаў асновы кальвінісцкага вучэння на беларускай мове. Ён быў таксама першым, хто выдаў першую кнігу на беларускай мове на тэрыторыі Беларусі. Клапоцячыся аб развіцці беларускай мовы і культуры, С. Будны выступаў за дыялог культур, заклікаў да засваення ўсёй сукупнасці еўрапейскай культуры.

Ідэолаг радыкальнай плыні беларуска-літоўскай Рэфармацыі асуджаў езуітаў за іх рэлігійную інталерантнасць і тых праваслаўных дзеячаў, якія імкнуліся адмежавацца ад заходнееўрапейскай культуры.

Карысць еўрапейскай адукацыі С. Будны адчуў на ўласным вопыце. Менавіта ў Кракаўскім універсітэце ён атрымаў грунтоўную гуманітарную і багаслоўскую адукацыю, якую пазней удасканальваў у Базельскім пратэстанцкім універсітэце.

Не пазбаўлены наватарства і выказванні С. Буднага па праблемах мастацтва. Так, ім сфармуляваны адзін з асноўных прынцыпаў эстэтычнай думкі эпохі Адраджэння: мастацтва – люстэрка жыцця, а не Боскай сутнасці. Ім жа абгрунтавана думка пра пазнавальнае значэнне мастацтва і яго маральна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выхаваўчую ролю. Эстэтыка гуманіста мела рацыяналістычны характар. На яго думку, прыгожае тое, што сапраўднае. Па праблеме суадносін формы і зместу С. Будны на першае месца вылучаў змест.

Падсумоўваючы вышэйсказанае, неабходна адзначыць, што асновай светапогляду С. Буднага з’яўляецца гуманізм. Праўда, у С. Буднага (у адрозненне ад Ф. Скарыны) ён носіць больш рацыянальны характар. Розум, рацыянальны аналіз становіцца ў С. Буднага ўніверсальным крытэрыем карысці, дабра. У яго светапоглядзе рацыяналізм з’яўляецца галоўным – і ў крытыцы рэлігіі, і ў сацыяльным вучэнні, ва ўсіх ацэнках з’яў жыцця. На аснове дадзенай метадалогіі ён выказаў шэраг прынцыпова новых ідэй, на падставе якіх вучоныя XX ст. будуць распрацоўваць уласна культуралагічныя канцэпцыі.

***Рэнесансава-ўтапічная канцэпцыя Міколы Гусоўскага*** (1470?–1533?). Беларускі паэт-гуманіст з’яўляецца прадстаўніком новалацінскай усходнееўрапейскай школы XVI ст. Грунтоўныя гуманітарныя веды ён набываў у розных адукацыйных установах Беларусі, Італіі, Польшчы. Задавальняючы жаданне свайго мецэната Э. Вітэлія, сакратара велікакняжацкай канцылярыі, паэт напісаў у 1522 г., у Рыме, твор «Carmen de statura feritate acvenatione bisontis» («Песня пра постаць, дзікасць зубра і паляванне на яго»). Акрамя гэтай паэмы, у рымскі перыяд ён напісаў яшчэ 11 вершаў, паэмы «Новая і славутая перамога над туркамі ў ліпені месяцы», «Жыццё і подзвігі Гіяцынта». У творчай спадчыне асветніка ўвасоблены грамадска-палітычныя і эстэтычныя погляды эпохі.



М. Гусоўскі належаў да творцаў, якія стаялі ля вытокаў рэнесансавага рэалізму. У сваёй паэзіі ён адлюстраваў найважнейшыя культурныя каштоўнасці і гуманістычныя ідэалы.

Так, у паэмах і вершах творца ўслаўляў дзейснага, свабоднага, гарманічна развітога суб’екта культуры. Паэт выказаў ідэю аб узаемасувязі асобы, прыроды і грамадства і заклікаў да беражлівых адносін да прыроды, рацыянальнага выкарыстання і памнажэння прыродных багаццяў радзімы. Можна лічыць, што паэтам сфармуляваны асноўны прынцып экалагічнай культуры. Прыроду Беларусі М. Гусоўскі ўспрымаў як крыніцу здароўя, радасці, выхавання высокіх патрыятычных і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эстэтычных пачуццяў. Як выразнік перадавых грамадска-палітычных і эстэтычных поглядаў М. Гусоўскі выступаў за ўсебаковую міжкультурную камунікацыю. Так, у паэме «Песня пра зубра» ён адстойваў ідэю яднання і супрацоўніцтва розных па веры і культуры еўрапейскіх народаў, міждзяржаўных зносін.

Паэт змог вызначыць фактары пасіянарнасці, жыццяздольнасці беларускага народа і яго культуры. Паводле меркавання творцы, імі з'яўляюцца працавітасць, сумленнасць, гарачая любоў да роднага краю, глыбокая маральнасць, зладжаная і гарманічная сістэма жыццёвых правіл, прыярытэтаў, звычаяў, абрадаў, духоўных светаўяўленняў, традыцый. У народнай мудрасці М. Гусоўскі бачыў невычэрпную крыніцу для розных відаў элітарнай культуры і адзін з фактараў стойкасці народнага духу. У свае творы ён уключаў асобныя элементы беларускай народнай культуры.

Нягледзячы на пэўную ўнутраную супярэчлівасць светапогляду М. Гусоўскага, якая праяўлялася ў абстрактнасці яго гуманізму, артадаксальнасці, вальнадумстве, ідэалізме і стыхійным матэрыялізме, культуратворчасць паэта прама ці апасродкавана паўплывала на станаўленне беларускай культуралагічнай думкі, польска-беларускай літаратуры, такіх яе жанраў, як лірыка-эпічная, гістарычная і сатырычная паэма, элегія, эпіграма.

***Талерантнасць і рацыяналізм Васіля Цяпінскага*** (каля 1540–1603?). Гуманіст-асветнік падзяляў грамадска-палітычныя і рэлігійныя погляды Ф. Скарыны. Нарадзіўся ён у сям'і дробнага гаспадарскага баярына Полацкага павета. Даследчыкі яго жыцця і творчасці мяркуюць, што В. Цяпінскі быў «асабіста і ідэйна звязаны з С. Будным» [16, с. 155].


ВАСИЛЬ ТЯПИНСКИЙ

У трактаце «Пра найважнейшыя палажэнні хрысціянскай веры» С. Будны пісаў, што ў 1574 г. у доме В. Цяпінскага адбыўся сінод антытрынітарыяў. Услед за Ф. Скарынам і С. Будным ён наважыўся надрукаваць Евангелле на царкоўнаславянскай і беларускай мовах. У 1570 г. ім быў завершаны пераклад і выдадзена Евангелле, якое змяшчала пісанні святых ад Матфея, Марка і часткова ад Лукі. Да выдання В. Цяпінскі напісаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грунтоўную прадмову, дзе выказаў шэраг цікавых ідэй адносна становішча беларускай культуры і народа як яе суб'екта. Ён дае вельмі пазітыўную ацэнку беларускаму этнасу: «зацный, славный, острий, довстипный» [16, с. 155]. З тэксту прадмовы відавочна, што гуманіст быў занепакоены ўпадкам культуры і асветы, духоўнасці тагачаснага грамадства і заклікаў пануючыя слаі і духавенства ВКЛ дапамагчы народу адкрыць школы і ўзняць навуку. Мысліцель выявіў прычыны крызісу культуры, які быў дэтэрмінаваны, на думку аўтара прадмовы, афіцыйнай палітыкай паланізацыі і акаталічвання беларусаў, а таксама падтрымкай гэтай палітыкі мясцовымі феадаламі. В. Цяпінскі выйсце з крызісу бачыў у адкрыцці школ, у якіх бы навучанне вялося не на польскай і лацінскай мовах, а на беларускай. У Евангеллі ён нават змясціў 210 слоў-перакладаў, якія тлумачылі на палях незразумелыя ці малазразумелыя для паспалітага народа словы. Думкі, выкладзеныя ў прадмове пяць стагоддзяў таму назад, не згубілі сваёй актуальнасці і для сённяшняга часу.

Падыход В. Цяпінскага да рэлігіі як формы духоўнай культуры быў рацыяналістычны і талерантны. Рэлігійную адукацыю і выхаванне ён разглядаў як сродак асветы і фарміравання этнічнай самасвядомасці беларускага народа.

***Эксплікацыя сутнасці інкультурацыі Лаўрэнціем Зізаніем (Тустаноўскім)*** (1550–60-я – каля 1634). Навукова-педагагічная і грамадская дзейнасць Л. Зізанія ажыццяўлялася ў рэчышчы рэфармацыйнага руху. Паходзіў мысліцель-гуманіст з дробнай шляхты Трокскага ваяводства.



Пасля заканчэння Астрожскай школы на Валыні Л. Зізаній працаваў выкладчыкам царкоўнаславянскай і грэчаскай моў у Брэсцкай, Віленскай, Львоўскай праваслаўных брацкіх школах, хатнім настаўнікам у сем'ях некаторых магнатаў ВКЛ. Акрамя педагагічнай працы, займаўся кнігадрукаваннем. Так, у Вільні ім былі створаны і апублікаваны «Азбука з Лексісам» («Наука ку читаню и розуменю писма словенского» і «Грамматіка словенска съвершеннаго искуства осми частиі слова…»). Л. Зізаній таксама падрыхтаваў да выдання «Катэхізіс Вялікі». Рукапіс кнігі быў зроблены на беларускай мове і выдадзены ў

1627 г. у Маскве, у XVIII ст. неаднаразова перавыдаваўся старaверамі ў Гродне.

Кнігі, выдадзеныя педагогам-гуманістам, садзейнічалі фарміраванню ў вучняў сацыяльных якасцей, уласцівасцей, каштоўнасцей, ведаў і ўменняў, засваенню норм, правіл, узораў, установак, паводзін, дзякуючы якім чалавек становіцца дзеяздольным удзельнікам сацыяльных сувязей, інстытутаў і супольнасцей. Так, у «Азбуку» акрамя матэрыялу, які вучыць чытаць і пісаць, уключаны дапаможны лексічны матэрыял, царкоўныя палемічныя тэксты і малітвы. Таму кніга магла выкарыстоўвацца як у свецкім, так і ў царкоўным навучанні. Нельга пераацаніць значэнне «Лексіса», які ўяўляў сабой слоўнік-энцыклапедыю (1061 слова), дзе прыведзены самыя разнастайныя звесткі па біялогіі, геаграфіі, медыцыне, філасофіі, этнаграфіі, ваеннай гісторыі, прававым становішчы розных сацыяльных груп насельніцтва, змешчаны словы з народнай гутарковай мовы. У даступнай для простых людзей форме тлумачацца розныя з'явы рэчаіснасці. Можна без перабольшвання сцвярджаць, што «Лексіс» – значная культурна-асветніцкая з'ява ў гісторыі культуралагічнай думкі Беларусі.

«Грамматіку словенску…» тагачасныя асветнікі-гуманісты разглядалі як падмурак, на якім павінна трымацца далейшае паглыбленае вывучэнне розных навук. Змест кнігі складалі сем вольных мастацтваў. Праз усю кнігу праходзіць думка аб неабходнасці свецкіх ведаў, вывучэння арыфметыкі, астраноміі, граматыкі, геаметрыі, дыялектыкі, рыторыкі, музыкі і аб іх ролі ў развіцці асобы.

Уклад Л.Зізанія ў гісторыю беларускай гуманітарнай думкі вызначаецца рацыяналістычнымі адносінамі да пэўных з'яў прыроды і грамадскага жыцця. У яго культурнай спадчыне пашыраліся гуманістычныя погляды на сутнасць чалавека, яго месца ў свеце. Педагог быў упэўнены ў сіле розуму і душы чалавека, лічыў, што чалавек створаны Богам і з'яўляецца гаспадаром самому сабе. У навукова-педагагічнай літаратуры Лаўрэнція Зізанія выказаны думкі, якія сугучныя культуралагічнай канцэпцыі інкультурацыі.

***Культуралагічны дыскурс у творчасці Мялеція Сматрыцкага*** (1575–1633). Пісьменнік-паленіст эпохі Адраджэння знаходзіўся ў цэнтры грамадска-рэлігійнага руху ў Беларусі. Скончыўшы філасофскі факультэт Віленскай езуіцкай акадэміі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ён выкладаў стараславянскую, грэчаскую і лацінскую мовы ў праваслаўных брацкіх школах Вільні, Менска, Кіева, пэўны час займаў пасаду рэктара брацкай школы ў Кіеве. Больш за 30 гадоў ён жыў у розных гарадах і мястэчках Беларусі.



Мысліцель не застаўся ў баку ў перыяд бязлітаснай рэлігійна-нацыянальнай канфрантацыі, якая распачалася адразу пасля Берасцейскай (1596) уніі. З гэтай нагоды ён напісаў шэраг прац антыезуіцкай накіраванасці. Найбольш вядомыя яго творы – «Антыграфі, або Адказ на з’едлівы трактат» (1608) і «Трэнас, альбо Лямант усходняй царквы» (1610). У іх М. Сматрыцкі, як ніхто іншы, пераканаўча і найбольш дакладна выявіў прычыны уніі. Паводле яго, унія была дэтэрмінавана прыгнечаным становішчам у грамадстве, маральным разлажэннем праваслаўнага духавенства. Характарызуючы маральнае аблічча святароў, ён пісаў: «У жыцці вы шынкары і купцы, па звычках – лежабокі, у размове – невукі, у абыходжанні – крывадушныя, а па адзенні – драпежныя ваўкі, вашы забавы – распусныя. Гэта ўсё губіць і вас саміх, і тых, хто вас пераймае» [122, с. 139].



Абагульненнем навукова-педагагічнай дзейнасці з’явілася «Грамматики славенския правилное синтагма», выдадзеная ў 1619 г. У ёй Сматрыцкі адстойваў і сцвярджаў правы беларусаў на захаванне сваёй мовы як асновы культуры, абараняў мову і айчынную самабытную культуру ад нападкаў каталіцкіх палемістаў. Праца адметная багаццем граматычнага аналізу, выяўлення прыроды моўнага строю, слова, стылю, лексікі. З выданнем «Грамматікі словенской…» Л. Зізанія і выхадам у свет працы М. Сматрыцкага гаворка пра беларускую мову і літаратуру з абстрактнай катэгорыі пераўтваралася ў практычны здабытак народа. На працягу двух стагоддзяў «Грамматика…» Мялеція Сматрыцкага служыла падручнікам усяму ўсходнеславянскаму свету. Па ёй спасцігаў граматыку вялікі рускі вучоны М. В. Ламаносаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Творчая спадчына М. Сматрыцкага – гэта своеасаблівы летапіс важнейшай старонкі культурагенезу, барацьбы беларускага народа за захаванне сваёй самабытнай мовы, праваслаўнай рэлігіі і культуры. Таленавітым педагогам выказаны асноўныя палажэнні канцэпцыі сацыялізацыі і інкультурацыі асобы беларуса.

## 2.3. Увасабленне ідэалу свабоды суб’екта культуры ў творах беларускіх гуманістаў

Культуралагічнай накіраванасцю адметны творы шэрагу беларускіх філосафаў. У гэты перыяд шырока вядомымі былі працы ***Андрэя Волана*** (1530–1610), філосафа і правазнаўцы, ідэолага рэфармацыйнага руху ў Беларусі. Адукацыю ён атрымаў ва ўніверсітэтах Германіі. Мысліцель з’яўляецца аўтарам каля 30 прац, якія маюць гуманістычную накіраванасць: «Пра палітычную або грамадзянскую свабоду», «Прамова да сената», «Пра шчаслівае жыццё, або Найвышэйшае чалавечае дабро» і інш. У іх А. Волан выказаў шэраг прапаноў па рэформе сацыяльных і палітычных адносін, права і дзяржаўнага кіравання. У рэлігійна-палемічных творах з пазіцый кальвінізму крытыкаваў асноўныя догмы, арганізацыйную будову каталіцкай царквы. Адстойваў прынцыпы верацярпімасці.




*Кніга Міхаіла Літвіна*

Блізкімі да поглядаў А. Волана па сутнасці і сэнсе былі думкі ***Міхаіла Літвіна***. Гуманіст паходзіў са збяднелай беларускай шляхты. На жаль, звесткі пра месца нараджэння і яго смерць пакуль невядомыя. Каля 1550 г. ён напісаў сацыяльна-палітычны трактат «Аб норавах татар, літоўцаў і масквіцян». У трактаце М. Літвін ставіў пытанні сацыяльна-палітычнага ўдасканалення грамадства. Гарманічнае развіццё беларускага грамадства мысліцель звязваў з маёмаснай роўнасцю, справядлівасцю, мудрым дзяржаўным кіраваннем і аб’ектыўным правасуддзем. У сваёй працы адстойваў прынцып аднолькавага абкладання падаткамі простага чалавека і шляхціца: чым большая маёмасць, тым большы павінен быць падатак.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

Гуманіст падтрымліваў ідэю талерантнасці, выступаў супраць умяшання каталіцкай царквы ў свецкія справы, ганьбіў карыслівасць і распусту асобных святароў. Грамадскія праблемы філосаф разглядаў з пазіцый проціпастаўлення дрэнных і добрых звычаяў.

Погляды М. Літвіна сугучны ідэям грамадзянскага гуманізму, прасякнуты рэфармацыйна-гуманістычным пафасам эпохі Адраджэння.

Рупліва працаваў на культурнай ніве ў гэты час ***Саламон Рысінскі*** (1560?–1625). Нарадзіўся ён на Полаччыне, пэўны час там жа працаваў настаўнікам. Маюцца звесткі, што С. Рысінскі нейкі час жыў у Германіі і Польшчы. У пачатку XVII ст. служыў у князёў Радзівілаў. Праблемнае поле навуковых інтарэсаў С. Рысінскага было вельмі шырокім, аб чым сведчаць яго «Пісьмы», «Кан’ектуры да пісьмаў Л. А. Сенекі», «Пошукі па Аўзонію», «Зборнік прыказак». Для прац філосафа, педагога, этнографа характэрны шырокія веды ў галіне гісторыі, літаратуры, міфалогіі і моў. С. Рысінскі ў сваіх творах схіляўся да матэрыялістычнага тлумачэння з’яў прыроды.

Адным з пачынальнікаў свецкай адукацыі ў Беларусі быў ***Ян Намыслоўскі*** (1560–1635). Мысліцель-гуманіст паглыбляў веды ў Ягелонскім універсітэце ў Кракаве. У 1585 г. прызначаны рэктарам арыянскай школы ў Іўі. З 1593 г. – прапаведнік абшчыны арыян у Навагрудку. У 1592 г. Ян Намыслоўскі выдаў твор «Анатомія і гарманічнасць хрысціянскага чалавека», у 1597 г. надрукаваў «Зварот да братоў-евангелікаў». Працуючы ў Іўеўскай школе, напісаў падручнікі «Дапаможнік для авалодання вучэннем Арыстоцеля» і «Сентэнцыі, неабходныя ў грамадскім жыцці». У яго падручніках шмат яскравых узораў, разважанняў, у якіх крытыкаваліся асноўныя догмы хрысціянскай рэлігіі.

Да станаўлення імпліцытных культуралагічных ведаў у XV–XVI стст. прычыніліся многія іншыя беларускія гуманісты. Эпоха Адраджэння натхніла на самаадданую асветніцкую працу Даніэля Бялінскага, Бярнарда Ваяводку, Эразма Вітэлія, Фабіяна Даманеўскага, Мацея Кавячынскага, Станіслава Кашуцкага, Лаўрэнція Крышкоўскага, Даніэля Ланчыцкага, Фаўста Соцына, Якуба з Калінаўкі і іншых прадстаўнікоў рэфармацыйнага руху ў Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 3

# ПЕРААСЭНСАВАННЕ СУТНАСЦІ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКІМІ АСВЕТНІКАМІ Ў XVII–XVIII стст.

## 3.1. Сацыяльна-культурныя адметнасці фарміравання культуралагічных поглядаў у эпоху Асветніцтва

XVII–XVIII стст. – гістарычная эпоха, на працягу якой культура заходнееўрапейскіх краін набыла тую развітую форму, што вылучыла Еўропу з астатняга свету, а еўрапейскую культуру – у асобы тып культуры. У папярэднія эпохі культура Еўропы яшчэ не была «еўрапейскай» у гэтым сэнсе, а ў XXI ст. яна ўжо перастала быць спецыфічна «еўрапейскай», г. зн. асаблівым сацыякультурным светам, што аб'ядноўвае краіны Еўропы (у адрозненне ад іншых).

Контуры новаеўрапейскай культуры сталі вызначацца ў XVII ст. Рэфармацыя была зародкам культуры новага тыпу. Яна праклала дарогу да пераасэнсавання догматаў хрысціянства. Пратэстантызм самім фактам свайго існавання сцвердзіў магчымасць рознага разумення Свяшчэннага Пісання. Духоўная атмасфера ў грамадстве пачала мяняцца. Манаполія царквы на пасрэдніцтва ў стасунках чалавека з Богам рухнула. У барацьбе з царквой былі закладзены асновы навуковага прыродазнаўства. Знакамітыя мысліцелі Новага часу Ф. Бэкан, Т. Гобс, Р. Дэкарт, Б. Спіноза, Г. Лейбніц і іншыя вызвалілі філасофію ад схаластыкі і павярнулі яе тварам да навукі. Асновай філасофскага пазнання для іх стала не сляпая вера, а розум, які абапіраўся на логіку і факты. Паступова ўся грамадская думка набывала незалежнасць ад рэлігіі.

Еўрапейская культура, назаўжды захаваўшы свае хрысціянскія карані, хрысціянскія каштоўнасці і ідэалы, з цягам часу спарадзіла на іх дух лібералізму і нават атэізму. Хрысціянская рэлігія засталася важнейшым фактарам духоўнага жыцця грамадства, але яе манапольнаму панаванню над усёй культурай прыйшоў канец. Еўрапейская культура стала свецкай.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З Новага часу бярэ пачатак і другая асаблівасць еўрапейскай культуры – яе шматнацыянальнасць, шматмоўнасць. Сярэдневяковая латынь саступіла месца нацыянальным мовам, што, з аднаго боку, узбагаціла еўрапейскую культуру традыцыямі і вопытам народнай творчасці, а з другога – зрабіла дасягненні культуры больш даступнымі для народаў Еўропы. Пачаўся падзел нацыянальных культур, што паслужыла базай развіцця агульнаеўрапейскай культуры, адзінай у сваёй разнастайнасці. У краінах Еўропы фарміруюцца арыгінальныя мастацкія школы і літаратурныя плыні, у якіх па-рознаму знаходзяць выражэнне мастацкія стылі таго часу – барока і класіцызм.

Кантакт і ўзаемадзеянне культур – адна з важнейшых умоў культурнага прагрэсу, які вывеў Еўропу ў Новы час на лідзіруючае месца ў свеце.

У XVIII ст. у еўрапейскай культуры прыкметна ўзмацніўся свецкі пачатак. Важную ролю ў культуры эпохі Асветніцтва пачала адыгрываць філасофія. XVIII ст. нярэдка называюць «стагоддзем філасофіі», бо ў тагачасны перыяд менавіта яна займала адно з вядучых месцаў у духоўным жыцці грамадства. Сфарміраваўся своеасаблівы тып філасофа-асветніка, у якім адначасова сумяшчаліся асобныя рысы як філасофа, так і асветніка, а нярэдка і пісьменніка, грамадскага дзеяча. Да ліку найбольш знакамітых і папулярных філасофаў-асветнікаў адносяцца ***Вальтэр, Ж.-Ж. Русо, Д. Дзідро, Ш. Мантэск'е*** і інш.

Асветніцтва было распрацавана менавіта філасофамі-асветнікамі. Яны стварылі даволі стройную канцэпцыю мінулага, сучаснага і будучага чалавецтва. Аснову дадзенай канцэпцыі склалі паняцці «натуральны стан», «натуральнае права», «грамадскі дагавор», «прырода чалавека», «розум, «прагрэс». Паводле гэтай канцэпцыі, эвалюцыя чалавецтва пачалася з «натуральнага стану», заснаванага на «натуральным праве», якое, у сваю чаргу, адпавядала «прыродзе чалавека». Асветнікі разглядалі «прыроду чалавека» ў якасці своеасаблівай сукупнасці такіх псіхалагічных якасцей і маральна-духоўных каштоўнасцей, як свабода, роўнасць, братэрства, любоў, міласэрнасць, справядлівасць, што ўласцівы толькі чалавеку і выдзяляюць яго з жывёльнага свету. Названыя якасці з'яўляюцца натуральнымі, бо яны нараджаюцца разам з чалавекам і адначасова выступаюць яго неад'емнымі, натуральнымі правамі. Без іх і без права на іх чалавек перастае быць сапраўдным чалавекам.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Перыяд «натуральнага стану», які ахопліваў час існавання першабытнага грамадства, асветнікі называлі «залатым векам», бо тады, на іх думку, меў месца найвышэйшы росквіт свабоды, роўнасці, братэрства, справядлівасці і інш. Аднак гэтыя прынцыпы не былі поўнасцю гарантаваныя, нярэдка яны парушаліся з-за недахопу любві і з-за ўзмацнення саперніцтва паміж людзьмі. Неабходнасць урэгулявання такой сітуацыі прывяла да ўзнікнення дзяржавы, а разам з ёй – улады, права і законаў. Прычым усё гэта ўзнікла не па волі Бога, а ў выніку «грамадскага дагавору» – свядомага пагаднення паміж людзьмі. Менавіта дзяржава павінна была гарантаваць захаванне прынцыпаў і норм «натуральнага права». Так узніклі першыя цывілізацыі. Праўда, дзяржава найчасцей дрэнна спраўлялася з такімі абавязкамі і таму ў грамадстве паступова ўзмацняліся розныя несправядлівасці, несвабода, няроўнасць. Асветнікі лічылі, што феадальны лад несумяшчальны з прынцыпамі розуму і «натуральнага права», а таму яго павінен замяніць больш справядлівы і гуманны дзяржаўны лад. Яны прапаноўвалі праграму пабудовы такога новага грамадства ў «светлай будучыні», калі зноў расквітнеюць свабода, роўнасць, справядлівасць, братэрства паміж людзьмі. На шляху да такой «светлай будучыні» асветнікі бачылі дзве галоўныя перашкоды – дэспатызм (найперш у форме абсалютнай манархіі) і абскурантызм (крайне негатыўнае стаўленне да асветніцтва і навукі).

На думку асветнікаў, да ліку асноўных сродкаў пабудовы новага грамадства адносіліся адукацыя і выхаванне, а галоўнай прычынай няшчасцяў чалавека было невуцтва. Таму надзвычай важная роля надавалася навучанню, выхаванню людзей, іх асветніцтву, а таксама кіраўніку дзяржавы – «гасудару-філосафу», «мудрацу на троне». Асветнікі распрацавалі таксама канцэпцыю правоў чалавека. Яе асноўныя ідэі знайшлі адлюстраванне ў знакамітай «Дэкларацыі правоў чалавека і грамадзяніна» (1789), якая была прынята ў пачатку Вялікай французскай рэвалюцыі. У дадзенай дэкларацыі неад’емнымі правамі чалавека былі абвешчаны свабода асобы, слова, сумлення, зафіксаваны роўнасць усіх людзей перад законам і права чалавека на барацьбу супраць прыгнечання.

Галоўную ролю ў рэлігійным жыцці еўрапейскіх краін на працягу XVIII ст. адыгрывалі каталіцтва і пратэстантызм, якія існавалі ў выглядзе розных плыняў і кірункаў – лютэранства,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кальвінізму, англіканства, анабаптызму і інш. У XVIII ст. прыкметна актывізавалася дзейнасць каталіцкага ордэна езуітаў, аднак у 1773 г. паводле рашэння папы рымскага Клімента XIV ён быў забаронены на «вечныя часы». На працягу XVII–XVIII стст. у краінах Еўропы набылі вядомасць такія рэлігійна-містычныя вучэнні, як «янсенізм» і «квіетызм». Янсенізм быў распрацаваны ў першай палове XVII ст. прафесарам Карнеліем Янсеніем. Ён адмаўляў свабоду волі і прадвызначанасць да выратавання або пагібелі (рай або пекла), што па сутнасці адвяргала царкоўнае вучэнне аб выратаванні «добрымі справамі». Квіетызм (ад лац. quietus – спакойны, безмяцежны) узнік у XVII ст. унутры каталіцызму і быў афіцыйна асуджаны царкоўнымі інстанцыямі. Гэты кірунак быў распрацаваны іспанскім багасловам Малінасам, які таксама выступаў супраць тэзіса аб выратаванні «добрымі справамі» і патрабаваў містычнага зліцця чалавечай душы з Богам.

На працягу XVIII ст. у розных краінах свету даволі шырока распаўсюдзіліся ідэі скептыцызму і атэізму. Пачаўся навуковы аналіз Біблііі, што стварыла тэарэтычны фундамент для крытыкі рэлігіі. Вялікая французская рэвалюцыя канца XVIII ст. прывяла не толькі да звяржэння абсалютызму, але і да канфіскацыі царкоўных, манастырскіх зямель, адмены царкоўнай дзесяціны. У выніку рэвалюцыі святары атрымалі статус дзяржаўных чыноўнікаў і павінны былі прыносіць клятву на вернасць рэвалюцыйнай уладзе. Спецыяльныя дэкрэты Канвента (1793) увогуле скасавалі ў Францыі каталіцкую царкву як самастойны інстытут. Рэвалюцыянерамі-атэістамі была нават зроблена няўдалая спроба ўвесці новую спецыфічную рэлігію – «Культ Розуму». Прыхільнікі дэізму – вучэння, паводле якога Бог прызнаецца Сусветным Розумам, які калісьці стварыў усё існае, а пазней ніколі не ўмешваўся ў развіццё свету і чалавецтва, паспрабавалі стварыць «Культ Вярхоўнай Істоты». Аднак абедзве гэтыя спробы скончыліся беспаспяхова.

Надзвычай хутка пачала развівацца навука, якая разам з філасофіяй лічылася найлепшым увасабленнем магчымасцей чалавечага розуму. Асноўнымі стылямі мастацкай культуры паранейшаму заставаліся барока і класіцызм. Аднак узніклі і новыя стылі ў мастацтве – ракако і сентыменталізм. У эпоху Асветніцтва мастацтва стала (у параўнанні з папярэднім перыядам) менш глыбокім і ўзвышаным і ў той жа час, наадварот,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

больш лёгкім, вытанчаным, павярхоўным. У мастацкай культуры ўзмацнілася своеасаблівая цяга да геданізму, пачуццёвага задавальнення. Мастацтва XVIII ст. стала больш заангажыраваным, бо пачало ўсё актыўней умешвацца ў працэсы грамадска-палітычнага жыцця. Сярод усіх відаў культуры на першыя месцы выйшлі філасофія, музыка і тэатр, якія нават адцяснілі на другі план выяўленчае мастацтва.

## 3.2. Сутнасць культуры ў метафізічнай карціне свету

У Беларусі ідэйныя вытокі Асветніцтва бяруць пачатак у духоўна-культурным развіцці грамадства эпохі Адраджэння, у творчасці мысліцеляў канца XVII – пачатку XVIII ст. У цэнтры іх увагі былі не асобны індывід, не хаатычнае нагрувашчванне фактаў і выпадковая сувязь гістарычных фактаў і падзей, а калектыўныя формы народнага жыцця, вынікі іх сумеснай дзейнасці, грамадскія інстытуты.

Адначасова трэба заўважыць, што тэрмін «культура» ў іх сачыненнях не ўжываецца, яго замяняе паняцце «цывілізацыя», пад якой яны разумелі выхаванне, развітое, высакароднае грамадства. Слова «цывілізацыя» ў светапоглядзе айчынных асветнікаў сведчыць, што галоўным прадметам іх інтарэсу было сучаснае ім грамадства з яго супярэчнасцямі і канфліктамі. Асветнікі былі не столькі апалагетамі існуючай цывілізацыі, колькі яе крытыкамі.

Г.Каніскі прапагандаваў неабходнасць усталявання ў краіне парадку і законнасці, крытыкаваў духоўнае ўбоства тых, хто меў уладу. Так, у «Слове да новавыбраных суддзяў» ён крытыкуе правасуддзе: «І што да суддзяў, дык гэта: неправасуддзе, нязнанне і неруплівасць спазнаць законы, лянота ў справе, хабарніцтва, патуранне сябрам і сваякам, раўнівасць праз веру сляпая, ад беднасці сляпая, якая не заўважае таго, што сапраўдная вера ад праўды ніколі не хоча аддзяліцца» [122, с. 625].

Фізіякраты (Л. Залускі, Г. Млоцкі, М. Страйноўскі, І. Храптовіч і інш.) разглядалі грамадства як натуральны арганізм, што складае частку прыроды; лічылі, што адыход чалавека ад разумных законаў прыроды непазбежна выкліча няшчасці, бедствы і беспарадкі. Л.Залускі ў «Агульнай філасофіі» адзначаў:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Дабротыи, якія прыносяць чалавеку найвышэйшую асалоду, абавязкова павінны быць стабільнымі, яны не павінны залежаць ад зменлівага, поўнага выпадковасцей, а выпадковасці адбываюцца без папярэдняга розуму, і чалавеку трэба дабівацца сваіх даброт праз розум» [122, с. 623].

Прадстаўнікі ранняга перыяду Асветніцтва (Б. Дабшэвіч, К. Нарбут, М. Пачобут-Адляніцкі і інш.) сцвярджалі гуманістычныя ідэі павагі да чалавека, выхавання і адукацыі на аснове свабоды перакананняў, высокай грамадзянскасці і адказнасці. Гісторык-асветнік А. Нарушэвіч адводзіў розуму галоўную ролю ў гістарычным працэсе, а прадметам навуковага даследавання лічыў не толькі дзеянні кіраўнікоў і военачальнікаў, але і жыццё простага народа. П. Бжастоўскі, М. Карповіч, І. Яленскі развівалі тэндэнцыі прыродазнаўчага матэрыялізму, радыкальныя сацыяльна-ўтапічныя ідэі. На іх думку, чалавек культурны ў меру сваёй разумнасці і разумны ў меру адпаведнасці свайму прыроднаму прызначэнню. У параўнанні з прыродай культура выступае не як асобны від быцця, а толькі як звяно ў агульным ланцужку прыроднай эвалюцыі. Аднак такі натуралістычны падыход, паводле якога культура – тая ж прырода, не дазваляў адрозніваць іх ні ў жыцці, ні ў пазнанні.

Для пашырэння ідэй Асветніцтва ў Беларусі шмат зрабілі Камісія народнай адукацыі Рэчы Паспалітай, якая па сутнасці была першым у Еўропе Міністэрствам асветы, а таксама выкладчыкі Віленскай акадэміі, народных вучылішчаў. Прагрэсіўныя асветніцкія тэндэнцыі адлюстраваны ў літаратуры і мастацтве, кнігавыдавецкай, культурна-асветніцкай і навукова-педагагічнай дзейнасці.

## 3.3. Рацыянальна-тэхнічны ідэал культуры Асветніцтва

***Увасабленне каштоўнасцей барочнай культуры ў творчай спадчыне Сімяона Полацкага.*** Складанае перапляценне драматычных гістарычных падзей XVII–XVIII стст. знайшло адлюстраванне ў беларускай культуры, маральна-этычных уяўленнях народа, у творах мысліцеляў таго часу.

Яркім прадстаўніком філосафаў-асветнікаў гэтай эпохі з'яўляецца Сімяон Полацкі (Самуіл Гаўрылавіч (Емяльянавіч) Пятроўскі-Сітніяновіч, 1629–1680). Беларускі пісьменнік, філосаф-асветнік і царкоўны дзеяч пачатковую адукацыю атрымаў



у Полацку, вучыўся ў Кіева-Магілянскай школе, у Віленскай акадэміі. У 1656 г. вярнуўся ў Полацк, прыняў праваслаўнае манаства. У Богаяўленскім манастыры вакол яго згуртаваліся таленавітыя пісьменнікі Полаччыны. У гэты перыяд Сімяон Полацкі напісаў шэраг паэтычных твораў, у якіх выказвае любоў і пашану да свайго народа, да роднага горада і краю. У 1664 г. пераязджае ў Маскву, дзе з'яўляецца дарадцам цара па царкоўных справах, перакладчыкам і рэдактарам. У 1667 г. прызначаецца выхавальнікам і настаўнікам царскіх дзяцей.

Беларускі асветнік актыўна займаецца не толькі палітычнай і царкоўнай барацьбой, але і педагагічнай, асветніцкай, выдавецкай дзейнасцю. Літаратурная, багаслоўская і навукова-асветніцкая спадчына яго ўнушальная. Ім напісаны і выдадзены «Буквар мовы славянскай», шэраг багаслоўскіх прац («Абед душэўны», «Вячэра душэўная», «Вянец веры кафаліцкія» і інш.). Сімяон Полацкі падрыхтаваў да друку два вялікія зборнікі вершаў «Рыфмалагіён» і «Вертаград мнагацветны».

Літаратурная творчасць і філасофскія погляды пісьменніка фарміраваліся як пад уплывам засваення шырокага кола тагачасных ведаў, так і ўздыму нацыянальна-вызваленчага руху, які ахапіў беларускія землі. Безумоўна, на погляды пісьменніка аказваў уздзеянне тэалагічны светапогляд, які заставаўся пануючым у XVII ст. Шэраг ранніх твораў ён прысвяціў Хрысту, розным рэлігійным паняццям і міфам. Але ў большасці пазнейшых твораў адчуваюцца элементы нерэлігійнага светаўспрымання. Традыцыйная для ўсходнеславянскага светапогляду арыентацыя на прыярытэт агульнанародных інтарэсаў дапаўнялася ў С.Полацкага напружаным адчуваннем каштоўнасцей чалавечай асобы. У шматжанравай літаратурнай спадчыне ён адстойваў хрысціянскія духоўныя каштоўнасці, усё, што карысна для душы чалавека.

У творчасці С. Полацкага сфарміраваўся самабытны беларуска-славянскі тып барочнай культуры, які спалучаў сярэдневяковыя і рэнесансавыя ідэалагічныя арыентацыі і духоўныя каштоўнасці, з аднаго боку, і кампраміс паміж праваслаўна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

візантыйскім традыцыяналізмам і лаціна-еўрапейскім навуковым рацыяналізмам, з другога.

Аксіясфера ў творчай спадчыне мысліцеля прадстаўлена такімі каштоўнасцямі, як хрысціянская любоў, праўда, ісціна, вера, прыгажосць. С. Полацкі таксама прызнаваў маральную каштоўнасць трагічнага ў жыцці людзей. Ён адрозніваў вонкавую матэрыяльную красу і духоўную прыгажосць. У дыдактычным вершы «Прыгажосць» паэт піша: «Не шелком и златом каждо красен буди, // но добродетели: ублажат тя люди…// Тленно благо красота, недолго блистает, // в един час огневица ону истребляет. // Многим красота лица погибель родила, // купно души с плотию смертно повредила» [122, с. 305].

С. Полацкі выказаў шэраг арыгінальных думак па праблемах мастацтва. Красамоўна мысліцель абгрунтаваў сутнасць мастацтва, ён лічыў, што жывапіс, літаратура, музыка ёсць не што іншае, як імітаванне прыроды. Творца перадае толькі цялеснае аблічча любых з'яў ад Бога да жывёльнага, тое, што мае «плоцкую» форму. Вобразна апісвае С. Полацкі прыроду творчага працэсу. Творцу ён параўноўвае з пчалой. Мастак, як і пчала, збірае ад пахучых кветак прыгожае і карыснае, перадае ў мастацкіх вобразах не толькі тое, што ўбачыў, але сілай уяўлення і не бачанае. Гуманістычная канцэпцыя мастацтва выявілася ў яго трактаце «Слова да шчырага іконнага пісання», вершах «Подражание», «Живописание».



*Помнік Сімяону Полацкаму, г. Полацк*

С. Полацкі добра ведаў усходнеславянскую і заходнееўрапейскую культуры і выказваўся за дыялог культур: «Се что добро, или что красно, то еже жити братии вкупе» [122, с. 305]. Ён падтрымліваў ідэю экуменізму, якая прадугледжвала з'яднанне ўсіх хрысціянскіх цэркваў, але ніколі не адмаўляўся ад праваслаўя.

Такім чынам, творчасць Сімяона Полацкага можна лічыць адной з вяршынь развіцця айчыннай грамадска-палітычнай, у тым ліку і культуралагічнай, думкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Канцэпцыя рэлігіі Казіміра Лышчынскага.*** У гісторыю айчыннай грамадскай думкі К.Лышчынскі (1634–1689) увайшоў як мысліцель-атэіст, які прапаведаваў сістэму ідэй, свабодную ад тэалагічных уяўленняў. Нарадзіўся асветнік у мястэчку Лышчыцы на Брэстчыне. Адукацыю атрымаў у езуіцкіх навучальных установах Брэста, Кракава, Каліша. Нейкі час выкладаў у Львоўскім і Брэсцкім езуіцкіх калегіумах. Але большую частку жыцця правёў у сваім маёнтку ў Лышчыцах, дзе займаўся юрыдычнай практыкай і педагагічнай дзейнасцю.




*Паштовая марка Беларусі, прысвечаная К. Лышчынскаму*

Мысліцель-атэіст глыбока вывучаў філасофію, гісторыю і прыродазнаўства. Усё яго жыццё прайшло ў вывучэнні твораў мысліцеляў старажытнасці, сваіх сучаснікаў і крытычным іх асэнсаванні. Пад уплывам іх ідэй у К. Лышчынскага сфарміравалася аўтарская рэлігійная канцэпцыя, у аснову якой пакладзена матэрыялістычнае разуменне прыроды Бога. У сучаснай культуралогіі рэлігія трактуецца як ранняя форма духоўнай культуры. Найбольш важнай істотнай характарыстыкай рэлігіі з'яўляецца вера ў звышнатуральны, надпрыродны абсалют – Бога.

Атэістычныя ідэі К. Лышчынскага заснаваны на матэрыялістычных уяўленнях пра навакольны свет. На яго погляд, прырода існуе вечна, яна бясконцая і развіваецца па сваіх законах без умяшання Бога. Сваю атэістычную канцэпцыю матэрыяліст сфармуляваў у рукапісным творы «Аб неіснаванні Бога», напісаным на лацінскай мове. У дадзенай працы К. Лышчынскі на ўзроўні навукі таго часу імкнуўся даказаць, што прырода як рэальнасць знаходзіцца ў пастаянным руху і развіцці без умяшання звышнатуральнай сілы. Паслядоўна адмаўляў стваральную сілу Бога і самога Бога як рэальнасць. Паводле мысліцеля-атэіста, Бог – хімерычнае тварэнне чалавека, выдуманае ім і не маючае рэальнай асновы. Ён не толькі адхіляў Тварца-Бога, але на яго месца ставіў чалавека. Адмаўленне існавання Бога на аснове аналізу яго сутнасці прывяло К. Лышчынскага да перагляду яшчэ шэрагу рэлігійных ідэй. Так, ён адхіляў тэзіс аб несмяротнасці душы, не прызнаваў хрысціянскія догматы аб існаванні раю, пекла, чысцілішча, анёлаў, д'яблаў і іншыя звышнатуральныя прыродныя істоты.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

Мысліцель не верыў у бязгрэшнае зачацце Дзевы Марыі, Тройцу, ва Уваскрэсенне Хрыста.

Наватарскімі былі меркаванні К. Лышчынскага па пытанні паходжання хрысціянства. Ён адмаўляў Божае паходжанне ўсякай рэлігіі, у тым ліку і хрысціянства. Філосаф сцвярджаў, што вера, якую лічаць свяшчэннай, – гэта гісторыя чалавецтва. Наш суайчыннік абвяргаў тэзіс тэолагаў пра прыроджаныя рэлігійныя пачуцці, уласцівую людзям Божую ідэю.

З вышэйсказанага вынікае, што радыкальная рэлігійная канцэпцыя К. Лышчынскага фарміравалася ў рэчышчы айчыннай і еўрапейскай матэрыялістычнай і атэістычнай традыцыі і абапіралася на прагрэсіўныя думкі свайго часу, рэнесансавыя і асветніцкія ідэалы.

***Аксіёмы розуму Андрэя Вішаватага.*** Прадаўжальнікам рацыяналістычных рэлігійна-філасофскіх традыцый ранняга беларускага антытрынітарызму быў А. Вішаваты (1608–1678). Нарадзіўся ў маёнтку Філіпава Трокскага ваяводства ў шляхецкай сям'і. Адукацыю атрымаў у шэрагу еўрапейскіх універсітэтаў (Лейдэнскім, Амстэрдамскім, Парыжскім). А. Вішаваты – актыўны прыхільнік Рэфармацыі, падзяляў ідэі сацыялізму. З-за ганення каталіцкай царквы вымушаны быў пакінуць Рэч Паспалітую і пасяліцца спачатку ў Венгрыі, Германіі, а потым у Галандыі. За мяжой Вішаваты напісаў шэраг рэлігійна-філасофскіх твораў па праблемах этыкі, логікі і філасофіі. Галоўны з іх – трактат «Аб рэлігіі, згоднай з розумам».

У сваіх працах вучоны выступае супраць традыцый і царкоўнага аўтарытэту, дае індывіду права самастойна вырашаць рэлігійна-філасофскія і маральна-этычныя праблемы. Чалавечы розум, сцвярджаў А. Вішаваты, гэта натуральны інструмент, дадзены Богам для пазнання праўды і адрознення яе ад фальшы. У працы зроблена спроба выкласці некаторыя лагічныя, метафізічныя і натуралістычныя аксіёмы розуму. На яго погляды паўплывалі такія найбуйнейшыя еўрапейскія мысліцелі, як Галілей, Гасендзі, Дэкарт, Кеплер, Спіноза і іншыя, творы якіх ён грунтоўна даследаваў. У цэнтр яго рэлігійна-філасофскай дактрыны пакладзены тэзіс аб тым, што розум чалавека здольны дайсці да галоўных рэлігійных ісцін уласнымі сіламі, кіруючыся натуральнымі сродкамі. Працэс веры філосаф параўноўваў са звычайнай інтэлектуальнай дзейнасцю. Праўда, або ісціна, грунтуецца на асновах, уласцівых самому розуму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Толькі розум, па меркаванні асветніка, здольны вывесці чалавека з супярэчнасцей існуючай цывілізацыі.

***Разуменне дынамікі культурна-гістарычнага працэсу Каролем Вырвічам*** (1717–1793). Навукова-педагагічная дзейнасць айчыннага мысліцеля-асветніка набыла шырокую вядомасць у XVIII ст. Яго светапогляд фарміраваўся пад уплывам французскай асветніцкай думкі, асабліва Вальтэра і Ш. Мантэск'е. Нарадзіўся педагог у Браслаўскім павеце ў шляхецкай сям'і. У 1746 г. скончыў Віленскую акадэмію, пасля заканчэння якой выкладаў рыторыку, гісторыю і геаграфію ў Крожскім і Навагрудскім езуіцкіх калегіумах. Працяглы час жыў за мяжой, дзе вывучаў арганізацыю асветы ў Францыі, Галандыі і Германіі. Быў прафесарам і рэктарам Варшаўскага калегіума. К. Вырвіч з'яўляецца аўтарам шэрагу падручнікаў па гісторыі і геаграфіі, дзе выклаў свае погляды на гістарычныя навукі.

Філосаф непрымальна адносіўся да традыцыйных поглядаў тагачасных гісторыкаў, якія трактавалі гісторыю як гісторыю палітычных падзей і войнаў. Ён разглядаў гісторыю як сукупнасць змен у палітычным жыцці, звычаях, рэлігіі, эканоміцы, культуры. Духоўная і матэрыяльная культура функцыянальна выступае як дзейнасць, веды, асветніцтва і сродак фарміравання гарманічнай асобы. Паводле К. Вырвіча, у культуры ўвасабляюцца сродкі, спосабы і вынікі чалавечай дзейнасці. Вялікую ўвагу ён надаваў матэрыяльнай культуры, якая, па меркаванні філосафа, вызначае ўзровень жыцця грамадства, характар яго матэрыяльных патрэб і магчымасці іх задавальнення. Вялікую ўвагу ў сваіх творах Вырвіч надае эканоміцы. У гандлі ён бачыў галоўную крыніцу багацця, сродкам павышэння гандлю вучоны лічыў развіццё прамысловасці і земляробства.

У творах К. Вырвіча («Сучасная геаграфія», «Усеагульная геаграфія», «Паходжанне сучасных дзяржаў і народаў» і інш.) перакрыжоўваліся традыцыйныя тэалагічныя і прагрэсіўныя асветніцкія ідэі.

Цікавымі для сучасных культуролагаў з'яўляюцца разважанні А.Вырвіча аб сутнасці ісціны (праўды), ідэі, веры. Так, ён пастуліраваў, што ісціна ёсць тое, што мае рысы выразнасці і зразумеласці. Гэтымі рысамі валодаюць пэўныя ідэі і паняцці, якія маюць аксіяматычны характар і агульныя для ўсіх людзей. Менавіта яны адыгрываюць ролю крытэрыяў ісціны.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аналіз творчай спадчыны А. Вырвіча дазваляе меркаваць, што па сваіх поглядах ён наблізіўся да заходнееўрапейскіх мысліцеляў Новага часу. У яго працах маюцца асобныя выказванні, якія карэлююць з пэўнымі культуралагічнымі канцэпцыямі.

***Метадалогія Бенядзікта Дабшэвіча*** (1722–1794). Знакамітым прадстаўніком эклектычнай філасофіі ў Беларусі быў Б. Дабшэвіч, навуковая спадчына якога грунтоўна даследавалася еўрапейскімі вучонымі (Э. Вінтэрам, Л. Хмаем і інш.). Нарадзіўся ён каля Навагрудка, адукацыю атрымаў у Віленскай акадэміі, дзе пазней выкладаў філасофію і тэалогію. Нейкі час чытаў лекцыі ў Навагрудскім езуіцкім калегіуме.

Беларускі філосаф надрукаваў 10 прац, у якіх адстойвае павагу да навукі, да выхавання і адукацыі, падтрымлівае думку прагрэсіўных еўрапейскіх вучоных аб неабходнасці падзелу сфер навукі, філасофіі і рэлігіі. Галоўная яго праца «Погляды новых філосафаў». Арыгінальнасць твора ў тым, што ў перыяд амаль поўнага панавання схаластыкі і каталіцкай ідэалогіі філосаф праводзіць некаторыя ідэі Асветніцтва. У ёй Б. Дабшэвіч па сутнасці распрацаваў метадалогію даследавання сацыякультурных працэсаў і з’яў. Як і ўсе тагачасныя вучоныя, ён імкнуўся вырашыць навуковыя задачы з дапамогай матэматыкі. На яго думку, важнейшая яе задача «надзейна адчыняць дарогу да вывучэння ўсіх навук і даваць спосаб удалага параўнання» [122, с. 206]. Аднак філосаф, акрамя матэматыкі і натуразнаўства, спрабаваў адшукаць ісціну метадамі гуманітарных навук. Напрыклад, логіку ён лічыў першай з навук, здатных да ўстанаўлення ісціны. У якасці фундаментальных прынцыпаў логікі Б. Дабшэвіч называў прынцып дастатковай падставы і прынцып сумнення. Метадычнае сумненне, паводле мысліцеля, азначае, што даследчык не асуджае, не падумаўшы, погляды іншых, а спакойна ўзважвае ўсе гэтыя выказванні, што здаюцца нам непрымальнымі, старанна вывучае гэтыя палажэнні, як быццам бы яны карысныя.

Заслугоўваюць увагі культуролагаў разважанні філосафа наконт праблем метаду. Метад ён разглядаў як «функцыю розуму, з дапамогай якой шмат якія паняцці, многія меркаванні і мноства разважанняў так зводзяцца ў ясныя і пэўныя правілы, што або выяўленыя ісціны яны (гэтыя правілы) раскрываюць іншым, або з іх дапамогай выяўляюцца да гэтага часу невядомыя [ісціны]» [122, с. 206].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падводзячы вынікі аналізу творчай спадчыны Б. Дабшэвіча, неабходна адзначыць, што ім разгледжаны амаль усе існуючыя ў тагачаснай еўрапейскай думцы значныя ідэі, тэорыі, аргументацыі па праблемах пазнання. Яго метадалогія пабудавана на аснове сістэмы Р. Дэкарта і мела наватарскі характар. Асабліва важнае значэнне для даследчыкаў уяўляюць работы, у якіх аналізуюцца паняцці, тое, што сёння называецца семантыкай, семіялогіяй, прагматыкай і г.д. У працах вучонага разглядаецца сістэма поглядаў, якія абапіраюцца на новыя філасофскія і натуральныя тэорыі.

***Адлюстраванне культуры сацыяльных супольнасцей у творчасці Язэпа Даманеўскага*** (канец XVI – 1-я палова XVII ст.). У творчай спадчыне філосафа-маралiста, якім быў Я. Даманеўскі, увасоблены творчы метад у духу эстэтыкі барока, паказаны сацыяльна-тэрытарыяльныя супольнасці, сацыякультурная сітуацыя на тагачасных беларускіх землях і яе адметныя асаблівасці. Ім у Любчы надрукаваны шэраг маральна-павучальных вершаваных твораў, у якіх адлюстраваны філасофска-этычныя погляды паэта-гуманіста. Так, у працах «Жыццё сельскае і гарадское», «Некаторыя эмблемы», «Афарызмы Саламона ў паэтычным выкладанні» і іншых сфармуляваны тэарэтычныя асновы яго этыкі. У іх ён аналізуе гарадское і вясковае асяроддзе як фактары, якія ўплываюць на сацыякультурную сітуацыю.

Я. Даманеўскі ідэалізаваў вясковую субкультуру як увасабленне «натуральнага стану» чалавека, гарадскую ж трактаваў як «супрацьнатуральнае», чужое прыродзе чалавека, як крыніцу амаральнага пачатку, зла, якое садзейнічала разбэшчванню чалавечай асобы, дэфармацыі яго першапачатковай прыроды.

У шкале каштоўнасцей субкультуры паэт на першы план вылучаў дабрачыннасць і працавітасць, якія, на яго погляд, з'яўляюцца асноўнай умовай шчаслівага жыцця, крыніцай багацця. Высокі маральны статус гэтых каштоўнасцей Я. Даманеўскі абгрунтоўваў прыкладамі з Бібліі і грамадзянскай гісторыі. Філосаф падпарадкоўваў індывідуальныя інтарэсы чалавека інтарэсам агульнага дабра.

Творчая спадчына філосафа адметная і тым, што ў ёй каларытна перададзены побыт гараджан і сялян, іх фальклор, дасціпны гумар.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Этнакультурная інтэнцыянальнасць у творах Саламона Маймана*** (1753–1800). Асветнік адстойваў правы людзей на жыццё, авеянае радасцю пазнання, напоўненае святлом розуму і ісціны. Нарадзіўся С. Майман у мястэчку Мір у сям’і яўрэйскага арандатара. Вывучаў у Германіі медыцыну, філасофію, фізіку, матэматыку. Нейкі час ён пражываў у Польшчы і Галандыі. У Еўропе пазнаёміўся з філасофскімі творамі Мендэльсона, Канта, Спінозы, Лока, Майманіда.


Portrait of Solomon Maimon by Arndt

Жыццё філосафа-асветніка адзначана пастаянным пошукам, нястомнай працай у авалоданні асновамі навук, плённай асветніцкай дзейнасцю. У 1790 г. выдаў сваю філасофскую працу «Спроба трансцэндэнтальнай філасофіі» на нямецкай мове, у якой найбольш поўна і грунтоўна выкладзены яго філасофскія погляды. Паводле пункту гледжання С. Маймана, усякае пазнанне магчыма з дапамогай свядомасці з яе ўяўленнямі, суджэннямі, перажываннямі. Свядомасць, лічыў філосаф, з самой сябе па сваіх уласных законах упершыню стварае свой уласны прадмет і тым самым надае яму аб’ектыўнасць і рэальнасць. Пазнанне магчыма толькі як пазнанне працэсу ўзнікнення прадмета. Паводле меркавання С. Маймана, быццё ажыццяўляецца ў пэўных актах свядомасці, у якіх нешта з’яўляецца ці мысліцца ў якасці прадмета, а быць прадметам азначае мець сэнс. У працы «Спроба трансцэндэнтальнай філасофіі» асветнік пісаў: «Калі розум карыстаецца сваімі формамі пачуццёвых аб’ектаў (я маю на ўвазе сінтэтычныя, што падлягае сумненню), то гэта адбываецца не непасрэдна, а праз аб’екты розуму, якія іх прадстаўляюць» [108, с. 392].

Прадметам свядомасці асветніка ў першую чаргу былі аб’екты духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў. Аб гэтым сведчыць шэраг тэкстаў яго прац. Так, у «Аўтабіяграфіі» (1791) С. Майман усебакова адлюстраваў побыт, надзённыя праблемы і духоўнае жыццё тагачаснага беларускага грамадства. Гэта дазваляе сцвярджаць аб наяўнасці ў творчасці філосафа этнакультурнай інтэнцыянальнасці, асноў фенаменалогіі культуры. Ён лічыў, што людзям найперш неабходна даць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кнігі, у якіх галоўнае месца займалі б пытанні прыродазнаўства, матэматыкі і філасофіі. Майман асабліва вялікую ўвагу адводзіў асветніцтву ў вырашэнні надзённых праблем рэфармавання існуючай сістэмы ўлады і грамадскіх адносін. Творы Саламона Маймана чыталі і высока ацэньвалі І. Гётэ, А. Гумбальт, І. Кант, І. Фіхтэ, Ф. Шылер.

***Асэнсаванне кагнітыўнага элемента палітычнай культуры Казімірам Нарбутам*** (1738–1807). Пэўныя канцэптуальныя ўяўленні аб сутнасці палітыкі вярхоўнай улады ўвасоблены ў асобных працах К. Нарбута. Нарадзіўся ён у маёнтку Яшнец Лідскага павета. Адукацыю атрымаў у піярскіх школах Шчучына і Дубровіцы. Удасканальваў свае веды па філасофіі і прыродазнаўчых навуках у піярскіх калегіумах Вільні і Рыма. Пасля вяртання на радзіму выкладаў філасофію ў Віленскім піярскім канвікце. У 1769 г. выдаў у Вільні падручнік па логіцы «Логіка, або Навука разважання і разумнай размовы». У гэтай працы К. Нарбут з гуманістычна-асветніцкіх пазіцый выказаўся за свабоду навукі, звязваючы яе з пошукам ісціны. «Логіка, пісаў філосаф, – гэта навука, якая вучыць, як спасцігнуць і спазнаць ісціну, або, што адно і тое ж: гэта мастацтва правільнага мыслення» [123, с. 293].



Думкі аб грамадскай прыродзе чалавека выказаны ім у працы «Эклектычная філасофія» і ў прадмове да кнігі «Ваенная навука прускага караля для яго генералаў». Нарбут адстойваў думку пра неабходнасць шырокай свецкай адукацыі, выступаў супраць цялеснага пакарання вучняў. Як асветнік-гуманіст ён клапаціўся аб фарміраванні ў вучня асобы, чалавека, цесна звязанага з практычнымі патрэбамі грамадства і часу. Па меркаванні мысліцеля-асветніка, чалавек створаны для жыцця ў грамадстве, але пры гэтым захоўвае свае прыродныя правы, якія яму павінна гарантаваць дзяржаўная ўлада. Члены грамадства, на думку аўтара «Эклектычнай філасофіі», павінны актыўна ўдзельнічаць у палітычным жыцці дзяржавы незалежна ад станоўчай або адмоўнай яе ацэнкі. Але для гэтага патрэбны добрая адукацыя, адкрытыя і незалежныя каналы для палітычнай дзей-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

насці людзей. Таму яго грамадская дзейнасць тычылася ўдасканалення тагачаснай сістэмы адукацыі, наданню ёй свецкага характару. Будучы членам Адукацыйнай камісіі, К. Нарбут шмат зрабіў для рэфармавання школьнага навучання ў Беларусі і Літве. Ён з’яўляўся адным з аўтараў «Статута парафіяльных школ» і настаўлення «Аб інспектаванні (візітацыі) школ». У гэтых працах асветнік адстойваў прагрэсіўныя метады навучання, патрабаваў, каб у школах навучалі неабходным практычным навыкам і ведам, якія б былі звязаны з сацыяльна-культурным жыццём грамадства. Шмат намаганняў прыклаў рэфарматар, каб увесці ў курс навучання свецкую этыку, якая б з’яўлялася навукай маральнасці.

Вярхоўную ўладу К. Нарбут разглядаў як арганізацыю, што ўзнікае на пэўнай ступені развіцця грамадства і служыць у інтарэсах усіх і на агульную карысць. Таму ў краіне неабходна стварыць такія законы, на якіх бы грунтаваліся цэласнасць, бяспека і шчасце грамадзян. Дзяржава, на думку філосафа, павінна клапаціцца аб непарушнасці законаў, справядлівасці, роўнасці, свабодзе асобы.

Такім чынам, характэрная рыса творчасці К. Нарбута – вера ў чалавека і яго розум, які здольны спасцігнуць ісціну праз асвету, што фарміруе адпаведныя ўстаноўкі і стэрэатыпы паводзін, якія садзейнічаюць пераводу ўяўленняў і каштоўнасцей у сферу практычнай рэалізацыі. Гэтыя гуманістычныя ідэі ён адстойваў на працягу ўсяго жыцця.

***Філасофія розуму і адчуванняў Станіслава Шадурскага*** (1726–1789). Вядомым прадстаўніком натурфіласофіі 2-й паловы XVIII ст. з’яўляўся С. Шадурскі, які пазітыўна ўспрымаў навуковыя дасягненні прыродазнаўства і прагрэсіўныя тагачасныя канцэпцыі і вучэнні. Ён нарадзіўся непадалёку ад Дзвінска. Спачатку вучыўся ў Віленскім універсітэце, а потым паглыбляў веды ў Францыі, дзе вывучаў філасофію, прыродазнаўства і матэматыку. Вярнуўшыся на радзіму, філосаф займаўся педагагічнай дзейнасцю ў Варшаўскім і Навагрудскім калегіумах.

Вучоны напісаў і надрукаваў шэраг філасофскіх твораў: «Прынцыпы філасофіі мыслення і адчуванняў», «Фізіка, або Філасофія прыроды» і інш. Як прадстаўнік натурфіласофіі ён арыентаваўся на навуковыя дасягненні прыродазнаўства і не-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гатыўна ставіўся да схаластыкі. Ён пісаў, што «ад перыпатэтычнай сістэмы, якая аперыруе абсалютнымі выпадковасцямі, таемнымі якасцямі, бояззю пустаты і матэрыяльнымі субстанцыяльнымі формамі (якія, аднак, не з'яўляюцца матэрыяй), мы адышлі даўно і адрозніваемся ад яе, як неба ад зямлі. У гэтай частцы філасофіі (фізіцы) мы не прытрымліваемся іх сістэмы, таму што фізічныя з'явы яны тлумачаць хутчэй метафізічна, чым натуральным спосабам» [122, с. 330].

Філасофія С. Шадурскага, якую ён сам называў «філасофіяй розуму і адчування», з'яўляецца значным укладам у развіццё навуковай і грамадскай думкі Еўропы. З тэксту яго твора «Філасофскія азначэнні агульнай фізікі» бачна, што думка славутага айчыннага філосафа зазнала ўплыў светапогляднай сістэмы Р. Дэкарта. Ён падзяляў асноўныя прынцыпы дэкартаўскай філасофіі, такія як матэрыялістычная фізіка, ідэалістычная і дуалістычная метафізіка. С. Шадурскі падтрымліваў думку Р. Дэкарта пра існаванне дзвюх субстанцый – матэрыяльнай і духоўнай.

Гэта ідэя была пазней выкарыстана культуролагамі пры вызначэнні прадметнага (знешняга) і асобаснага (унутранага) відаў культуры, а таксама падзелу культуры на духоўную і матэрыяльную. У працэсе культурагенезу духоўная дзейнасць чалавека адслаілася ад матэрыяльнай і супрацьпаставіла ёй сябе як самастойны інстытуцыянальны і прафесіяналізаваны спосаб апрадмечвання вынікаў псіхічнай дзейнасці.

Пры станаўленні эксплiцытных культуралагічных ведаў іх заснавальнікі абапіраліся на тэзіс С. Шадурскага пра магчымасць карыстацца рознымі філасофскімі сістэмамі, запазычваючы з іх тое, што ўяўляецца дакладным і не выклікае сумнення. З філасофіі і іншых гуманітарных і прыродазнаўчых навук замежнымі і айчыннымі тэарэтыкамі фундаментальнай культуралогіі былі адаптаваны да тэорыі і гісторыі культуры пэўныя метады і паняцці (эвалюцыя, дыфузія, дынаміка, сінергетыка, інтэрферэнцыя і інш.).

З вышэйсказанага вынікае, што філасофія розуму і адчуванняў С. Шадурскага з'яўляецца важным укладам у станаўленне філасофскай і прыродазнаўчай думкі Новага часу, у развіццё не толькі імпліцытных, але і эксплiцытных культуралагічных ведаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Сацыякультурны ўтапізм Сцяпана Аскеркі*** (1712–?). Канцэпцыя перабудовы грамадства, якую распрацаваў С. Аскерка, была заснавана на супастаўленні беларускай і нямецкай грамадскіх мадэляў, якія ён ведаў з уласнага вопыту.

Нарадзіўся С. Аскерка на Навагрудчыне ў сям'і заможнага шляхціца. Вучыўся ў слуцкай гімназіі, потым у Германіі. Германію ён прымаў за ўзорную мадэль цывілізацыі, а вёску – за ўзор простага і натуральнага жыцця ў прыродзе. З-за ганення езуітаў вымушаны быў жыць у Германіі, дзе быў саветнікам юстыцыі караля Фрыдрыха II. У 1760 г. напісаў і выдаў кнігу «План, які не з'яўляецца нормай». У працы ён неаднаразова спасылаецца на Ш. Мантэск'е, Д. Юма і перакананы, што змена грамадскіх адносін залежыць ад добрай волі грамадзян. У гэтым даследаванні ён выкладае ўтапічны план перабудовы нямецкага грамадства, усталявання такога грамадскага ладу, які б садзейнічаў уздыму жыццёвага ўзроўню, культуры і асветы народа. Так, вучоны прапаноўваў увесці працоўныя і ашчадныя кніжкі для кожнага рабочага, весці ўлік грамадскага прыбытку. Аскерка даказваў неабходнасць прафесійнай адукацыі сялян, абавязковага навучання дзяцей з пяцігадовага ўзросту, лекарскай дапамогі насельніцтву. Праца беларускага эканаміста папярэднічала творам вядомых французскіх сацыялістаў-утапістаў Л. Сен-Сімона, Ш. Фур'е, Р. Оўэна.

***Навука пра чалавека Лукі Залускага*** (1604–1676). Нарадзіўся Л. Залускі на Міншчыне ў шляхецкай сям'і. Пасля заканчэння Віленскага ўніверсітэта выкладаў паэтыку, рыторыку, філасофію, тэалогію ў шэрагу ўніверсітэтаў Рэчы Паспалітай. Выдаў у Вільні ў 1640 г. кнігу «Агульная філасофія», якая складаецца з дзвюх частак, – «Практычная філасофія» і «Тэарэтычная філасофія». Адышоўшы ад афіцыйна прынятай метадалогіі, ён на першы план паставіў навукі пра чалавека, а не навукі аб прыродзе і спосабах пазнання. Л. Залускі арыентаваўся на гуманістычны ідэал навукі. Філасофія, на яго думку, павінна служыць удасканаленню чалавечай маралі і грамадскага жыцця людзей.

Разглядаемы твор мысліцеля адлюстроўвае выразную індывідуальную філасофскую пазіцыю аўтара. На яго думку, філасофія не столькі навука, колькі мудрасць, «настаўніцтва ў норавах». У працы «Этыка» Л. Залускі спрачаецца з акадэмікамі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перыпаэтыкамі, якія сцвярджалі, што адны даброты ўласцівы душы, другія – целу, іншыя – вонкавыя (багацце, слава, пашана, улада). Ён адзначаў, што «адшукванне дзяржаўных пасад вядзе цябе да ганаровых званняў. Але зусім не да шчасця… Небяспечная рэч – гонар, і тым больш небяспечная, чым ён вышэй» [57, с. 94–95]. Гуманітарная навука, паводле мысліцеля, павінна садзейнічаць сацыялізацыі асобы, яе маральнаму ўдасканаленню.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 4

# УПЛЫЎ ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ІДЭАЛОГІІ НА РАЗВІЦЦЁ ЭКСПЛІЦЫТНЫХ КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫХ ВЕДАЎ у XIX ст.

## 4.1. Узнікненне новых навуковых дысцыплін і галін даследавання культуры

У XIX ст. краіны Захаду ўступілі ў перыяд сталага індустрыяльнага грамадства, для якога ўласціва наяўнасць новых прынцыпаў рэгуляцыі сацыякультурнага жыцця. Складаны механізм прамыслова развітой сістэмы патрабаваў для свайго падтрымання не толькі адпаведнай сацыяльнай і палітычнай сістэмы, але і адэкватнага духоўнага забеспячэння ў выглядзе сістэмы норм і каштоўнасцей. Яны стваралі асэнсаваны і актыўны ўдзел насельніцтва ў неабходных відах жыццядзейнасці, выканання адпаведнай разнастайнасці роляў і дасягнення згоды паміж living рознымі слаямі і групамі. Прыярытэт эканамічнай сферы, звязанай з прамысловай вытворчасцю, надаваў асаблівае значэнне падтрыманню тых каштоўнасцей, без якіх нельга забяспечыць паўнавартасны «ўдзел у агульнай справе», «роўнасць партнёраў». Вымяраліся гэтыя каштоўнасці фінансава-эканамічнымі крытэрыямі.

У сістэме каштоўнасцей асобы індустрыяльнага грамадства вызначаліся дасягненні і поспех; валоданне прыватнай уласнасцю; індывідуалізм; спажыванне; універсалізм; актыўнасць і праца; вера ў прагрэс; правы асобы на жыццё, свабоду і ўласнасць; павага да навукі і тэхнікі і інш.

У XIX ст. навука ўступіла ў свой «залаты век». Навуковыя адкрыцці ў галіне фізікі, хіміі, біялогіі, астраноміі, геалогіі, медыцыны адбываліся адно за адным. Прыродазнаўчы прагрэс паўплываў і на гуманітарныя навукі, шэраг з якіх пераходзяць на пазіцыі біялагічнага рэдукцыянізму. Гэта закранула асобныя кірункі этналогіі, псіхалогіі, сацыялогіі і, безумоўна, узніклай у канцы стагоддзя навукі аб культуры (культуралогіі, культурнай антрапалогіі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Філасофская і культуралагічная думка Беларусі ў XIX ст. складвалася пад уплывам разнастайных эканамічных, сацыяльна-палітычных, культурных і ідэйных фактараў. Станоўчы ўплыў на фарміраванне свядомасці інтэлігенцыі аказваў вызваленчы рух, які разгарнуўся ў 20–40-я гг. У гарадах нашай краіны было створана некалькі тайных таварыстваў, якія ставілі сваёй мэтай падрыхтоўку ўзброенага паўстання супраць расійскага царызму, выступалі з патрабаваннем сацыяльных і палітычных перамен. Філаматы спрабавалі весці асветніцкую работу сярод працоўных і ўкараненне ў іх свядомасць рэвалюцыйных ідэй.

Ажыўленню культуралагічнай думкі ў Беларусі садзейнічала распаўсюджванне матэрыялістычных ідэй. Беларускія мысліцелі выступалі з крытыкай канцэпцыі аб незалежнасці свядомасці ад матэрыі і духу ад цела. М. Лавіцкі і іншыя падышлі да матэрыялістычнага разумення мастацтва як адлюстравання рэчаіснасці.

## 4.2. Спецыфічныя асаблівасці сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства

Рост нацыянальнай свядомасці народа, актывізацыя барацьбы за вызваленне і выхад на арэну гістарычнай творчасці садзейнічалі развіццю беларускай нацыянальнай культуры. У літаратуру, выяўленчае мастацтва, навуку прыйшла бліскучая плеяда творцаў, якія стаялі на пазіцыях рамантызму, у якім спалучаліся рысы дваранскага асветніцтва, дыдактызму і сентыменталізму. Прадстаўнікі беларускага рамантызму арыентаваліся на духоўныя каштоўнасці народа.

У 2-й палове XIX ст. у новай беларускай літаратуры ўзнікае рэалістычны кірунак. Ф. Багушэвіч, Я. Лучына і іншыя былі прапаведнікамі ідэалогіі сялянскага дэмакратызму.

Вялікую ролю ў развіцці грамадскай думкі адыгралі вучоныя і выкладчыкі Віленскага ўніверсітэта, Горы-Горацкага земляробчага інстытута. У навучальных установах распаўсюджвалася забароненая літаратура, ствараліся тайныя гурткі. Значная колькасць выкладчыкаў прытрымлівалася вольналюбівых ідэй і абуджала свядомасць студэнтаў.

У 40–50-я гг. пачынаецца кансалідацыя беларускай нацыі, на грамадскую арэну выходзіць шэраг вядомых беларускіх архео-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лагаў, пісьменнікаў, фалькларыстаў, этнографаў (І. Барычэўскі, Ф. Савіч, У. Сыракомля, К. і Я. Тышкевічы, М. Янчук і інш.). Дзейнасць беларускай інтэлігенцыі станавілася больш свядомай і мэтанакіраванай. Яны з'яўляюцца выразнікамі нацыянальных і сацыяльных памкненняў народа.

Афармленне рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку як самастойнай ідэалагічнай плыні грамадска-палітычнай і культуразнаўчай думкі Беларусі адбылося ў перыяд паўстання 1863 г. Яно звязана з рэвалюцыйнай і публіцыстычна-асветніцкай дзейнасцю Кастуся Каліноўскага і яго паплечнікаў. Яны сталі першымі свядомымі даследчыкамі свайго народа.

У 2-й палове XIX ст. актывізуецца дзейнасць расійскіх і польскіх даследчыкаў па вывучэнні гісторыі, мовы, фальклору беларускага народа. Прадстаўнікі расійскай афіцыйнай навукі імкнуліся адшукаць агульнасць рускай і беларускай культур, а польскія – даказаць еднасць беларусаў і палякаў. Але менавіта вынікі рускай і польскай навукі, незалежна ад палітычнай арыентацыі даследчыкаў, пацвердзілі нацыянальную самабытнасць беларусаў, абудзілі ў беларускай інтэлігенцыі цікавасць да сваіх каранёў. Пачынаецца свядомае самапазнанне беларускага этнасу і яго культуры. У гэты перыяд П. Баброўскі, А. Багдановіч, М. Без-Карніловіч, Н. Васільева, У. Вярыга, Л. Галамбёўскі, І. Грыгаровіч, З. Даленга-Хадакоўскі, М. Доўнар-Запольскі, Я. Карскі, А. Кіркор, Ю. Крачкоўскі, І. Насовіч, М. Нікіфароўскі, Е. Раманаў, А. Сапуноў публікуюць шэраг грунтоўных прац, у якіх сабраны разнастайныя артэфакты духоўнай і матэрыяльнай культуры.

Эпоха шырокага дэмакратычнага руху, этнакультурнай кансалідацыі беларускага народа выклікала на мастацкую арэну выдатную плеяду паэтаў-дэмакратаў. Пачынальнікамі новай беларускай літаратуры былі П. Багрым, Ф. Багушэвіч, А. Гурыновіч, В. Дунін-Марцінкевіч, К. Каганец. Народнае жыццё, багатая духоўная культура беларусаў сталі пільнай увагай пісьменнікаў.

## 4.3. Канцэпцыя народнасці і яе ўвасабленне ў літаратурнай спадчыне

Пад уздзеяннем эстэтыкі рамантызму і росту нацыянальнай самасвядомасці развівалася творчасць ***Тамаша Зана*** (1796–



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1855). Паэт-рамантык нарадзіўся ў в.Мясота Ашмянскага павета ў шляхецкай сям'і. Вучыўся ў Мінскай гімназіі, Маладзечанскім павятовым вучылішчы, Віленскім універсітэце. У час вучобы ва ўніверсітэце разам з А. Міцкевічам быў ініцыятарам стварэння тайных таварыстваў студэнцкай моладзі – філаматаў, філарэтаў і прамяністых, за што быў арыштаваны і ў 1824 г. высланы ў Арэнбург. На радзіму вярнуўся ў 1841 г., пасяліўся ў маёнтку Кахачын каля Оршы і займаўся літаратурнай дзейнасцю.



Т. Зан належаў да прадстаўнікоў новай беларускай літаратуры, якая фарміравалася ў рэчышчы асветніцтва і рэвалюцыйнага рамантызму. У «Прамове на першай маёўцы прамяністых» паэт гаварыў: «Што за прамень залаты вас паклікаў у поле? //Што вы шукаеце тут, як сляпыя без долі? //Што, адкажыце? Але – хто шукае, той знойдзе, //Стукай – адчыняць, а той, хто ідзе, той і дойдзе!» [58, с. 223]. Нягледзячы на тое, што ён пісаў на польскай мове, яго літаратурная творчасць абапіралася на беларускія крыніцы і гісторыю народа. Т.Зан у сваёй творчасці шырока выкарыстоўваў вобразы і сімвалы вуснай народнай творчасці, разглядаў фальклор як крыніцу абнаўлення і ўзбагачэння мастацкай культуры.

Творца раскрыў прыгажосць краявідаў радзімы, паказаў вытокі гісторыі беларускага этнасу. Ён звяртаў увагу маладых на багацце беларускага фальклору і прыгажосць мовы беларусаў. Сам паэт шанаваў мову беларускага народа, шырока выкарыстоўваў яе элементы ў сваёй творчасці. Ідэі, перакананні і культуратворчасць Т. Зана значна паўплывалі на погляды і паэзію Я. Чачота, А. Міцкевіча, А. Адынца і інш. Так, беларускае народнае паданне пра затапленне горада Svіцязь, якое лягло ў аснову яго балады «Свіцязь-возера», паслужыла А. Міцкевічу і Я. Чачоту сюжэтам для аналагічных твораў.

Багацце і самабытнасць беларускай народнай культуры пасапраўднаму выявіў фальклярыст і паэт ***Ян Антоні Тадэвушавіч Чачот*** (1796–1847). Нарадзіўся ён у в. Малюшычы Навагрудскага павета ў сям'і арандатара. Адукацыю атрымаў у Навагрудскай дамініканскай школе, адзін год навучаўся ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Віленскім універсітэце. Тут зблізіўся з сябрамі тайнага таварыства філаматаў. Мэтай таварыства была культурная праца ў народзе, выхаванне патрыятызму ў асяроддзі беларускай моладзі. Юнак не толькі падзяляў свабодалюбівыя ідэі філаматаў, але шмат рабіў па іх развіцці і пашырэнні сярод студэнцкай і вучнёўскай моладзі літаратурнымі сродкамі. Польскі літаратуразнавец Станіслаў Свірка адзначаў, што «Чачот быў філамацкім маяком, які стаяў на віленскіх ростанях класіцызму і рамантызму і які нязменна паказваў на народнасць» [99, с. 170]. Паэт захапляўся стварэннем вершаў на беларускай мове. Яго творы карысталіся вялікім поспехам. Адметнасцю творчасці Я. Чачота было мастацкае паглыбленне ў вусна-паэтычную спадчыну беларускага народа. На яго раннія творы моцны ўплыў аказалі асветніцкія ідэі сентыменталізму.



Пяру Я. Чачота належыць шэраг рамантычных балад: «Свіцязь-возера», «Мышанка», «Навагрудскі замак», «Калдыгейскі шчупак». Ён аўтар кнігі «Аповесці для маладых дзяўчат», мноства вершаў. У сваіх творах паэт адстойваў інтарэсы беларускага сялянства, заклікаў паважаць просты народ, паляпшаць яго дабрабыт, крытыкаваў прыгонніцкі лад, выказваўся за адмену прыгоннага права. Творы Я. Чачота прасякнуты сапраўднай народнасцю і павагай да беларуса. Зыходзячы з ідэі народнасці, паэт адмаўляў барацьбу паміж памешчыкамі і сялянамі. Ён лічыў, што інтарэсы існавання нацыі, адраджэння яе самастойнасці патрабуюць класавага міру, салідарнасці ўсіх сацыяльных груп.

Літаратурная спадчына Я. Чачота заснавана на вусна-паэтычнай творчасці беларусаў. Паэт збіраў і вывучаў беларускі фальклор. Ён запісаў і склаў зборнік беларускіх народных песень, якія сабраў на Навагрудчыне. Выдаў «Сялянскія песні», шэсць фальклорных зборнікаў, куды ўвайшло каля 1000 песень у перакладзе на польскую мову і ў арыгінале, а таксама прыказкі і прымаўкі, слоўнік беларускай мовы і ўласныя беларускія вершы. Дарэчы, многія вершы паэта напісаны не па-беларуску. У прадмовах да зборнікаў Я.Чачот паказваў асаблівасці фальклору і мовы беларускага народа. Так, у прадмове да кнігі «Сялянскія песні з-пад Нёмана і Дзвіны» ён пісаў: «Паэзія, якую мы называем сёння гміннай, простанароднай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

была некалі агульнай для ўсіх нашых продкаў: для паноў, князёў, словам, агульнанароднай; ужо ад аднаго гэтага яна павінна была б карыстацца большай павагай нават у тых, хто нічога добрага не хоча бачыць ва ўсім, што ёсць простанароднае, сялянскае» [99, с. 209]. Сваімі творамі ён праславіўся як сапраўдны фальклярыст і ўвайшоў у гісторыю не толькі беларускай літаратуры, але і фалькларыстыкі. Спадчына Я. Чачота, якая спалучала, з аднаго боку, асветніцкі рацыяналізм і дыдактызм, а з другога – рысы сентыменталізму і рамантычнай ідэалізацыі, зрабіла велізарны ўплыў на творчасць А. Міцкевіча. Адзначаючы гэта, С. Свірка пісаў: «Міцкевіч пайшоў у тым кірунку, і дарога тая прывяла яго да вялікай рамантычнай і народнай паэзіі» [99, с. 170].

Падчас выкрыцця студэнцкіх тайных згуртаванняў у 1823 г. Я. Чачот быў сасланы на Урал. Толькі праз 10 гадоў яму зноў удалося вярнуцца ў Беларусь.



Развіццю беларускай грамадска-палітычнай думкі спрыяла культуратворчасць беларускага і польскага паэта ***Адама Міцкевіча*** (1798–1855). Нарадзіўся ён на хутары Завоссе непадалёку ад Навагрудка ў сям'і адваката. Першапачатковую адукацыю атрымаў у Навагрудскай дамініканскай школе, а затым паглыбляў веды ў Віленскім універсітэце, дзе ўключыўся ў дзейнасць па стварэнні тайнага таварыства студэнцкай моладзі (філаматаў). У «Плане новай арганізацыі» А. Міцкевіч сфармуляваў асноўныя задачы філаматаў: культурная праца ў масах, шырэй распаўсюджваць сярод народа асветніцтва, развіваць нацыянальную самасвядомасць, абуджаць у грамадзян імкненне да грамадскай дзейнасці, фарміраваць грамадскую думку. Паэт напісаў статуты для тайных арганізацый, шэраг вершаў-маніфестаў. Філаматы адыгралі важную ролю ў грамадскім і культурным жыцці Беларусі, у фарміраванні ідэй нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння.

За ўдзел у патрыятычным руху студэнцкай моладзі паэт быў высланы ў цэнтральныя раёны Расіі. Тут ён зблізіўся з дзекабрыстамі, Пушкіным, Вяземскім, Баратынскім. У 1829 г. выехаў у Заходнюю Еўропу. У 1848 г. прымаў актыўны ўдзел у рэвалюцыйных падзеях. У Італіі стварыў польскі легіён, які

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

змагаўся супраць Аўстрыйскай імперыі. У 1854 г., калі пачалася руска-турэцкая вайна, А. Міцкевіч разам з польскімі патрыётамі змагаўся супраць Расійскай імперыі.

Сваю рэвалюцыйна-вызваленчую дзейнасць паэт спалучаў з вялікай літаратурнай працай. Ім напісаны шэраг паэм: «Гражына», «Дзяды», «Конрад Валенрод», «Пан Тадэвуш». Літаратурная спадчына складаецца з мноства балад і вершаў. Многія з іх напісаны пад уплывам ідэй рэвалюцыйных дэмакратаў. У творах А. Міцкевіча цэнтральным з'яўляецца вобраз рамантычнага героя-барацьбіта за свабоду і шчасце народаў Беларусі і Літвы, ажывае гісторыя старажытнай Беларусі, паказаны складаны лёс беларускага народа.

Крыніцай паэзіі А. Міцкевіча была цікавасць да народнай культуры, звычаяў, мастацтва. Беларускую мову паэт лічыў самай гарманічнай і з усіх моў найменш зменёнай, найбольш багатай і чыстай гаворкай, якая даўно з'явілася і цудоўна распрацавана. У працы «Пра Беларусь і беларускую мову» паэт пісаў: «З усіх славянскіх народаў русіны, гэта значыць славяне Пінскай, часткова Мінскай і Гродзенскай губерняў, захавалі найбольшую колькасць славянскіх рысаў. У іх казках і песнях ёсць усё. Пісьмовых помнікаў у іх мала, толькі Літоўскі Статут напісаны іхняй мовай, самай гарманічнай і з усіх славянскіх моў найменш зменёнай» [99, с. 291]. Праз усю творчасць паэта праходзіла ідэя народнасці, авеяная рамантычным пафасам.

А. Міцкевіч адным з першых распачаў творчае асваенне вобразаў і матываў беларускага фальклору. Высока ацэньваючы фальклор Беларусі, ён увасобіў сэнсы і сімвалы вуснай народнай творчасці ў шэрагу сваіх паэтычных твораў. Даследчыкі творчасці паэта па праву называюць яго заснавальнікам беларускай школы ў польскай літаратуры, прадстаўнікі якой услед за А. Міцкевічам адлюстроўвалі багацце беларускай народнай культуры. Дабратворны ўплыў творчасці паэта адчулі таксама многія беларускія творцы XIX ст. (Я. Баршчэўскі, А. Вярыга-Дарэўскі, В. Дунін-Марцінкевіч, В. Каратынскі, А. Рыпінскі, У. Сыракомля і інш.).

Прадстаўніком ранняга беларускага рамантызму з'яўляецца ***Ян Баршчэўскі*** (1794–1851). Нарадзіўся ён у в. Мурагі Полацкага павета ў сям'і збяднелага шляхціца. Адукацыю атрымаў у Полацкай езуіцкай акадэміі, доўгі час працаваў хатнім настаўнікам і гувернёрам у розных месцах. Потым выкладаў

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

грэчаскую і лацінскую мовы ў некалькіх пецярбургскіх установах і займаўся самаадукацыяй. Тут пачаў сур'ёзна займацца прафесійнай творчасцю, выдаваў штогадовы альманах «Незабудка», на старонках якога друкаваліся яго асобныя творы. Падтрымліваў творчыя сувязі з А. Міцкевічам, Т. Лада-Заблоцкім, Р. Падбярэскім і інш.



Літаратурную творчасць мысліцель распачаў з вершаў «Дзеванька» (прысвечаны паненцы Максімавічанцы), «Гарэліца», «Бунт хлопаў», «Рабункі мужыкоў» і «Размова хлопаў». Беларускамоўныя творы пісаліся ім не для друку, таму што мова народа не была ў той час яшчэ літаратурнай. Публікаваліся польскамоўныя творы Я. Баршчэўскага. Вядомы таксама і жывапісныя творы пісьменніка. Ён маляваў пейзажы і карыкатуры, якія карысталіся папулярнасцю сярод мясцовых жыхароў. Яго галоўны твор – празаічны зборнік «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» – з'явіўся ў друку ў 1846 г. Праз тры гады ў Кіеве была надрукавана першая частка зборніка «Проза і вершы» (на польскай мове), у якую ўвайшлі балады, паэма «Жыццё сіраты», аповесць «Душа не ў сваім целе».

Многія творы Баршчэўскага распаўсюджваліся ў рукапісах або вусным шляхам. Баршчэўскаму належыць важная роля ў гісторыі мастацкай культуры беларускага народа. Ствараючы свае творы ў рэчышчы рамантызму, пісьменнік увесь час звяртаўся да народнай культуры. На аснове беларускага эпасу, паданняў і легендаў стварыў шэраг балад («Дзве бярозы», «Русалка-спакусніца» і інш.). У творы «Курганы Паўночнай Беларусі» ён пісаў: «Апавяданні старых пра розныя здарэнні ў іх народных аповесцях, якія перайшлі ад чалавека да чалавека са старадаўніх часоў, былі для мяне гісторыяй гэтае зямлі, характару і пачуццяў беларусаў» [14, с. 143]. На працягу ўсёй творчасці кіраваўся рамантычна-ўзнёслым пачуццём любві да роднага краю. Як рамантык аддаваў перавагу творам, у якіх хацеў пазнаёміць свет з беларускім народам, святочнымі і трагічнымі аспектамі яго жыцця. Літаратуразнавец М. Грабоўскі адзначаў, што ў кожным слове «Шляхціца Завальні…»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чуеш беларуса. Р. Друцкі-Падбярэскі таксама лічыў, што названы твор пранізаны беларускім духам. Менавіта гэтым можна патлумачыць пэўныя праявы старашляхецкага кансерватызму, ідэалізацыі мінулай вольнасці і дабрачыннасці.

## 4.4. Асэнсаванне адметнасцей карціны свету і ментальнасці беларусаў



Адным з першых выразнікаў асаблівасцей нацыянальнай свядомасці беларусаў і працэсу адраджэння беларускай культуры быў ***Францішак Бенядзікт Багушэвіч*** (1840–1900), які нарадзіўся ў фальварку Свіраны Віленскага павета ў сям'і збяднелых шляхціцаў. Вучыўся ў Віленскай гімназіі і Пецярбургскім універсітэце. Удзельнік паўстання 1863–1864 гг. З-за пагрозы рэпрэсій вымушаны быў пераехаць ва Украіну, дзе знаходзіўся да 1884 г. Затым пераехаў у Вільню, нядоўгі час жыў у Кушлянах Ашмянскага павета. Пры жыцці Ф. Багушэвіча за мяжой выйшлі паэтычныя зборнікі «Дудка беларуская» і «Смык беларускі», апавяданне «Тралялёначка». Падрыхтаваны да друку зборнікі «Скрыпка беларуская» і «Беларускія апавяданні Бурачка».

Вытокі яго светапоглядаў і ідэйных перакананняў неабходна шукаць у ідэях вызваленча-дэмакратычнага руху, які быў накіраваны на барацьбу супраць асіміляцыі народаў Расійскай імперыі, пазбаўленых сваіх суверэнных правоў на самастойнае дзяржаўнае і духоўна-культурнае існаванне, адбудову сваёй дзяржавы.

У агульным працэсе этнакультурнай кансалідацыі творчасць Ф. Багушэвіча – пачатак фарміравання нацыянальнай эстэтыкі, у цэнтры якой – эстэтызацыя каштоўнасцей дэмакратычнай ідэалогіі. Паводле паэта, асноватворнай каштоўнасцю ідэалогіі нацыянальнага адраджэння з'яўляецца беларуская мова. У прадмове да зборніка «Дудка беларуская» ён пісаў: «Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю..., а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі» [10, с. 698]. Праблему мовы творца вылучаў як асноўную праблему нацыянальнага жыцця, найважнейшую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

форму выяўлення духоўнасці народа, найбольш устойлівую, галоўную прыкмету нацыі.

Выразны акцэнт у сваіх творах Ф. Багушэвіч рабіў на такой культурнай каштоўнасці, як свабода, якую ён усведамляў найперш як адсутнасць падначалення адных у імя панавання другіх, нямногіх. Свабоду ён уяўляў як натуральны чалавечы стан, дасягненне якога несумяшчальна з тагачаснымі грамадскімі адносінамі.

У шэрагу твораў паэта знайшла выразнае ўвасабленне любоў да роднага краю і зямлі, на якой нарадзіўся і вырас («Мая хата», «Свая зямля» і інш.): «Што чужога прагнуць, то сваё кідаюць, //Я не кіну хаты, хоць мяне вы рэжце. //Не пайду да вас я, хіба ў арэшце» [9, с. 704].

Народ і яго стваральная праца, па меркаванні паэта, – выток і ўвасабленне самой сутнасці жыцця, вышэйшая каштоўнасць быцця. Паняцце «народ» у Ф. Багушэвіча ахоплівае ўсіх людзей працы. У яго гэта не толькі «мужыкі нашы», але ўсе беларусы, беларускі народ.

Асновай, падмуркам творчасці Ф.Багушэвіча быў прынцып рэалізму і народнасці. Кірунак яго дзейнасці вызначала імкненне садзейнічаць уздыму самасвядомасці працоўнага люду. Вырашыць гэту задачу, на думку паэта, было магчыма толькі ў працэсе развіцця ўсіх бакоў духоўнага і матэрыяльнага жыцця народа. Вялікія спадзяванні ў гэтай місіі творца ўскладаў на мастацтва, у тым ліку і на літаратуру. Велізарную сілу ўздзеяння мастацтва ён сцвярджае ў праграмных вершах «Мая дудка» і «Смык».



На канцэпцыі ўнікальнасці і непаўторнасці кожнай чалавечай істоты грунтавалася культуратворчасць ***Янкі Лучыны*** (Івана Люцыянавіча Неслухоўскага) (1851–1897). Паэт-дэмакрат нарадзіўся ў Мінску ў сям'і калежскага асэсара. Вучыўся ў Мінскай гімназіі, на матэматычным факультэце Пецярбургскага ўніверсітэта, механічным аддзяленні Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута. Працаваў нейкі час у галоўных чыгуначных майстэрнях у Тыфлісе, тэхнічным бюро Лібава-Роменскай чыгункі ў Мінску.

Творчая спадчына Я. Лучыны складаецца са шматлікіх вершаў на беларускай, польскай і рускай мовах, а таксама паэм



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Паляўнічыя акварэлькі з Палесся», «Пятруся», «Віялета», «Ганудя», «Андрэй». Асновай яго маральна-эстэтычнай пазіцыі з'яўляюцца гуманістычная накіраванасць, дэмакратызм і арганічнае зліццё яго жыцця з жыццём народа. У спакойных, стрыманых творах паэта ўзаемадзейнічаюць рэалістычныя і рамантычныя пачаткі.

Я. Лучына фактычна стварыў сацыяльна-філасофскі і антрапалагічна абумоўлены тып беларуса XIX ст. з яго тонкім складам душы, псіхалагічнай адметнасцю цэласнай асобы. На думку Я. Лучыны, гераічны характар беларуса з яго паўнатой і напружанасцю жыцця парадніўся ў мірным сутыкненні душы, прыроды і чалавечай духоўнай актыўнасці. Чалавек у творчасці паэта выступае як асноўная субстанцыя, найважнейшая і абсалютная каштоўнасць. У супрацьлегласць А. Шапенгаўэру, які бачыў зло ў чалавечай прыродзе, Я. Лучына шчыра верыў у стваральную сутнасць чалавека. А вылечыць маральна хворае грамадства, па меркаванні паэта, дапаможа навука, святло якой створыць гармонію ў чалавеку, зробіць яго шчаслівым. «Сонца навукі скрозь хмары цёмныя // Прагляне ясна на над нашай ніваю, //І будуць жыць дзеткі патомныя // Добраю доляю – доляй шчасліваю» [106, с. 807].

У станаўленні светапогляду Лучыны вялікае значэнне меў натуралізм як рацыяналізаваная форма светасузірання. Беларуская нацыянальная ідэя ў яго творчасці зводзілася да нацыянальнага светапогляду, да такога разумення сябе ў свеце, калі сваё светабачанне ўспрымаецца натуральным, аптымальным.



Выразнікам працэсу станаўлення нацыянальнай самастойнасці беларускага народа быў ***Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч*** (1808, паводле іншых звестак 1807–1884). Паэт па сацыяльным паходжанні і выхаванні належаў да дробнай шляхты. Бацькі мелі фальварак Панюшкавічы ў Бабруйскім павеце. У 1824 г. ён скончыў Бабруйскае павятовае вучылішча і працягваў адукацыю ў Пецярбургскім універсітэце. З 1827 г. служыў дробным чыноўнікам ва ўстановах

Мінска, а з 1840 г., пакінуўшы службу, пасяліўся ў маёнтку Люцынка непадалёку ад Мінска. Тут разгарнулася яго культурна-асветніцкая, літаратурная дзейнасць.

Пачаткам літаратурнай працы стала драма «Сялянка», 1846 г. («Ідылія», пастаноўка ажыццёўлена ў 1852 г.). У 1850-я гг. напісаў шэраг вершаваных аповесцей і апавяданняў: «Вечарніцы» і «Апантаны», «Купала», «Шчароўскія дажынкі» і інш. Дзейнасць Дуніна-Марцінкевіча разгортвалася на мяжы змены этапаў нацыянальна-вызваленчага руху, у перыяд паступовага ўсталявання новых грамадскіх адносін. Яго светапогляд прасякнуты імкненнем да ўстанаўлення гарманічных узаемасувязей у сферы сацыяльных адносін, у галіне культуры, маралі, нацыянальнага жыцця. Тэндэнцыя ўпарадкавання існуючага, а не пераўтварэння яго выступае дамінуючай у драматурга. Прынцып гарманічнага адзінства ў сферы маралі стаў асновай для абгрунтавання ідэі класавай гармоніі. Дасягненне гармоніі, ён лічыў, можна ажыццявіць шляхам маральнага ўдасканалення, асветніцтва, развіцця нацыянальнай культуры.

Асаблівую ўвагу ў ажыццяўленні гэтай задачы Дунін-Марцінкевіч надаваў літаратуры на беларускай мове, якая была звернута да пана і селяніна, прапаведавала ідэальны стан грамадства, у якім захаваны формы простых і добразычлівых патрыярхальных адносін. Тлумачыўшы свой намер пісаць па-беларуску, ён адзначаў: «Жывучы сярод люду, які размаўляе па-беларуску, прасякнуты яго ладам думак, марачы аб долі гэтага братняга племені, анямеўшага ў маленстве ад невуцтва і цемнаты, вырашыўшы для заахвочвання яго да асветы ў духу яго звычаяў, паданняў і разумовых здольнасцей пісаць на яго ўласнай гаворцы» [99, с. 422]. Шлях да гармоніі творца бачыў у маральным удасканаленні, асветніцтве, развіцці нацыянальнай культуры.

Маральны характар ідэалу, што сцвярджаў драматург, выразна праглядваецца ў пазнейшых творах «Залёты», «Пінская шляхта». Народнае жыццё і селянін як прадстаўнік народа былі аб’ектам пільнай увагі пісьменніка. Сваёй творчасцю Дунін-Марцінкевіч абуджаў гістарычную памяць працоўнага люду, пачуццё грамадзяніна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.5. Праблема самасвядомасці культуры ў беларускай філасофіі XIX ст.

Гістарычная патрэба змен у грамадскім жыцці спарадзіла новы тып мыслення, асэнсавання праблем нацыянальнага самавызначэння беларускага народа. Айчынныя філосафы па-новаму падыходзяць да аналізу розных сфер быцця, у тым ліку і духоўнага, імкнуцца акрэсліць сутнасць дабра, шчасця, сумлення і іншых культурных каштоўнасцей.

Арыгінальную карціну свету ў рамках традыцыйнай філасофскай думкі прапанаваў беларускі логік, псіхолаг ***Анёл Доўгірд*** (1776–1835). Нарадзіўся ў маёнтку Юркаўшчына Мсціслаўскага павета, вучыўся ў мясцовай школе езуітаў, потым у школе піяраў у Дуброўне. Закончыўшы вучобу ў Віленскай акадэміі, выкладаў геаграфію, матэматыку, фізіку, французскую, польскую мовы, паэтыку і рыторыку ў Лідскім, Вількамірскім, Расіенскім, Віцебскім, Шчучынскім, Любяшоўскім піярскіх вучылішчах. У час захопу Вільні войскам Напалеона быў капеланам Віленскай гімназіі і сакратаром мясцовага аб’яднання піяраў. Пасля вызвалення Беларусі ад французаў выконваў абавязкі капелана ў Галоўнай духоўнай семінарыі. У Віленскім універсітэце да яго закрыцця выкладаў логіку, псіхалогію і поўны курс тэарэтычнай і практычнай філасофіі. У гэты перыяд надрукаваў у часопісе «Віленскі дзённік» артыкул пра філасофію кантыянца Ф. Яронскага, манаграфію «Аб логіцы, метафізіцы і маральнай філасофіі». У 1828 г. ён абараніў доктарскую дысертацыю па тэалогіі «Пра цуды».

У творчай спадчыне мысліцеля філасофія і тэалогія спалучаліся ці дапаўнялі адна адну. «А ў саміх творах яны іманентна былі процістаўлены адна адной, хоць сам Доўгірд да гэтага не імкнуўся і толькі ў некаторых выпадках падкрэсліваў, што ў тэалогіі і філасофіі разглядаюцца розныя сферы быцця свету, таму нельга адным падмяняць другое» [122, с. 413]. Пазнанне, а значыць, і логіка, паводле Доўгірда, пачынаюцца з успрымання, якое паступова пераходзіць у сукупнасць іх, а потым ва ўяўленне. Вырашальная роля ў працэсе пазнання належыць даследаванню, бо гэта тое, што фіксуе адносіны рэчаў у нашай свядомасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як і еўрапейскія філосафы (Дэкарт, Гобс, Бэкан, Лок і інш.), Доўгірд быў прыхільнікам механістычнай карціны свету, прымаючы за першаэлементы існуючага так званыя механічныя элементы свету. Філасофію здаровага розуму ён прымяняў у розных галінах даследавання: у метафізіцы, логіцы, маральнай філасофіі, гісторыі. Часткамі яго філасофскай сістэмы з'яўляліся гісторыя філасофіі, логіка, метафізіка (ці тэалогія натуральная), маральная філасофія; кожная з гэтых частак падзяляецца на шмат іншых «сваіх раздзелаў».

Маральная філасофія мысліцеля абапіралася на эўдэманізм і асветніцкую этыку. На яго погляд, мэта маралі заключаецца ў імкненні да шчасця. Таму шляхі да шчасця вызначаюць агульная практычная філасофія і агульныя законы, якімі трэба кіравацца. Філосаф выявіў сутнасць этыкі, якая, па яго меркаванні, вызначае аснову правоў і маральных абавязкаў чалавека. Яна павінна задавальняць чатыры правілы: «быць самадастатковай і не вынікаць ні з аднаго больш высокага правіла; быць дакладнай ці такой, каб з яе вынікалі ўсе астатнія правілы; быць яснай, гэта значыць даваць чалавеку безумоўны крытэрый адрозніваць дзеянні "благачэсныя" ад "неблагачэсных"; быць лёгкай, каб без асаблівых цяжкасцей ёй маглі карыстацца ў канкрэтных выпадках» [122, с. 416]. На думку даследчыкаў, у філасофіі Доўгірда спалучаюцца «розныя этычныя вучэнні – і хрысціянскае, і асветніцкае: "голас сумлення" павінен працаваць ва ўнісон з ведамі, бо без іх нельга прызнаць учынак маральным. Адзінства сумлення і даволі глыбокіх ведаў – вось умова сапраўды маральнага акта. Маральны імператыў Доўгірда гучыць так: "Так рабі заўсёды, каб не было сорамна апавядаць усяму свету пра сваё дзеянне і пра пабуджальныя матывы, якія цябе да яго накіравалі"» [122, с. 416]. Маралі, сцвярджаў філосаф, трэба вучыць з дзяцінства, растлумачваць сувязі маралі і жыццяў у свеце, і тут вельмі прыдатны асабісты прыклад. Трэба з маленства клапаціцца пра душу, не забруджваць яе.

Філасофская сістэма А. Доўгірда, на наш погляд, не згубіла сваёй актуальнасці для сучасных культуролагаў. У ёй вызначаны галоўныя прынцыпы маральнай культуры.

Велізарны ўплыў на фарміраванне айчыннай культуры аказалі ідэі родапачынальніка беларускай рэвалюцыйнай дэмакратыі ***Кастуся Каліноўскага*** (1838–1864). Нарадзіўся ён у в. Мастаўляны Гродзенскага павета ў сям'і дробнага шляхціца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пачатковую адукацыю атрымаў у Свіслацкай гімназіі, у 1856 г. паступіў у Пецярбургскі ўніверсітэт. Тут зблізіўся з рускімі рэвалюцыянерамі-дэмакратамі, якія аказалі на яго вялікі ўплыў. Вярнуўшыся ў 1861 г. на радзіму, К. Каліноўскі ўзначаліў вызваленчы рух у Беларусі.



У 1862 г. К. Каліноўскі разам са сваімі аднадумцамі распачаў выданне першай у гісторыі Беларусі нелегальнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай газеты «Мужыцкая праўда», якая адыграла вялікую ролю ў падрыхтоўцы паўстання 1863 г. Яна ўпершыню на беларускай мове несла рэвалюцыйна-дэмакратычныя ідэі ў асяроддзе сялян, клікала іх на барацьбу з прыгонніцтвам і самаўладдзем.

Друкаваная і рукапісная спадчына К. Каліноўскага складаецца з сямі нумароў газеты, шэрагу рэвалюцыйных інструкцый, заклікаў, загадаў, а таксама некалькіх лістоў. Яе аналіз сведчыць, што рэвалюцыянеры-дэмакраты галоўнай сваёй задачай лічылі барацьбу супраць феадальна-прыгонніцкіх адносін. К. Каліноўскі быў перакананы ў тым, што без знішчэння існуючага несправядлівага грамадзянскага і дзяржаўнага ладу немагчыма стварыць грамадства на новых справядлівых пачатках. Ён марыў раздаць усю зямлю сялянам, адмяніць класавыя, нацыянальныя і рэлігійныя прывілеі і абмежаванні з тым, каб зрабіць галоўным крытэрыем каштоўнасці чалавека працу, ацэньваць асобу па яе рэальных справах і заслугах. Будучы прыхільнікам ідэалаў сялянскага абшчыннага сацыялізму, К. Каліноўскі абараняў у першую чаргу інтарэсы сялянства, змагаўся за перамогу сялянскай рэвалюцыі. Ён верыў, што адзіным сродкам знішчэння самаўладдзя і ліквідацыі памешчыцкага землекарыстання з'яўляецца ўзброенае паўстанне, сялянская рэвалюцыя. Ім была распрацавана праграма гэтай рэвалюцыі, якая прадугледжвала звяржэнне самаўладства, перадачу ўсёй зямлі без усялякага выкупу сялянам, усталяванне народнай, дэмакратычнай дзяржавы.

К. Каліноўскі развіў далей рэвалюцыйна-дэмакратычныя этычныя ідэі. У «Мужыцкай праўдзе» ён востра крытыкаваў мараль эксплуататарскіх класаў, паказаў паразітызм памешчыкаў, норавы і парадкі памешчыцка-буржуазнага ладу, дзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

квітнее шырокая сістэма ліхвярства і хабарніцтва. Паняцце праўды ў К. Каліноўскага было непарыўна звязана з катэгорыяй сумлення, да якога ён часта звяртаўся ў сваіх публіцыстычных творах. Патрыятызм у яго не абмяжоўваўся інтарэсамі толькі адной нацыі. К.Каліноўскі быў перакананы, што свабоды і народнага шчасця можна дасягнуць толькі поплеч з народамі Польшчы і Расіі.

Такім чынам, для этыкі К. Каліноўскага характэрны сацыяльная накіраванасць, глыбокі гуманізм, цвярозая ацэнка жыццёвых сітуацый, барацьба за сцвярджэнне карэнных сацыяльных інтарэсаў працоўнага беларускага народа.

Міжкультурная камунікацыя была цэнтральнай ідэяй філасофіі ***Францішка Савіча*** (1815–1846). Нарадзіўся ён у в. Вяляцічы Пінскага павета ў сям'і ўніяцкага святара. Вучыўся ў Пінскім павятовым вучылішчы, а з 1833 г. – у Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі. Будучы студэнтам 3-га курса, стварыў тайную арганізацыю «Дэмакратычнае таварыства», напісаў для яго статут «Прынцыпы дэмакратызму». Ва ўспамінах Ф. Савіч патлумачыў мэту таварыства: «…маючы моцную волю, можна прынесці карысць братам і можна пакласці яшчэ камень у будынак Айчыны нашай… вырашылі заснаваць аб'яднанне, якое надало б лепшы кірунак нашым калегам, вырвала б іх з бессэнсоўнага, распуснага жыцця, адцягнула ад картаў і прынесла б лепшую мараль і ўстойлівыя прынцыпы» [136, с. 503]. У 1837 г. быў арыштаваны і высланы на Каўказ. У 1841 г. яму ўдалося ўцячы і нелегальна пасяліцца ў мястэчку Янішпаль непадалёку ад Жытоміра. Ён з'яўляецца аўтарам вершаў у форме гутарак і «Успамінаў». Героямі яго твораў былі простыя людзі.

У грамадскай дзейнасці Ф. Савіч кіраваўся ідэяй братэрства ўсяго чалавецтва. На думку змагара за ідэалы свабоды і сацыяльнай справядлівасці, садружнасць суб'ектаў розных культур з'яўляецца адной з найважнейшых духоўных каштоўнасцей, убіраючы ў сябе гістарычны вопыт і асветніцкую ідэю роўнасці. Ф. Савіч адзначаў, што ўсе нацыі роўныя, і ніхто не павінен адчуваць нянавісць адзін да аднаго, нягледзячы на нацыянальныя адрозненні. Ён адмяжоўваўся ад прадстаўнікоў сляпога нацыяналізму і прытрымліваўся дэмакратычных сіл Польшчы і Расіі. Пры распрацоўцы нацыянальна-культурных пытанняў акцэнтаваў увагу на тым, што радніла народы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Расійскай імперыі. Асноўнай сілай у рэвалюцыйна-дэмакратычнай барацьбе ён лічыў сялянства. Гэта адрознівала Ф. Савіча ад рэвалюцыянераў-дваран пачатку XIX ст.

У сваіх творах змагар за ідэалы свабоды крытыкаваў антыгуманны і амаральны характар прыгонніцтва, патрабаваў скасаваць ганебнае права аднаго чалавека панаваць над другімі. У доказе амаральнасці прыгонніцкіх адносін Ф. Савіч абапіраўся на ідэю роўнасці сацыяльных правоў усіх людзей. Але ён не абмяжоўваўся спасылкамі на прыроду чалавека. Ф. Савіч спрабаваў разгледзець матывы паводзін людзей у сувязі з грамадскімі ўмовамі іх існавання, надаючы рашаючае значэнне палітычнаму ладу, культуры, быту, таму ён выказваўся за рэспубліканскі лад замест манархіі.

Для ідэалогіі Ф. Савіча характэрна адданасць ідэалам розуму, свабоды і сацыяльнай справядлівасці. Ён, не выходзячы за межы ідэалістычнай трактоўкі сацыяльных з’яў, выказаў шэраг цікавых ідэй, якія сталі ўзорам для будучага развіцця культуралагічнай думкі ў Беларусі. У ёй закладзены асновы тэорыі дыялогу культур, культурнай талерантнасці, аксеалогіі.

Ідэям вызваленчага руху адпавядала філасофская канцэпцыя ***Юзафа Яжоўскага*** (1798–1855). Вучыўся ў Віленскім універсітэце, на працягу шасці гадоў быў прэзідэнтам таварыства філаматаў. Акцэнтаваў увагу сяброў таварыства на вывучэнні філасофскіх твораў Арыстоцеля, Дэкарта, Русо, Вальтэра, Канта і інш. Знаёмства з філасофіяй ён разглядаў як неабходны этап на шляху да ўнутранага ўдасканалення асобы. Ю. Яжоўскі ў працах І. Канта шукаў адказ на пытанне пра месца чалавека ў свеце і яго прызначэнне. Асновай перамен, якія б прывялі да змены сацыяльных адносін, Ю.Яжоўскі лічыў чалавека, што мае вялікую сілу і магутнасць. Крыніцай гэтай сілы ён лічыў разуменне чалавекам свайго прызначэння.

Філосаф падтрымліваў ідэю развіцця народаў і ўдасканалення грамадства. Пад уплывам І. Канта ён парваў з асветніцкім уяўленнем пра «залаты век» натуральнага стану. Паводле яго меркавання, чым даўжэй грамадства будзе знаходзіцца ў стане дзяцінства, тым больш у будучым яно зазнае бедстваў. Ю. Яжоўскі прызнаваў сувязь маралі і палітыкі, выказваўся за канстытуцыю і прадстаўнічае кіраванне. Ён заяўляў, што народ праз асветніцтва павінен усвядоміць карысць канстытуцыйнага кіравання і шкоднасць дэспатызму.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значны ўклад у развіццё філасофскай думкі ўнёс ***Мацвей Лавіцкі*** (1816–1900), які нарадзіўся ў в. Вашкі Гайнаўскага павета ў дробнашляхецкай сям'і. Адукацыю атрымаў у Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі. За актыўны ўдзел у рэвалюцыйна-дэмакратычным руху ў 1840 г. быў высланы ў Сібір, дзе знаходзіўся да 1858 г. Вярнуўшыся на радзіму, М. Лавіцкі супрацоўнічаў у часопісах «Звязда» і «Навукова-літаратурны дзённік».

Філосаф-дэмакрат асаблівую цікавасць праяўляў да праблемы дзяржавы і маралі. Існуючую феадальна-абсалютысцкую форму палітычнай арганізацыі ён разглядаў як сродак задушэння свабоды і разбэшчвання асобы і на гэтай падставе адмаўляў манархію. Філосаф абгрунтаваў ідэю аб дзвюх формах дзяржавы – дэспатызме і «якабінскім кіраванні». Якабінскую дыктатуру ён лічыў кіраваннем будучага. Зыходным прынцыпам яго філасофскіх поглядаў з'яўлялася «натуральнае права» ў яго антыфеадальным, дэмакратычным разуменні. Феадальна-абсалютысцкі рэжым Лавіцкім адмаўляўся як неадпаведны натуральнай прыродзе і правам чалавека, а існуючыя аграрныя адносіны разглядаліся як адна з галоўных прычын, што перашкаджае дасягненню роўнасці і свабоды.

Неабходнасць новага, больш дасканалага грамадскага парадку абумоўлена, згодна з меркаваннем М. Лавіцкага, заканамерным характарам развіцця грамадства. Змена асобных этапаў у гісторыі чалавецтва такая ж непазбежная, як і натуральны працэс змены ўзроставых перыядаў у жыцці індывідуума. Падтрымліваючы канцэпцыю паслядоўнага і паступовага развіцця, М. Лавіцкі лічыў магчымым і рэвалюцыйны шлях пераўтварэння грамадства. У сваіх працах «Погляд на хрысціянскі свет», «Варыяцыі», «Нарыс духу Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі» ён выказваўся за ўсталяванне прынцыпаў нацыянальнага раўнапраўя і суверэнітэту. М. Лавіцкі быў перакананы, што ў развіцці чалавецтва не павінна быць народаў-паноў і народаў-рабоў, што ўсе народы роўныя, а справа вызвалення Радзімы павінна стаць асабістай справай кожнага чалавека як члена грамадства.

Высокая ацэнка нацыянальна-вызваленчага руху ўтрымліваецца ў творчай спадчыне ***Аляксандра Незабытоўскага*** (1819–1849). Філосаф нарадзіўся ў в. Смалічы непадалёку ад Нясвіжа. Адукацыю атрымаў у прыватных пансіёнах у Вар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шаве і Дэрпцкім універсітэце. Некалькі гадоў (1844–1847) пражыў у Заходняй Еўропе. У Парыжы надрукаваў пяць кніг пра актуальныя грамадска-палітычныя і эканамічныя праблемы тагачаснага грамадства.

У сваіх працах выступаў у абарону дэмакратыі і нацыянальна-вызваленчай барацьбы прыгнечаных народаў Расіі. Таленавіты публіцыст заклікаў народ на барацьбу супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, патрабаваў скасавання паншчыны. У крытычным нарысе «Славянскія літаратуры» ўпершыню выступіў супраць кансерватыўна-рамантычнай плыні ў тагачаснай польскай літаратуры. Пісьменнік падверг крытыцы клерыкальна-месіянскія ідэі А. Міцкевіча. Кніга мемуараў «Мае запіскі» прысвечана паўстанню 1830–1831 гг., у якой ён пазітыўна ацэньвае змаганне за суверэнітэт беларускага, літоўскага і польскага народаў.

## 4.6. Развіццё фалькларыстыкі і этнакультуралогіі апісальнага кірунку

Выспяванне нацыянальнай самасвядомасці пабудзіла прадстаўнікоў розных грамадска-палітычных кірункаў да ўсебаковага вывучэння эканомікі, гісторыі, мовы, культуры Беларусі і асобных яе рэгіёнаў. Багатым дакументальным матэрыялам вызначаюцца працы М. В. Без-Карніловіча («Гістарычныя звесткі пра выдатныя мясціны на Беларусі з дадаткам іншых звестак, якія да яе ж адносяцца»), Т. Нарбута («Гісторыя літоўскага народа»). Матэрыяльную і духоўную культуру асобных рэгіёнаў Беларусі вывучалі К. А. Гаворскі, З. Я. Даленга-Ходакоўскі, Р. А. Падбярэскі, Э. Ф. Плятэр, А. Ф. Рыпінскі, А. П. Сапуноў і інш.




*Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шматграннасцю і фундаментальнасцю вызначаліся працы братоў ***К. П. Тышкевіча*** (1806–1868) і ***Я. П. Тышкевіча*** (1814–1873), заснавальнікаў айчыннай навуковай археалогіі, музеязнаўства, фалькларыстыкі і этнаграфіі. Нарадзіліся яны ў мястэчку Лагойск, атрымалі па тым часе грунтоўную адукацыю. Старэйшы Канстанцін вучыўся ў Полацкім езуіцкім, Забельскім дамініканскім калегіумах, Віленскім універсітэце. Малодшы Яўстафій скончыў гімназію ў Мінску, потым тры гады самастойна папаўняў веды ў бібліятэках Пецярбурга. З мэтай авалодання навуковымі метадамі археалагічных і гістарычных даследаванняў наведаў Данію, Фінляндыю і Швецыю.

Лагойск са старажытным замкам, рассеяныя навокал замчышчы, гарадзішчы і курганы з дахрысціянскай мінуўшчыны выклікалі вялікую цікавасць братоў Тышкевічаў. З вывучэння лагойскіх старажытнасцей і пачалі яны сваю навукова-археалагічную і краязнаўчую дзейнасць.

Не зважаючы на графскі тытул, Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы, а часам і бацька бралі ў рукі рыдлёўкі і з дапамогай навакольных сялян раскопвалі старажытныя курганы. Пераапрануўшыся ў сялянскае адзенне, яны хадзілі па вясковых хатах, каб паслухаць і запісаць народныя песні, легенды, паданні, шчырую гутарку сялян пра побыт, паўдзельнічаць у абрадах. Захопленыя загадкамі старажытнасці, Тышкевічы вырашылі грунтоўна разабрацца ў тыпах гістарычных помнікаў на роднай зямлі і высветліць, ці ёсць у іх сувязь з культурай плямён, што некалі жылі на тэрыторыі Беларусі.

У выніку даследаванняў сотняў крывіцкіх курганоў і аналізу іх пахавальнага інвентару яны першымі адзначылі этнічныя прыкметы – скроневыя кольцы ў жанчын, тым самым далі ключ для вызначэння тэрыторыі рассялення крывічоў. Аналіз пахавальнага інвентару дазволіў зрабіць ім вывады пра гандлёвыя сувязі крывічоў з аддаленымі землямі; пра мясцовае насельніцтва, якое забяспечвала жалезам не толькі сябе, але і вывозіла яго; пра мясцовыя прылады працы і вырабы, што былі на ўзроўні тагачасных вырабаў суседніх краін. А з гэтага вынікала: у часы так званай ваеннай дэмакратыі тут не было таго варварства, пра якое сцвярджалі некаторыя гісторыкі.

Адначасова з археалогіяй Тышкевічы грунтоўна займаліся і фальклорам. Збіралі песні, легенды, прыказкі і прымаўкі, даследавалі абрады. У апісанні памінальных і калядных абрадаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я. Тышкевіч быў адным з першых сярод беларускіх этнографаў. Ён сцвярджаў: «Народная паэзія дае нам магчымасць пазнаць пачуцці народа, а прымаўкі – пазнаёміцца з яго розумам» [152, с. 5].

На аснове ўласных калекцый разам з бацькам Піем Феліцыянавічам Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы стварылі першы на тэрыторыі Беларусі гісторыка-археалагічны музей, які размясціўся ў іх радавым маёнтку ў Лагойску. Толькі ў нумізматычнай калекцыі Тышкевічаў налічвалася 1140 медалёў і манет. Сярод трох тысяч кніг, сабраных у бібліятэцы музея, было каля 500 старажытных помнікаў айчыннага кнігадрукавання. У музеі захоўваліся зброя, вырабы старадаўняй разьбы, багатая калекцыя ручнікоў, сурвэтак, абрусаў. За сваю плённую шматгадовую працу ў галіне гісторыі, археалогіі і этнаграфіі Я. Тышкевіч быў абраны ганаровым членам Расійскай Імператарскай акадэміі навук у Пецярбургу, Каралеўскай акадэміі навук у Стакгольме, Інстытута археалогіі ў Лондане, шматлікіх навуковых айчынных і замежных археалагічных таварыстваў.

Запаветнай марай братоў было стварыць у Вільні грунтоўны музей старажытнасцей на аснове экспанатаў, якія меліся ў Лагойскім археалагічным музеі. У 1845 г. частку лагойскай калекцыі Я.Тышкевіч перавёз у Вільню пад выглядам выстаўкі, якую пасляператварыў у прыватны музей, а потым з дазволу ўлад – у музей, што размясціўся ў старажытнай зале Віленскага ўніверсітэта. Яго выбралі старшынёй гэтага музея. Музей актыўна папаўняўся экспанатамі з Мінска, Магілёва, Віцебска, Оршы, Навагрудка, Крэва, Ліды, Пінска, Браслава, Паставаў і інш. Даследчык ахвяраваў музею сваю бібліятэку (3 тыс. кніг) і разам з братам Канстанцінам – археалагічную калекцыю з 2 тыс. адзінак. За два гады калекцыя музея дасягнула 10 тыс. экспанатаў [152, с. 6]. У 1856 г. музей быў афіцыйна адкрыты. Але казённая адміністрацыя, напалоханая паўстаннем 1863–1864 гг., пачала разглядаць музей як адзін з цэнтраў «польскай інтрыгі», і паводле загаду генерал-губернатара М. Мураўёва ён быў афіцыйна забаронены ў 1864 г. «Шкодныя» экспанаты музея адпраўлялі ў Маскву. Я. Тышкевіч, вызвалены ад усіх пасад, абражаны і зняважаны, у 1865 г. пакінуў Вільню.

Вынікам навуковай дзейнасці К. і Я. Тышкевічаў сталі грунтоўныя манаграфічныя працы «Археалогія ў Літве», «Нашы краі», «Апісанне Барысаўскага павета…», «Пра курганы ў Літве і Заходняй Русі», «Вілія і яе берагі» і інш. Гэтымі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працамі пакладзены пачатак шэрагу айчынных культуразнаўчых навук: археалогіі, музеялогіі, краязнаўства, нумізматыкі, фалерыстыкі і інш.

Значнае месца ў навуковай спадчыне ***Івана Іванавіча Насовіча*** (1788–1877) займаюць фальклорна-этнаграфічныя працы, у якіх сістэматызаваны багаты лексічны, фразеалагічны і фальклорны матэрыял, сабраны ім з розных рэгіёнаў Беларусі. Нарадзіўся этнограф у в. Гразівец Быхаўскага павета (цяпер Чавускі раён). Скончыўшы Магілёўскую гімназію і духоўную семінарыю ў 1812 г., ён працаваў выкладчыкам, інспектарам Аршанскага, выкладчыкам, рэктарам Мсціслаўскага духоўных вучылішчаў, загадчыкам і выкладчыкам Дынабургскай гімназіі, Маладзечанскага і Свянцянскага дваранскіх вучылішчаў. У 1843 г. выйшаў у адстаўку, пераехаў у Мсціслаў і заняўся навуковай працай.

Фалькларыст шмат падарожнічаў па Беларусі, што дало яму магчымасць глыбока пазнаёміцца з народнай творчасцю беларускага народа. І. І. Насовіч цесна супрацоўнічаў з Аддзяленнем рускай мовы і славеснасці Пецярбургскай АН, Археаграфічнай камісіяй, Аддзяленнем этнаграфіі Рускага геаграфічнага таварыства. Па іх прапанове распачаў падрыхтоўку першага гістарычнага слоўніка беларускай мовы «Алфавітны паказальнік старажытных беларускіх слоў, выбраных з Актаў, што адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі», які быў выдадзены ў 1853 г. і адзначаны Увараўскай прэміяй. У ім мовазнавец-лексікограф даў тлумачэнне і лексікаграфічную інтэрпрэтацыю каля 13 тыс. слоў.

Асноўная навуковая праца І. І. Насовіча – тлумачальна-перакладны «Слоўнік беларускай мовы», над якім ён самааддана працаваў 16 гадоў. Слоўнік быў выдадзены ў 1870 г. і адзначаны Дзямідаўскай прэміяй. У яго ўвайшло больш за 30 тыс. слоў, запісаных аўтарам у Магілёўскай, Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай губернях, а таксама выбраных з вуснай народнай творчасці, старабеларускіх пісьмовых помнікаў; усе значэнні слоў і словазлучэнняў раскрываюцца аўтарскімі тлумачэннямі з дакладнымі рускімі эквівалентамі і цытатамі з дыялектнай, фальклорнай ці агульналітаратурнай мовы, часам даецца этымалогія слоў. У 1881 г. быў выдадзены «Дадатак да беларускага слоўніка І. І. Насовіча» (каля 1 тыс. новых слоў). Слоўнік

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да гэтага часу застаецца ўнікальным зборам беларускай лексікаграфіі.

Грунтоўнымі былі і фальклорна-этнаграфічныя працы І. І. Насовіча, галоўная сярод якіх – «Зборнік беларускіх прыказак» (1867), за які аўтару быў прысуджаны залаты медаль Рускага геаграфічнага таварыства. У ім змешчана каля 3,5 тыс. прыказак, прымавак, прыгаворак, праклёнаў, скорагаворак і іншых блізкіх да іх паняццяў. У зборніку раскрываецца сэнс прыказак, выяўляецца іх паходжанне, даюцца эквіваленты з рускай мовы, а ў многіх выпадках і з іншых моў. І. І. Насовічу належаць зборнікі «Беларускія прыказкі і прымаўкі» (1852), «Беларускія прыказкі і загадкі» (1868), «Беларускія песні» (1873). Акрамя 350 тэкстаў песень, фалькларыст змясціў шэраг артыкулаў, прысвечаных песеннай культуры беларусаў. Вядомы рукапіс зборніка «Легенды, паданні, быліны, байкі, анекдоты», які, на жаль, не быў выдадзены. Зборнікі адкрываюцца прадмовамі аўтара, у якіх І. І. Насовіч выказваў свае погляды на беларускую вусна-паэтычную творчасць народа, рабіў фанетыка-граматычныя і лексічныя каментарыі, тлумачэнне пэўных выразаў і слоў.

Аўтарству І. І. Насовіча належыць гістарычна-лінгвістычны нарыс «Аб плямёнах да часоў Рурыка, што засялялі беларускую тэрыторыю», дзе ён даводзіў, што назвы плямён «дрыгавічы», «радзімічы», «крывічы» і іншыя паходзяць ад беларускіх народных слоў.

У творчай спадчыне І. І. Насовіча засведчаны стан і ўзровень развіцця беларускай культуры сярэдзіны XIX ст., данесены нашчадкам моўны скарб нашага народа. У навуковых працах этнографа аналізуюцца і асэнсоўваюцца жыццё і побыт беларусаў, іх духоўны свет і мараль, звычаі і павер'і, практычная



мудрасць і багацце вуснай паэтычнай творчасці.

Вядомым даследчыкам духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў з'яўляўся ***Адам Ганоры Кіркор*** (1819–1886). Этнограф нарадзіўся ў в. Слівіна Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні ў сям'і небагатага беларускага шляхецкага роду. Вучыўся ў Магілёўскай і Віленскай гімназіях. У юнацкім узросце заці-

кавіўся фальклорам і этнаграфіяй. Падчас навучання ў гімназіі напісаў этнаграфічны артыкул «Рэшткі язычніцкіх звычаяў на Беларусі», які быў надрукаваны ў зборніку лепшых сачыненняў выхаванцаў Беларускай навучальнай акругі.

Распачатая ў 1839 г. літаратурна-навуковая дзейнасць А. Кіркора працягвалася ўсё жыццё. Так, знаходзячыся ў Вільні на казённай службе, ён адначасова пісаў тэатральныя рэцэнзіі, выдаваў літаратурна-навуковыя альманахі «Радэгаст», «Віленскі альманах», «Памятныя кніжкі Віленскай губерні», «Віленскі зборнік», дзе друкаваліся таксама і яго працы па гісторыі і этнаграфіі Беларусі і Літвы. Пэўны час з'яўляўся рэдактарам газеты «Виленский вестник». Рэдагуючы перыядычныя выданні, ён пашырыў у іх неафіцыйны аддзел, змясціў багатыя матэрыялы па гісторыі і статыстыцы Віленшчыны, у тым ліку яе беларускіх паветаў. Выдатны знаўца гісторыі і этнаграфіі Беларусі і Літвы, А. Кіркор стварыў гурток беларускіх, польскіх і літоўскіх літаратараў і дзеячаў культуры, які існаваў на працягу 1850–1860-х гг. Да яго належалі або падтрымлівалі з ім сувязі пісьменнікі У. Сыракомля, В. Каратынскі, В. Дунін-Марцінкевіч, А. Вярыга-Дарэўскі, А. Адынец, І. Ходзька і іншыя, гісторыкі М. Маліноўскі і Я. Тышкевіч, журналіст В. Пшыбыльскі, кампазітар С. Манюшка і інш. Гуртkoўцы вывучалі, папулярызавалі гісторыю, матэрыяльную і духоўную культуру беларусаў, выяўлялі гісторыка-этнічную самастойнасць і самабытнасць беларускага этнасу.

Асабліва каштоўнымі для беларускай культуралагічнай навукі былі яго працы «Аб этнаграфічнай мяжы літоўскай і славянскай народнасцей у Літве» (1857), «Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню» (1857–1859), «Літоўскае Палессе» (1882) і «Беларускае Палессе» (1882), у якіх паказаны этнічная і сацыяльна-бытавая характарыстыка тыпаў беларуса, яго высокія духоўна-маральныя якасці, падкрэсліваецца самастойнасць беларускай мовы, яе багатыя пісьмовыя традыцыі. У «Этнаграфічным поглядзе на Віленскую губерню» змешчаны больш за 100 беларускіх песень, 200 прыказак, слоўнік беларускай мовы, выказана вялікая павага да духоўнага жыцця працоўнага народа.

У фальклорна-этнаграфічных працах А. Кіркор праанaлізаваў велізарны масіў беларускай вусна-паэтычнай творчасці на матэрыяле Ашмянскага, Лідскага, Вілейскага, Нясвіжскага,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Свянцянскага паветаў: песні, прыказкі, прымаўкі, паданні, гульні і танцы. Праўда, у духоўнай культуры навуковец перавагу аддаваў міфалагічным крыніцам і недаацэньваў яе сацыяльна-бытавы кантэкст [73].

Як уладальнік уласнай друкарні А. Кіркор выдаў у ёй шэраг навуковых і мастацкіх кніг, у тым ліку творы Ю. І. Крашэўскага, У. Сыракомлі, Ю. Ляскоўскага і інш. Пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. А. Кіркор, страціўшы магчымасць працаваць у Вільні, быў вымушаны перабрацца ў Пецярбург, а потым і ў Кракаў. Тут ён працягваў навуковую і журналісцкую дзейнасць, займаўся археалагічнымі даследаваннямі ў Галіцыі, чытаў публічныя лекцыі па літаратуры і археалогіі. З прац гэтага перыяду асаблівую цікавасць маюць «Нарысы сучаснай рускай літаратуры» (1873), дзе падкрэсліваліся яе дэмакратычныя традыцыі, роля ў ёй В. Бялінскага і М. Чарнышэўскага, «Пра літаратуру братніх славянскіх народаў» (1874). У іх, па нашым меркаванні, найлепш праявіўся цэласны, пазбаўлены прымітыўнага этнаграфізму погляд на беларускую культуру як на шматвяковую гістарычную з'яву ў адзінстве пісьмовых і вусна-паэтычных, фальклорных відаў творчасці.

А. Кіркор не меў спецыяльнай адукацыі, у апошні перыяд навуковай дзейнасці працаваў у неспрыяльных умовах, але паспеў зрабіць нямала ў розных галінах навукі і культуры. Як даследчык духоўнай культуры беларускага народа, літаратуразнавец, выдавец і збіральнік літаратурна-культурных сіл ён адыграў прыкметную ролю ў станаўленні навукі аб беларускай культуры.



Каштоўнай крыніцай для вывучэння культуры, народнай творчасці і побыту беларусаў з'яўляюцца навуковыя працы ***Мікалая Якаўлевіча Нікіфароўскага*** (1845–1910). Нарадзіўся ён у в. Вымна Веліжскага павета Віцебскай губерні ў сям'і панамара вясковай царквы. Сям'я жыла бедна, але маці імкнулася даць двум сынам і дачцэ пачатковую адукацыю ў прыватнай сельскай школе. Працягваў адукацыю М. Нікіфароўскі ў Віцебскім духоўным вучылішчы. У 1861 г. яго як лепшага вучня з духоўнага вучылішча перавялі ў Віцебскую духоўную семінарыю. Пасля заканчэння семінарыі ў 1867 г. ён

быў прызначаны выкладчыкам народнага вучылішча ў в. Лоўжа. Большую частку жыцця М. Нікіфароўскі працаваў у навучальных установах Віцебска, але вышэй настаўніка падрыхтоўчага класа гімназіі ці семінарыі яго кар'ера не пайшла.

Сустрэча ў Віцебску з П. Шэйнам была паваротнай у жыцці М. Нікіфароўскага. Знакаміты даследчык культуры абудзіў у яго цікавасць да побыту і творчасці беларускага народа. Больш за 20 гадоў супрацоўнічаў ён з П. Шэйнам у якасці карэспандэнта. М. Нікіфароўскі даслаў яму значную колькасць фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў, але ў выданнях П. Шэйна змешчана толькі іх частка, астатняе перададзена ў архіў Акадэміі навук. М. Нікіфароўскаму фальклорна-этнаграфічныя зборнікі П. Шэйна ў значнай ступені абавязаны сваёй навуковай каштоўнасцю.

З 1890-х гг. М. Нікіфароўскі пачаў выступаць з самастойнымі навуковымі працамі па этнаграфіі, фальклоры і гісторыі Віцебшчыны. Апублікаваў каля 20 даследаванняў, датычных матэрыяльнай і духоўнай культуры, вусна-паэтычнай творчасці беларусаў. Этнаграфічны аддзел Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі пры Маскоўскім універсітэце, сябрам якога з 1890 г. стаў беларускі фалькларыст, пачаў выдаваць серыю нарысаў М. Нікіфароўскага пад агульнай назвай «Нарысы Віцебскай Беларусі». Асноўную ўвагу ў гэтай працы даследчык надаваў характарыстыцы становішча розных груп насельніцтва Віцебшчыны (старцаў, музыкаў і інш.). «Нарысы…» складаліся з васьмі частак і былі завершаны ў 1899 г.

М. Нікіфароўскі таксама аўтар «Нарысаў простанароднага жыцця-быцця ў Віцебскай Беларусі і апісанне прадметаў ужытку (этнаграфічныя звесткі)» (1895) – першага буйнейшага даследавання матэрыяльнай культуры і вытворчай дзейнасці сельскага насельніцтва XIX ст., у прыватнасці сялян Віцебшчыны.

Капітальнай працай М. Нікіфароўскага лічыцца даследаванне «Простанародныя прыкметы і павер'і, прымхлівыя абрады і звычаі, легендарныя паданні пра асобы і мясціны» (1897), у якой змяшчаюцца 2307 народных прыкмет, павер'яў, забабонаў, абрадаў, звычаяў, сродкаў народнай медыцыны і ветэрынарыі, а таксама сказы і паданні пра асілкаў [125].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З фальклорных прац М. Нікіфароўскага заслугоўвае ўвагі першы буйны зборнік беларускіх частушак «Беларускія песні-частушкі», матэрыял для якога ён збіраў у 1860–1905 гг. У ім навуковец прасочвае працэс развіцця частушачнага жанру з сярэдзіны XIX да пачатку XX ст. Таксама М. Нікіфароўскі з'яўляецца ўкладальнікам зборнікаў «Простанародныя прыкметы» (1897), «Простанародныя загадкі» (1898), «Нячысцікі: Збор простанародных у Віцебскай Беларусі паданняў пра нячыстую сілу» (1907) і інш.

Сваімі даследаваннямі па гісторыі, фальклоры і этнаграфіі М. Нікіфароўскі стварыў трывалы грунт айчыннага культуразнаўства, паказаў самабытнасць культуры, якую за тысячагоддзі стварыў беларускі этнас.



Упершыню шырокія колы еўрапейскай грамадскасці ў навукова-папулярнай форме пазнаёміў з побытам і вуснай народнай творчасцю беларусаў ***Павел Міхайлавіч Шпілеўскі*** (1823–1861). Нарадзіўся ён у в. Шыпілавічы Бабруйскага павета ў сям'і святара. Вучыўся ў Мінскай духоўнай семінарыі і Пецярбургскай духоўнай акадэміі. Акадэмію скончыў са званнем кандыдата багаслоўя, быў прызначаны выкладчыкам славеснасці ў Варшаўскае павятовае духоўнае вучылішча. У 1853 г. пераехаў у Санкт-Пецярбург, дзе са снежня 1853 г. працаваў пакаёвым наглядчыкам у Галоўным педагагічным інстытуце, а з красавіка 1855 г. – настаўнікам у школе пры экспедыцыі складання дзяржаўных папер.

У раннія гады ў яго выявілася цікавасць да культуры роднага краю. Яшчэ будучы студэнтам акадэміі, П. Шпілеўскі склаў слоўнік беларускай мовы і пачаў збіраць матэрыял для работы «Беларускія народныя павер'і», дзе змясціў цікавыя звесткі з гісторыі мястэчак і вёсак Беларусі, апісанні побыту, павер'яў, абрадаў і звычаяў беларускага народа, становішча сельскай гаспадаркі і прамысловасці. Адзначыў сумленнасць, сціпласць, кемлівасць і працавітасць беларускага селяніна, самабытнасць беларускай мовы. Запісаў і надрукаваў паданне пра Мянеска, пра паходжанне Менска.

У 1853 г. П. Шпілеўскі наладзіў экспедыцыю па Беларусі, якая доўжылася тры гады. За гэты час ён наведаў шмат



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

населеных пунктаў Беларусі. Вынікам экспедыцыі была праца «Путешествие по Полесью и Белорусскому краю», якая ў форме гісторыка-этнаграфічных і публіцыстычных нарысаў была надрукавана ў часопісе «Современник». У іх вучоны прыводзіў культурна-гістарычныя звесткі пра вёскі, мястэчкі, якія наведаў падчас падарожжа, апісваў адзенне, жыллё, абрады, святы жыхароў гэтых рэгіёнаў [180]. У экспедыцыі пісьменнік збіраў таксама звесткі пра беларускую мову з мэтай напісаць граматыку, але не закончыў гэтую працу.

Надзвычай багаты этнаграфічны матэрыял змяшчаецца ў працы «Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических ее сказках», якую надрукаваў у 1853–1856 гг. У яе аўтар уключыў шмат перапрацаваных і перакладзеных на рускую мову беларускіх казак, шырока і грунтоўна адлюстраваў абрады, рытуалы, звычаі беларусаў, змясціў многія дзясяткі народных песень і іншых вусных твораў. Пяру П. Шпілеўскага належаць працы «Описание посольства Льва Сапеги в Московию» (1850), «Белорусские пословицы» (1853), «Дожинка, белорусский обычай. Сценическое представление» (1857), шэраг артыкулаў пра тэатральнае і літаратурнае жыццё Расіі.

У сваіх навукова-папулярных творах П.Шпілеўскі праводзіў і адстойваў ідэю самабытнасці і самастойнасці беларускай мовы, народнай культуры, адзначаў высокія маральныя якасці сялян як суб’ектаў створанай імі культуры, выявіў высокі культуратворчы патэнцыял беларускага народа.



Разнастайны этнакультурны матэрыял прадстаўлены ў навуковых працах ***Паўла Васільевіча Шэйна*** (1826–1900). Этнограф і фалькларыст нарадзіўся ў Магілёве. Вучыўся ў нямецкім вучылішчы пры лютэранскай царкве Св. Міхаіла ў Маскве. З 1851 г. працаваў выкладчыкам у розных павятовых вучылішчах і гімназіях Тулы, Віцебска, Калугі і інш. З 1881 г. жыццё і навуковая дзейнасць звязана з Пецярбургам.

Этнаграфічна-фальклорную дзейнасць П. Шэйн пачаў у сярэдзіне 1850-х гг. Збіральніцкая праца ажыццяўлялася мэтанакіравана і сістэмна ў адпаведнасці са створанай ім «Праграмай для збірання помнікаў народнай творчасці». Дарэчы, гэта адна з першых спецыяльных фаль-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

клорных праграм у Расіі. Яе навуковец разаслаў беларускім карэспандэнтам, сярод якіх былі А. Я. Багдановіч, Я. Ф. Карскі, Ю. Ф. Крачкоўскі, Я. Лучына, М. Я. Нікіфароўскі і інш.

Асновай прац П.Шэйна былі матэрыялы, якія ён сабраў падчас некалькіх паездак па Беларусі. Фальклорна-этнаграфічныя апісанні калядных, масленічных, купальскіх, жніўных, вясельных, пахавальных абрадаў беларусаў з песнямі і фальклорнымі тэкстамі даволі поўна прадстаўлены ў кнізе «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю» (1887–1902). У кнізе змешчаны таксама міфалагічныя і бытавыя казкі пра жывёл, легенды, паданні, прыказкі, прымаўкі, звесткі пра матэрыяльную культуру беларусаў (жыллё, адзенне, ежу, заняткі і інш.).

П. Шэйн з’яўляецца складальнікам зборнікаў «Рускія народныя песні» (1870), «Беларускія народныя песні» (1874), «Велікарос у сваіх песнях, абрадах, звычаях, вераваннях, казках, легендах і да т.п.» (1898–1902). У яго працах змешчана шмат унікальных твораў вуснай народнай творчасці, большасць з іх запісаны з захаваннем асаблівасцей беларускай мовы.



Гісторыі этнаграфіі, фальклору, мове і літаратуры прысвечаны разнажанравыя працы ***Аляксандра Карлавіча Ельскага*** (1834–1916). Нарадзіўся ён у сям’і памешчыка Карла Ельскага ў маёнтку Замосце, які знаходзіўся непадалёку ад вёскі Дудзічы Ігуменскага павета (цяпер Пухавіцкі раён). Сям’я была вельмі культурная. Старэйшы яго брат Міхаіл стаў вядомым у свой час музыкантам, кампазітарам. У 1852 г. Аляксандр скончыў Мінскую класічную гімназію. Прымаў удзел у Крымскай вайне. У чыне паручніка выйшаў у адстаўку і пасяліўся ў в. Замосце, дзе пасля смерці бацькі атрымаў у спадчыну фальварак.

Літаратурна-публіцыстычную дзейнасць пачаў яшчэ ў маладосці. Пісаў ён на беларускай, рускай і польскай мовах. Добра ведаў французскую і нямецкую мовы. У 1860-х гг. надрукаваў шэраг артыкулаў у «Виленским вестнике» аб становішчы беларускіх сялян. А. Ельскі супрацоўнічаў таксама з рэдакцыямі «Геаграфічнага слоўніка Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краін», «Вялікай усеагульнай ілюстраванай энцыкла-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

педыі», для якіх напісаў звыш дзесяці тысяч гістарычна-краязнаўчых артыкулаў пра Беларусь. Так, у дадзеных выданнях змешчаны «Слоўца аб старым Заслаўі», «Пра беларускую гаворку», «Нататкі аб падарожжы па Мінскай губерні», «Слоўца аб матэрыялах, якія служаць для даследавання беларускай гаворкі, этнаграфіі і літаратуры» і інш. Пяру А. Ельскага належыць некалькі вершаваных і празаічных твораў на беларускай мове – «Сынок» (1895), «Выбіраймася ў прочкі» (1896), «Слова аб праклятай гарэлцы і аб жыцці і смерці п’яніцы» (1900). Усе гэтыя творы вытрыманы ў духу асветніцтва.

Краязнавец пераклаў на беларускую мову першую частку паэмы «Пан Тадэвуш» А. Міцкевіча, якая выйшла ў Львове ў 1893 г., а ў 1908 г. у Вільні выдаў зборнік «100 прымавак, загадак, прыдумак і гавэндаў для пажытку беларускага (крывіцкага) народа». Шэраг прац напісана на польскай мове: «Беларуская літаратура і бібліяграфія», «Гістарычныя звесткі пра радзівілаўскую ткальню паясоў у Слуцку», «Гістарычныя звесткі пра фабрыку шкла і аздобных люстэрак ва Уруччы Радзівілаўскім на Літве», «Нарыс гісторыі мясцовай гаспадаркі ў супастаўленні з народнымі звычаямі ад першабытных да астатніх часоў» і інш. [52].

У 1864 г. этнограф заснаваў у Замосці краязнаўчы музей, дзе сабраў каля 60 карцін і 2 тыс. гравюр, малюнкаў і эскізаў, бібліятэку з 10 тыс. кніг, сярод якіх былі старадрукі, хронікі, матэрыялы паўстанняў і вайны 1812 г., лісты Адама Міцкевіча, Тадэвуша Касцюшкі, а таксама іх асабістыя рэчы. Там захоўваліся каштоўныя калекцыі фарфору, шкла, слуцкіх паясоў. Багаты збор А. Ельскага прыводзіў у Замосце гісторыкаў і этнографаў, пісьменнікаў і краязнаўцаў. Тут у свой час пабывалі славутыя тады вучоныя браты Катарбінскія, Здзяхоўскі, Федароўскі, Талька-Грынцэвіч, пісьменнік Вайсянгоф.

Разнастайная культуратворчасць А. Ельскага высока ацэньвалася яго сучаснікамі. Яго працамі і музейным зборам карысталіся вучоныя Кракаўскай акадэміі, супрацоўнікі музея Румянцава ў Маскве, члены Маскоўскага этнаграфічнага таварыства. Прызнаннем яго падзвіжніцкай навуковай дзейнасці было прысваенне краязнаўцу звання члена-супрацоўніка Вольнаэканамічнага таварыства ў Пецярбургу, правадзейнага члена камісіі гісторыі і мастацтва філалагічнага аддзялення Акадэміі навук у Кракаве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У XIX ст. беларускія вучоныя зрабілі важкі ўклад у вывучэнне не толькі беларускай культуры, але сістэмна даследавалі культурныя працэсы ў іншых рэгіёнах свету. Так, І. Дамейка ўзбагаціў сваімі даследаваннямі навуку Аргенціны, Бразіліі, Перу, Уругвая, Чылі. М. Судзілоўскі вывучаў культуру Гавайскіх астравоў, Кітая, Японіі.



Першае сістэмнае апісанне сацыякультурнага жыцця кітайскага і японскага народаў, іх паўсядзённай культуры, традыцый, звычаяў, карціны свету, рэлігіі ажыццявіў ***Іосіф Антонавіч Гашкевіч*** (1814–1875). Нарадзіўся знаўца ўсходняй культуры ў Мінскім павеце ў сям'і святара. Пасля заканчэння прыходскай школы адукацыю працягваў у Мінскай духоўнай семінарыі. У ліку двух яе лепшых выпускнікоў быў накіраваны на вучобу ў Санкт-Пецярбургскую духоўную акадэмію.

У 1839 г. ён быў залічаны ў склад 12-й рускай духоўнай місіі ў Пекін, дзе знаходзіўся дзевяць з паловай гадоў. Дапытлівы малады чалавек не абмяжоўваў дзейнасць толькі рэлігійнымі абавязкамі. І. Гашкевіч грунтоўна вывучаў духоўную і матэрыяльную культуру кітайцаў, іх мову, звычаі і абрады, захапляўся прыродазнаўствам. Так, сабраная, апісаная і сістэматызаваная І. Гашкевічам унікальная калекцыя насякомых захоўваецца ў Заалагічным музеі Расійскай акадэміі навук. Даследчык праводзіў сістэматычныя астранамічныя і метэаралагічныя назіранні, вывучыў, акрамя кітайскай, некалькі ўсходніх моў – манчжурскую, карэйскую, мангольскую, японскую. Матэрыялы, якія І. Гашкевіч сабраў у Кітаі, паслужылі падставай для серыі публікацый у пецярбургскіх зборніках навуковых прац. Былі апублікаваны артыкулы аб шаўкаводстве, вырабе тушы, бялілаў, румян. Асобныя матэрыялы, дасланыя з Кітая, публікаваліся ў выданнях Галоўнай фізічнай абсерваторыі ў Санкт-Пецярбургу, а таксама ў часопісах «Морской сборник» і «Северная пчела». Шэраг артыкулаў вучоны надрукаваў у «Трудах членов российской духовной миссии в Пекине».

У «кітайскі цыкл» увайшлі артыкулы «О шелководстве (перевод с китайского)», «Императорское, или благовонное, пшено (скороспелое) юй-дао-ми, или сень-дао-ми», «О разведе-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

нии шань-янь. Discoracea alat'l (картофель)», «О китайских счетах». Значная частка нарыса «Хонкон, из записок русского путешественника» (першы гістарычны нарыс у расійскай гістарыяграфіі аб англійскай калоніі на тэрыторыі Кітайскай імперыі) прысвечана паказу сацыяльна-культурнага жыцця ў Ханконе (Ганконгу). Акрамя негацыянтаў і агентаў Еўропы і Азіі, якія займаліся гандлем, там было нямала прадстаўнікоў мастацтва і навукі. Пры ганконгскіх клубах існавалі добрыя бібліятэкі. Значную асветніцкую дзейнасць ажыццяўляла аддзяленне Лонданскага Азіяцкага таварыства, якое праводзіла пасяджэнні і друкавала навукова-папулярныя паведамленні.

Навуковы свет высока ацаніў працы І. Гашкевіча. Так, прафесар Брант, дырэктар Заалагічнага музея, у гутарцы з вучоным з захапленнем гаварыў: «А теперь я хочу сказать несколько слов о ваших статьях. Великолепно! Вы, сударь, пропагандируете полезные для России труды китайских ученых. Это большое подспорье для ведения культурного сельского хозяйства» [43, с. 44].

Пасля вяртання з Кітая І. Гашкевіча як лінгвіста, які валодае ўсходнімі мовамі, запрасілі на службу ў Міністэрства замежных спраў драгаманам (перакладчыкам) у Азіяцкі дэпартамент. У якасці перакладчыка ён з місіяй адмірала Пуцяціна чатыры гады знаходзіўся ў Японіі і сем гадоў з'яўляўся першым расійскім консулам у Краіне ўзыходзячага сонца. За гэты час вучоны сабраў вялікую калекцыю флоры і фаўны Індакітая, Філіпін, Карэі і Японіі. Знаходжанне ў Японіі І. Гашкевіч скарыстаў для стварэння першага Японска-рускага слоўніка, які ўключаў 10 тыс. лексічных адзінак. Слоўнік надрукавалі ў 1857 г., за што аўтар атрымаў Дзямідаўскую прэмію ад Імператарскай Акадэміі Навук з уручэннем залатога медаля. Для таго часу слоўнік быў сапраўдным дасягненнем лінгвістыкі. Ім карысталіся пры вывучэнні японскай мовы не толькі ў Расіі, але і ў краінах Еўропы. Лінгвістычныя пошукі І. Гашкевіча сістэматызаваны ў працы «О корнях японского языка» (1899) [39].

Усе намаганні рускага консула былі накіраваны на зближэнне славянскай і японскай культур. І. Гашкевіч і служачыя консульства вучылі японцаў фатаграфіі, шыццю адзення еўрапейскага крою, выпечцы хлеба, прыгатаванню малочных прадуктаў і саленняў, марской справе і медыцыне, артылерыі і фартыфікацыі. Важнае значэнне консул прыдаваў распаўсюдж-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ванню ў Японіі рускай мовы. З гэтай мэтай у Хакадатэ была створана консульская школа, дзе навучалася да дзесяці японскіх хлопчыкаў. Руская школа існавала таксама ў Нагасакі. Каб палегчыць авалоданне рускай мовай, была складзена Руска-японская азбука. Да новага японскага года 100 экзэмпляраў азбукі былі падораны хакадацкім дзецям. Пазней у рускіх школах Японіі выкладалі не толькі супрацоўнікі консульства, але і былыя яе вучні. Варта адзначыць, што на рускай мове ў хакадацкай школе выкладалі матэматыку, геаграфію і гісторыю. У выніку такіх спрыяльных умоў руская мова стала адной з самых распаўсюджаных замежных моў у Хакадатэ.

Трансляцыю ўсходнеславянскай культуры ў Японіі здзяйсняла і праваслаўная місія. У складзе консульства былі два святары: протаіерэй В. Е. Махаў і дыякан І. В. Махаў. Служыў В. Махаў каля года, а пасля з’ехаў у Расію. Консул даслаў у Пецярбург ліст з просьбай неадкладна адправіць у Японію праваслаўнага святара. Змяніў яго ў 1861 г. епіскап Мікалай (у свецкім жыцці Іван Дзмітрыевіч Касаткін). Да гэтага часу консульства завяршыла будаўніцтва ў Хакадатэ рускай праваслаўнай царквы, якая называлася Саборам Уваскрэсення. Мастак Кандрат Ільіч Карсалін, які паходзіў з Беларусі, стварыў для гэтай царквы два абразы «Дзяцінства Хрыста» і «Узнясенне Гасподне». Іосіф Антонавіч усебакова спрыяў дзейнасці айца Мікалая. У яго карыстанне была аддадзена багатая бібліятэка І. Гашкевіча. Агульнымі намаганнямі атрымалася абудзіць цікавасць многіх японцаў да праваслаўнага вучэння. Так, праваслаўную веру прынялі настаўнік Савабэ Такума (Павел), урач Сакаі Анцуноры (Іаан) і інш. У 70-я гг. XIX ст. у Токіа было адкрыта катэхізатарскае вучылішча для падрыхтоўкі японскіх прапаведнікаў праваслаўя. У 1882 г. адбыўся першы выпуск мужчынскай семінарыі, у якой, акрамя рускіх прадметаў, выкладалася японская гісторыя, кітайскія класічныя навукі. Стары Запавет і Новы Запавет, логіку, псіхалогію выкладалі на рускай мове. У гэты час адкрылася і жаночая семінарыя, дзе, акрамя рэлігійнай і агульнай адукацыі, дзяўчынкі вучыліся музыцы, спевам, вядзенню хатняй гаспадаркі. Іосіф Антонавіч не толькі шчодра дзяліўся з японцамі сваімі ведамі, не толькі імкнуўся далучыць іх да найбагацейшай духоўнай культуры рускага народа, але і сам старанна даследаваў культурны вопыт японскага этнасу. Ён быў асвет-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нікам і вучоным, які цалкам прысвяціў сябе гэтай справе. Дыпламатам сабрана ўнікальная бібліятэка, якая па сённяшні час захоўваецца ў Інстытуце Усходазнаўства РАН (Пецярбургскі філіял). У ёй налічваецца 1346 японскіх ксілаграфаў і старадрукаў, 47 лістоў геаграфічных карт. Сабраныя пісьмовыя помнікі сведчаць пра markdown-рознабаковасць інтарэсаў вучонага: геаграфія, этнаграфія, гісторыя, мова, прычым не толькі японская, але і народаў суседніх краін – Кітая і Карэі.



Выяўленнем агульных асноў усходняй і заходняй культур займаўся ***Адольф Міхайлавіч Янушкевіч*** (1803–1857). Нарадзіўся даследчык у Нясвіжскім замку. Хлопчыка хрысціў Міхал Геранім Радзівіл. Першыя гады дзяцінства прайшлі ў в. Усаве недалёка ад Капыля, якую яго бацькі трымалі ў заставе (маёмаснае забеспячэнне атрыманай пазыкі, звязанае з перадачай даўжнікам маёмасці крэдытору з правам далейшага выкупу). У 1821 г. Міхал Янушкевіч набыў ва ўласнасць в. Дзягільна недалёка ад Койданава (Дзяржынскі раён). Пачатковую адукацыю Адольф атрымаў у дамініканскай школе ў Нясвіжы. Затым яго ўзяў на выхаванне бяздзетны сваяк, падкаморы Міхал Янушкевіч, уладальнік в. Краснае ў Ямпальскім павеце Падольскай губерні, і паслаў у 1819 г. у Вінніцкую гімназію. Пасля яе заканчэння А. Янушкевіч паступае ў 1821 г. у Віленскі ўніверсітэт і 3 гады слухае курсы на літаратурным аддзяленні.

Ва ўніверсітэце А. Янушкевіч быў заўважаны прагрэсіўна настроенымі прафесарамі і студэнтамі, заслужыў іх прызнанасць і павагу за тое, што ўмеў цаніць розум, меў схільнасць да літаратурнай творчасці і навукі. Падчас навучання ва ўніверсітэце была апублікавана яго сентыментальная «дума» пад назвай «Мелітон і Эвеліна» і шэраг вершаў. А. Янушкевіча вельмі высока шанаваў знакаміты гісторык і грамадскі дзеяч Іаахім Лялевель, які ўзначальваў кафедру ўсеагульнай гісторыі. Прафесар быў ідэйным натхняльнікам студэнтаў, якія ва ўніверсітэце стварылі тайныя таварыствы філаматаў і філарэтаў. Іх члены выступалі супраць афіцыйнай палітыкі расійскіх улад у галіне адукацыі, супраць абмежавання культурна-асветніцкіх



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

функцый навукі, асуджалі дэспатызм, прыгонніцтва, феадальна-абсалютысцкія парадкі. У недалёкай будучыні лёс прывядзе прафесара і яго таленавітага вучня на дарогу рэвалюцыйнай барацьбы, дэвізам якой будзе «За нашу і вашу свабоду!».

Завяршыўшы ўніверсітэцкі курс, А. Янушкевіч вяртаецца ў Камянец, дзе яго абіраюць дэпутатам Галоўнага Суда Ізбы Цывільнай. На гэтай пасадзе 24-гадовы малады чалавек праявіў сябе найлепшым чынам. За добрасумленнасць, справядлівасць, высокі прафесіяналізм улады ўзнагародзілі яго пахвальным лістом, а грамадскасць выказала жаданне абраць дэпутатам на наступныя 3 гады. Але здароў’е не дазволіла апраўдаць высокі давер грамадскасці. Урачы настойліва рэкамендавалі прайсці курс лячэння ў Карлсбадзе, куды ён і паехаў вясной 1829 г. У Еўропе А. Янушкевіч прабыў 20 месяцаў. Акрамя Карлсбада наведаў шэраг гарадоў Італіі, Саксоніі, Чэхіі, Паўднёвай Францыі, дзе блізка сышоўся з І. Гётэ, А. Міцкевічам, А. Адзінцом. А. Міцкевіч у паэме «Дзяды» спісаў з А. Янушкевіча сімвалічны вобраз вязня Адольфа, які прарочыў у турме, што зняволеных там філаматаў і філарэтаў чакае Сібір і казематы.

Летам 1830 г., завяршыўшы курс лячэння, А. Янушкевіч вяртаецца на радзіму і ўключаецца ў арганізацыйную дзейнасць па фарміраванні паўстанцкіх атрадаў. За ўдзел у паўстанні быў асуджаны на ссылку ў казахскія стэпы, дзе 30-гадоваму вязню лёсам было наканавана чвэрць стагоддзя пражыць далёка ад горача любімай радзімы. Васемнаццаць гадоў пражыў ссыльны сярод казахаў. У перыяд зняволення актыўна вывучаў культуру народаў Сярэдняй Азіі, ажыццяўляў кампаратыўны аналіз беларускай і ўсходнеазіяцкай культуры. Вынікі даследавання выкладзены ў кнізе «Zywot Adolfa Januszkiewicza i jego Listy ze stepów kirgizkich», што ў 1861 г. была выдадзена ў Парыжы, а ў 1875 г. – у Берліне [56]. На рускую мову кніга была перакладзена толькі ў 1966 г. у Алма-Аце. Ёсць і казахскі пераклад дадзенай працы [185]. Гэта кніга і шэраг іншых дакументаў дазваляюць нам рэканструяваць навукова-асветніцкую дзейнасць славутага суайчынніка, дух і волю якога не зламалі амаль невыносныя ўмовы 25-гадовага жыцця ў ссылцы.

Безумоўна, шматгадовая скрупулёзная даследчая праца над рознымі літаратурнымі тэкстамі дазволіла назапасіць шмат тэарэтычных ведаў у галіне не толькі гуманітарных, але і прыродазнаўчых навук. Падчас ссылкі А. Янушкевіч шмат ван-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

драваў, вывучаў гісторыю качавых народаў, іх побыт, запісваў казахскія легенды, паданні і песні. Нягледзячы на слабае здароў'е, адсутнасць элементарных умоў вандроўнік знаходзіў сілы, каб пасля цяжкіх пераходаў занатаваць цікавыя эпізоды з жыцця казахскага народа. Свае ўражанні ён перадае ў лістах на радзіму і занатоўвае ў «Дарожным дзённіку». Літаратурна апрацаваныя назіранні ўтрымліваюць цікавыя звесткі па геаграфіі, біялогіі, гісторыі, этнаграфіі, фальклоры этнасаў Сярэдняй Азіі.

«Дарожны дзённік» А. Янушкевіча з'яўляецца важнай крыніцай па гісторыі Казахстана XIX ст. Чытач і сучасны даследчык знойдзе ў ім апісанне складанага працэсу далучэння казахаў Старэйшага жуза да Расіі, аналіз сацыяльна-эканамічнага становішча казахаў, адметнасцей народнага мастацтва. Менавіта дзякуючы навукова-асветніцкай дзейнасці А. Янушкевіча Еўропа даведалася аб сапраўдным жыцці і побыце казахаў, перамяніла тыя стэрэатыпы, паводле якіх казахі ўяўляліся дзікімі ордамі, з абмежаваным інтэлектам.

Такім чынам, у XIX ст. у Беларусі ўзнікаюць этналогія і фалькларыстыка як новыя апісальныя навукі. Да 1870-х гг. пераважаў міфалагічны кірунак. Яго прадстаўнікі асноўны акцэнт рабілі на духоўную культуру: песні, паданні, абрады, вераванні – і разглядалі яе як старажытны светапогляд, ідэалізавалі міфалогію. Навукова-даследчая праца пачынальнікаў этналогіі і фалькларыстыкі спрыяла развіццю інтарэсу да беларускай культуры, абуджэнню этнічнай самасвядомасці. З канца XIX ст. у этналогіі паступова фарміруецца эвалюцыйны падыход. Акрамя збору і апісання артэфактаў нацыянальнай культуры, робяцца спробы іх тэарэтычнага абагульнення і аналізу. Разам з даследаваннем аб'ектаў матэрыяльнай і духоўнай культуры пачынаецца асэнсаванне з'яў і феноменаў сацыяльнай культуры народа. На падставе аналізу разнастайных фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў навукоўцы прыходзяць да высновы, што беларусы належаць да асобай і самастойнай этнічнай супольнасці. Сацыядынаміка беларускай культуры разглядаецца як працэс развіцця ад простых да складаных форм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 5

# РАЗНАСТАЙНАСЦЬ КУЛЬТУРНЫХ ПРАКТЫК І ІХ КАНЦЭПТУАЛЬНАЕ АСЭНСАВАННЕ Ў ХХ ст.

## 5.1. Асноўныя тэндэнцыі сацыякультурнага развіцця

ХХ ст. увайшло ў гісторыю сусветнай цывілізацыі як эпоха найвялікшых сацыяльных катаклізмаў, што кардынальна паўплывалі на лёс многіх народаў. Навука стала яшчэ больш магутным фактарам развіцця постіндустрыяльнага грамадства. Як адзінка знешняга геапалітычнага ўзаемадзеяння заходняя культура іманентна імкнецца да мадэрнізацыі, абнаўлення. Стварэнне квантавай механікі, тэорыі рэлятыўнасці, кібернетыкі, ядзернай энергетыкі, геннай інжынерыі, камп’ютарнай і лазернай тэхнікі, мноства іншых навукова-тэхнічных навін у корані змянілі навуковую карціну свету і яе ўвасабленне не толькі ў навуковых тэорыях, але і ў разнастайных творах культуры. У індустрыяльным грамадстве склаўся і прынцыпова іншы тып вытворчасці, распаўсюджання і захавання культуры. Культура стала найбольш дынамічным, нават у параўнанні з тэхнікай, кампанентам цывілізацыі. Вытворчасць, перадача, захаванне і спажыванне інфармацыі ажыццяўляюцца на прынцыпова іншай тэхналагічнай аснове, што прыводзіць да карэнных змен у культуры.

Аптымістычнае светаадчуванне, абумоўленае поспехамі навуковай думкі, увасобленай у сусветнай прамысловасці і тэхніцы, паслужыла асновай для ўзнікнення характэрнага для чалавека ХХ ст. адчування касмічнасці свайго быцця. Касмізм – унікальная, найцікавейшая з’ява сучаснай культуры. Значэнне яго пачынае ўсведамляцца толькі зараз, у трэцім тысячагоддзі. У працах вядомых касмістаў У. І. Вярнадскага, А. Л. Чыжэўскага, Тэйяра дэ Шардэна былі пастаўлены прынцыпова новыя праблемы касмічнай ролі чалавецтва, адзінства чалавека і космасу, маральна-этычнай адказнасці падчас касмічнай экспансіі чалавецтва [161].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яшчэ адна акалічнасць адрознівае XX ст. ад папярэдніх. Буйныя адкрыцці мінулага рэдка былі звязаныя з развіццём тэхнікі. Яны існавалі аўтаномна нават тады, калі апярэджвалі прагрэс тэхнікі. Тэхніка таксама развівалася незалежна ад навукі. Часам яны развіваліся паралельнымі курсамі, часам разыходзіліся. У XX ст., асабліва ў другой палове, яны немагчымыя адна без адной. Навука стала моцным фактарам развіцця тэхнікі, тэхніка стала навукаёмістай, і абедзве абумовілі далейшы прагрэс вытворчасці. З'яўляюцца атамная энергетыка, генная інжынерыя, пачынаецца засваенне касмічнай прасторы. Усё гэта не без падстаў прымушае называць гэты час стагоддзем тэхнікі, якая пранікае ва ўсе сферы чалавечага існавання, закранае ўсе формы жыццядзейнасці чалавека.

Можа здацца, што бурнае развіццё тэхнікі ў XX ст. уяўляе сабой урачыстасць розуму і можа стаць асновай шчасця і ажыццяўлення шматвяковых летуценняў чалавецтва. На жаль, гэта далёка не так. Тэхнічны прагрэс, даруючы чалавеку матэрыяльныя выгоды, адымае ў яго чалавечы пачатак, ператвараючы яго спачатку ў прыдатак машыны, а затым у абслугоўваючы элемент машыннай вытворчасці. Чалавецтва, якое марыла аб вызваленні ад знясільваючай працы, у чарговы раз выпрабавала расчараванне: яно стала рабом стандарту, які адняў у чалавека нават яго святая святых – непаўторнасць пачуццяў. Х. Артэга-і-Гасет у кнізе «Паўстанне мас» паказвае працэс абязлічвання мас, які адбываецца ў свеце вытворчасці, абсталяванай новай тэхнікай [127].

Тэхніка ў XX ст. з жорсткасцю выявіла сябе ў Першую сусветную вайну, калі свет быў узрушаны ўжываннем атрутных рэчываў і іншых форм масавага знішчэння. Другая сусветная вайна з яшчэ большай выразнасцю паказала адваротны бок развіцця навукі і тэхнікі для чалавецтва.

Ідэя панавання чалавека над прыродай паставіла грамадства на мяжу экалагічнага крызісу. Перад сусветнай культурай паўсталі жыццёва важныя задачы: як захаваць і палепшыць якасць прыроднага асяроддзя пры нарастаючым навукова-тэхнічным уздзеянні на яго? Якімі павінны быць якасці чалавека ў новай экалагічнай сітуацыі? Як ліквідаваць адчужэнне чалавека ад прыроды? Яшчэ І. Кант адзначаў, што абавязкі мы маем толькі ў дачыненні да людзей. Нежывое падпарадкавана нашай самаўпраўнасці. І абавязкі ў дачыненні да жывёл з'яўляюцца такімі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

толькі ў той ступені, у якой яны трапляюць у кола нашых інтарэсаў.

У ХХ ст. намеціўся антрапалагічны паварот у сацыяльна-гуманітарных навуках. Пошукі сэнсу чалавечага існавання паказалі, что вера ў прагрэс, у бесперапыннае ўдасканаленне чалавецтва, якая натхняла мысліцеляў апошніх двух стагоддзяў, сябе не апраўдала. Чалавецтва не рухалася наперад, яно ні на крок не наблізілася да ўвасаблення дабра і розуму ў чалавечых адносінах. Вучоныя імкнуліся знайсці рэцэпты выратавання чалавека ў самім чалавеку, у таямніцах яго цела, душы, розуму. У сваіх навуковых пошуках яны зыходзілі з ідэі, што творчая і плённая справа адбываецца ў глыбіні чалавека, і гэта глыбока ўнутраная справа і ёсць сапраўдная, асноўная справа чалавека, якая заключаецца ў дзейнасным сцвярджэнні сябе ў вытоках жыцця.

У індустрыяльным грамадстве фарміруецца новая форма сацыяльнай культуры – масавая культура.

Праз сродкі масавай інфармацыі масавая культура пранікае ў самыя шырокія слаі насельніцтва, самыя аддаленыя куткі як у рамках нацыянальных супольнасцей, так і ў глабальных маштабах.

Сучасная культуралогія дае мноства азначэнняў гэтай з'яве, бо масавая культура займае вялікую і ўсё больш значную культурную прастору ў свеце. На Захадзе яе называюць папулярнай культурай і індустрыяй забаў, спажывецкай і камерцыйнай культурай. Яе з'яўленне і функцыянаванне часта звязваюць з развіццём сродкаў масавай інфармацыі, з задачамі прапаганды пэўнай ідэалогіі, пэўных каштоўнасцей. Сапраўды, масавая культура мае ўсе гэтыя якасці. Было б несправядліва зводзіць яе толькі да забаў або кітчу, якія не валодаюць ні мастацкай, ні эстэтычнай каштоўнасцю. Ступень яе папулярнасці звязана не толькі з модай або даступнасцю амаль для кожнага члена грамадства. Тэарэтыкі адзначаюць, што масавая культура, якая з'явілася ў ЗША, з самага пачатку існавала ў інтарэсах бізнесу і толькі потым стала ўдзельнічаць у іншых сферах культурнага жыцця людзей. У Еўропе яна спачатку выступала як апазіцыя афіцыйнай культуры, што была звязана з дзяржавай, ёй прапагандавалася і распаўсюджвалася праз навучальныя ўстановы і царкву.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Больш поўнае тлумачэнне масавай культуры прапаноўваюць тыя культуролагі, якія разглядаюць яе функцыі. Адны тэарэтыкі бачаць яе сутнасць у тым, што яна здзяйсняе стандартызацыю духоўнай дзейнасці чалавека, калі ігнаруецца і нават «вымываецца» індывідуальная непаўторнасць кожнага. Іншыя адзначаюць, што ёй уласціва імкненне надаваць элементам культурнай сістэмы пэўнасць, аднастайнасць, абсалютнае падабенства, калі ўсе бакі жыцця нівеліруюцца. Масавая культура арыентуецца на самыя нізкія густы і адзнакі, таму папулярнае мастацтва не толькі дае плоскую і абмежаваную карціну жыцця, але прыводзіць людзей да звужэння эмоцый і інтарэсаў. З дапамогай масавага мастацтва мы прыстасоўваемся да норм жыцця непаўналетніх. Французскі сацыёлаг Э. Марэн лічыць, што для масавай культуры характэрны сістэма «зорак», рэклама, эротыка, гвалт, хэпі-энд.

Свет масавай культуры вялізны: ён уключае рэкламу, шоу-бізнес, папулярныя кіна- і тэлежанры, такія як мюзікл, эратычны фільм, фільм жахаў, вестэрн, гангстарскі фільм, некаторыя літаратурныя формы, напрыклад дэтэктыўны раман, і інш. Мэтай большасці відаў і жанраў масавай культуры становіцца адыход ад практычных патрэб штодзённасці. Масавая культура прапаноўвае ілюзію зносін, дачынення людзей да чалавечай супольнасці. У канчатковым рахунку гэтыя ілюзіі ашукваюць не толькі спажыўцоў, але і стваральнікаў масавай культуры.

Самыя розныя аўтары адзначаюць, што ўнутраным, істотным бокам масавай культуры з'яўляецца памкненне да пошласці – паніжэння ідэалу да ўзроўню ўсярэдненасці, звычайнасці, штодзённасці. Нездарма нават на радзіме масавай культуры яе называюць часта псеўдакультурай або контркультурай.

«Экранная культура» як праява маскульту – інтэрнацыянальная па сваёй прыродзе. Яна лёгка перасякае нацыянальна-дзяржаўныя межы, не мае моўных абмежаванняў, таму хутка авалодвае свядомасцю разнамоўнай аўдыторыі «без перакладчыка». Даступнасць і разнастайнасць культурнай інфармацыі прыводзяць, з аднаго боку, да значнай аднароднасці сусветна-інфармацыйнай прасторы, да зняцця ўсіх перашкод, а з другога – да вялікай разнастайнасці інфармацыі, з якой чалавек можа выбраць тое, што адпавядае яго арыентацыі. Здольнасць хуткага і надзейнага пераносу інфармацыі на любыя адлегласці робіць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

магчымым радыкальную дэцэнтралізацыю важнейшых працэсаў, у тым ліку вытворчасць, кіраванне, адукацыю.

Абазначанае кола праблем сацыякультурнага развіцця сусветнай супольнасці, у тым ліку і беларускага грамадства, знайшла сваё адлюстраванне ў гісторыі беларускай культуралагічнай думкі.

## 5.2. Спецыфіка актаў самапазнання і самасвядомасці беларускай культуры

На мяжы XIX–XX стст. важным фактарам светапогляднага развіцця беларускай свядомай інтэлігенцыі з'яўляюцца ідэі рэвалюцыйных дэмакратаў. Іх праграма побач з патрабаваннямі сацыяльна-палітычнага зместу прадугледжвала патрабаванне свабоднага развіцця нацыянальнай культуры. Пазіцый рэвалюцыйнай дэмакратыі прытрымліваліся ў дарэвалюцыйны перыяд Я. Купала, Я. Колас, Цётка і інш.

Рэвалюцыя 1905–1907 гг. стварыла спрыяльныя ўмовы для далейшага паглыблення зместу дэмакратычна-вызваленчага руху. М. Багдановіч у артыкуле «Беларускае адраджэнне» пісаў: «1905 год з'яўляецца вехай, якая пазначае пункт пералому ў гісторыі беларускага адраджэння. Падзеі, звязаныя з гэтым годам, стварылі ў народных масах імкненне разабрацца ў наватарскім жыцці і выклікалі ліхаманкавы попыт на ідэалагічныя каштоўнасці» [20, с. 274]. Ідыёлагі нацыянальна-культурнага адраджэння атрымалі магчымасць абапірацца на нацыянальныя перыядычныя выданні. Газеты «Наша доля», «Наша ніва», «Наша хата» з'яўляліся своеасаблівымі інстытутамі беларускай культуры. На іх старонках адбывалася станаўленне беларускай літаратурна-мастацкай крытыкі, публіцыстыкі, фалькларыстыкі, у тым ліку і культуралогіі. Перадавая інтэлігенцыя, якая гуртавалася вакол названых перыядычных выданняў, распачынае непасрэдную практычную дзейнасць па трансляцыі каштоўнасцей беларускай культуры. Так, В. Ластоўскі ў 1910 г. выдаў першую навуковую працу на беларускай мове «Кароткая гісторыя Беларусі». У 1913 г. у Віцебскім аддзяленні Маскоўскага археалагічнага інстытута А. П. Сапуноў пачаў чытаць лекцыі па гісторыі Беларусі. У гэтым вучэбным курсе разглядаліся і некаторыя праблемы беларускай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На хвалі нацыянальна-вызваленчага руху ў Пецярбургу ўзнік Беларускі навукова-літаратурны гурток студэнтаў Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта. Галоўная заслуга гуртка – навуковае абгрунтаванне неабходнасці правядзення сістэматычных даследаванняў беларускай мовы, літаратуры і культуры. Пры садзейнічанні С. Вянгерава, Я. Карскага, А. Пагодзіна, Е. Раманава, Б. Эпімах-Шыпілы і іншых навукоўцаў гуртkoўцы распрацавалі комплексную праграму даследавання матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. На пасяджэннях гуртка студэнты абмяркоўвалі свае навуковыя даклады: «Фанетычная транскрыпцыя беларускіх твораў», «Беларуская народная музыка», «Вывучэнне старажытных гістарычных помнікаў і ахова даўніны» і інш. Такім чынам, выкладчыкі і студэнты ўпершыню выказалі думку пра стварэнне асобнай навукі аб беларускай культуры.

Інтарэс да комплекснага даследавання беларускай культуры ўзмацніўся ў гады Першай сусветнай вайны (1914–1918), Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. Шматлікія беларускія палітычныя партыі ў барацьбе за дзяржаўную незалежнасць, адзінства нацыі, нацыянальна-культурнае адраджэнне імкнуліся абаперціся на першыя культуралагічныя канцэпцыі, выпрацаваныя беларускімі тэарэтыкамі (М. Багдановіч, А. Цвікевіч і інш.).

З утварэннем БССР беларусазнаўства працягвае развівацца і атрымлівае дзяржаўную падтрымку. Першыя кіраўнікі беларускай дзяржавы (З. Жылуновіч, У. Ігнатоўскі, А. Чарвякоў) нацыянальнай палітыцы надавалі важнае значэнне. Асноўны яе змест вызначалі пытанні развіцця беларускай мовы. У пачатку 1920-х гг. беларуская мова, дзякуючы намаганням Я. Коласа, Я. Купалы, М. Гарэцкага, М. Чарота, М. Лынькова, К. Чорнага і інш., набыла ўсе галоўныя прыкметы, уласцівыя літаратурнай мове. Арганізацыяй беларусазнаўства займаўся Народны камісарыят асветы БССР.

Значную ролю ў станаўленні эксплiцытных культуралагічных ведаў адыграў Інстытут беларускай культуры, які існаваў у 1922–1929 гг. Даследаванні ў ім набылі комплексны характар. Яго супрацоўнікі К. Міцкевіч (Я. Колас), І. Луцэвіч (Я. Купала), С. Некрашэвіч, Я. Лёсік, І. Замоцін, М. Байкоў, А. Ясінскі і інш. распрацоўвалі беларускую навуковую тэрміналогію, мэтанакіравана і паслядоўна выяўлялі асаблівасці матэрыяль-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най і духоўнай культуры беларусаў. Вынікі навуковых даследаванняў публікаваліся ў «Запісках аддзела гуманітарных навук» Інбелкульта, часопісах «Наш край», «Полымя», «Маладняк».

Паралельна з навуковым развівалася і асветнае беларусазнаўства. Так, у 1920/21 акадэмічным годзе ў школах быў уведзены прадмет «Беларусазнаўства». Арганізоўваліся курсы і гурткі. Напрыклад, у 1924–1927 гг. у Мінску дзейнічалі Вышэйшыя курсы беларусазнаўства, на якіх рыхтавалі настаўнікаў і лектараў.

У 1930-х гг. беларусазнаўства пачынае паступова згортвацца. Дзяржаўнае і партыйнае кіраўніцтва СССР пачало праводзіць у жыццё дэнацыяналізаваную савецкую ідэалогію, згодна якой абмяжоўвалася культурна-асветніцкая дзейнасць у савецкіх рэспубліках. Паступова прыхільнасць да беларускай культуры трансфарміравалася ў поўную сваю процілегласць і стала прычынай сталінскіх рэпрэсій. Так, беспадстаўна былі абвінавачаны ў нацыянал-дэмакратызме А. Баліцкі, П. Галавач, М. Гарэцкі, У. Дубоўка, А. Дудар, Я. Дыла, В. Ластоўскі, Я. Лёсік, С. Некрашэвіч, Я. Пушча, А. Цвікевіч і інш. Ішло скарачэнне беларускамоўных школ, выдання беларускіх кніг і газет.

Непрыхільныя адносіны да нацыянал-дэмакратызму захаваліся аж да 1990-х гг. З узнікненнем незалежнай Рэспублікі Беларусь каштоўнасці ідэалогіі нацыянал-дэмакратызму былі замацаваны ў нацыянальным заканадаўстве. Важнае значэнне ў фарміраванні дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры набылі законы «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб адукацыі», «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь». Апошнім заканадаўчым дакументам беларуская мова абвяшчалася дзяржаўнай. Адначасова ў законе адзначалася, што ўсебаковае развіццё і функцыянаванне беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця прадугледжвае клопат аб свабодным развіцці і выкарыстанні ўсіх нацыянальных моў. На падставе названага закона ў рэспубліцы была распрацавана Дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў. Праграма была заклікана садзейнічаць не толькі адраджэнню і развіццю мовы і культуры беларускага этнасу, але і свабоднаму развіццю і роўнаму выкарыстанню родных моў суб’ектамі іншых нацыянальнасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, можна сцвярджаць, што на працягу XX ст. завяршыўся працэс фарміравання беларускай культуралогіі з рознымі яе галінамі (фундаментальнай, прыкладной, гістарычнай і інш.). На стыку гуманітарных навук узнікаюць філасофія культуры, сацыялогія культуры, лінгвакультуралогія, культураметрыя, музейная культуралогія.

## 5.3. Навуковыя канцэпцыі культуры першай паловы XX ст.

Працы, прысвечаныя вывучэнню культуры як асобай формы арганізацыі жыцця чалавека, з'явіліся ў шэрагу еўрапейскіх краін прыкладна ў 50-я гг. XIX ст. У гэты перыяд пачынае фарміравацца самастойная навука, якая даследуе гістарычнае развіццё культуры і ажыццяўляе параўнальны аналіз розных яе тыпаў, вывучае заканамернасці яе функцыянавання і структурнай арганізацыі, узаемадзеяння з прыроднымі ўмовамі. У канцы XIX ст. ужо былі заснаваны кафедры ва ўніверсітэтах і нават створаны цэлыя інстытуты, галоўнай задачай якіх было вывучэнне культур у гістарычным і структурна-функцыянальным аспектах. Для сістэматызацыі, абагульнення канкрэтна-эмпірычных даных выкарыстоўваліся розныя метады, прыёмы, ствараліся тэорыі культур, культуралагічныя канцэпцыі, якія ўпарадкоўвалі разрозненыя звесткі ў адзіную цэласную карціну.

Да пачатку XX ст. сфарміраваліся розныя кірункі ў вывучэнні культур: эвалюцыянісцкі, дыфузіянісцкі, біялагічны, псіхалагічны, функцыянальны і інш. Моцны ўплыў на станаўленне гэтых кірункаў аказалі заходнееўрапейскія вучоныя Г. Спенсер, Э. Тайлар, А. Басціян, Л. Г. Морган, Ф. Рэтцэль, Л. Фрабеніус, Ж. А. Гібіно, М. Лацарус, Г. Лебан, Г. Тард, З. Фрэйд, Г. Рахейм, К. Юнг, Б. Маліноўскі, А. Р. Радкліф-Браўн, Э. Дзюркгейм і інш. Значны ўклад у развіццё тэорыі культурна-гістарычнага працэсу ўнеслі расійскія культуролагі гэтага часу М. Я. Данілеўскі, П. А. Сарокін, М. А. Бярдзяеў, А. А. Патабня і інш.

У гэты перыяд узнікаюць і першыя культуралагічныя канцэпцыі беларускіх мысліцеляў, літаратурная творчасць і грамадска-палітычная дзейнасць якіх развівалася ў межах нацыя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нальна-культурнага адраджэння. Аўтарамі шэрагу важнейшых палажэнняў канцэпцыі дзяржаўна-культурнага будаўніцтва былі пераважна класікі беларускай літаратуры. Ужо на гэтым пачатковым, стартавым этапе нацыянальна-культурнага адраджэння яны пункцірна ў метадалагічным плане імкнуліся акрэсліць яго сутнасць як заканамернага культурна-гістарычнага развіцця пэўных рэгіёнаў царскай Расіі, у якіх большасць насельніцтва складалі этнічныя беларусы.

### 5.3.1. Асэнсаванне дэтэрмінантаў нацыянальна-адраджэнскага руху Антонам і Іванам Луцкевічамі

***Антон Іванавіч Луцкевіч*** (1884–1942) нарадзіўся ў г. Шаўляй Ковенскай губерні ў шляхецкай сям'і. У 1902 г. скончыў Мінскую гімназію. Вучыўся на фізіка-матэматычным факультэце Пецярбургскага ўніверсітэта, юрыдычным факультэце Дэрпцкага ўніверсітэта. Адзін з заснавальнікаў у 1903 г. Беларускай рэвалюцыйнай грамады. Арыштаваны ў Мінску ў 1904 г. за распаўсюджванне партыйнай літаратуры; выпушчаны з пазбаўленнем права пакідаць горад. У лютым 1906 г. перайшоў на нелегальнае становішча і пераехаў у Вільню. Першы артыкул апублікаваў у 1906 г. у № 1 газеты «Наша доля». Супрацоўнічаў з выдавецтвам «Нашай нівы». Пасля акупацыі Вільні ў 1915 г. нямецкімі войскамі ўзначаліў Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Адзін з выдаўцоў газеты «Гоман». У 1915 г. з братам, паэтэсай Цёткай (А. Пашкевіч) і інш. заснаваў Беларускую сацыял-дэмакратычную работніцкую групу, узначаліў Беларускі народны камітэт.



У перыяд існавання Беларускай народнай рэспублікі займаў шэраг пасад ва ўрадзе БНР. У канцы сакавіка 1919 г. перад пагрозай польскай акупацыі Заходняй Беларусі выехаў у Берлін, дзе знаходзіўся амаль год. З лютага 1920 г. пражываў у Вільні. Там аднавіў выданне газеты «Наша ніва» і выдаў зборнікі «Наша ніва» і «Памяці Івана Луцкевіча». Выкладаў у Віленскай беларускай гімна-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

зіі. У ліпені 1921 г. заснаваў Беларускую школьную раду, якая пазней злілася з Таварыствам беларускай школы. Пасля ўтварэння ў 1925 г. Беларускай сялянска-работніцкай грамады працаваў у яе рэдакцыйным камітэце. У 1930 г. польскія ўлады забаранілі дзейнасць Беларускага выдавецкага таварыства, якім кіраваў Антон Луцкевіч. У 1931 г. звольнены з работы ў Віленскай беларускай гімназіі. Пасля ўступлення ў Заходнюю Беларусь Чырвонай арміі яго запрасілі на сход беларускай інтэлігенцыі. 30 верасня 1939 г. арыштаваны савецкімі ўладамі ў Вільні; этапіраваны ў Мінск. Рашэннем Асобай нарады пры НКУС СССР 14 чэрвеня 1941 г. прыгавораны да 8 гадоў зняволення. Памёр у зняволенні ў 1942 г.

Акрамя грамадска-палітычнай дзейнасці А. І. Луцкевіч займаўся плённай навукова-публіцыстычнай дзейнасцю. Першы артыкул «Што будзе?» надрукаваў у газеце «Наша доля» ў 1906 г. У артыкулах і нататках крытыкаваў аграрную і нацыянальную палітыку царызму. Так, у артыкуле «Краёвае становішча» выказваўся за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне беларускага народа, асуджаў нацыяналізм. У артыкуле «Эканамічная эвалюцыя і беларускі рух» вызначыў фактары развіцця беларускага вызваленчага руху, які звязаў з развіццём капіталістычных адносін і станаўленнем нацыянальнай буржуазіі. Шэраг прац прысвечаны гісторыі БРГ і БСГ «Польская акупацыя на Беларусі» і «За дваццаць пяць гадоў (1903–1928)» [105]. Даследаваў гісторыю нарадавольніцкага руху, выступаў з дакладамі і рэфератамі па гэтым пытанні. Як літаратурны крытык А. І. Луцкевіч напісаў шэраг літаратурна-крытычных прац («Нашы песняры», «Адбітае жыццё», «Пуцяводныя ідэі літаратуры», «Вязніца Адама Міцкевіча» і інш.). Ён з’яўляецца таксама аўтарам лінгвістычных прац [79]. Ім распрацаваны цыкл лекцый па фанетыцы і этымалогіі. У 1917 г. выдаў працу «Як правільна пісаць па-беларуску», у 1918 г. – «Беларускі правапіс». А. І. Луцкевіч пераклаў на беларускую мову працу М. Доўнар-Запольскага «Асновы дзяржаўнасці Беларусі», «Элементарную алгебру» А. Кісялёва і падручнік В. Остэрлёфа і Я. Шустэра «Сусветная гісторыя. Ч. 2. Сярэднявечная гісторыя», Новы Запавет і Псалтыр. Асобныя яго артыкулы і нататкі прысвечаны жыццю і творчасці М. Багдановіча, А. Бурбіса, М. Гарэцкага, Ядвігіна Ш., Ф. Багушэвіча, Я. Коласа, Я. Купалы, Цёткі, К. Сваяка і інш. [142].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Адным з пачынальнікаў і ідэйных кіраўнікоў беларускага культурна-асветніцкага і грамадска-палітычнага руху быў ***Іван Іванавіч Луцкевіч*** (1881–1919). Беларускі дзеяч культуры нарадзіўся ў г. Шаўляй Ковенскай губерні ў шляхецкай сям'і. Яго бацька Ян Герман прымаў актыўны ўдзел у паўстанні Кастуся Каліноўскага. Адукацыю І. Луцкевіч пачынаў у Лібаўскай і Мінскай гімназіях. У 1902–1905 гг. адначасова навучаўся на юрыдычным факультэце Пецярбургскага ўніверсітэта і ў Маскоўскім археалагічным інстытуце.

У студэнцкія гады далучыўся да нацыянальна-вызваленчага руху. Быў адным з заснавальнікаў Беларускай рэвалюцыйнай грамады. За палітычную дзейнасць у 1903 г. трапіў у астрог. Актыўна ўдзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях 1905 г. у Мінску. Пад пагрозай арышту выехаў у пачатку 1906 г. у Вільню. Тут прычыніўся да выдання беларускіх газет «Наша доля», «Наша ніва», «Гоман», стварэння кнігавыдавецкіх суполак «Наша хата» і Беларускае выдавецкае таварыства. Па яго ініцыятыве ў Вільні быў адкрыты Беларускі клуб, вакол якога гуртавалася аматарская драматычная група пад кіраўніцтвам Францішка Аляхновіча. У 1919 г. у выніку намаганняў І. Луцкевіча ў Вільні адбылося адкрыццё першай беларускай гімназіі, дзе ён выкладаў краязнаўства і беларусазнаўства. Змагар за незалежную Беларусь з'яўляецца аўтарам шэрагу навукова-публіцыстычных прац па гісторыі, мастацтве, кніжнай культуры Беларусі, аповесці «Дым і попел». Ім уведзены ў навуковы ўжытак помнік старабеларускай кніжнай культуры XVI ст. мусульманскі аль-кітаб, напісаны па-беларуску, але арабскай графікай.

Браты Луцкевічы былі аднымі з першых, хто зразумеў неабходнасць дзяржаўнай незалежнасці Беларусі. Выступалі за аднаўленне ў Беларусі царкоўнай уніі дзеля паяднання рэлігійнага і грамадска-палітычнага рухаў у адзіным нацыянальна-адраджэнскім працэсе. Іх светапогляд эвалюцыяніраваў ад канцэпцыі краёвай аўтаноміі да абвяшчэння БНР у яе этнаграфічных межах. Адметнасцю іх поглядаў была культурная талерантнасць, якая праявілася ў адстойванні раўнапраўных адносін Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы і Польшчы [79]. Яны імкнуліся данесці ідэі дзяржаўна-культурнага адраджэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да сусветнай супольнасці. Мысліцелі ініцыіравалі абмеркаванне пытання аб нацыянальна-культурным самавызначэнні беларускага народа на канферэнцыі сацыялістычных і рэвалюцыйных партый у Фінляндыі ў 1905 г., Славянскім з'ездзе прагрэсіўных студэнтаў у 1908 г. у Празе, Міжнароднай канферэнцыі нацый у 1906 г. у Лазане.

### 5.3.2. Выяўленне сэнсафарміруючай ролі беларускай мовы Язэпам Лёсікам



Праблемы незалежнасці Беларусі, яе нацыянальнага адраджэння, гісторыі і будучыні займалі асноўнае месца ў грамадска-палітычнай і публіцыстычнай дзейнасці ***Язэпа Юр'евіча Лёсіка*** (1883–1940). Мовазнавец нарадзіўся ў в. Мікалаеўшчына Мінскага павета ў сям'і селяніна. У 1898 г. ён паступіў у Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю. Аднак на другі год быў выключаны з яе без права паступлення ў іншыя навучальныя ўстановы. Пераехаўшы ў Ноўгарад-Северскі на Чарнігаўшчыне, паступіў у гарадское вучылішча, скончыў яго ў 1902 г. і быў прызначаны настаўнікам у школу ў мястэчку Грамяч. Захапіўся палітычнымі справамі і стаў знаёміць з палітычнымі пытаннямі грамяцкіх сялян. За палітычную дзейнасць быў арыштаваны і прыгавораны да бестэрміновага высялення ў Сібір. Тут сустрэўся з Алесем Гаруном. Нягледзячы на адарванасць ад сваёй Бацькаўшчыны, Я. Лёсік трымаў цесную сувязь з ёю: супрацоўнічаў з «Нашай нівай», падтрымліваў кантакты з пісьменнікамі і знаёмымі настаўнікамі Беларусі. На радзіму вярнуўся ў 1917 г. і адразу ўключыўся ў нацыянальна-вызваленчы рух. Я. Лёсік супрацоўнічаў з Беларускай сацыялістычнай грамадой, рэдагаваў газету «Вольная Беларусь» Беларускага нацыянальнага камітэта, удзельнічаў у рабоце Усебеларускага з'езда (1917). У чэрвені 1918 г. узначальваў Раду БНР. З устанаўленнем у Беларусі савецкай улады адышоў ад палітычнай дзейнасці і прысвяціў сябе навуцы, культурна-асветніцкай і педагагічнай дзейнасці. З утварэннем Інбелкульта стаў адным з актыўнейшых даследчыкаў беларускай мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выключную ролю ў фарміраванні этнічнага светаадчування асобы Я. Лёсік надаваў мове. На яго думку, родная мова ўплывае на фарміраванне светапогляду асобы, развіццё яе мыслення, эстэтычнага густу, крэатыўнасці. У публіцыстычных артыкулах і прадмовах да сваіх мовазнаўчых прац ён сцвярджаў, што мова – асноўны вынік і сродак культуры, матэрыялізаванае думанне, выяўленне ступені развіцця нацыі. Лейтматывам у яго творчай спадчыне праходзіць думка аб тым, што без роднай мовы адбываецца дэградацыя асобы і грамадства, занядбанне іх інтэлектуальнага, творчага, маральнага патэнцыялу.

Я. Лёсік выступаў за пашырэнне сферы ўжытку беларускай мовы, наданне ёй не толькі дзяржаўнага, але і мажарытарнага статусу. Разглядаў мову як важнейшы прадмет, які мае асветнае, выхаваўчае і практычнае значэнне. Паказаў месца роднай мовы ў працэсах мыслення школьнікаў, разумення і ўяўлення імі з'яў культуры. У сувязі з гэтым першачарговай задачай грамадства, пераконваў мовазнавец, з'яўляецца навучанне роднай мове. Акрамя навукова-тэарэтычнага абгрунтавання ролі мовы ў фарміраванні асобы, Я. Лёсік робіць шэраг практычных крокаў па выяўленні ўмоў, спосабаў, метадаў і форм навучання беларускай мове. У 1922 г. ім былі распрацаваны і выдадзены «Практычная граматыка беларускай мовы», «Беларуская мова. Пачатковая граматыка», «Беларуская мова. Правапіс», «Сінтаксіс беларускай мовы», «Граматыка беларускай мовы. Фанетыка», «Граматыка беларускай мовы. Марфалогія» і інш. Я. Лёсік узначаліў рэформу беларускага правапісу і азбукі, удзельнічаў у рабоце Тэрміналагічнай камісіі. Яго навуковая лінгвістычная дзейнасць была высока ацэнена. У 1928 г. ён быў зацверджаны правадзейным членам Беларускай акадэміі навук.

Вучоны выступаў супраць лінгвацэнтрычнай канцэпцыі, адпаведна якой галоўная ўвага звярталася на засваенне марфалагічных, сінтаксічных, фанетычных моўных адзінак. Гэтай канцэпцыі ён проціпастаўляе антрапацэнтрычную парадыгму, дзе ў цэнтры навучання ставіцца асоба суб'екта культуры, яго маўленчыя здольнасці ствараць і ўспрымаць выказванні [35].

Але плённая навуковая і культурна-асветніцкая дзейнасць творцы была перапынена сталінскімі рэпрэсіямі. У 1930 г. ён быў арыштаваны і сасланы ў Саратаўскую вобласць, дзе і памёр у 1940 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я. Лёсік пакінуў надзвычай багатую і разнастайную літаратурную спадчыну. Акрамя лінгвістычных прац ім напісана шмат мастацкіх твораў: «Геркулес і селянін», «Бусел і буслянята», «Па-валачобнаму», «Апавяданне без назвы» і інш.

Шэраг нарысаў і артыкулаў прысвяціў пісьменнік гісторыі і культуры Беларусі – «Гісторыя Вялікага княства Літоўскага-Беларускага», «Літва – Беларусь», «Бітва пад Грунвальдам у апісанні хронікі Быхаўца, Длугаша, Бельскага і інш.».

Публіцыстыка Я. Лёсіка прадстаўлена артыкуламі, у якіх даследуюцца вытокі беларускай нацыянальнай культуры («Культурны стан Беларусі к моманту Лютаўскае рэвалюцыі», «Гістарычная няўхільнасць», «Рабочы стан пануючых і прыгвалчаных нацый»). Погляды на нацыянальна-культурнае адраджэнне выказаны ў працах «Аўтаномія Беларусі», «Вольная Беларусь», «Праціўнікам беларускага руху», «Нашы патрэбы» і інш. Як і браты Луцкевічы, спачатку ён быў прыхільнікам аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай федэрацыі, у якую, па меркаванні публіцыста, павінны былі ўвайсці Велікаросія, Латвія, Літва, Каўказ, Украіна, Сібір, Фінляндыя, Эстонія. Але пасля разгону Усебеларускага з'езда і падпісання Брэсцкага міру перайшоў на пазіцыі незалежнай Беларускай дэмакратычнай рэспублікі.

### 5.3.3. Культуралагічны дыскурс у творчай спадчыне Якуба Коласа



Сярод творцаў першай паловы XX ст. вылучаецца магутная постаць ***Якуба Коласа*** (Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча) (1882–1956).

Нарадзіўся паэт у сям'і Міхаіла Казіміравіча і Ганны Юр'еўны, якія паходзілі з сялян в. Мікалаеўшчына. Бацька служыў лесніком у князя Радзівіла, маці вяла хатнюю гаспадарку. Кастусь сам навучыўся рускай грамаце. Дзве зімы ён разам са старэйшымі братамі вучыўся

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

дома, у так званага «дарэктара», потым скончыў народнае вучылішча ў Мікалаеўшчыне. У 1898 г. паступіў на казённы кошт у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, якую закончыў у 1902 г. У час вучобы захапляўся мастацкай літаратурай, складаў вершы і байкі на рускай мове, збіраў матэрыялы па беларускай этнаграфіі, запісваў вусную народную творчасць. У гэты ж час пачаў ствараць вершы і празаічныя творы на беларускай мове.

У 1902–1905 гг. малады настаўнік працаваў на Палессі ў вёсках Люсіна (цяпер Ганцавіцкі раён), Пінкавічы (цяпер Пінскі раён). Рабіў этнаграфічныя запісы, збіраў фальклор. У гэты ж час ён пазнаёміўся з нелегальнай рэвалюцыйнай літаратурай, праводзіў растлумачальныя гутаркі з сялянамі. 9–10 ліпеня 1906 г. прыняў удзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе, які адбыўся ў в. Мікалаеўшчына. З'езд разагнала паліцыя. К. Міцкевіч у ліку іншых быў пазбаўлены права працаваць настаўнікам. У 1907 г. ён прыехаў у Вільню, некалькі тыдняў працаваў загадчыкам літаратурнага аддзела ў «Нашай ніве», але паводле загаду паліцыі быў вымушаны пакінуць горад. У 1908 г. – асуджаны на тры гады турэмнага зняволення паводле абвінавачання ў актыўных дзеяннях, накіраваных на выкананне праграмы Усерасійскага саюза настаўнікаў, які, як было заяўлена на судзе, меў на мэце ліквідацыю існуючага ў Расійскай імперыі грамадскага ладу. Увесь тэрмін пакарання Я. Колас адбыў у Мінскім астрозе. За кратамі ўдавалася пісаць вершы і перапраўляць на волю.

Пасля выхаду з турмы з верасня 1911 г. па 1914 г. Я. Колас займаўся настаўніцкай працай: некалькі месяцаў без афіцыйнага дазволу навучаў дзяцей чыгуначнікаў у мястэчку Лунінец, у 1912–1914 гг. пасля атрымання пасведчання аб добранадзейнасці працаваў настаўнікам спачатку ў в. Купяцічы недалёка ад Пінска, а потым у Пінскім 3-м прыходскім вучылішчы. Гэты час вельмі адметны для асабістага жыцця Якуба Коласа. У жніўні 1912 г. на хутары Смольня, каля в. Мікалаеўшчына, адбылася яго першая сустрэча з Янкам Купалам, якая паклала пачатак іх сяброўству.

Падчас Першай сусветнай вайны ў сувязі з набліжэннем фронту Я. Колас разам з сям'ёй эвакуіраваўся ў Маскоўскую губерню, дзе быў мабілізаваны на вайсковую службу. Пасля заканчэння Аляксандраўскага ваеннага вучылішча служыў у



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

запасным палку ў Пермі, ваяваў на Румынскім фронце, але ў хуткім часе ў сувязі з хваробай атрымаў адпачынак і паехаў да сям'і ў г. Абаянь Курскай вобласці. Як настаўнік быў вызвалены ад вайсковай службы і працаваў выкладчыкам, школьным інструктарам у Абаяні і яго наваколлі.

Другая палова 1920-х – 1930-я гг. – час актыўнай грамадскай дзейнасці Я. Коласа, прызнання яго заслуг. У 1926 г. яму нададзена званне народнага паэта БССР, з 1928 г. ён акадэмік Акадэміі навук БССР. Я. Колас удзельнічаў у рабоце Першага Усебеларускага з'езда савецкіх пісьменнікаў і Першага Усесаюзнага з'езда савецкіх пісьменнікаў у Маскве (1934), дзе быў абраны ў кіруючыя органы творчых саюзаў літаратараў. У 1935 г. ён выступаў з прамовай на Сусветным кангрэсе абароны культуры ў Парыжы.

Аднак з сярэдзіны 1920-х гг. Я. Колас трапіў у поле зроку савецкіх рэпрэсіўных органаў. У 1925 г. у яго быў праведзены вобыск, а затым і допыт у сувязі з «лістападаўскай справай», якая датычылася «контррэвалюцыйнай арганізацыі» на Случчыне. У 1930-я гг. ціск на Я. Коласа яшчэ больш узмацніўся. Яго адкрыта абвінавачвалі ў так званай нацдэмаўшчыне, у прапагандзе ідэй бяскласавасці беларускай нацыі, знаходзілі ў творах ідэалізацыю кулацтва, хутарской гаспадаркі, перабольшванне ролі інтэлігенцыі. У 1930 г. Я. Колас быў змушаны публічна каяцца ў палітычных «памылках». Былі арыштаваны і рэпрэсіраваны блізкія сваякі паэта. У 1938 г. у доме пісьменніка шукалі зброю, яму пагражаў арышт, аднак санкцыя на яго ад вышэйшага савецкага кіраўніцтва не была дадзена. Магчыма, з-за шырокай вядомасці і народнага прызнання. Такім чынам, творца трапіў у бязвыхаднае становішча, цалкам залежнае ад ідэалагічных установак камуністычнай партыі і грамадска-дзяржаўных структур таталітарнай сістэмы. Жахі прымусовай калектывізацыі, разбурэнне традыцыйнага ўкладу вёскі, татальны кантроль над усімі сродкамі грамадска-палітычнага, духоўнага жыцця, фактычная забарона свабоды слова і волевыяўлення, масавыя рэпрэсіі супраць нацыянальнай інтэлігенцыі – усё гэта негатыўна паўплывала на Коласа як творцу. Ён аказаўся заложнікам сістэмы, міжвольным прапагандыстам сацыялістычнага рэалізму, які быў зводам палітычных патрабаванняў, але выдаваўся за эстэтычную катэгорыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У час Вялікай Айчыннай вайны паэт жыў пад Масквой у Клязьме, Ташкенце, Маскве. У вершах (зборнікі «Адпомсцім», 1942; «Голас зямлі», 1943), паэмах «Суд у лесе» (1942), «Адплата» (1943–1944), публіцыстычных артыкулах перыяду Вялікай Айчыннай вайны ён услаўляў патрыятызм, гераізм савецкіх людзей, выкрываў чалавеканенавісніцкую сутнасць фашызму. У 1944 г. Я. Колас удастоены звання заслужанага дзеяча навукі БССР. У канцы 1944 г. – вярнуўся ў Мінск.

Пасля вайны, з сярэдзіны 1940-х гг. і да канца жыцця Я. Колас працаваў у Акадэміі навук БССР, быў вядомы як грамадскі дзеяч: выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета БССР, членам ЦК на XX–XXII з'ездах КПБ і Усесаюзнага Камітэта па Дзяржаўных прэміях у галіне літаратуры і мастацтва, віцэ-старшынёй Усеславянскага антыфашысцкага камітэта, старшынёй Беларускага і членам Савецкага камітэта абароны міру – і гэта была не фармальная праца. У Я. Коласа заўсёды знаходзілі водгук праблемы асобных грамадзян, паслядоўна адстойваў ён інтарэсы і ўсёй беларускай нацыі. У 1956 г. пісьменнік напісаў ліст у вышэйшыя партыйныя інстанцыі, у якім выказаў занепакоенасць становішчам беларускай мовы ў грамадскім жыцці, прапанаваў меры па яе абароне.

Літаратурная творчасць Я. Коласа пачынаецца з 1906 г. Менавіта ў гэтым годзе ў віленскай беларускамоўнай газеце «Наша доля» з'явіўся яго першы надрукаваны твор. Тут упершыню быў выкарыстаны псеўданім Якуб Колас. У той жа час ён пачынае актыўна супрацоўнічаць у якасці аўтара з віленскай беларускамоўнай газетай «Наша ніва». У творчасці Я. Коласа гэтага перыяду з'яўляюцца новыя формы. У 1909 г. у Санкт-Пецярбургу ў выдавецтве «Загляне сонца і ў наша аконца» выйшла першая яго кніга «Другое чытанне для дзяцей беларусаў». У 1910 г. у Вільні надрукаваны першы зборнік вершаў «Песні жальбы» (напісаны ў 1906–1909 гг.). Высокую ацэнку гэтым раннім творам даў Максім Горкі. У 1910-я гг. Я. Колас выходзіць на больш высокі ўзровень літаратурнай працы – звяртаецца да буйных літаратурных форм з філасофскім асэнсаваннем рэчаіснасці, пачынае працу над ліра-эпічнымі паэмамі «Новая зямля» і «Сымон-музыка». Напісаныя ў гэты перыяд вершы і апавяданні друкаваліся ў газеце «Наша ніва». У 1912 г. у Вільні выходзіць зборнік «Апавяданні», у 1913 г. у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Санкт-Пецярбургу – апавяданні «Нёманаў дар», «Тоўстае палена», зборнік вершаваных апавяданняў «Прапаў чалавек». Галоўная тэма гэтых твораў – жыццё беларускага сялянства. У Вільні ў 1914 г. Беларускім выдавецкім таварыствам выдадзены зборнік апавяданняў шырокага тэматычнага дыяпазону «Родныя з'явы». Празаічныя творы Я. Коласа гэтага перыяду па сваёй тэматыцы, ідэйнай накіраванасці, вобразнай структуры збліжаліся з яго паэзіяй.

У 1920-я гг. пашыраецца тэматыка твораў Я. Коласа. Ён прыходзіць да апісання жыццёвых шляхоў беларускай інтэлігенцыі пачатку XX ст., яе духоўных пошукаў. Пісьменнік стварае палескія аповесці: два вялікія празаічныя творы «У палескай глушы» (Вільня, 1923) і «У глыбі Палесся» (Мінск, 1927). Яны пазней увайшлі як першая і другая часткі ў трылогію «На ростанях» – найбольшы празаічны твор Я. Коласа. У 1925 г. была апублікавана п'еса «Забастоўшчыкі», пра тое, як беларускае настаўніцтва ўключалася ў палітычную барацьбу. У аснове сюжэта – першы нелегальны з'езд настаўнікаў у Мікалаеўшчыне. Акрамя таго, у 1925 г. напісана аповесць «На прасторах жыцця», прысвечаная моладзі 1920-х гг., праблемам яе духоўнага станаўлення, адукацыі, культуры, імкненню да пераўтварэння жыцця.

У творчасці Я. Коласа 1930-х гг. прысутнічае тэма калектывізацыі. Галоўны герой яго даволі схематызаванай аповесці «Адшчапенец» (1932) пасля доўгіх ваганняў прыходзіць да высновы аб перавагах калектыўнай гаспадаркі перад аднаасобнай. Апроч таго, у гэты перыяд Я. Колас звярнуўся да драматычных падзей Першай сусветнай вайны, галоўным чынам праз паказ «салдацкай праўды» (п'еса «Вайна вайне», апошняя рэдакцыя 1938 г.) і Грамадзянскай вайны – аповесць «Дрыгва» (1933) і створаная на яе аснове п'еса «У пушчах Палесся» (1937). У 1940 г. пачаў пісаць паэму «Рыбакова хата» пра жыццё працоўных Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы, іх барацьбу за свае правы. У гэты перыяд Я. Колас плённа працаваў у галіне перакладу з рускай, украінскай, польскай моў («Палтава» А. Пушкіна, некаторыя творы М. Лермантава, А. Міцкевіча).

У 1950-я гг. Я. Коласам завершана аповесць «На ростанях», у якой апісаны падзеі 1906–1911 гг. Яна стала трэцяй, апошняй часткай аднайменнай трылогіі. У якасці навуковага рэдактара

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ён удзельнічаў у падрыхтоўцы першага выдання «Руска-беларускага слоўніка».

Культуралагічны аналіз тэкстаў літаратурных твораў Я. Коласа дае падставу сцвярджаць, што іх этнакультурная значнасць заключаецца ў тым, што яны прасякнуты этнічным каштоўнасным зместам, духоўным здароў'ем. У сваёй творчасці пісьменнік імкнуўся асэнсаваць першавытокі беларускай культуры, спасцігнуць яе самабытны характар, сутнасць этнанацыянальнага духу, месца і ролю розных суб'ектаў культуры ў грамадскім працэсе. Коласаўскія тэксты напоўнены разнастайнымі культурнымі сэнсамі. Многія літаратурныя творы Я. Коласа ўключаны ў цэлую сістэму культурных каардынат, яны як бы сатканы з мноства ведаў аб культуры. Гэта сапраўды рэфлексійная дзейнасць творцы пераўтварылася ў своеасабліва выказаныя паэтам культуралагічныя ідэі, паняцці, сімвалы. І менавіта ў гэтым сэнсе творчасць Я. Коласа прасякнута культуратворчымі і культуралагічнымі інтэнцыямі [32].

Для Я. Коласа характэрна асаблівае прадчуванне сутнасных працэсаў, феноменаў і з'яў культуры наогул і беларускай у прыватнасці. Імкненне абудзіць нацыянальны дух і веру народа ў сябе як стваральніка і транслятара высокай духоўнай культуры з'яўляецца той рэфлексійна-пачуццёвай прасторай, вакол якой фарміруецца этнанацыянальны масіў дыскурсу пісьменніка. Літаратурная творчасць і грамадска-палітычная дзейнасць Я. Коласа цалкам упісваліся ў стратэгію нацыянальна-культурнага адраджэння. Стратэгія адраджэння разумелася ім як паскораны рух эканамічнага, сацыяльна-палітычнага і культурнага працэсаў да больш высокіх форм грамадскага быцця і нацыянальнай свядомасці пасля працяглага перыяду застою. «Адбудаванне гарадоў, пабудова новых фабрык і заводаў, шырокі творчы размах работы для буйнага росту эканомікі і прамысловасці, густая сетка школ розных тыпаў, вышэйшых навучальных і навуковых устаноў» – такім бачыўся пісьменніку шлях да дзяржаўнага і культурнага адраджэння [77, с. 64].

Адным са змястоўна-тэматычных вузлоў творчасці пісьменніка была праблема нацыянальнай самасвядомасці, адсутнасці беларусаў у еўрапейскай культуры. У выніку спецыфікі гістарычнага развіцця беларускага этнасу да канца XIX ст., лічыў Я. Колас, народ і нават большая частка інтэлігенцыі мелі няяркі, невыразны і неакрэслены светапогляд, неразвітую нацыя-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нальную самасвядомасць. Ва ўяўленні прадстаўнікоў еўрапейскай супольнасці беларусы паўставалі як нявызначаная маса без этнічнай свядомасці і сваёй нацыянальнай ідэі. У сувязі з гэтым Я. Колас усведамляў неабходнасць фарміраваць рэпрэзентатыўна-кананічны ідэал беларускага народа, спалучаны з верай у праўду, у заўтрашні дзень, у высокія ідэалы жыцця. Трэба было развеяць думку, якая склалася, аб спрадвечнай культурнай адсталасці беларускага народа, аб яго няздольнасці да самастойнага этнанацыянальнага развіцця. У шэрагу публіцыстычных артыкулаў і мастацкіх твораў пісьменніка выразна прасочваецца праблема асэнсавання ролі культурнай памяці і забыцця як у кантэксце культурнай цэласнасці, так і ў актуальным быцці канкрэтнай асобы. Я. Колас лічыў, што беларускі народ, дасягнуўшы ў пачатку XX ст. пэўнага ўзроўню свайго культурна-гістарычнага развіцця і этнічнай самасвядомасці, пачаў усведамляць важнасць сваёй гісторыі, веданне якой неабходна захаваць і перадаць наступным пакаленням. Таму мнеманічная аксіялогія культуры літаральна пранізвае коласаўскія тэксты.

У дыдактычнай працы «Методыка роднай мовы», артыкулах «Шануйце і любіце сваю родную мову», «Что было и что стало», «Думкі да дваццацігоддзя» і іншых пісьменнік вызначае месца і ролю роднай мовы ў інтэграцыі беларускага грамадства. Мова, паводле яго меркавання, уяўляе сабой галоўную форму выражэння і існавання нацыянальнай культуры, выступае як сродак рэалізацыі ўнутранай формы выражэння культуры [78, с. 321]; з’яўляючыся «праблемай сэнсу культуры», яна сінтэзуе сацыяльныя, культурна-гістарычныя, псіхалагічныя, эстэтычныя аспекты жыцця беларускага народа. У працэсе літаратурнай, навуковай дзейнасці пісьменнік выявіў патэнцыял народнай мовы, незвычайную моўную чуйнасць, мастацкую інтуіцыю. У яго творчай спадчыне мова выступае як універсальная форма асэнсавання рэальнасці, у якую арганізуюцца ўсе ўзніклыя або ўжо існуючыя ўяўленні, аперцэпцыі, паняцці, вобразы і іншыя сэнсавыя канструкцыі (носьбіты сэнсу). «Скрозь адчыненыя дзверы роднай мовы, – зазначаў творца ў працы «Методыка роднае мовы», – льецца ў школу шырокая, магутная плынь, плынь асветы, людкуючы розум і пачуцці дзяцей» [78, с. 319].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я. Колас прычыніўся да распрацоўкі канцэпцыі інкультурацыі. Ён акрэсліў яе змест, ролю агентаў і сацыяльных інстытутаў інкультурацыі, да якіх адносіў навучальныя ўстановы, музеі, бібліятэкі, тэатры, дзеячаў культуры і мастацтва, педагогаў, сродкі масавай інфармацыі, сям'ю. Абазначыў змест, формы і метады іх дзейнасці. Мэтай дзейнасці агентаў інкультурацыі, паводле меркавання пісьменніка, з'яўлялася ажыццяўленне духоўнай вытворчасці, трансляцыя культуры, фарміраванне высокіх духоўных патрэб, стварэнне ўмоў для выяўлення і рэалізацыі творчых здольнасцей асобы. Ім вызначаны спосабы перадачы культурнай інфармацыі шляхам вертыкальнай, гарызантальнай і непрамой трансмісій, абазначаны псіхалагічныя механізмы інкультурацыі.

Важнейшым тэзісам коласаўскай канцэпцыі інкультурацыі з'яўляецца думка аб выключнай ролі этнанацыянальнай культуры ў фарміраванні асобы. Аб тым, што этнічная культура з'яўляецца ўстойлівай часткай нацыянальнай культуры, дзякуючы якой адбываецца назапашванне і трансляцыя народнага вопыту ў гісторыі, Я. Колас пісаў у артыкулах «Янка Купала і паэзія» [77, с. 312–318], «Двадцать пять» [77, с. 324–330], «Что было и что стало», «Культура і навука ў БССР за 30 год», «Вялікі друг народа» [78, с. 272–274], «Быть гражданином» і інш. У артыкуле «Культура і навука ў БССР» пісьменнік адзначаў, што «народ – невычэрпная крыніца талентаў», менавіта ён «творыць сваю культуру і навуку».

Субкультура як адна з самых яркіх праяў сацыякультурнага быцця грамадства знайшла пэўнае адлюстраванне ў творчай спадчыне Я. Коласа. У паэмах «Новая зямля», «Сымон-музыка», трылогіі «На ростанях», шэрагу публіцыстычных артыкулаў («Нашы сустрэчы», «Памятные встречи», «Прамова на адкрыцці помніка Янку Купалу», «Янка Купала», «Он живет среди нас», «Крыштальная празрыстасць» і інш.) прадстаўлена паўнавартасная і ўплывовая ў культуралагічным плане мастацкая канцэпцыя субкультуры інтэлігенцыі і сялянства як сегмента беларускай этнанацыянальнай культуры. У разнажанравых творах найбольш грунтоўна ўвасоблены карціна свету, ідэалы, патэрны паводзін, каштоўнасці, мараль, думы, псіхалогія, характар, адметнасці побыту сялянства і інтэлігенцыі як носьбітаў адпаведных субкультур.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У творчай спадчыне Я. Коласа адлюстраваны таксама ментальны свет беларусаў, які ўвасоблены пісьменнікам этнакультурнымі архетыпамі, ёсць адначасова і адлюстраванне іх духоўнага свету. Архетыпныя вобразы Старца, Музыкі, Прыроды выступалі ў мастацкіх творах Я. Коласа ўвасабленнем свабоды, справядлівасці, роўнасці, натуральнасці, непрымусовасці. Архетыпы паказаны Я. Коласам як анталагічная аснова маральнасці беларускага народа. Анталагічнасць праяўляецца ў сімвалічных зместах, якія маюць энергетычнае напаўненне і дзейнасную прыроду, г.зн. яны дзейнічаюць у жыцці чалавека і выяўляюць духоўна-цялесную цэласнасць.

### 5.3.4. Культурна-антрапалагічная сутнасць мастацка-публіцыстычнай творчасці Янкі Купалы

Духоўную прыгажосць і маральныя заганы розных сацыяльных супольнасцей беларускага грамадства, складаны гістарычны лёс народа і самабытнасць беларускай культуры выявіў у сваёй творчасці ***Янка Купала*** (Іван Дамінікавіч Луцэвіч) (1882–1942). Нарадзіўся паэт у фальварку Вязынка пад Мінскам. Яго бацькі – Дамінік Ануфрыевіч Луцэвіч і Бянігна Іванаўна Валасевіч – належалі да дробнай збяднелай шляхты, арандавалі зямлю ў памешчыцкіх фальварках. У 1898 г. Купала закончыў Бяларуцкае народнае вучылішча. Пасля смерці бацькі ў 1902 г. працаваў на гаспадарцы, таксама на пасадах хатняга настаўніка, пісара ў судовага следчага ў Радашковічах, практыканта на бровары ў Яхімоўшчыне і інш.



Восенню 1908 г. Я. Купала пераязджае ў Вільню, дзе супрацоўнічае з рэдакцыяй «Нашай нівы». У снежні 1909 г. – накіроўваецца ў Пецярбург, дзе вучыцца на курсах і працуе ў Публічнай бібліятэцы, удзельнічае ў рабоце навукова-літаратурнага гуртка беларускіх студэнтаў. Увосень 1913 г. вяртаецца ў Вільню, дзе спачатку працуе сакратаром Беларускага выдавецкага таварыства, а потым зноў супрацоўнічае з «Нашай нівай», адзін час

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ён з'яўляецца яе рэдактарам. У канцы верасня 1915 г. едзе ў Маскву, там вучыцца ў Народным універсітэце імя А. Л. Шаняўскага. У 1916 г. пераязджае ў Мінск. Тут ён прызываецца ў армію, трапляе ў дарожна-сапёрны атрад, які знаходзіўся ў Мінску, а летам таго ж года быў пераведзены ў Полацк. Час нямецкай акупацыі правёў у Смаленску.

У 1919 г., пасля абвяшчэння БССР, Я. Купала пераехаў на сталае месцажыхарства ў Мінск. Працуе намеснікам загадчыка літаратурна-выдавецкага аддзела Наркамасветы БССР, рэдагуе часопісы «Вольны сьцяг» і «Рунь», дапамагае ўтварэнню Інстытута беларускай культуры, сапраўдным членам якога быў абраны ў 1922 г. (паводле ўтварэння на базе Інбелкульта Акадэміі навук у 1928 г. ён стаў акадэмікам). Паэт узначальвае літаратурную суполку «Полымя», якая аб'яднала пісьменнікаў-«адраджэнцаў».

У 1930-я гг. пачынаецца хваля рэпрэсій сярод творчай інтэлігенцыі, і Я. Купала, як і шмат іншых беларускіх творцаў, вымушаны пісаць ухвальныя вершы на тэмы «будаўніцтва сацыялізму». Ён шмат разоў выклікаўся на допыты па справе контррэвалюцыйнай арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі», якая ў рэальнасці не існавала. 20 лістапада 1930 г., не вытрымаўшы здзекаў, Купала робіць спробу самагубства. У шпіталі, канчаткова зломлены, падпісвае «Адкрыты ліст Я. Купалы» з адрачэннем ад нацыянальнай ідэі. У гэтым лісце, надрукаваным у газеце «Звязда» 14 снежня 1930 г., Купала «шчыра» раскайваецца ў контррэвалюцыйнай дзейнасці, у сваёй ідэйна-натхняючай ролі ў беларускім нацыянальна-дэмакратычным руху.

Другая сусветная вайна застала Я. Купалу ў Каўнасе, дзе 22 чэрвеня 1941 г. ён спыніўся, вяртаючыся з Рыгі са з'езда пісьменнікаў Латвіі. Забраўшы з Мінска жонку, пісьменнік выехаў у Маскву, а адтуль у канцы кастрычніка – эвакуіраваны ў Печышчы (Татарстан). 4 чэрвеня 1942 г. Купала быў раптоўна выкліканы ў Маскву тэлеграмай ад старшыні Саўнаркама БССР І. С. Былінскага. 28 чэрвеня ў Маскве Купала трагічна загінуў у гасцініцы «Масква». Паэт быў пахаваны ў Маскве на Ваганькаўскіх могілках, а праз 20 гадоў яго прах быў перавезены ў Беларусь. Цяпер магіла Янкі Купалы знаходзіцца на Вайсковых могілках у Мінску, побач з магілай Якуба Коласа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першыя літаратурныя творы паэт пачаў пісаць яшчэ ў 1903 г. Пачынаў пісаць па-польску. Некалькі сентыментальных вершаў надрукаваў у 1903–1904 гг. у часопісе «Ziarno» пад псеўданімам «К-а». Першы верш на беларускай мове «Мая доля» з'явіўся ў 1904 г. Першае беларускамоўнае выступленне ў друку – публікацыя ў 1905 г. у газеце «Северо-Западный край» верша «Мужык». Першая публікацыя ў беларускамоўнай прэсе – верш «Касцу», надрукаваны ў «Нашай ніве» ў маі 1907 г. Летам таго ж года ў «Нашай ніве» з'яўляюцца і іншыя творы паэта. Яго ранні́м вершам уласціва падабенства да фальклору і беларускай паэзіі XIX ст. На працягу 1906–1907 гг. напісаны паэмы «Зімою», «Нікому», «Адплата кахання», 18 снежня 1908 г. «Наша ніва» публікуе паэму «У Піліпаўку». У тым жа годзе скончана праца над паэмамі «Адвечная песня» і «За што?». Тэмай гэтых твораў стала сацыяльная несправядлівасць, прыгнёт. У 1908 г. у Пецярбургу ў выдавецтве «Загляне сонца і ў наша аконца» выходзіць першы зборнік Купалы пад назвай «Жалейка». У 1910 г. надрукаваны паэма «Адвечная песня» і зборнік «Гусляр». У змешчаных у зборніку вершах гучаць заклікі да абуджэння нацыянальнай годнасці і змагання за волю, але ж вершы з адкрытымі заклікамі да паўстання («Звяяваным» і інш.) былі выкрэслены перад выданнем, каб пазбегнуць цэнзуры. У гэтым жа годзе паэт завяршае паэмы «Курган» і «Сон на кургане», якія лічацца сімвалічнай выявай беднаснага становішча ў тагачаснай Беларусі, спробай вылучыць яго глыбінныя прычыны.

У 1912 г. Я. Купала завяршыў свой першы сцэнічны твор – камедыю «Паўлінка», якая ў наступным годзе была выдадзена ў Пецярбургу, а потым і пастаўлена на сцэне, спачатку ў Пецярбургу, потым у Вільні, нарэшце ў Радашковічах. У чэрвені 1913 г. завершана гістарычная паэма «Бандароўна», следам за ёй – паэмы «Магіла льва», «Яна і я», а таксама сцэнічны жарт «Прымакі». Вясной 1913 г. быў выдадзены трэці зборнік Купалы – «Шляхам жыцця». У вершах, што склалі гэты зборнік, у адрозненне ад папярэдніх двух, прыкметны значны ўплыў эстэтыкі мадэрну і сімвалізму. Сярод іншых твораў у зборніку была змешчана драматычная паэма «На папасе». Гэтым жа годам датуецца цэнтральны твор у дарэвалюцыйнай творчай спадчыне Купалы – драма «Раскіданае гняздо». У ёй на прыкладзе адной сялянскай сям'і, якая засталася без зямлі і пры-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тулку, адлюстравана трагедыя беларускага народа. Творца ставіць перад сваімі героямі праблему выбару: вечнаму маўклівому цярпенню і прыстасаванню да абставін супрацьпастаўляецца ўтапічная ідэя «вялікага сходу» як адзінага паратунку ад несправядлівасці. П'еса была пастаўлена на сцэне толькі ў 1917 г., пасля рэвалюцыі, а надрукавана яшчэ пазней – у 1919 г. у Вільні.

Напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі Я. Купала піша новыя вершы і друкуе шматлікія артыкулы на тэмы нацыянальнага адраджэння ды змагання за волю ў рэдагуемай ім газеце «Звон», адначасова перакладае на беларускую мову «Слова аб палку Ігаравым».

У кастрычніку – снежні 1918 г. паэт стварае нізку вершаў-заклікаў, якая стане яго водгукам на падзеі тых гадоў – рэвалюцыі, акупацыі, абвяшчэнне БНР: «Час!», «На сход!», «Пчолы», «Званы» і інш. У 1922 г. выходзіць зборнік «Спадчына», які складаецца як з новых вершаў, так і са створаных падчас Першай сусветнай вайны. У жніўні гэтага ж года Купала завяршае працу над трагікамедыяй «Тутэйшыя» – іранічнай панарамай гарадскога жыцця акупацыйных часоў. Афіцыйная крытыка абвінавачвае аўтара ў «дробнабуржуазным народніцтве» і «супрацьстаўленні сябе пралетарскай дыктатуры». У 1924 г. ён друкуе паэму «Безназоўнае», у якой усхваляе барацьбу за незалежнасць папярэдніх гадоў і заклікае не спыняць змагання, замацоўваць ужо дасягнутае і пакінуць пасля сябе цалкам вольную Беларусь. У 1925 г. паэт атрымлівае званне народнага паэта БССР. Летам 1926 г. у часопісе «Полымя», што прыйшоў на змену «Адраджэнню», была надрукавана нізка вершаў, многія з якіх былі пратэстнымі і трапілі пад строгую забарону: «Царскія дары», «Каб», «Акоў паломаных жандар…» і інш.

Творчасць Я. Купалы 1930-х гг. складаецца з прасавецкіх твораў: паэм «Над ракой Арэсай» (1933), прысвечанай калектывізацыі, «Барысаў» (1934) і «Тарасова доля» (1939), памяці Тараса Шаўчэнкі. З вершаў гэтага перыяду быў складзены зборнік «Ад сэрца» (1940), за які Купала ў 1941 г. атрымаў Сталінскую прэмію ў галіне літаратуры і мастацтва.

У ваенны перыяд ён стварае шэраг вершаў-зваротаў да свайго народа, у якіх заклікае да барацьбы з акупантамі: «Бела-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рускім партызанам», «Зноў будзем шчасце мець і волю…», «Паўстаў народ…» і інш.

Творчасць Я. Купалы ўяўляе сабой летапіс жыцця беларускага народа, адбітак яго нацыянальнага характару і светаразумення. У купалаўскіх творах акрэсліваецца ідэя свабоды, – нацыянальнага, сацыяльнага і духоўнага разняволення чалавека. Цыкл артыкулаў – «Адбудова Беларусі», «Незалежнасць», «Больш самачыннасці», «Справа незалежнасці Беларусі за мінулы год», «Моладзь ідзе!», «Справа беларускага нацыянальнага гімна» і інш. – прысвечаны выяўленню нацыянальнай ідэі, перадумоў, шляхоў і сродкаў вырашэння праблем нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі. Я. Купала акрэсліў маштабнасць нацыянальна-вызваленчага руху, разглядаў імкненне беларускага народа да самавызначэння. Пісьменнік прытрымліваўся думкі, што беларусы павінны перш за ўсё вырашыць праблему ўласнай самастойнасці. Спачатку творца падтрымліваў погляды дзеячаў Рады БНР, якія імкнуліся стварыць дзяржаўна-культурную аўтаномію ў складзе Польшчы, а потым стаў на пазіцыі прыхільнікаў стварэння незалежнай суверэннай дзяржавы. У артыкуле «Менск» ён пісаў: «Толькі незалежная Беларусь збавіць нас раз назаўсёды ад чужой апекі і перакідання з аднаго боку на другі. Толькі Беларуская дзяржава запэўніць нам спакой, парадак і лепшую долю» [94, с. 378].

Важнейшай умовай існавання незалежнай Беларусі, паводле меркавання Я. Купалы, з'яўляецца беларуская армія. У артыкулах «Беларускае войска», «Беларускі сцяг уваскрос» публіцыст адстойваў думку, што стварэнне нацыянальнай арміі – дзейсны сродак барацьбы за ўласную самастойнасць: «Хай жа гэта армія стане абаронай сваёй айчыны! Беларускі сцяг уваскрос! Хай беларуская армія не дасць яму болей памерці» [94, с. 380].

Неабходным элементам нацыянальнага і дзяржаўна-культурнага жыцця Я. Купала лічыў наяўнасць беларускага гімна. Ён заклікаў паэтаў і кампазітараў як мага хутчэй заняцца гэтай справай: «Справа беларускага гімна павінна быць вырашана, і то як найхутчэй» [94, с. 442].

Як прадстаўнік нацыянальнай гуманістычна настроенай інтэлігенцыі Я. Купала прапаведаваў ідэі культурнай талерантнасці. У артыкуле «Незалежная дзяржава і яе народы» публіцыст адстойваў права кожнага народа ствараць сваю культуру. Будучая Беларусь, па цвёрдым перакананні пісьменніка, павін-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на забяспечыць роўнасць усіх нацыянальных меншасцей перад уладай і законам, даць магчымасць свабоднага развіцця нацыянальным культурам.

У артыкулах «Забабон», «Уваскрашэнне польскага ўніверсітэта ў Вільні» і «Моладзь ідзе!» Я. Купала вызначае ролю і месца розных суб’ектаў нацыянальнай культуры ў справе дзяржаўна-культурнага будаўніцтва. Ён не ўяўляў будучую незалежную Беларусь без адукаваных, здольных грамадзян, якія будуць служыць справе сацыяльна-эканамічнага і культурнага адраджэння краю. Вялікія спадзяванні творца ўскладваў на інтэлігенцыю і моладзь. У артыкуле «Забабон» ён пісаў: «Хай жа наша шчырая беларуская інтэлігенцыя, вышаўшая з-пад беларускай саламянай страхі і злучаная святой думкай адбудавання Беларускай Дзяржавы, хай жа яна скажа сваё жалезнае слова» [94, с. 364].

У аснове купалаўскай канцэпцыі ляжыць прынцып усебаковага развіцця беларускай мовы як ядра культуры, заваявання ёй месца ў сусветнай супольнасці. Глыбокае разуменне Купалам моўнай праблемы выразна выяўляецца падчас тэкставага аналізу артыкула «Ці маем мы права выракацца роднай мовы», у якім ён аналізуе прычыны пасіўнага выкарыстання роднай мовы беларусамі ў XIX – пачатку XX ст. Перашкодай на шляху функцыянавання беларускай мовы, тлумачыў наратар, з’яўлялася палітыка расійскіх улад, якія імкнуліся зрабіць усё для таго, каб выключыць з народнай свядомасці беларускае слова. Пісьменнік сцвярджаў, што мова народа з’яўляецца важнейшай формай этнічнай ідэнтыфікацыі, тым моцным падмуркам, на якім можа паўстаць нацыянальная ідэалогія. Мастацкія і публіцыстычныя яго творы пранізаны патрыятызмам і глыбінным гістарызмам. Я. Купала імкнуўся абудзіць у беларусаў пачуццё годнасці і ўдзячнасці да продкаў, якія былі здольныя захоўваць сваю дзяржаўнасць і незалежнасць, бараніць радзіму ад ворагаў, развіваць адметную культуру. У творах народнага паэта Беларусі выразна выяўляецца канцэпцыя чалавека, у якой увасоблены высокія духоўныя памкненні асобы, далучанай да перадавых ідэй свайго часу, яе высокія маральныя якасці, права кіравацца ў сваіх учынках уласным выбарам, жаданне знайсці справядлівасць. Погляды Я. Купалы вызначаліся дэмакра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тызмам, адмаўленнем насілля, сцвярджэннем прыярытэту агульначалавечых духоўных каштоўнасцей над класавымі.

## 5.3.5. Канцэпцыя Беларускага адраджэння Максіма Багдановіча

У залаты фонд беларускай культуры ўвайшла спадчына ***Максіма Адамавіча Багдановіча*** (1891–1917). Нарадзіўся паэт у Мінску. Раннія дзіцячыя гады прайшлі ў Гродне. У 1896 г. бацька паэта, Адам Ягоравіч, з дзецьмі пераязджае ў Ніжні Ноўгарад. У 1902 г. Максім паступіў у Ніжагародскую мужчынскую гімназію. Падчас рэвалюцыі 1905 г. прымае ўдзел у вучнёўскіх і студэнцкіх дэманстрацыях, за што атрымлівае атэстацыю «недобранадзейнага вучня».



У чэрвені 1908 г. Багдановічы пераязджаюць па службе бацькі ў Яраслаўль. У 1909 г. Максім захворвае на сухоты і выязджае на лячэнне ў Крым. У 1911 г. ён наведвае Вільню, дзе знаёміцца з Вацлавам Ластоўскім, Іванам і Антонам Луцкевічамі і іншымі дзеячамі Беларускага адраджэння. Летам гэтага ж года браты Луцкевічы запрасілі Максіма адпачыць на хутары Ракуцёўшчына (непадалёку ад Радашковіч), які тады належаў іх дзядзьку В. Лычкоўскаму. Там за два месяцы быў напісаны цыкл вершаў «Старая Беларусь», а пазней многія творы з цыкла «Места», «З беларускіх матываў». У тым жа годзе Максім Багдановіч меў намер паступіць у Пецярбургскі ўніверсітэт на філалагічны факультэт, але праз недахоп грошай і сыры клімат сталіцы вяртаецца ў Яраслаўль і паступае ў Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй. У снежні 1915 г. Багдановіч паехаў у Маскву, каб наведаць беларускага гісторыка Уладзіміра Пічэту. Вядомы даследчык паўплываў на погляды паэта, якія ён выказаў у артыкуле «Белорусское возрождение».

Пасля заканчэння ў 1916 г. ліцэя паэт прыязджае ў Мінск, дзе жыў на кватэры Змітрака Бядулі. Хоць ён быў ужо цяжка хворы, але ўладкаваўся на працу сакратаром у губернскую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

харчовую камісію, шмат працаваў, а ўвесь вольны час аддаваў літаратурнай творчасці.

У лютым 1917 г. сябры паэта сабралі грошы, каб ён змог паехаць у Крым лячыцца, але лячэнне не дапамагло, і ў тым жа годзе ў Ялце Максім Багдановіч памёр ва ўзросце 25 гадоў. Пахавалі паэта ў Ялце на Старых гарадскіх могілках.

Пачаткам літаратурнай дзейнасці М. Багдановіча лічыцца 1907 г. Яго першым значным мастацкім творам было беларускамоўнае празаічнае апавяданне «Музы́ка», якое адразу ж надрукавала «Наша ніва». У гэтым алегарычным творы малады аўтар расказваў аб шматпакутным лёсе Беларусі на працягу стагоддзяў і выказваў надзею на хуткія перамены да лепшага. Апавяданне было напісана пад уплывам народнай творчасці. У хуткім часе Максім стаў сталым супрацоўнікам «Нашай нівы» і завочна пасябраваў з супрацоўнікамі газеты. Творчасць М. Багдановіча развівалася ў атмасферы вострых сацыяльна-палітычных канфліктаў пачатку XX ст. З самага пачатку творы паэта былі прасякнуты пафасам патрыятычнага служэння сацыяльнаму і нацыянальнаму вызваленню беларускага народа, ідэямі роўнасці і братэрства, гуманістычнымі ідэаламі. Тэма сацыяльнага прыгнёту і нацыянальнага адраджэння беларусаў выразна прагучала ў першых лірычных вершах: «Над магілай», «Прыйдзе вясна», «На чужыне», «Краю мой родны! Як выкляты богам…», кароткім вершаваным лірычным апавяданні «З песняў беларускага мужыка», якія былі апублікаваныя ў «Нашай ніве». Асноўным зместам вершаў, якія потым склалі цыклы «Старая Беларусь», «Места», «Згукі Бацькаўшчыны», «Старая спадчына», была барацьба за гуманістычныя ідэалы. На першы план у іх выходзіла тэма паднявольнага жыцця беларускага народа, моцна гучалі таксама ідэі нацыянальна-вызваленчай барацьбы супраць царскай імперыі. Не прымаючы тагачаснай рэчаіснасці, уціску чалавека-працаўніка, Багдановіч проціпастаўляў ім агульначалавечыя духоўныя пачаткі прыгожага і добрага.

У Вільні на пачатку 1914 г., у друкарні Марціна Кухты, пры грашовай падтрымцы Магдалены Радзівіл, выдадзены адзіны прыжыццёвы зборнік твораў М. Багдановіча «Вянок». Зборнік змяшчаў 92 вершы і 2 паэмкі, размешчаныя на 120 старонках, якія былі аб’яднаныя па нізках: «Малюнкі і спевы», «Думы» і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Мадонны». У вершах паэт выказаў глыбокае і рознабаковае разуменне гісторыі беларускага народа, яго багатых дзяржаўна-палітычных і культурных традыцый.

Беспрэцэдэнтнай па шырыні і разнастайнасці творчага дыяпазону з'яўляецца дзейнасць М. Багдановіча ў галіне беларускага мастацкага перакладу. Ён пераклаў на беларускую мову вершы Поля Верлена, Эміля Верхарна, Генрыха Гейнэ, Аляксандра Пушкіна, Авідзія, Гарацыя і іншых замежных паэтаў, на рускую – творы Янкі Купалы, Тараса Шаўчэнкі, Івана Франко.

Акрамя таго, у рускім і ўкраінскім друку з'яўляюцца публіцыстычныя артыкулы М. Багдановіча на рускай мове, прысвечаныя пытанням гісторыі літаратуры, нацыянальным і грамадска-палітычным праблемам; выходзяць гістарычныя і краязнаўча-этнаграфічныя брашуры, а таксама літаратуразнаўчыя рэцэнзіі. У іх зроблены сістэматызаваны і комплексны агляд гісторыі беларускай літаратуры ад XII да пачатку XX ст. ва ўзаемасувязі з агульнаславянскім і ўсееўрапейскім культурным кантэкстам. У артыкуле «Беларускае адраджэнне» і публічных выступленнях крытык выявіў грунтоўную дасведчанасць у нацыянальна-вызваленчых рухах у Беларусі і братніх славянскіх краінах. Галоўным матывам для многіх паэтычных і іншых публіцыстычных твораў М. Багдановіча была беларуская мова. Творца быў перакананы, што захавацца, забяспечыць за сабой пачэснае месца сярод цывілізаваных народаў нашай планеты беларусы змогуць толькі праз сваю родную мову.

У скандэнсаваным выглядзе культуралагічныя ідэі выяўляюцца ў працы «Беларускае адраджэнне» (1915), дзе вызначана перыядызацыя нацыянальна-вызваленчага руху на працягу XIX – пачатку XX ст. М. Багдановіч вылучаў дарэформенны этап, які характарызуецца ажыўленнем лакальнага патрыятызму ў часткі інтэлігенцыі. Падчас паслярэформеннага этапу (1860–1890-я гг.) адбываецца зараджэнне народніцка-сацыялістычнага руху, паглыбленне навуковага вывучэння культуры Беларусі. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. паклала пачатак якасна новаму этапу, калі адбываецца паглыбленне і дынамізацыя дзейнасці грамадска-культурных суполак і беларускамоўных выданняў, выступаюць на арэну барацьбы за незалежнасць Беларусі Я. Колас, Я. Купала, А. Гарун, Ядвігін Ш. і інш.

У гэтай канцэптуальнай працы М. Багдановіч сфармуляваў праграмныя патрабаванні нацыянальна-адраджэнскага руху.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На яго погляд, неабходна дабівацца для Беларусі самакіравання ў межах «краёвай» аўтаноміі; неабходна скасаванне абмежаванняў у адносінах да беларускай мовы, увядзенне яе ў школьнае навучанне, дзяржаўныя ўстановы і царкоўна-рэлігійны ўжытак [20].

У разглядаемай працы, а таксама ў артыкуле «Новая інтэлігенцыя» М. Багдановіч абгрунтаваў культуратворчую ролю беларускай інтэлігенцыі. Межы інтэлігенцыі ён акрэсліваў двума патрабаваннямі: яна павінна мець імкненне да ведаў і несці свае веды на карысць народу.

Творца праводзіў ідэю адкрытасці беларускай нацыі, яе культуры сусветнай цывілізацыі, падкрэсліваў неабходнасць культурнага дыялогу з памежнымі суб’ектамі культуры, у прыватнасці з польскім і рускім народам.

М. Багдановіч адным з першых пачаў распрацоўваць такія паняцці, як «беларускі народ», «беларуская культура», «беларуская нацыя», «беларуская мова», «нацыянальная свядомасць», «нацыянальнае пачуццё».

Такім чынам, публіцыстычная, мастацка-творчая і грамадская дзейнасць М. Багдановіча адыграла выключную ролю ў фарміраванні ідэйна-эстэтычных асноў беларускай нацыянальнай культуры, арыентаванай на патрыятычныя традыцыі, багацце фальклору, на лепшыя здабыткі сусветнай культуры.

### 5.3.6. Сістэматызацыя культурна-гістарычнага шляху беларусаў

Праблемы духоўнага сталення нацыі, актывізацыі глыбінных культурных патэнцый беларусаў, росту іх нацыянальнай самасвядомасці ўвасобіў у сваёй творчай спадчыне ***Максім Іванавіч Гарэцкі*** (1893–1938). Нарадзіўся літаратуразнавец у в. Малая Багацькаўка Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні ў сялянскай сям’і. У 1913 г. ён скончыў каморніцка-агранамічнае вучылішча ў Горы-Горках, у 1916 г. – Паўлаўскае ваеннае вучылішча ў Петраградзе. Працоўную дзейнасць пачаў у Вільні ў якасці чарцёжніка, каморніка землеўпарадкавальных камісій Віленскай губерні. У час Першай сусветнай вайны быў прызваны ў расійскую армію восенню 1914 г. Быў цяжка паранены ў першых баях, доўга лячыўся ў ваенных шпіталях

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вільні, Масквы, Магілёва. Потым у чыне прапаршчыка служыў у Іркуцку і Гжацку, у канцы 1916 г. – на фронце ў пінскіх балотах. Тут цяжка захварэў і быў адасланы ў тыл на лячэнне, а ў 1917 г. – звольнены з войска. Пераехаў у Смаленск, дзе паступіў у археалагічны інстытут. Служыў у Смаленскім Савеце, паралельна супрацоўнічаў у газетах «Известия Смоленского Совета», «Звязда». Разам з рэдакцыяй «Звязды» ў 1919 г. пераехаў у Менск, потым у Вільню.



Падчас акупацыі Вільні польскім войскам працаваў настаўнікам Віленскай беларускай гімназіі і беларускіх настаўніцкіх курсаў. Супрацоўнічаў у газетах «Беларускія ведамасці», «Беларускі звон». Рэдагаваў газеты «Наша думка», «Беларускія ведамасці». У студзені 1922 г. быў арыштаваны польскімі ўладамі як палітычны злачынца і зняволены ў Лукішскую турму ў Вільні. У выніку пратэстаў за мяжой супраць масавых арыштаў беларускіх і літоўскіх дзеячаў прымусова высланы ў Савецкую Беларусь. У кастрычніку 1923 г. пераехаў з сям'ёй з Вільні ў Мінск, дзе выкладаў мову і літаратуру ў БДУ, Камуністычным універсітэце БССР, Мінскім ветэрынарным тэхнікуме, Горацкай сельгасакадэміі. Вёў даследчую дзейнасць у Інбелкульце і Акадэміі навук.

У канцы 1920-х гг. разам з іншымі беларускімі дзеячамі стаў аб'ектам кампаніі «крытыкі» ў друку. У ліпені 1930 г. быў арыштаваны па абвінавачанні ў прыналежнасці да Саюза вызвалення Беларусі, у 1931 г. засуджаны да высылкі на пяць гадоў у горад Вятку, дзе працаваў чарцёжнікам, тэхнікам-рахункаводам, настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе г.п. Пясочня. Увесь гэты час займаўся літаратурнай працай. У лістападзе 1937 г. быў зноў арыштаваны і расстраляны па прысудзе «тройкі» НКУС у Вязьме. Рэабілітаваны 15 лістапада 1957 г.

Літаратурная творчасць М. Гарэцкага пачалася ў 1912 г., калі ў газеце «Наша ніва» было апублікавана яго апавяданне «У лазні». У 1914 г. пабачыў свет зборнік прозы «Рунь». У перыяд з 1914 г. па 1919 г. з-пад пяра пісьменніка выйшла шмат твораў, якія адлюстроўвалі шырокі спектр сацыяльных,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палітычных, духоўных праблем беларускага народа, супярэчнасці яго нацыянальнага характару: «Генерал», «Рускі», «Антон», «Дзве душы», «Літоўскі хутарок», «Чарнічка», «Хадзяка», «На этапе» і інш. Творы 1920-х гг. адметныя глыбокім псіхалагізмам і гістарычнай панарамнасцю: «У чым яго крыўда», «Чырвоныя ружы», «Жартаўлівы Пісарэвіч», «Усебеларускі з'езд 1917-га года», «На імперыялістычнай вайне» і інш. У шэрагу твораў пісьменнік звяртаўся да праблемы ўзаемаадносін інтэлігента і народа, да ролі і місіі інтэлігенцыі ў нацыянальным развіцці (аповесць «Меланхолія», апавяданне «Фантазія» і інш.).

У раманах-хроніках «Камароўская хроніка» і «Віленскія камунары», напісаных у пачатку 1930-х гг., прадстаўлена панарамнае гісторыка-мастацкае палатно лёсу беларусаў на працягу амаль паўтара стагоддзя.

У сваіх мастацкіх і навукова-публіцыстычных творах М. Гарэцкі паслядоўна праводзіў хрысціянска-этычны ідэал міласэрнасці, справядлівасці, чалавекалюбства, міру ў адносінах паміж людзьмі і народамі. Пісьменнік імкнуўся разбурыць негатыўны стэрэатып аб тым, што беларусы ніколі не мелі ўласнай самастойнасці, а былі заўсёды часткай польскай ці расійскай дзяржавы. Таму праблема культурнай памяці была галоўнай у многіх яго творах. Асабліва абвострана прааналізавана яна ў артыкулах «Развагі і думкі», «Наш тэатр». Ідэю духоўнага і сацыяльна-палітычнага самасцвярджэння беларусаў М. Гарэцкі выказаў у фундаментальнай навуковай працы «Гісторыя беларускай літаратуры», дадаткам да якой стала «Хрэстаматыя беларускай літаратуры: XI–1905 год», надрукаваная ў Вільні ў 1922 г. Тут зроблены навуковы аналіз тысячагадовай гісторыі беларускай культуры – ад хрысціянскай міфалогіі да культуратворчых набыткаў пачатку 1920-х гг. У творы развіты ідэі Я. Коласа, Я. Купалы аб культурнай памяці. Памяць разглядалася творцам не проста як адзін з многіх элементаў культуры, але як нейкая субстанцыя, з дапамогай якой замацоўваюцца ўсе элементы ў адно цэлае. Культура – структура гістарычнай памяці не толькі ўсяго чалавецтва, але і асобнага народа. На погляд аўтара, беларусы не згубяцца ў свеце, будуць вартымі рэчаіснасці XX ст. і будучыні пры ўмове стварэння этнанацыянальных форм культурнага жыцця. Этнанацыянальнае выступала для М. Гарэцкага адным з крытэрыяў развітасці і

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

цывілізаванасці беларускага грамадства, магчымасці эфектыўнай прысутнасці ў сусветнай культуры.

Пісьменнік прыходзіць да высновы, што нацыянальна-культурнае адраджэнне з'яўляецца заканамерным гісторыка-культурным працэсам у Беларусі. На працягу многіх стагоддзяў беларусы мелі сваю дзяржаўнасць, якая заўсёды пазітыўна ўплывала на развіццё духоўнай і матэрыяльнай культуры. У якасці прыкладу аўтар прыводзіць Вялікае Княства Літоўскае, калі адбыўся сапраўдны росквіт беларускай мовы, пісьменства, архітэктуры, народнай культуры. Крызіс беларускай культуры ў наступныя стагоддзі ён тлумачыць стратай ВКЛ дзяржаўнай незалежнасці, павярхоўнай «вонкавай культурнасцю» беларускай арыстакратыі і шляхты, якія арыентаваліся на польскія духоўна-культурныя і рэлігійныя ўзоры. На погляд пісьменніка, у захаванні культурна-моўнай самабытнасці станоўчую ролю адыграла ўніяцкая царква, духавенства якой трымалася беларускай мовы і традыцый.

У кнізе дадзены глыбокі аналіз стану этнаграфіі і фалькларыстыкі таго часу. М. Гарэцкі адзначаў важную ролю прац П. Бяссонава, Я. Карскага, І. Насовіча, М. Нікіфароўскага, Е. Раманава, М. Янчука ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. У шырокім сацыяльным і нацыянальна-адраджэнскім кантэксце ім разгледжана творчасць пісьменнікаў-нашаніўцаў М. Багдановіча, З. Бядулі, А. Гаруна, К. Каганца, Я. Коласа, Я. Купалы, Цёткі і інш. [35].

Такім чынам, можна канстатаваць, што М. Гарэцкі зрабіў выключна важкі ўклад у развіццё беларускай гуманітарнай, у тым ліку і культуралагічнай думкі. «Гісторыю беларускай літаратуры» можна па праву лічыць першай гісторыяй айчыннай культуры.

## 5.3.7. Мадэль культурнай аўтаноміі Цішкі Гартнага

Творчая спадчына ***Цішкі Гартнага*** (Зміцера Хведаравіча Жылуновіча) (1887–1937) з'яўляецца адметнай вяхой на шляху развіцця і станаўлення беларускай культуралогіі. Нарадзіўся пісьменнік у мястэчку Капыль у сям'і бедных сялян-чорнарабочых. Першапачатковую адукацыю атрымаў дома, потым была вучоба ў хатніх настаўнікаў. У 1902 г. паступіў у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

двухкласнае Капыльскае народнае вучылішча. Пасля яго заканчэння паступіў на працу ў гарбарную майстэрню ў родным мястэчку. У 1909–1912 гг. у пошуках працы аб’ездзіў многія гарады Беларусі, Украіны, Літвы і Латвіі.

У 1913 г. трапіў у Пецярбург. Тут ён становіцца карэспандэнтам бальшавіцкай газеты «Правда». Пяць месяцаў працаваў на заводзе «Вулкан», затым тры месяцы быў беспрацоўным. У хуткім часе ўладкаваўся на працу ў выдавецтва «Новый человек». У 1915 г. быў мабілізаваны ў войска, але праз месяц адпушчаны. У 1916 г. працаваў у Беларускім бежанскім камітэце.



Кастрычніцкая рэвалюцыя прынесла шмат перамен. У лютым 1918 г. Ц. Гартнага прызначаюць сакратаром Беларускага камісарыята пры ўрадзе РСФСР. З сакавіка гэтага ж года ён рэдактар першай беларускай савецкай газеты «Дзянніца». Пасля абвяшчэння БССР Ц. Гартны – Старшыня Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада. Пазней у розныя гады быў рэдактарам газеты «Савецкая Беларусь» і часопіса «Полымя», дырэктарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР, намеснікам міністра асветы БССР. Працаваў у Інстытуце беларускай культуры. З 1929 г. з’яўляўся правадзейным членам Акадэміі навук БССР. Падчас сталінскіх рэпрэсій неаднаразова выключаўся з бальшавіцкай партыі за ўдзел у «контррэвалюцыйных арганізацыях беларускіх нацыянал-дэмакратаў». У 1936 г. быў арыштаваны органамі НКУС. Спачатку ўтрымліваўся ў мінскай турме, а пазней пераведзены ў Магілёўскую псіхіятрычную лячэбніцу, дзе і памёр.

Першыя вершы на беларускай мове напісаў у 1904 г. У 1908 г. у штотыднёвай беларускай газеце быў надрукаваны яго першы верш, прысвечаны Я. Купалу. У 1910 г. з’явіўся верш «Не хіліся, дуб зялёны», прысвечаны Я. Коласу.

Паэтычны зборнік Ц. Гартнага «Песні» выйшаў у 1913 г. у Пецярбургу. Зборнік вызначаецца народным поглядам паэта на працу, якую ён лічыў не толькі асновай матэрыяльнага існавання, але і першай умовай духоўнага жыцця. У вершах «Красуй, збожжа!», «Песні жняі», «Касьба», напісаных у рэчышчы нацыянальнай традыцыі, Ц. Гартны паэтызуе сялянскую працу. Лейтматывам цыкла «Песень працы» з’яўляецца думка паэта аб тым, што людзі працы – сяляне і рабочыя – творцы жыцця,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стваральнікі ўсяго каштоўнага на зямлі. Паэтычны зборнік Ц. Гартнага, які выйшаў у Берліне ў 1922 г., меў назву «Песні працы і змагання». Ён тэматычна працягваў матывы першага зборніка.

У паэме «Паэт, маці і муза» (1915) Ц. Гартны вызначыў сваё паэтычнае крэда, назваў сваю музу «музай змагання», падкрэсліўшы тым самым сілу паэзіі, яе непарыўную сувязь з жыццём і барацьбой народа.

Ц. Гартны выступаў і ў жанры сатырычнага верша, байкі, фельетона. Пад псеўданімам «Авадзён» у перыядычным друку з'явіліся яго вершы «Пан, якіх многа», «Папоўскія гадкі», «Сымон-пан», «Бог памагае» і інш.

Як празаік Ц. Гартны спрабаваў свае сілы ў розных формах эпічнага жанру: пісаў нататкі, нарысы, абразкі, апавяданні, аповесці, раман «Сокі цаліны». Яго апавяданні аб'яднаны ў зборнікі «Трэскі на хвалях» (1923) і «Прысады» (1927). Творчасці пісьменніка ўласцівы класавы падыход да падзей і з'яў рэчаіснасці, але адначасова выразна акрэслена і гуманістычная тэндэнцыя. Кірунак гэтай тэндэнцыі быў вызначаны яшчэ ў нашаніўскі перыяд, калі ён знаходзіўся пад жыватворным уплывам паэзіі Я. Купалы і Я. Коласа. У творах, прысвечаных адлюстраванню дарэвалюцыйнай рэчаіснасці, празаік паказвае абумоўленасць учынкаў сваіх герояў сацыяльна-эканамічнымі абставінамі, жорсткую залежнасць ад іх.

Светапогляд пісьменніка эвалюцыяніраваў ад сацыял-дэмакрата леванародніцкага кірунку да бальшавіка і прадстаўніка левага фланга нацыянальна-вызваленчага руху. Перавагу аддаваў рэфармацыйным метадам, з дапамогай якіх імкнуўся дамагчыся беларускай дзяржаўнасці ў форме аўтаноміі ў складзе Расійскай дэмакратычнай рэспублікі. На думку Ц. Гартнага, права самастойнага кіравання ў галіне культуры, асветы і адукацыі беларускай і іншых этнічных супольнасцей можна ажыццявіць у шматэтнічным грамадстве, якім была Расія [45]. Прынцып культурна-нацыянальнай аўтаноміі для нацыянальнасцей, якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі, быў уключаны ў праграму Беларускай сацыялістычнай грамады. Гэта ідэя знайшла сваё адлюстраванне і ў праграмах Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі, Беларускай партыі сацыялістаў-федэралістаў. Пасля ўтварэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

БССР асноўныя палажэнні культурна-нацыянальнай аўтаноміі рэалізоўваліся ў працэсе беларусізацыі.

Будучы дзяржаўным дзеячам, супрацоўнікам Інбелкульта Ц. Гартны імкнуўся паслядоўна адстойваць права кожнай нацыі, якая пражывала на тэрыторыі БССР, на магчымасць навучання на роднай мове, раўнапраўе ў якасці дзяржаўных беларускай, рускай, польскай, яўрэйскай моў і інш. Пры яго намаганні побач з беларускімі адкрываліся школы для нацыянальных меншасцей, ствараліся культурна-асветныя ўстановы, на чатырох мовах выдаваліся газеты. Культурна-нацыянальная аўтаномія спалучалася з элементамі нацыянальна-палітычнай. З сярэдзіны 1920-х гг. у БССР пачалі арганізоўвацца нацыянальныя Саветы, якія садзейнічалі гаспадарчаму ўздыму, абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці этнасаў, павышэнню іх культурнага ўзроўню.

Канцэпцыю культурна-нацыянальнай аўтаноміі падтрымлівала большасць беларускіх дзеячаў нашаніўскага перыяду: А. Бурбіс, М. Багдановіч, браты А. і І. Луцкевічы, К. Каstравіцкі, А. Пашкевіч (Цётка) і інш.

Адмоўныя адносіны партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва СССР да праграмы культурна-нацыянальнага адраджэння прывялі ў 1930-я гг. да яе згортвання, а яе тэарэтыкаў – да праследаванняў за нацыянальна-дэмакратычныя погляды.

## 5.4. Метадалагічныя прынцыпы вывучэння беларускай культуры

### 5.4.1. Разнастайнасць канцэпцый культуры

Гуманітарная думка XX ст. характарызуецца наяўнасцю розных тэарэтычных плыней і школ, для якіх агульным і, як правіла, адзіным прадметам аналізу выступаюць розныя аспекты культуры. Фарміруецца асобны падыход да даследавання культуры, які імкнецца вывучаць толькі гэты ўнікальны кампанент сферы чалавечай дзейнасці. У выніку пераасэнсавання статусу тэарэтычных ведаў і спосабаў іх пабудовы ўзнікае сінергетычны кірунак у даследаванні культуры. Галоўная задача прадстаўнікоў сінергетычнай парадыгмы заключалася ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тым, каб знайсці ў нетрах самой культуры рухаючыя яе дынаміку сілы. Стрыжнем сінергетычнага разумення працэсу развіцця культуры з’яўляецца прынцып нелінейнага руху культурнага працэсу. Развіццё культуры, на думку прадстаўнікоў сінергетыкі, адбываецца стыхійна, залежыць як ад унутранага стану культуры, так і ад уздзеяння асяроддзя, на ім сказваецца і сіла выпадковасцей, і свабода творчай асобы.

Такі падыход да дынамікі культуры дазваляе знайсці дыялектычныя ўзаемаадносіны адзінства і разнастайнасці ў культурным працэсе.

Значную папулярнасць набывае аксіялагічная трактоўка ідэі культуры, у аснову якой пакладзены тэзіс аб тым, што гуманістычная асоба не толькі спажывае каштоўнасці, але стварае і развівае іх па прычыне прафесійнай і асабістай патрэбнасці. Так, В. Віндэльбандам і Г. Рыкертам культура інтэрпрэтавалася як сукупнасць абсалютных прынцыпаў і абавязковых ацэнак, якія сцвярджалі незалежныя і самастойныя каштоўнасці. Праз каштоўнасці ацэнкі і суджэнні, на іх погляд, набываюць сілу і апраўданне [25; 132]. Паводле меркавання Г. Рыкерта, «толькі ў сферы культуры можна непасрэдна сустрэцца з рэальнасцю, якая звязана з такога рода значнымі каштоўнасцямі» [132, с. 69]. Таму культура як сукупнасць, якая валодае каштоўнасцю, і з’яўляецца прадметам гістарычнага пазнання.

Паралельна з вызначэннем культуры з дапамогай паняцця каштоўнасці фарміруецца вучэнне аб культуры як духу. Б. Крочэ, Р. Кронер разглядалі філасофію культуры як філасофію духу, мэтай якой павінна быць гістарычнае апісанне разнастайных форм культуры. Паняцце «дух» аб’ядноўвала ў сабе чатыры філасофскія катэгорыі – Ісціну, Дабро, Прыгожае і Карысць. Дух імі пакладзены ў аснову літаратуры, мастацтва, маралі, права, эканомікі, эстэтыкі. Паводле іх меркавання, мэтай філасофіі культуры з’яўляецца аб’яднанне ўсіх галін культурнай творчасці ў адзіную сэнсавую цэласнасць. Р. Кронер лічыў, што «рэфлексія стварае ступені цэласнасці культуры, пераўтварае кожную галіну культуры ў момант цэласнасці» [86, с. 279].

Да заслугі прадстаўнікоў вучэння аб духу неабходна аднесці і тое, што яны змаглі даць тэарэтычны сінтэз разнастайных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

галін культуры – мастацтва, літаратуры, эстэтыкі, этыкі, палітыкі і інш.

Шырокае прызнанне і папулярнасць у сярэдзіне мінулага стагоддзя атрымаў экзістэнцыялізм, які стаў адным з найбольш уплывовых і прадукцыйных культурагенных фактараў, ён вызначаў інтэлектуальна-духоўныя пошукі шырокіх слаёў інтэлігенцыі, аказаў моцны ўплыў на літаратуру, гісторыю, мастацтва. Да экзістэнцыялізму адносяцца канцэпцыі, якія часам разыходзяцца і нават аспрэчваюць адна адну па шэрагу прынцыпова важных пазіцый, такіх як праблема свабоды і аўтаноміі чалавека; быццё, чалавек і яго адносіны з быццём; свядомасць і канструяванне значэнняў вопыту і інш.

Значны ўплыў на філасофію і культуру XX ст. аказала фенаменалогія. Фенаменалагічная праблематыка атрымлівае сваё развіццё па розных кірунках: па лініі пошуку метафізічных абгрунтаванняў саміх прынцыпаў аналізу феноменаў; фенаменалогіі як метаду «пазнання іншага». Фенаменалагічны метад знайшоў выкарыстанне ў культуралогіі, псіхалогіі, псіхіятрыі, этыцы, эстэтыцы, сацыялогіі і інш.

Адным з уплывовых кірункаў культуралагічнага аналізу XX ст. стала герменеўтыка. Намаганні яе прадстаўнікоў (Э. Беці, М. Хайдэгер, Г.-Г. Гадамер, П. Рыкёр і інш.) былі скіраваны на распрацоўку ўсеагульнай тэорыі інтэрпрэтацыі, выяўленне агульнай гнасеалагічнай структуры, якая ляжыць у аснове ўсіх форм навуковага тлумачэння свету культуры.

У 1930-я гг. мінулага стагоддзя ў літаратуразнаўстве і мастацтвазнаўстве ўзнікае структуралізм, які выступае з прэтэнзіяй на ўніверсальнасць. Яго прадстаўнікі (К. Леві-Строс, Ф. дэ Сасюр і інш.) прапаноўвалі альтэрнатыўныя метады даследавання і вырашэння праблем сацыягуманітарных ведаў. Праўда, ён хутка трансфармаваўся ў постструктуралізм.

Такім чынам, у сусветнай гуманітарнай навуцы першай паловы XX ст. адбываецца трансфармацыя ўніверсальных схем, пераацэнка каштоўнасцей, калі на змену класічным тэорыям прыходзіць мадэрнісцкі пошук новых форм і спосабаў пазнання. Відавочна, дух часу – адмаўленне класічных падыходаў у мысленні – не мог не паўплываць на беларускіх філосафаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.4.2. Метафізічнае вымярэнне беларускага шляху І. У. Канчэўскім (І. Абдзіраловічам)

Пытанне беларускай ідэнтычнасці і пошуку сваіх ідэалаў з’яўляецца найважнейшым у творчасці ***Ігната Уладзіміравіча Канчэўскага*** (1896–1923). Нарадзіўся філосаф у сям’і сакратара акруговага вайсковага суда. У 1913 г. скончыў Віленскае рэальнае вучылішча. Потым навучаўся ў Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце, на гісторыка-філалагічным факультэце ў Маскоўскім універсітэце, на Вышэйшых кааператыўных курсах пры Універсітэце імя А. Л. Шаняўскага. У 1916 г. яго забралі ў войска, ваяваў у Румыніі, а падчас Лютаўскай рэвалюцыі апынуўся ва Украіне, дзе ўступіў ва ўкраінскае нацыянальнае войска, але пазней пакінуў фронт.

Пасля абвяшчэння БССР пераехаў са Смаленска ў Мінск, дзе працаваў у розных дзяржаўных установах. У вольны час займаўся актыўнай культурна-асветніцкай дзейнасцю. Пісаў вершы, палітычныя артыкулы, рэцэнзіі, якія друкаваліся ў газетах «Беларускія ведамасці», «Новае жыццё», «Наша думка» і інш. У 1923 г., будучы хворым на сухоты, памірае ў Вільні.



У паэтычных і публіцыстычных творах І. Канчэўскі ажыццяўляе пераацэнку ідэалаў і каштоўнасцей у кантэксце праблемы беларускай ідэнтычнасці. Паэтычная творчасць вызначаецца філасофскай пранікнёнасцю ў сутнасць народнага жыцця, спалучэннем прыгажосці беларускага слова з нацыянальным светабачаннем, замілаваннем да чалавека, верай у адраджэнне і будучы росквіт Беларусі.

Фарміраванне ўласнай ідэнтычнасці і пошук ідэалаў найбольш выразна праяўляецца ў яго філасофскім эсэ «Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду», выдадзеным у 1921 г. у Вільні [1]. Ужо ў назве адчуваецца кантэкст беларускай ідэнтычнасці. Шлях уяўляецца філасофу як адзін з архетыпаў, што злучае мінулае і будучыню, скіраваны наперад, да ідэалаў Адраджэння. Пошук свайго беларускага шляху як і пытанне ідэнтычнасці ў час дзяржаўна-культурнага адраджэння былі надзвычай актуальнымі. Да гэтай праблемы звярталіся

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў той час многія грамадскія дзеячы. Але толькі І. Канчэўскі надаў гэтай праблеме метафізічнае вымярэнне. Анталагічны статус Беларусі ў яго супадае са статусам мяжы паміж Усходам і Захадам, якая адначасова іх падзяляе і аб'ядноўвае, аднак пры гэтым не з'яўляецца ні тым, ні іншым. Але аўтара больш цікавіць не наяўнасць мяжы і нават не існаванне беларускага шляху, а здзяйсненне яго.

Эсэ пачынаецца з аналізу дэтэрмінантаў, якія абумовілі невыразнасць беларускай культуры: «У невыразнасці беларускай культуры хочуць бачыць духовую сьмерць народу, яго няздольнасць вызначыць свой духовы ідэал» [1, с. 8]. Прызнаючы невыразнасць беларускай культуры, І. Канчэўскі выяўляе яе прычыны. Паводле яго меркавання, гэта вынікае з падзеленасці/падвоенасці Беларусі. Кажучы пра падзеленасць, ён у першую чаргу мае на ўвазе падзеленасць беларусаў на рыма-каталікоў і праваслаўных. Філосаф адзначае, «што асоба, якая стаіць перад выбарам рэлігіі, выбірае адначасна і пэўны тып цывілізацыі, культурную традыцыю, сьветагляд, грамадзкі і дзяржаўны лад». Такім чынам, падвоенасць паводле веравызнання вядзе да падзеленасці на два цывілізацыйныя і культурныя тыпы ў межах адной культуры. Пачатак гісторыі ваганняў паміж Усходам і Захадам І. Канчэўскі звязвае з хрышчэннем Русі.

У працы даецца сутнаснае вызначэнне ўсходняй і заходняй культур. На думку філосафа, усходняя культура ўвасабляе схільнасць да ўсяго крайняга, выразнага, падкрэсленага; імкненне да агульнай «адналітнай» формы, з чаго вынікае ідэя адзінай палітычнай формы. Культура Захаду ўвасабляе поўную супрацьлегласць Усходу. Тут няма і не можа быць адзінай формы як у палітыцы, так і ў духоўным і сацыяльным жыцці. Яна адмаўляе адзінае правільнае і імкнецца да разнастайнасці. У такой сітуацыі, лічыць аўтар, неабходны сінтэз, згарманізаванне двух кірункаў. Беларуская культура павінна ўзяць лепшыя каштоўнасці заходняй і ўсходняй культур. Але пры гэтым трэба ствараць свае «беларускія формы жыцця».

Прычыну размытай ідэнтычнасці І. Канчэўскі бачыў у адсутнасці «ўласных форм жыцця» і ў панаванні чужых форм. З гэтай нагоды філосаф грунтоўна прааналізаваў трансфармацыю форм жыцця. Абапіраючыся на канцэпцыю «культурна-гістарычных тыпаў», ён разгледзеў гісторыю еўрапейскай культуры як гісторыю форм. І. Канчэўскі заўважае, што на



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

еўрапейскую культуру заметна паўплывала антычная культура. Але еўрапейскія народы прынялі толькі яе форму, не дух. Аднак змест і форма ўтвараюць дыялектычнае адзінства, і гэта аднабаковае запазычанне прывяло да негатыўных наступстваў. Форма жыцця замест таго, каб служыць чалавеку, пачала валодаць ім, сціскаючы і затрымліваючы яго духоўныя імкненні. Аўтар эсэ піша: «…чым слабей разьвіта духовасьць чалавека, тым большую вагу набірае форма: звычай, догмат, дактрына, незразумелы лёзунг <…> чым душа цямней, тым панаваньне формулы непадзельней» [1, с. 22]. У выніку еўрапейскае грамадства набывае культуру, якую І. Канчэўскі называе «духовым мяшчанствам», якая абапіраецца на дзве сілы – моду і дысцыпліну. З дапамогай іх адбылася экспансія на беларускія землі чужых форм як з Захаду, так і з Усходу. Самай моцнай экспансія заходняй і ўсходняй культур была ў XVIII–XIX стст. У сувязі з гэтым І. Канчэўскі вызначае важнейшую задачу нацыянальна-культурнага адраджэння: вызваленне ад чужых, «мёртвых» форм і стварэнне «беларускіх формаў жыцьця» [1, с. 17]. Але філосаф не адмаўляецца ад формы наогул, а лічыць неабходным падыходзіць да яе творча, не прывязвацца да пэўнай формы.

Праграма пераадолення чужых форм засноўваецца на ідэі «ліючайся формы». Абапіраючыся на тэзіс Геракліта, што нельга двойчы ўвайсці ў адну раку, усё цячэ, усё мяняецца, аўтар лічыць неабходным трымацца той формы, якая ўвесь час змяняецца. Праз увядзенне паняцця «ліючаяся форма» І. Канчэўскі выходзіць на сутнасць творчасці, якую ён даследуе ў двух аспектах: містычным (як касмічная сіла) і сацыяльным (як асноўны прынцып грамадскага жыцця). Містычную сутнасць творчасці ён бачыць у акце стварэння свету. У матэрыі як пачатку ўсяго існуючага зліты ўсе сілы: творчыя і дэструктыўныя, варожыя і прыяцельскія, але сама матэрыя ёсць толькі магчымасць тварыць, а не сама творчасць. Толькі чалавек на пэўным этапе эвалюцыі прыроды прыходзіць у свет, каб «разьвярнуць усю моц сваёй творчасьці, каб зьліцца ў творчым тэмпе сусьветнага дыханьня сусьветнай гармоніі» [1, с. 28].

Сацыяльны аспект творчасці разумеецца І. Канчэўскім як абавязак свабоднай, маральна трывалай творчасці ва ўсіх праявах жыцця – эканамічнай, сацыяльна-палітычнай і духоўнай. Тут жа ён адзначае, што ў тагачасным беларускім грамадстве



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адсутнічаюць умовы для сацыяльнай творчасці. Па-першае, пэўнымі сацыяльнымі формамі карыстаюцца пануючыя класы і штучна затрымліваюць іх развіццё. Па-другое, для сацыяльнай творчасці патрэбны значна больш спрыяльныя абставіны ў параўнанні з творчасцю індывідуальнай. Неабходнай умовай творчасці, на думку філосафа, з’яўляецца адсутнасць прымусу, г.зн. палітычная незалежнасць, якая разглядаецца ім як «падстава грамадзкай творчасьці, гэтай творчасьці і не хапала» [1, с. 34]. Творчасць І. Канчэўскі звязвае з неабходнасцю разбурэння. Ствараючы новыя формы грамадскага жыцця, мы з неабходнасцю разбураем старыя. Аднак творчасць і разбурэнне, сцвярджае аўтар, павінны быць не толькі ўзаемазвязаны, але і ўраўнаважаны.

Такім чынам, вырашэнне праблемы беларускай ідэнтычнасці бачылася аўтару эсэ як стварэнне беларускіх форм жыцця і разбурэнне чужых (як усходніх, так і заходніх) форм. Этыка-сацыялагічная канцэпцыя І. Канчэўскага была ўспрынята неадназначна тагачаснымі прадстаўнікамі беларускай гуманітарнай думкі. На старонках штотыднёвіка «Pzegald Wilenski» распачалася вострая дыскусія адносна кірунку развіцця беларускай культуры. Некаторыя аўтары абвінавачвалі філосафа ў анархізме за негатыўную ацэнку ўсіх тагачасных палітычных партый і кірункаў. Другія яго праграму дасягнення незалежнасці называлі ўтапічнай. Але незалежна ад супрацьлеглых ацэнак крытыкі сыходзіліся ў адным – у кожным выяўленні яго працы перш за ўсё відаць вялікае замілаванне чалавекам. У беларусе ён хацеў бачыць чалавека, вольнага ад духоўнага, палітычнага і эканамічнага рабства. Безумоўна, праблема беларускай ідэнтычнасці – найбольш складаная ў гуманітарных навуках, яна з’яўляецца прадметам і сучасных даследаванняў. І. Канчэўскі першы, хто сістэмна, на аснове глыбокага навуковага аналізу зрабіў спробу вызначыць важнейшыя падыходы да яе вырашэння.

### 5.4.3. Інтэрпрэтацыя канцэпцыі заходнерусізма А. І. Цвікевічам

Тэарэтычнае абгрунтаванне неабходнасці берагчы і ўзбагачаць свае духоўныя скарбы ўтрымліваецца ў працах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Аляксандра Іванавіча Цвікевіча*** (1888–1937). Выдатны палітычны дзеяч беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння нарадзіўся ў Брэсце ў сям'і фельчара чыгуначнай бальніцы. Скончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта. Пасля заканчэння яго працаваў прысяжным павераным у Пружанах і Брэсце.



Падчас Першай сусветнай вайны знаходзіўся ў Туле, прымаў актыўны ўдзел у дзейнасці Камітэта дапамогі ахвярам вайны. У 1917 г. у Маскве стаў адным з заснавальнікаў і кіраўнікоў Беларускай народнай грамады. Удзельнічаў у рабоце Усебеларускага з'езда. Пасля абвяшчэння БНР выконваў дыпламатычныя місіі ва Украіне і ў Заходняй Еўропе і Расіі. З 1921 г. па 1923 г. займаў пасаду міністра замежных спраў ва ўрадзе БНР, пэўны час узначальваў яе ўрад. У 1925 г., прызнаўшы Мінск адзіным цэнтрам нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння, А. Цвікевіч прыняў рашэнне аб спыненні дзейнасці Рады міністраў БНР і з сям'ёй пераехаў у БССР. Тут ён працаваў у Наркамаце фінансаў, потым – вучоным сакратаром у Інбелкульце, Інстытуце гісторыі Акадэміі навук БССР. У 1930 г. гісторык быў арыштаваны і абвінавачаны па справе Саюза вызвалення Беларусі. Пасля адбыцця пяцігадовай ссылкі быў арыштаваны паўторна і расстраляны ў Мінску ў 1937 г.

Паралельна з актыўнай палітычнай дзейнасцю А. Цвікевіч займаўся плённай навукова-публіцыстычнай дзейнасцю. Ён з'яўляецца аўтарам шасці манаграфій, а таксама шэрагу артыкулаў, эсэ і публікацый у тагачасным друку («Да пытання аб незалежнасці Беларусі», «Усе дарогі вядуць у Беларусь», «Незалежнасць як праграма сённяшняга дня», «Эўразійцы» і інш.). У сваіх працах філосаф даследаваў праблемы нацыянальна-культурнага адраджэння, фарміравання грамадска-палітычнай думкі ў Беларусі, станаўлення самасвядомасці і развіцця дзяржаўнасці беларускага народа.

У навуковую спадчыну А. Цвікевіча ўваходзяць такія працы, як «Кароткі нарыс узнікнення Беларускай Народнай Рэспуб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лікі» (1918), у якой ён ахарактарызаваў беларускі нацыянальны рух 1917–1918 гг., асабліва падкрэсліў значэнне акта 25 сакавіка 1918 г. пра абвяшчэнне незалежнасці БНР. Станаўленню беларускай ідэі публіцыст прысвяціў працу «Беларусь. Палітычны нарыс» (1919). У ёй даецца таксама грунтоўны аналіз тагачаснага стану вызваленчага руху. У кнізе «Адраджэнне Беларусі і Польшча» (1921) паказаў сутнасць канцэпцыі польскіх гісторыкаў і палітыкаў адносна «ўсходняга пытання», мэтай якіх было зрабіць Беларусь сваёй калоніяй. Увесь змест працы «Вялікае апрашчэньне ці вялікае ўдасканаленьне?» быў звернуты да той часткі інтэлігенцыі, якая скептычна і адмоўна адносілася да беларускага нацыянальнага адраджэння.

Найбольш значнай з пункту гледжання культуралогіі з’яўляецца праца А. Цвікевіча «“Западно-руссизм”: Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст.» (1929) [173], дзе аўтар усебакова прааналізаваў ідэалогію і практыку Расійскай імперыі, скіраваную на культурную асіміляцыю. Сутнасць канцэпцыі заходнерусізма заключалася ў адмаўленні гістарычнасці беларусаў як самастойнай і самабытнай этнічнай адзінкі, атаясамліванні іх з велікарускім этнасам. Канцэптуальнае афармленне заходнерусізма адбылося пасля паўстання 1863–1864 гг., калі ажыццяўлялася «русское дело в крае». Яго ідэолагамі былі прадстаўнікі кансерватыўных ліберальна-славянафільскіх колаў Расіі І. Аксакаў, П. Бацюшкаў, М. Каткоў, І. Карнілаў, К. Каўфман і інш. Названая канцэпцыя мела месца і ў Беларусі. Найбольш шчырымі прыхільнікамі заходнерусізма выступалі К. Гаворскі, М. Каяловіч, Л. Паеўскі, А. Пшчолка, Л. Саланевіч і інш.

### 5.4.4. Філасофія культуры М. А. Лоскага

Свае адносіны да ідэі адраджэння нацыянальнай культуры беларусаў выказаў ***Мікалай Ануфрыевіч Лоскі*** (1870–1965) у канцэпцыі няспыннага адухаўлення быцця. Нарадзіўся філосаф у мястэчку Краслаўка Дынбургскага павета Віцебскай губерні. Бацькі яго паходзілі з беларускага шляхецкага роду. Пачатковую адукацыю атрымаў у Віцебскай гімназіі, але не закончыў яе, таму што быў выключаны за прапаганду сацыялізму і атэізму. Грунтоўныя гуманітарныя веды атрымаў у Бернскім,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Санкт-Пецярбургскім універсітэтах. Пазней паглыбляў веды ў шэрагу нямецкіх універсітэтаў. Быў запрошаны ў Санкт-Пецярбургскі ўніверсітэт, дзе спачатку займаў пасаду прыват-дацэнта, а потым прафесара.



Навукова-педагагічную дзейнасць М. Лоскі спалучаў з рэвалюцыйна-прапагандысцкай. Так, напярэдадні рэвалюцый 1917 г. ім былі напісаны працы «Чего хочет партия народной свободы» і «Про социализм», у якіх выкладзены сацыяльна-палітычныя патрабаванні партыі кадэтаў. За ліберальна-дэмакратычныя погляды быў высланы ў 1922 г. савецкім урадам за мяжу. Працаваў прафесарам філасофіі ў Празе, Браціславе, ЗША. Памёр у Парыжы.

Па сваіх поглядах М. Лоскі належаў да рэлігійных філосафаў артадаксальна-праваслаўнай арыентацыі. Паводле яго канцэпцыі «рэальнага ідэалізму» аснову быцця складаюць духоўныя, надзеленыя свабоднай воляй сутнасці – патэнцыяльныя і рэальныя «субстанцыяльныя дзеячы». Яны пачынаюцца ад элементарных часцінак і канчаюцца чалавекам, грамадствам, нацыяй, урэшце, космасам – рэалізацыяй сусветнага духу. Філасофія культуры М. Лоскага грунтуецца на ідэі няспыннага адухаўлення быцця. Паводле меркавання філосафа, нацыя і нацыянальная дзяржава з'яўляюцца «субстанцыяльнымі дзеячамі» і тыпамі асобы больш высокага парадку, чым асобны чалавек. Індывід, на яго думку, можа задавальняцца статусам фармальнага грамадзяніна дзяржавы, застаючыся абыякавым да культуры і лёсу нацыі [101].

Па поглядах у адносінах да нацыянальна-культурнай самастойнасці беларусаў М. Лоскі быў блізкі да заходнерусізма. Так, беларусаў і ўкраінцаў ён лічыў «галінамі рускага народа», які стварыў вялікую дзяржаву з сусветнай культурай. У артыкуле «Украінскі і беларускі сепаратызм» філосаф адмаўляў права беларускага і ўкраінскага народаў на стварэнне нацыянальнай дзяржаўнасці. Беларускую літаратурную мову называў «страшна неэстэтычным і некультурным дыялектам». Такі падыход у многім тлумачыцца яго прыналежнасцю да філасофскай артадаксальна-праваслаўнай плыні, якая падтрымлівала

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ідэю непадзельнасці праваслаўнай Расіі, а таксама адарванасцю ад беларускай культуры.

## 5.5. Развіццё тэарэтычнай этнакультуралогіі ў першай палове XX ст.

### 5.5.1. Канцэпцыя этнакультурагенезу Я. Ф. Карскага

На аснове глыбокага параўнальна-гістарычнага даследавання беларускай традыцыйнай культуры ***Яўхім Фёдаравіч Карскі*** (1861–1931) упершыню навукова абгрунтаваў нацыянальную самабытнасць беларусаў як самастойнага суб’екта гістарычнага тыпу культуры. Нарадзіўся філолаг-славіст у в. Лаша Гродзенскага павета. Пачатковую адукацыю атрымаў у Ятранскім народным вучылішчы, закончыў Мінскае духоўнае вучылішча і семінарыю, Нежынскі гістарычна-філалагічны інстытут. Пасля паспяховага заканчэння інстытута выкладаў рускую мову і літаратуру ў Віленскай гімназіі.



У 1893 г. Я. Карскі быў запрошаны для выкладання славянскіх моў у Варшаўскі ўніверсітэт. У гэты перыяд ён сістэматычна займаецца даследаваннем гісторыі беларускай мовы, фальклору, пісьменнасці. Ужо ў 1894 г. за працы па беларусазнаўстве быў узнагароджаны вялікім залатым медалём Расійскага геаграфічнага таварыства. У 1896 г. за даследаванне «Заходнерускія пераклады псалтыра ў XV–XVII стст.» атрымаў навуковую ступень доктара філалогіі ў Маскоўскім універсітэце. Літаратуразнавец таксама быў абраны членам Археаграфічнай камісіі Маскоўскага археалагічнага таварыства. У 1901 г. за працы ў галіне палеаграфіі Пецярбургская акадэмія навук узнагародзіла яго Ламаносаўскай прэміяй.

У 1905 г. Я. Карскі ўзначаліў самы значны на той час у Расіі часопіс «Русский филологический вестник», дзе змясціў шмат сваіх навуковых прац. У тым жа годзе стаў першым абраным рэктарам Варшаўскага ўніверсітэта. Дарэчы, на гэту пасаду славуты мовазнавец перавыбіраўся двойчы. У 1915–1916 гг. фальклярыст працаваў у Растове-на-Доне, куды быў эвакуі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раваны Варшаўскі ўніверсітэт. У перыяд з 1919 г. па 1920 г. працаваў у Мінску, Петраградзе. Тут Я. Карскі стаў адным з актыўнейшых арганізатараў акадэмічнай навукі і працягваў даследаваць беларускую традыцыйную культуру.

Я. Карскі – аўтар больш за 700 прац па славістыцы, беларусістыцы і русістыцы. Сярод іх неабходна адзначыць такія грунтоўныя даследаванні, як «Славянская кірылаўская палеаграфія» (1928), «“Руская праўда” паводле старажытнага спіса» (1930) і інш. Але найбольш фундаментальнай яго працай, сапраўднай энцыклапедыяй беларусазнаўства па праву лічыцца трохтомнае даследаванне «Беларусы» (1903–1922), у якой ён выявіў этнагенез беларусаў, акрэсліў этнічныя межы беларускага этнасу [71].

На падставе абагульнення фактычнага матэрыялу вучоны сцвярджаў, што прарадзімай славян з’яўлялася Палессе (басейн Прыпяці, верхняга Нёмана і ніжняй Бярэзіны). Паводле меркавання этнографа, у аснову беларускай народнасці ляглі плямёны дрыгавічоў, крывічоў і радзімічаў. Ён даказаў, што беларусы былі аўтахтонамі на сваіх землях. Грунтоўна даследаваны культурны стан плямён, якія склалі аснову беларускай народнасці. У трэцім томе паказаны сямейныя і грамадскія ўзаемаадносіны беларусаў, апісаны іх жыллё, заняткі, побыт, ежа, светапогляд, рэлігійныя вераванні, міфалогія. У цеснай сувязі з паказам асаблівасцей абрадаў і звычаяў разгледзеў Я. Карскі разнастайныя фальклорныя жанры, выявіў сувязь беларускага фальклору з фальклорам рускага і ўкраінскага народаў.

У другім томе «Мова беларускага племені» даследаваны важнейшыя этапы гісторыі беларускай мовы, яе спецыфічныя асаблівасці і ўзаемасувязі з рускай, украінскай, польскай, літоўскай і іншымі мовамі. Я. Карскі ўпершыню паспрабаваў вызначыць рэгіёны бытавання беларускай мовы. Значная частка працы прысвечана даследаванню гукавога і граматычнага ладу старабеларускай і сучаснай беларускай мовы ў яе народна-дыялектнай і літаратурнай формах.

У раздзеле «Старая заходнеруская пісьменнасць» мовазнавец праанaлізаваў помнікі старажытнай беларускай літаратуры XIV–XVIII стст. Найбольш поўна паказаны культурна-гістарычныя перадумовы зараджэння пісьменнасці на старабеларускай мове, вызначаны змест літаратурна-мастацкай спадчыны беларусаў. Не абыйшоў увагай вучоны і беларускую літаратуру

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

XIX – пачатку XX ст., звязаную з нацыянальна-культурным адраджэннем.

Такім чынам, Я. Карскі, абапіраючыся на прынцыпы культурна-гістарычнай школы, зрабіў вялікі ўклад у фарміраванне айчынных гуманітарных навук, у тым ліку і ў культуралогію. Яго навуковая спадчына не страціла сваёй значнасці для сучаснай культуралогіі, высновы вучонага з'яўляюцца асновай для далейшай распрацоўкі тэорыі і гісторыі беларускай культуры.

### 5.5.2. Выяўленне самабытнасці нацыянальнай культуры беларускага этнасу Е. Р. Раманавым

Збіранню твораў вусна-паэтычнай творчасці і даследаванню культуры і быту беларускага народа ўсё жыццё прысвяціў ***Еўдакім Раманавіч Раманаў*** (1855–1922). Нарадзіўся будучы этнограф у мястэчку Нова-Беліца Гомельскага павета ў беднай мяшчанскай сям'і. Навучаўся ў Гомельскай прагімназіі, на курсах настаўнікаў рускай мовы і гісторыі. У 1872 г. Е. Раманаў накіраваны на працу ў Герасімаўскае народнае вучылішча Хлыстоўскай воласці Аршанскага павета. Працаваў настаўнікам 14 гадоў, 20 гадоў выконваў абавязкі інспектара народных вучылішч у Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай губернях. На працягу 1897–1903 гг. Е. Раманаў з'яўляўся рэдактарам у газеце «Могилевские губернские ведомасти», з 1910 г. – загадчыкам секцыі этнаграфіі і археалогіі Паўночна-Заходняга аддзялення Рускага геаграфічнага таварыства. Апошнія гады жыцця навукоўца прайшлі ў Стаўрапалі (1917–1922), дзе ён працягваў займацца даследаваннем праблем фалькларыстыкі і этнаграфіі.



З самага пачатку Е. Раманаў спалучаў педагагічную працу з этнаграфічнай і навуковай дзейнасцю. Этнограф вывучаў матэрыяльную і духоўную культуру беларусаў: жыллё, адзенне, сямейны побыт, народныя абрады, вераванні, дзіцячыя гульні, народны каляндар, медыцыну. Важнае месца ў яго даследаваннях займала і мовазнаўчая тэматыка. На жаль, не ўсе сабра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя ім моўныя матэрыялы і завершаныя мовазнаўчыя даследаванні былі апублікаваны, не ўсе нават захаваліся ў рукапісах. Займаўся вучоны збіраннем твораў вусна-паэтычнай творчасці і даследаваннем культуры і быту беларускага народа. Ужо ў 1877 г. ён паведамляў Расійскай акадэміі навук, што за пяць гадоў настаўніцкай працы ім сабрана 2000 беларускіх слоў і з гэтага матэрыялу складзена «Спроба беларускага слоўніка», а ў якасці ўводзін да яго – «Кароткая беларуская граматыка». Супрацоўнікі Аддзялення рускай мовы і славеснасці Акадэміі навук прапанавалі яму аформіць свой слоўнік як дапаўненне да слоўніка І. І. Насовіча. На працягу наступных пяці гадоў Е. Раманаў збіраў не зафіксаваныя І. І. Насовічам словы на тэрыторыі Магілёўшчыны, лексікаграфічна апрацоўваў іх. Далейшая праца над слоўнікам была спынена, бо Е. Раманаў заняўся падрыхтоўкай да друку сваёй асноўнай фальклорна-этнаграфічнай працы – «Беларускага зборніка», своеасаблівай энцыклапедыі побыту, творчасці, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа XIX – пачатку XX ст. Планавалася выдаць матэрыялы ў 15 кнігах. Аднак пры жыцці Е. Раманава выйшла 9 тамоў (1886–1912), 10-ы том выпусціў Інбелкульт (1928), падрыхтаваныя 11–14-я тамы загінулі ў Другую сусветную вайну, лёс 15-га тома невядомы [135].

Значнай працай вучонага з'яўляюцца «Матэрыялы па гістарычнай тапаграфіі Віцебскай губерні. Павет Веліжскі» (1898), навуковыя вывады ў якой зроблены на аснове асабістых даследаванняў. У гэты перыяд апублікавана каля 100 розных прац. Пад яго рэдакцыяй выйшлі тры выпускі «Магілёўскай даўніны» (1900, 1901, 1903), два выпускі «Матэрыялаў па этнаграфіі Гродзенскай губерні» (1911, 1912), адзін выпуск «Крыніц для гісторыі Магілёўскага краю» (1916). У 1886–1894 гг. Е. Раманаў займаецца археалагічнымі раскопкамі на тэрыторыі Магілёўскай і Віцебскай губерній як самастойна, так і па даручэнні і на сродкі Маскоўскага археалагічнага таварыства, правадзейным членам якога ён з'яўляўся, і Археалагічнай камісіі. Археалагічныя і этнаграфічныя калекцыі Е. Раманава ўзбагацілі многія айчынныя і замежныя музеі. Так, у Эрмітажы захоўваецца 1017 экспанатаў Е. Раманава, у Музеі антрапалогіі і этнаграфіі імя Пятра І Акадэміі навук Расіі – 1007, у Дзяржаўным музеі этнаграфіі народаў Расіі – звыш 1100, у Гісторыка-этнаграфічным музеі Акадэміі навук Літвы – 242, якія



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даюць багацейшыя матэрыялы для вывучэння гісторыі Беларусі, Літвы і Латвіі. За гэты перыяд вучоны надрукаваў каля 60 артыкулаў, нарысаў, рэцэнзій і заметак па беларускай этнаграфіі, археалогіі, гісторыі і філалогіі, склаў археалагічныя карты Магілёўскай, Віцебскай і Гродзенскай губерній, сабраў звесткі пра 1000 гарадзішчаў Беларусі, выявіў шмат стаянак першабытнага чалавека, удзельнічаў у рабоце Дзявятага археалагічнага з'езда ў Вільні (1893). Каля в. Высокі Гарадзец Талачынскага раёна ён адкрыў помнік эпіграфікі XII ст. – «Рагвалодаў камень». Па ініцыятыве Е. Раманава і пры яго актыўным удзеле былі заснаваны Віцебскі, Магілёўскі і Віленскі этнаграфічныя музеі (куды даследчык перадаў шмат уласных знаходак), неаднаразова наладжваліся выстаўкі.

Дзейнасць Е. Раманава адзначана малым і вялікім залатымі медалямі, а таксама дыпломамі навуковых таварыстваў. Адкрыцці вучонага добра дакументаваныя і апрацаваныя, яны даюць багацейшыя матэрыялы для вывучэння гісторыі Беларусі, Літвы і Латвіі. На працы Е. Раманава абапіраліся наступныя пакаленні археолагаў, фалькларыстаў, этнографаў і мовазнаўцаў. Шэраг яго навуковых высноў пакладзены ў аснову сучасных айчынных культуралагічных даследаванняў.

### 5.5.3. Канцэпцыя культурна-гістарычнага развіцця М. В. Доўнар-Запольскага

Важкі ўклад у этнаграфічна-фалькларыстычную навуку зрабіў ***Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі*** (1867–1934), які нарадзіўся ў г. Рэчыца Мінскай губерні ў сям'і калежскага сакратара. Адукацыю атрымаў у Рэчыцкім народным вучылішчы і Мазырскай прагімназіі. Вучобу працягваў у Кіеўскай гімназіі і Кіеўскім універсітэце. Пасля заканчэння ўніверсітэта (1894) працаваў у Маскоўскім архіве Міністэрства юстыцыі і адначасова выкладаў у гімназіях. З 1901 г. выкладаў гісторыю ў Кіеўскім універсітэце, з'яўляўся дырэктарам створанага ім Кіеўскага камерцыйнага інстытута. У 1920-я гг. працаваў у Харкаўскім інстытуце народнай гаспадаркі, Азербайджанскім універсітэце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Плённым перыядам у педагагічнай і навуковай дзейнасці вучонага былі гады, калі ён жыў і працаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце і Інбелкульце (1925–1926). У гэты час ён даследаваў сацыяльна-эканамічную структуру беларуска-літоўскай дзяржавы XVI–XVIII стст., старажытныя беларускія архівы па-за межамі БССР, інтэнсіўна працаваў над гісторыяй і культурай беларускага народа ад эпохі першабытнага ладу да пачатку 1920-х гг. Закончаная «Гісторыя Беларусі» ўяўляла сабой сістэматызаванае абагульненае даследаванне этнагенезу беларусаў. Былі апублікаваны таксама «Народное хозяйство Белоруссии, 1861–1914 гг.» (1926), «Старыя беларускія архівы за межамі БССР» (1926).

Апошнія гады яго жыцця звязаны з Масквой, дзе наш суайчыннік займаў пасаду прафесара ў Ціміразеўскай сельскагаспадарчай акадэміі і Інстытуце народнай гаспадаркі імя Г. В. Пляханава.

Велізарную каштоўнасць для даследчыкаў беларускай культуры маюць фальклорна-этнаграфічныя працы М. Доўнар-Запольскага: «Белорусская свадьба и свадебные песни» (1888), «Белорусское Полесье» (1895), «Западнорусская сельская община в XVI в.» (1897), «Беларуская гаворка» (1890) і інш. У іх утрымліваецца каштоўны матэрыял пра сямейны побыт, сямейнае звычаёвае права, абрады беларусаў. Не страціла навуковай значнасці і распрацаваная ім Праграма этнаграфічнага вывучэння Беларусі.

Этнограф напісаў шэраг публіцыстычных артыкулаў, у якіх абгрунтоўваў гістарычныя падставы неабходнасці стварэння незалежнай беларускай дзяржавы, выступаў за развіццё беларускай культуры, навукі і літаратуры, ставіў праблему неабходнасці нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі. У навукова-публіцыстычным нарысе «Асновы дзяржаўнасці Беларусі» на падставе аналізу гістарычна-эканамічнага і эканамічнага фактараў абгрунтаваў права беларускага народа на

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУКИ

суверэннасць. Публіцыст абвергнуў погляд на беларусаў як на народ, пазбаўлены нацыянальнасці, рашуча падтрымліваў беларускае нацыянальнае адраджэнне ў пачатку XX ст., вітаў з'яўленне «строга аб'ектыўнай і навуковай» плыні ў беларускіх гістарычных і этнаграфічных даследаваннях [67].

М. Доўнар-Запольскі з'яўляецца аўтарам больш за 150 прац па гісторыі Кіеўскай Русі, Маскоўскай дзяржавы, Расіі ў XIX ст., гісторыі Літвы і Беларусі, па сацыяльна-палітычных рухах, сялянскім пытанні і этнаграфіі Беларусі. У іх гісторык сцвярджаў існаванне беларускай нацыі з уласнай гісторыяй, выразнымі этнаграфічнымі рысамі, багатай народнай культурай, з уласнай беларускай мовай як спадчынніцай дыялектаў крывічоў і дрыгавічоў. Працы яго пераважна мелі навукова-аналітычны характар. Навуковец шырока карыстаўся ў сваіх працах матэрыяламі больш за 20 архіваў (Масква, Санкт-Пецярбург, Кіеў, Вільня, Варшава, Кракаў, Львоў, Кастрама, Яраслаўль, Ноўгарад, Нясвіж і інш.). У іх утрымліваецца грунтоўны культуралагічны кантэкст.

### 5.5.4. Аналіз этнакультурных працэсаў А. Я. Багдановічам

Вывучэннем фальклорна-этнаграфічнай спадчыны беларускага народа на працягу ўсяго жыцця займаўся ***Адам Ягоравіч Багдановіч*** (1862–1940). Нарадзіўся ён у мястэчку Халопенічы Бабруйскага павета. Тут атрымаў першапачатковую адукацыю і два гады працаваў памочнікам настаўніка. У 1879 г. паступіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, дзе стварыў гурток самаадукацыі з найбольш здольных семінарыстаў. Гурткоўцы



акрамя дазволенай літаратуры нярэдка чыталі літаратуру рэвалюцыйнага зместу і горача абмяркоўвалі прачытанае.

Пасля заканчэння семінарыі (1882) А. Багдановіч працаваў настаўнікам у сельскай школе ў Ігуменскім павеце, загадчыкам Мінскага гарадскога пачатковага вучылішча. Педагагічную дзейнасць настаўнік спалучаў з рэвалюцыйнай прапагандай сярод вучнёўскай моладзі, настаўнікаў, вайскоўцаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З 1892 г. А. Багдановіч служыў у Гродзенскім аддзяленні Сялянскага пазямельнага банка. Некаторы час кіраваў публічнай бібліятэкай. У лістападзе 1896 г. ён быў пераведзены па службе ў Ніжні Ноўгарад. Тут у яго завязаліся сяброўскія адносіны з М. Горкім. З 1907 г. жыццё і дзейнасць А. Багдановіча звязаны з Яраслаўлем, дзе ён загадваў навуковай бібліятэкай Яраслаўскага дзяржаўнага музея і адначасова выкладаў гісторыю культуры ў мастацкім, музычным і тэатральным тэхнікумах.

Захапленне традыцыйнай культурай беларусаў праявілася ў А. Багдановіча даволі рана. Ужо ў семінарыі юнак збіраў і запісваў народныя казкі, легенды, паданні і песні. Значную іх частку перадаў П. В. Шэйну, які пэўную частку ўключыў у свой зборнік «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю». Багаты фактычны матэрыял і яго аналіз утрымліваюцца ў грунтоўнай працы А. Багдановіча «Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў», якая была апублікавана ў 1895 г. у Гродне. У гэтай працы зроблены сістэмны аналіз такіх перажыткаў, як анімізм, фетышызм, культ сонца і інш.

Асобны цыкл прац («Этнічны склад народаў славянскіх і рускіх», «Этнічны склад насельніцтва Верхняга Паволжа, Акі і Камы») прысвечаны вывучэнню этнакультураўтваральных працэсаў ва Усходняй Еўропе. Этнагенез і культурагенез разглядаюцца этнографам на аснове даных археалогіі, антрапалогіі, геаграфіі, палеанталогіі.

Старажытная тапаніміка шырока выкарыстана мовазнаўцам у якасці этналагічнага і культурна-гістарычнага матэрыялу ў працы «Мова зямлі. Утварэнне водарачных імёнаў і што ад іх паходзяць». Значную колькасць артыкулаў па сацыяльнай праблематыцы апублікаваў А. Багдановіч у перыядычных выданнях Беларусі і Расіі («Пра паншчыну», «Да гісторыі партыі “Народная воля” ў Мінску і Беларусі», «Рэвалюцыйны рух у Мінску і губерні ў 80-х і пачатку 90-х гадоў» і інш.) [70].

Навуковыя працы даследчыка традыцыйнай культуры беларусаў былі высока ацэнены беларускімі этнографамі, фалькларыстамі і мовазнаўцамі. Значная частка спадчыны А. Багдановіча захоўваецца ў Інстытуце літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 5.5.5. Прынцыпы даследавання этнарэгіянальных культур Беларусі

Этнаграфічныя матэрыялы, якія характарызуюць Палескі рэгіянальны тып культуры, сабраў і абагульніў ***Ісак Абрамавіч Сербаў*** (1871–1943), які нарадзіўся ў в. Кульшычы Прапойскага павета Магілёўскай губерні. Будучы этнограф у 1892 г. скончыў Полацкую настаўніцкую семінарыю, у 1901 г. – Маскоўскі археалагічны інстытут. Працаваў настаўнікам у Мінску, у беларускіх мястэчках. У 1910–1912 гг. як член Паўночна-Заходняга аддзела Расійскага геаграфічнага таварыства наладжваў экспедыцыі ў Беларусь. У 1919–1921 гг. працаваў у аддзелах народнай асветы Магілёўскай і Гомельскай губерняў, удзельнічаў у працы па зборы і ахове помнікаў мастацтва і гісторыі. З 1923 г. працаваў выкладчыкам, загадчыкам кафедры этнаграфіі БДУ, з 1925 г. – сакратаром секцыі этнаграфіі Інбелкульта. З 1929 г. – навуковы сакратар кафедры этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР.



*Паштовая марка Беларусі, прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння І. Сербава*

Даследаваць матэрыяльную культуру, вусную паэтычную і музычную творчасць беларускага народа І. Сербаў пачаў у другой палове 1920-х гг. Ім вывучаны курганы дрыгавічоў і радзімічаў каля Быхава, Мінска і Мазыра. Археолаг раскапаў і абследаваў каля 100 насыпаў і апісаў больш за 30 гарадзішчаў, селішчаў і стаянак.

Этнограф сабраў багатыя калекцыі народнага адзення і мастацтва, на аснове якіх выдадзены альбом «Беларускае народнае мастацтва». Ён першы з беларускіх этнографаў стварыў вялікую фотатэку, у якой зафіксаваны тыпы адзення жыхароў розных куткоў Палесся, жылля, гаспадарчых пабудоў, вырабы рамёстваў. Сабраныя этнаграфічныя матэрыялы і назіранні абагульніў у працах «Сяло Вялікае; Малюнкі з жыцця Беларусі» (1910), «Паездкі па Палессі 1911 і 1912 гг.» (1914), «Беларусы-сакуны» (1915).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 5.5.6. Лінгвакультуралагічны аспект у даследаваннях культуры А. К. Сержпутоўскага

Значны ўклад у беларускую фалькларыстыку, этнаграфію і мовазнаўства ўнёс ***Аляксандр Казіміравіч Сержпутоўскі*** (1864–1940). Нарадзіўся ён у в. Бялевічы Слуцкага павета Мінскай губерні ў беднай сялянскай сям'і. У 1884 г. скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю і пачаў працаваць настаўнікам у Мазырскім павеце. Прыкладна ў гэтыя гады А. Сержпутоўскі сур'ёзна захапіўся навуковай работай. У «Мінскіх губернскіх ведамасцях» у 1891 г. з'яўляецца першая публікацыя А. Сержпутоўскага «Голос из глуши», у якой ён пазнаёміў чытачоў з жыццём і побытам сялян-палешукоў в. Лучыцы Мазырскага павета. За час настаўніцтва на Мазыршчыне ён апублікаваў у гэтай газеце больш за дваццаць навуковых і пазнавальных артыкулаў.

У 1893 г. А. Сержпутоўскі пераехаў у Мінск, дзе пачаў працаваць пісарам у Мінскім аддзяленні Сялянскага пазямельнага банка, а потым у паштова-тэлеграфным ведамстве. У 1896 г. – пераехаў у Санкт-Пецярбург, дзе ўладкаваўся на працу на Галоўпаштамт. Работу спалучаў з вучобай у археалагічным інстытуце, які паспяхова закончыў у 1904 г. Паралельна з вучобай у інстытуце А. Сержпутоўскі займаўся на Вышэйшых юрыдычных курсах. З 1906 г. яго дзейнасць была звязана з Рускім музеем, дзе ён працаваў у этнаграфічным аддзеле. Менавіта з гэтага часу і пачалася яго сапраўдная навуковая дзейнасць.

У гэты перыяд малады вучоны двойчы пабываў у экспедыцыях на Палессі і сабраў там багатую этнаграфічную калекцыю, зрабіў мноства фотаздымкаў, запісаў свае назіранні за ўкладам жыцця беларусаў-палешукоў. А. Сержпутоўскі зрабіў шмат цікавых запісаў пра вёскі Ганцаўшчыны, якія абагульніў у этнаграфічным нарысе «Белорусы-полешуки: Постройки, занятия и поверия крестьян северной половины Мозырского и южной части Слуцкого уездов Минской губернии» (1908). У працы этнограф апісаў побыт, заняткі і вераванні сялян гэтага рэгіёна. Да таго ж перыяду адносяцца нарысы «Сябрына», «Бонда», «Талака», «Каўтун», «Запасванне гаўяда», «Паморак», «Земледельческие орудия Белорусского Полесья», «Ловля вьюнов», «О завитках в Белоруссии» і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Матэрыял, які мае вялікую навуковую значнасць для даследчыкаў культуры, утрымліваецца ў зборніку «Сказки и рассказы белорусов-полешуков» (1911). Менавіта ў гэтай кніжцы змешчаны шматлікія казкі і паданні, якія аўтар запісаў у в. Чудзін ад тутэйшых казачнікаў. Фалькларыст поўнасцю захаваў у ім сацыяльна-крытычную накіраванасць твораў, а таксама асаблівасці апавядальнікаў. Дадзеная праца з'яўляецца каштоўнейшай крыніцай для вывучэння беларускіх гаворак.

Навукова-даследчая дзейнасць вялася А. Сержпутоўскім і ў галіне мовазнаўства. Ён грунтоўна вывучаў дыялекты беларускай мовы, вынікі даследавання сістэматызаваны ў кнізе «Грамматический очерк белорусского наречия деревни Чудин Слуцкого уезда Минской губернии» (1911).

Шэраг публіцыстычных артыкулаў А. Сержпутоўскі прысвяціў пытанням станаўлення беларускай народнасці, паходжання і сутнасці рэлігіі. Яго шматлікая навуковая спадчына захоўваецца ў Музеі этнаграфіі, Рускім музеі, Расійскай акадэміі навук (Санкт-Пецярбург), у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і з'яўляецца бясцэннай крыніцай для культуролагаў [141].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Раздзел 6**

# БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРАЛОГІЯ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX – ПАЧАТКУ XXI ст.

## 6.1. Адметнасці сацыякультурных працэсаў інфармацыйнага грамадства

З незвычайнай вастрынёй паўстала ў сярэдзіне XX ст. праблема чалавека – яго месца ў свеце і роля ва ўсіх працэсах, якія выступаюць дваяка: як вынік развіцця ўсёй мінулай культуры і як пачатак наступных эпох. Праз чалавека праходзіць дэмаркацыйная лінія, якая адлучае мінулае ад будучыні.

Непрыманне негатыўных наступстваў постіндустрыяльнага грамадства спрыяла ўзнікненню разнастайных альтэрнатыўных форм жыццеўладкавання: экалагічныя рухі; утапічныя камуны; арганізацыі, што ўзніклі на аснове розных усходніх містычных вучэнняў; авангардныя плыні, звязаныя з пакланеннем музычна-эстрадным тыпам масавай культуры, і інш.

З сярэдзіны XX ст. у духоўным жыцці развітых краін, якія ўступілі ў постіндустрыяльную эпоху, выразна праяўляецца кірунак, што атрымаў назву постмадэрнізм. Ён заметна паўплываў на ідэалагічнае і рэлігійнае жыццё, літаратуру і мастацтва, на гуманітарныя веды. Постмадэрнісцкая ментальнасць складвалася як пераадоленне не толькі класічных, але і мадэрнісцка-авангардных установак і арыентацый, як адаптацыя духоўнай дзейнасці да ўмоў сталага дэмакратычнага грамадства, якое адрозніваецца плюралізмам у самых разнастайных сферах быцця.

Постмадэрнізм узнік як антытэза культуры, якая засноўвалася на каштоўнасцях і ідэалах Асветніцтва, і вылучыла ў якасці ядра культуры паняцце моўнай гульні. Дадзеная парадыгма апісвала культуру як разнастайнасць «моўных гульняў» – ад мовы прыказак і пытанняў да больш складаных сімвалічных форм навукі. Паводле меркавання прыхільнікаў постмадэрнізму, гэтыя гульні не падначальваюцца розным правілам. Іх можна мяняць у працэсе гульні, і яны не могуць прэ-

тэндаваць нават на мінімальную ступень універсальнасці і абавязковасці.

Постмадэрнізм уяўляе сабой, як лічаць некаторыя яго даследчыкі, нігілістычны комплекс, які прадугледжвае не столькі пераацэнку каштоўнасцей, колькі адмаўленне класічных каштоўнасцей і норм, вылучэнне на першы план несвядомай суб’ектыўнасці, прыярытэту вітальных, эмацыянальных і цялесных патрэбнасцей чалавека і пераўтварэнне рацыянальнасці і нават мовы ў сродак рэпрэсіўнага выцяснення эмоцый і пачуццяў.

У канцы ХХ ст. працэс культурнай інтэграцыі набірае сілу. Ідзе развіццё рознабаковых міжнародных культурных кантактаў, ствараюцца новыя міжнародныя культурныя, навуковыя, спартыўныя і іншыя арганізацыі, усталёўваюцца агульнапрынятыя для ўсіх краін нормы міжнароднага права, палітычнага жыцця, маралі. Усё гэта дазваляе нам гаварыць аб працэсе глабалізацыі сучаснай культуры.

Тэрмін «глабалізацыя» ў грамадскіх навуках ужываецца для абазначэння паскоранага працэсу інтэграцыі нацый у сусветную сістэму ў сувязі з развіццём сучасных транспартных сродкаў і эканамічных сувязей, а таксама ўзмацнення сродкаў масавай інфармацыі. Агульнапрынятая пазітыўная ацэнка глабалізацыі як працэсу пэўнага аб’яднання чалавецтва ў адзіную гаспадарчую сістэму толькі на базе сучаснай матэрыяльнай культуры, тэхнікі мае традыцыйны характар і абапіраецца на традыцыйна пазітыўную ацэнку амаль класічных ужо мадэлей агульнаграмадскага індустрыяльнага развіцця.

Пытанне аб уздзеянні на гісторыка-культурны працэс, аб глабальным мадэліраванні і планаванні мае ўжо не толькі тэарэтычнае, але і практычнае значэнне. Зразумела, каб ажыццявіць ідэальна плануючую функцыю, неабходна мець прагнастычную мадэль развіцця свету. Праблемы будучага культурна-гістарычнага развіцця ўвасобіліся ў выглядзе шэрагу культуралагічных канцэпцый. Так, А. Маслоу ўскладае свае надзеі на стварэнне будучага грамадства, у якім рашаючую ролю будуць адыгрываць самаактуалізуючыеся і схільныя да вышэйшых перажыванняў індывіды [116]. С. Хантынгтон у сваёй комплекснай праграме глабальнага мадэліравання праводзіць ідэю, што культурныя асаблівасці больш значныя, чым палітычныя і сацыяльныя разыходжанні, і фундаментальнай пра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

блемай сучаснай эпохі з’яўляецца супрацьстаянне сучаснага і традыцыйнага [168].

Праблема самасвядомасці, ідэнтычнасці таксама набывае ўсё больш вызначальнае значэнне менавіта на ўзроўні вылучаных культурцывілізацый, ці метакультур. Гэта таксама звязана з усведамленнем канфліктнасці свету і будучымі сутыкненнямі цывілізацый па «лініях культурных разломаў», г.зн. прасторавых меж метакультурных супольнасцей. Напрыклад, С. Хантынгтон выказвае меркаванне аб тым, што адрозненні паміж цывілізацыямі-культурамі велізарныя і яшчэ доўга будуць заставацца такімі [168]. Сапраўды, цывілізацыі непадобны па сваёй гісторыі, культурных традыцыях, рэлігіях. У людзей розных культурцывілізацый адрозніваюцца ўяўленні аб свеце ў цэлым, аб свабодзе, мадэлях развіцця, аб адносінах паміж індывідам і супольнасцю, аб Богу.

Асаблівую ролю ў вызначэнні абрысаў будучага культурнага свету пачынае адыгрываць фундаменталізм (строгае выкананне архаічных норм, вяртанне да былых парадкаў), перш за ўсё ў выглядзе рэлігійных рухаў. Вяртанне да традыцыйных культурных каштоўнасцей, на наш погляд, ёсць рэакцыя на экспансію глабальнай культуры ў развіваючыеся краіны. Дадзеная з’ява ахапіла ў першую чаргу краіны ісламскай метакультуры, якая адыгрывае істотную ролю ў сучасным свеце. Асноўны «культурны разлом» навукоўцы бачаць у супрацьстаянні Захаду астатняму свету. Выйсце з такога становішча бачыцца ў змене супрацьстаяння палітычных сістэм дыялогам розных культур, фарміраванні шматполюснага полікультурнага ўзаемадзеяння. Сёння паступова адбываецца пераарыентацыя сучаснай індустрыяльнай культуры на больш інтравертную, звернутую да ўнутранага свету чалавека. Гэта выяўляецца ў вялікай цікавасці да асобаснага самаўдасканалення, да рэлігійных сістэм, у непрыманні маладым пакаленнем рацыянальна-рэчавага падыходу да жыцця, ва ўзнікненні субкультур і контркультуры, пошуку сэнсу існавання ў заходняй культуры. Як адзінка знешняга геапалітычнага ўзаемадзеяння заходняя культура іманентна імкнецца да мадэрнізацыі, абнаўлення.

Такім чынам, дынаміка культуры ў кантэксце глабалізацыі будзе залежаць ад узаемадзеяння культурцывілізацый, ад вырашэння канфлікту паміж сучаснасцю і традыцыйнасцю, ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстання асаблівасцей культурна-гістарычнага шляху розных народаў.

На працягу ўсяго разглядаемага перыяду ўзнікалі і развіваліся канцэпцыі, якія імкнуліся асэнсаваць складаную, шматгранную, дынамічна развіваючуюся сучасную культуру, у якой увасабляюцца творчыя здольнасці чалавека, яго духоўны свет.

## 6.2. Сацыядынаміка беларускай культуры на мяжы тысячагоддзяў

Праблемы, аб якіх вялася размова вышэй, былі характэрны і для сучаснага беларускага грамадства. Акрамя таго, сацыякультурнае развіццё ў Беларусі мела яшчэ свае спецыфічныя асаблівасці. У другой палове мінулага стагоддзя назіраецца крызіс савецкай культуры, які выклікаў змены каштоўнасна-сэнсавага ядра монастылістычнай сацыялістычнай культуры, сістэмы патрэбнасцей, мэт і матывацый асобы, зніжэнне ўзроўню сістэмна-іерархічнай структураванасці, складанасці і поліфункцыянальнасці культурнага комплексу соцыуму, дамінаванне адмоўна накіраванага экзістэнцыяльнага стану індывіда. Дэградацыя падсістэмы каштоўнасных арыентацый, традыцыйнай маралі спарадзіла масіфікацыю разнастайных форм дэструкцыі сацыяльнага і асобаснага характару: аномію, агрэсію, бунт, канфармізм, рытрызм, рытуалізм, эскапізм і інш. Адным словам, на пераломным этапе грамадскага развіцця ў культуры ўзніклі дэструктыўныя механізмы, выкліканыя сацыяльным крызісам; рэзкімі зменамі ў агульным ладзе сацыякультурнай арганізацыі і рэгуляцыі калектыўных форм жыццядзейнасці людзей. У 80-я гг. XX ст. у беларускім грамадстве склаліся ўмовы для развіцця дэструктыўных працэсаў у сацыякультурнай сферы. Паглыбленне супярэчнасцей паміж савецкай культурай і яе суб’ектамі прывяло да паступовага размывання функцыянальнай цэласнасці і збалансаванасці сацыякультурнай сістэмы, у пэўным сэнсе яе дысфункцыі, парушэння сацыяльнага адзінства. Гэту з’яву ў духоўнай сферы культуролагі абазначылі катэгорыяй «сацыякультурная дэструкцыя».

Ва ўмовах сацыякультурнай дэструкцыі развівалася культурная талерантнасць, крэатыўнасць, варыятыўнасць, фарміруецца транзітыўная полістылістычная культура. Паралельна з

разбурэннем ранейшых палітычных і эканамічных механізмаў і вылучэннем на першы план новых патрэбнасцей, інтарэсаў і мэт у беларускім грамадстве адбываецца інтэнсіўная сацыякультурная дзейнасць, што знаходзіць адлюстраванне ва ўзмацненні маргінальных з'яў у культуры. Найбольш хутка маргінальныя формы развіваліся ў мастацкай культуры.

Культурная разнастайнасць трансфармацыйнага грамадства стварыла ўмовы для паступовых змен сацыякультурных арыентацый яго суб'ектаў, індывідуалізацыі культурнага жыцця і функцыянавання розных субкультур, якія маюць выразна акрэсленыя граніцы ведаў, норм, каштоўнасцей, узораў, уяўленняў, густаў, ідэалаў, традыцый. У сучасным беларускім грамадстве адначасова існуюць разнастайныя субкультуры.

Сацыядынаміка ў беларускім грамадстве мае пэўныя спецыфічныя асаблівасці. Культурныя працэсы ў ім носяць пераважна эвалюцыйны характар. Гістарычнае змяненне культуры адбываецца паступова, без вострай сацыяльнай барацьбы, у выглядзе дэсемантызацыі яе асобных рыс і форм. Узнікненне новых культурных форм ажыццяўляецца па розных мадэлях: па шляху эвалюцыі ўскладнення іх арганізацыі і структуры, павышэння яе ўстойлівасці і функцыянальнай універсальнасці; мадэрнізацыі ў бок узмацнення іх утылітарнасці і сацыяльнай эфектыўнасці; рэактуалізацыі класічных культурных форм і ўключэння іх у сацыяльную практыку; інтэграцыі новых культурных форм у існуючую культурную сістэму.

Ажыццяўляемыя ў беларускім грамадстве трансфармацыі прывялі да паступовага нарастання пазітыўных змен у сацыякультурнай сферы. З сярэдзіны 90-х гг. XX ст. пачынаецца якасна новы этап фарміравання транзітыўнай полістылістычнай культуры, якая характарызуецца паступовым развіццём антыдэструктыўных механізмаў.

Глыбока закранула сацыядынаміку беларускай культуры тэхнагенная катастрофа, якая ўзнікла ў выніку аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі (1986). У выніку яе наступстваў адбылося комплекснае і пралангіраванае дэструктыўнае ўздзеянне на ўсе бакі жыццезабеспячэння і жыццядзейнасці суб'ектаў беларускай культуры. У посткатастрофным социуме адбыліся рэзкія змены рэальнага быцця, парушэнне сацыяльна-псіхалагічных механізмаў адаптацыі асобы. Фарміраванне каштоўнасных арыентацый характарызуецца хвараві-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тасцю, зніжэннем здольнасці асобы адэкватна рэагаваць на абставіны сацыякультурнага развіцця.

Абвяшчэнне ва ўмовах распаду СССР незалежнай унітарнай дэмакратычнай сацыяльна-прававой дзяржавы Рэспублікі Беларусь у 1991 г. актуалізавала пытанні дзяржаўна-культурнага будаўніцтва. Таму ў гэты перыяд цікавасць да вывучэння культуры істотна ўзрастае. Беларускія вучоныя сумесна з навукоўцамі сусветнай супольнасці спрабуюць адказаць на пытанне: «Што ўяўляе сабой гістарычны шлях чалавецтва – паслядоўнае развіццё па пэўнай схеме (стадыі, этапы) або ўзаемадзеянне розных тыпаў культурцывілізацый?». З такім аспектам аналізу цесна звязаны праблемы ўдасканалення культур, распрацоўкі мадэляў будучага развіцця і ўплыву чалавека на ход гісторыка-культурнага працэсу ў цэлым. У гэты час у навукова-даследчых і ўстановах вышэйшай адукацыі Беларусі ствараюцца кафедры культуралогіі, у вучэбны працэс уводзіцца культуралагічны курс. Цікавасць да дысцыплін культуразнаўчага цыкла з'яўляецца адной з найбольш прыкметных асаблівасцей сучаснай адукацыі. У працэсе культуралагічнай адукацыі моладзь рыхтуецца да асабістай арыентацыі ў сучасным свеце, да асэнсавання яе як сукупнасці культурных дасягненняў чалавечага грамадства. Культуралагічная адукацыя садзейнічае ўзаемаразуменню і прадукцыйным зносінам прадстаўнікоў розных культур. З улікам абазначаных асаблівасцей развівалася беларуская навуковая культуралагічная школа, якая пачала фарміравацца ў першай палове ХХ ст. Асноўнымі кірункамі яе даследаванняў з'яўляюцца заканамернасці развіцця і функцыянавання культуры як цэласнасці, спецыфічнай функцыі і мадальнасці чалавечага быцця. Беларускія культуролагі займаюцца вывучэннем канкрэтна-гістарычных з'яў і феноменаў нацыянальнай і сусветнай культуры.

## 6.3. Распрацоўка тэарэтыка-метадалагічных праблем беларускай культуры

У цэнтры ўвагі айчынных культуролагаў, філосафаў і сацыёлагаў у разглядаемы перыяд былі праблемы функцыянавання і развіцця духоўнай і матэрыяльнай культуры. Прадметам даследавання культуролага з'яўляліся артэфакты культуры,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прасторавая і часавая арганізацыя іх формы, свет каштоўнасцей, сімвалаў і знакаў як спосабаў існавання культуры, спосабаў яе ўспрымання як «сваёй», так і «чужой». Акрамя таго, прадстаўнікі гуманітарных навук вывучалі працэсы пераемнасці розных культур – ад культур этнасаў да культур нацый, разнастайныя працэсы ўзаемадзеяння розных культур – ад дыфузіі культур да інтэрферэнцыі, ад дыялогу паміж культурамі да супярэчнасцей паміж культурамі і цывілізацыямі. У працэсе даследавання выкарыстоўваліся разнастайныя метады, якія сфарміраваліся ў гуманітарных навуках. Сярод іх найбольш прыярытэтнымі былі метады параўнальна-гістарычнага аналізу, эвалюцыянізму, тыпалогіі, структурна-функцыянальны метад, біяграфічны, метад кантэнт-аналізу і г.д.

Даследчыкі звярталіся да аднаго з мноства аспектаў існавання матэрыяльнай ці духоўнай культуры, да аднаго з яе вельмі разнастайных працэсаў, каб, зыходзячы з канкрэтнасці аспекту, формы, працэсу, асэнсаваць культуру як цэласнасць, як шматузроўневую сістэму.

Фундаментам айчыннай культуралогіі з’яўляецца філасофія культуры, якая вызначае важнейшы фактар у асэнсаванні ўсёй культуры і яе разнастайных сегментаў. У папярэдніх раздзелах дадзенай працы мы паказвалі, што на ўсіх этапах гісторыі фарміравання культуралагічнай думкі філосафы мелі самае непасрэднае дачыненне да вывучэння культуры. Сучасныя беларускія філосафы працягваюць традыцыі сваіх папярэднікаў і эфектыўна займаюцца вывучэннем сусветнай і айчыннай культуры з розных метадалагічных падыходаў і канцэпцый.



Адным з прадметаў культуралагічных даследаванняў беларускага філосафа ***Яўгена Міхайлавіча Бабосава*** (нар. 1931) з’яўляецца асоба стваральніка культуры і адначасова яе прадукту. Пасля заканчэння БДУ там жа выкладаў філасофію, займаў пасаду прафесара ў Мінскім медыцынскім інстытуце. У апошні час навукова-даследчую дзейнасць сумяшчае з педагагічнай у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў.

У аснове канцэпцыі асобы знаходзіцца ідэя, што асоба – гэта хутчэй не суб’ект творчасці, але пасрэднік паміж ніжэйшым і вышэйшым светам. Чалавек, па меркаванні акадэміка Нацыя-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нальнай акадэміі навук Беларусі, з'яўляецца суб'ектам адносін і свядомай дзейнасці. Я. Бабосаў прыходзіць да высновы, што асоба фарміруецца пад уплывам грамадскіх адносін, культуры, непасрэднай сацыякультурнай прасторы. Ім паказаны адрозненні паняццяў «індывід», «індывідуальнасць» і «асоба». Пад індывідам філосаф разумее асобнага прадстаўніка чалавечага роду, а індывідуальнасць, на погляд даследчыка, ёсць сукупнасць рыс, якія адрозніваюць пэўнага індывіда ад усіх іншых.

У працах Я. Бабосава развіваюцца ідэі П. Біцылі, І. Грэўса, П. Карсавіна аб узаемаадносінах культуры і асобы. Ён аналізуе працэс станаўлення маральнай культуры, прасочвае эвалюцыю ўяўленняў грамадства аб дабры і зле, справядлівасці і дабрачыннасці, абавязку, гонары і інш. Аўтар лічыць мараль неад'емнай часткай, нават ядром культуры. Таму фарміраванне ў асобе характэрных пэўнаму грамадству, класу маральных якасцей і норм паводзін з'яўляецца важнейшай функцыяй культуры. Маральная культура фарміруецца пад уплывам выхавання, жыццёвага вопыту, працоўнай дзейнасці, уздзеяння мастацтва, уласнага імкнення да самаўдасканалення. Маральныя нормы, прынцыпы вельмі важныя ў рэгуляцыі дзейнасці асобы ў грамадстве і атрымліваюць каштоўнаснае абгрунтаванне ў выглядзе ідэалаў дабра і зла, справядлівага і несправядлівага і інш. На погляд філосафа, маральная культура ўключае культуру этнічнага мыслення, культуру пачуццяў, культуру паводзін, этыкет. Мараль не толькі рэгулюе паводзіны людзей, арыентуе іх у культуры, але і ўплывае на фарміраванне, станаўленне самога чалавека. Маральныя нормы не з'яўляюцца знешнім у адносінах да чалавека імператывам. У працэсе іх засваення чалавекам яны пераўтвараюцца ва ўнутраны рэгулятар паводзін, трансфармуюцца з ведаў у перакананні, пераходзяць у прывычку. Мараль, адзначае Я. Бабосаў, выступае і як асаблівая форма зносін людзей, што дае аксіялагічную афарбоўку культуры, грамадству, свету.

Пытанні ўзаемаадносін чалавека, грамадства і культуры закранаюцца і ў іншых навуковых працах акадэміка: «Сацыяльныя аспекты навукова-тэхнічнай рэвалюцыі» (1976) [6], «Чалавек на парозе рынку: Сацыяльныя чаканні насельніцтва» (1992) [7], «Катастрофы: сацыялагічны аналіз» (2000) [5]. У гэтых і іншых працах аўтар распрацаваў новыя канцэптуальныя падыходы да даследавання сацыякультурных аспектаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

постіндустрыяльнага беларускага грамадства, уплыву навукі, тэхнікі на развіццё духоўнага свету чалавека.

Цыкл прац Я. Бабосава прысвечаны выяўленню сутнасці і зместу нацыянальнай ідэалогіі, беларускай ідэі. На думку філосафа, ідэалогія з’яўляецца неад’емнай часткай сацыяльнай рэчаіснасці, палітычнага і духоўнага быцця грамадства, спецыфічнай арыентацыйна-каштоўнаснай свядомасцю, якая выражае інтарэсы розных сацыяльных супольнасцей і грамадства ў цэлым. Яе структуру складаюць такія кампаненты, як веды, каштоўнасці, нарматывы, погляды, дзеянні, перакананні, валявы кампанент. У навуковы ўжытак Я. Бабосаў уводзіць паняцце «нацыянальная ідэалогія», якое ўключае ў сябе сістэму поглядаў, заснаваную на прынцыпах агульнасці нацыі і прыярытэту яе інтарэсаў у розных сферах грамадскага жыцця. Рост нацыянальнай самасвядомасці ў нашай краіне прыводзіць да адраджэння нацыянальнай ідэалогіі, нацыянальнай культуры, мовы, традыцый, сімволікі. Ядром нацыянальнай ідэалогіі з’яўляецца беларуская ідэя, станаўленню якой паспрыялі сацыяльна-філасофскія і гуманістычныя ідэі Ф. Скарыны, С. Буднага, С. Полацкага, А. Гаруна, М. Абдзіраловіча, М. Багдановіча, Я. Купалы і інш. Нацыянальная ідэя, якая фарміруецца ў кантэксце традыцый нацыянальнай культуры, з’яўляецца крыніцай духоўнага ўзбагачэння, фарміравання гуманістычнага светапогляду, высокіх грамадзянскіх якасцей, адраджэння гістарычнай памяці і нацыянальнай самасвядомасці, пачуцця патрыятызму.

Я. Бабосаў стварыў беларускую школу філасофіі і культуралогіі. Пад яго навуковым кіраўніцтвам даследчыкамі абаронена звыш 30 доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый.



Асновы тэарэтычнай культуралогіі на шырокім факталагічным матэрыяле прадставіў у сваіх працах ***Мікалай Ігнатавіч Крукоўскі*** (1923–2013) Нарадзіўся будучы культуролаг у в. Машкова Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. На малой радзіме атрымаў сярэднюю адукацыю. Вайна перапыніла шлях да навукі. Юнак ідзе дабравольцам на фронт і змагаецца з ворагам у партызанскай брыгадзе Канстанціна Заслонава. За баявыя заслугі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М. Крукоўскі быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені, медалём «За адвагу», медалём «Партызану Айчыннай вайны» І ступені.

Пасля вайны М. Крукоўскі скончыў філалагічны факультэт БДУ (1950), абараніў кандыдацкую дысертацыю (1952). Яго навукова-педагагічная дзейнасць была звязана з БДУ, Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў, Нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтрам імя Ф. Скарыны. Доктарскую дысертацыю па філасофіі абараніў у 1986 г.

Сутнасць і роля культуры ў развіцці грамадства і чалавека разглядаюцца ў працах «Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію» (2000) і «Бляск і трагедыя ідэалаў: філасофскія эцюды пра ідэалы, дэмакратыю і сусвет» (2004). У перыяд фарміравання эксплiцытных культуралагічных ведаў вельмі своечасова М. Крукоўскім былі прааналізаваны метадалагічныя падыходы да вывучэння культуры, якія сфарміраваліся раней у філасофіі культуры. Культуролаг сцвярджае, што пры вывучэнні тэорыі культуры сёння ўжо недастаткова «абапірацца толькі на філасофскую метадалогію, няхай сабе і ўтвораную на аснове лепшых дасягненняў філасофіі сусветнай» [88, с. 11]. У дадатак да лагічнай дэдукцыі ён прапаноўвае агульную тэорыю сістэм з цесна звязаным з ёй структурна-функцыянальным метадам. Паводле меркавання філосафа, пры выкарыстанні гэтай тэорыі для культуралогіі адкрываюцца перспектыўныя ўзаемадачыненні з такімі канкрэтнымі навукамі, як семіётыка, тэорыя інфармацыі, матэматыка.

М. Крукоўскі паказвае, што тэорыя культуры не можа развівацца чыста дэдуктыўнымі метадамі, як бы строга яна не была вытрымана: «Тэорыя павінна абапірацца і на эмпірыю навуковую, гэта значыць эмпірыю, якая скарыстоўвае не толькі механічны збор фактаў, але і пэўную іх класіфікацыю, сістэматызацыю і абагульненне, па магчымасці з выкарыстаннем статыстыкі і тэорыі імавернасцей» [88, с. 12].

Значную ўвагу надае аўтар месцу і ролі стылю ў культуралогіі. Вучоны лічыць, што «паняцце стылю смела можна было б увесці ў ранг катэгорыі агульнакультуралагічнай» [88, с. 12–13]. Спасылаючыся на О. Шпенглера, ён надае катэгорыі стылю статус асноўнага класіфікацыйнага культурна-гістарычнага тыпу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковай вартасцю прац М. Крукоўскага з’яўляецца аналіз дыялектычнай будовы культуры. У адрозненне ад культуролагаў, якія падзялялі культуру на два асноўныя структурныя ўзроўні: культуру матэрыяльную і культуру духоўную, ён уводзіць трэці сярэдзінны ўзровень – культура мастацкая. У мастацкай культуры, лічыць даследчык, як у сярэдзінным пласце культуры скандэнсавана духоўнае і матэрыяльнае, унутранае і знешняе, змест і форма, якія выступаюць у пэўнай рухомай раўнавазе, у супярэчлівым адзінстве [88, с. 131]. Аўтар не абмяжоўваецца разглядам марфалогіі культуры, аналізуе катэгарыяльна-ацэначную і стылявую тыпалогіі мастацкай культуры, яе структуру, нават разглядае будову паасобных відаў і жанраў мастацтва на ўзроўні мікраструктуры.

Вельмі глыбока разглядаецца вучоным духоўна-культурная прастора і яе катэгарыяльная характарыстыка. Да асноўных культуралагічных катэгорый, адпавядаючых духоўнаму ўзроўню культуры, ён адносіць ісціну, дабро, мараль і права, святое і грахоўнае, рэлігію і царкву. У працы таксама вызначаюцца агульныя рысы структуры гэтых катэгорый.

Заслугоўваюць увагі меркаванні культуролага адносна цыклічнага развіцця культуры, што былі ім выказаны яшчэ ў 1965 г. незалежна ад О. Шпенглера, А. Тойнбі і П. Сарокіна, тады малавядомых яшчэ ў савецкай навуцы. У тых жа працах, амаль на дваццаць гадоў абагнаўшы С. Хантынгтана, была пастаўлена актуальная праблема ўзаемадзеяння розных культур і цывілізацый.

Навуковыя інтарэсы М. Крукоўскага ахопліваюць філасофію, лінгвістыку, эстэтыку. Так, асноўныя палажэнні эстэтычнай канцэпцыі вучонага выкладзены ў яго працах: «Логіка прыгажосці» (1965), «Асноўныя эстэтычныя катэгорыі: Вопыт сістэматызацыі» (1974), «Кібернетыка і законы прыгажосці» (1977) [90], «Homo pulcher. Чалавек прыгожы» (1983) [89]. Ён – аўтар шматлікіх артыкулаў і навуковых прац па праблемах станаўлення нацыянальнай самасвядомасці, узаемаадносін культуры і суверэнітэту народа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Другая палова XX ст. адметна тым, што хрысціянскія тэолагі звярнуліся да праблем абгрунтавання рэлігіі, асэнсавання тэндэнцый развіцця мірской культуры, сінтэзу рэлігіі і культуры. Шляхі хрысціянска-рэлігійнай інтэграцыі культуры ў шэрагу навуковых прац аналізуе беларускі культуролаг ***Марына Аляксандраўна Мажэйка*** (нар. 1958). Шмат гадоў яна працавала ў БДУ, з'яўлялася прарэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Зараз займае пасаду прарэктара ў Тэалагічным інстытуце.

Акрамя аналізу асаблівасцей праваслаўна-багаслоўскага сінтэзу культуры, глыбока даследуе філасофію і культуру постмадэрнізму. Шматлікія аналітычныя артыкулы М. Мажэйкі, прысвечаныя розным аспектам гэтай плыні ў еўрапейскай філасофскай думцы, увайшлі ў энцыклапедычнае выданне «Постмадэрнізм» (2001). Аўтар адзначае, што сутнасцю постмадэрнізму з'яўляецца крытыка навукі, розуму, рацыяналістычнага пачатку, логікі. Сутнасць крытыкі навукі прадстаўнікамі постмадэрнізму (Ж. Ліатар, М. Фуко, Фукуяма і інш.), паводле меркавання аўтара, заключаецца перш за ўсё ў тым, каб разглядзець яе як ідэалогію і інструмент улады. Навуковыя веды, лічаць ідэолагі постмадэрнізму, згубілі свой статус аб'ектыўных, незацікаўленых ведаў, сваю аб'ектыўную значнасць і сталі выразнікамі толькі волі да ўлады – над прыродай, над другім чалавекам, над сабой. Філосаф адзначае і такую адметнасць постмадэрнісцкай філасофіі, як разрыў з гісторыяй.

М. Мажэйка сцвярджае, што постмадэрнізм выступіў з крытыкай не толькі навукі, але і любой формы інтэграцыі культуры ў адзінае цэлае незалежна ад таго ці гэта семіятычна зразумелая знакавая сістэма, ці адзіная сістэма каштоўнасцей.

Значная колькасць прац М. Мажэйкі тычыцца праблем семіётыкі, сінергетыкі, метадалогіі нелінейных аналітык, мастацтва, філасофіі мовы, сацыяльнай філасофіі, культуралогіі. Пад яе навуковым кіраўніцтвам маладымі даследчыкамі абаронена некалькі кандыдацкіх дысертацый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 6.4. Нацыянальная эстэтыка: спецыфіка станаўлення

Эстэтыку асобныя беларускія культуролагі лічаць тэорыяй мастацкай культуры. Так, М. І. Крукоўскі пры разглядзе метадалагічных падыходаў да вывучэння культуры адзначае: «Той жа лагічны касцяк, што экстрапаліраваны на ўсю культуру, добра паслужыць тут і нам, тым болей, што эстэтыка з’яўляецца не чым іншым, як тэорыяй мастацкай культуры…» [88, с. 10]. Такіх поглядаў прытрымліваўся і ***Уладзімір Міхайлавіч Конан*** (1934–2011), у полі зроку якога былі пытанні эстэтычных адносін суб’ектаў культуры да рэчаіснасці, іх арыентацыі ў свеце матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей.



Нарадзіўся будучы культуролаг у в. Вераскава Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям’і. Тут атрымаў сярэднюю адукацыю. Вучыўся ў БДУ на гістарычным факультэце. Да паступлення ў аспірантуру Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук БССР (1964) настаўнічаў на Вілейшчыне. Закончыўшы аспірантуру, У. Конан працягвае працаваць у Акадэміі навук спачатку ў якасці навуковага супрацоўніка, затым загадчыка сектара эстэтыкі і сацыяльнай псіхалогіі. У 1982 г. ён абараніў доктарскую дысертацыю па спецыяльнасці «эстэтыка». З 1991 г. філосаф загадваў аддзелам гісторыі і тэорыі культуры Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф. Скарыны.

Праблемнае поле навуковых інтарэсаў У. Конана шырокае. Ён глыбока прааналізаваў гісторыю беларускай культуры, беларускі фальклор, гісторыю і сучасны стан беларускай літаратуры, пытанні фалькларыстыкі і літаратуразнаўства Беларусі, архетыпы і сімвалы беларускага мастацтва. Але найбольш прац у яго па эстэтычнай культуры. Культуролаг з’яўляецца аўтарам такіх прац, як «Развіццё эстэтычнай думкі ў Беларусі. 1917–1934 гг.» (1968), «Демократическая эстетика Белоруссии. 1905–1917» (1971), «Очерк истории эстетической мысли Белоруссии» (1972) [81], «Эстетическая мысль Советской Белоруссии» (1978), «Проблемы искусства и эстетики в общественной мысли Белоруссии начала XX в.» (1985), «Беларуская

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эстэтыка і мастацкая культура: гістарычныя традыцыі і сучаснасць» (1988).

Паводле меркавання У. Конана, уся гісторыя эстэтычнай думкі ўяўляе сабой гісторыю рэалізацыі бесперапыннага працэсу спасціжэння аб'ектыўнай ісціны ў галіне эстэтычнага асваення рэальнасці наогул і мастацкага пазнання ў прыватнасці. Аўтар прааналізаваў гісторыю беларускай эстэтыкі і вызначыў найбольш важныя этапы яе фарміравання, акрэсліў асноўныя крыніцы гісторыі айчыннай эстэтыкі, вызначыў культурна-гістарычныя асаблівасці яе станаўлення і развіцця.

Навуковую значнасць мае даследаванне народных эстэтычных уяўленняў беларусаў. Даследчык лічыў, што ўжо ў вуснай народнай творчасці выяўляюцца пэўныя ўяўленні аб прыгожым, добрым, карысным. Гэтыя першапачатковыя паняцці аб прыгажосці атрымалі сваё далейшае развіццё ў літаратуры Сярэднявечча. Найбольш выразна, на погляд культуролага, эстэтычныя адносіны праявіліся ў тагачасным мастацтве, асабліва архітэктуры.

Эвалюцыя эстэтычных поглядаў беларускіх мысліцеляў у працах У. Конана прасочваецца ад старажытнасці да нашых дзён. Навуковым колам краіны вядомы і іншыя яго працы, напрыклад «Адам Бабарэка: Крытыка-біяграфічны нарыс» (1976), «От Ренессанса к классицизму» (1978). За ўдзел у напісанні цыкла калектыўных манаграфій па гісторыі філасофскай і грамадскай думкі Беларусі ён быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй Беларусі.



Заканамернасці гістарычнага станаўлення эстэтычнай свядомасці беларусаў усебакова разгледзеў ***Альфрэд Сцяпанавіч Майхровіч***, які нарадзіўся ў 1937 г. у Мінску. Вышэйшую адукацыю атрымаў у БДУ, пасля заканчэння якога працаваў у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР. З 1969 г. навуковая дзейнасць філосафа звязана з Інстытутам філасофіі і права, дзе ён пэўны час загадваў аддзелам гісторыі філасофіі, а потым быў дырэктарам гэтай установы (з 1980 г.). У 1984 г. вучоны абараніў доктарскую дысертацыю, а ў 1994 г. абраны членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Свае погляды па праблемах рэалістычнай эстэтыкі выказаў у працы «Эстетические взгляды Якуба Коласа» (1970). Філосаф абгрунтоўвае думку, што станаўленне беларускай эстэтычнай думкі адбывалася пад дабратворным уплывам эстэтыкі рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў. Адначасова А. Майхровіч сцвярджае, што беларуская эстэтычная думка мае свае непаўторныя рысы. У манаграфіі аналізуецца грамадска-эстэтычная праграма Ф. Багушэвіча, творчасць якога, па меркаванні даследчыка, была непарыўна звязана з грамадскімі і эстэтычнымі ідэаламі.

А. Майхровіч паказвае, што эстэтыка Я. Коласа была працягам і развіццём эстэтычнай праграмы Ф. Багушэвіча. Філосаф выявіў адметнасці коласаўскай эстэтыкі. Паэт, на думку даследчыка, увасобіў у сваёй творчасці новыя для беларускай нацыянальнай літаратуры ідэйна-эстэтычныя пазіцыі: эпічнае адлюстраванне рэчаіснасці; творчая культура рэльефнага ўзнаўлення яе рэальных, тыпічных, канкрэтна-пачуццёвых праяў; смеласць у вызначэнні грамадска значных і каштоўных мастацкіх ідэй. Аўтар адзначае, што Я. Колас распрацаваў шэраг важных пытанняў беларускай эстэтычнай навукі, запатрабаваных і ў наш час.

А. Майхровічу належаць манаграфіі «Аб эстэтычным асваенні рэчаіснасці» (1973), «Беларускія рэвалюцыйныя дэмакраты» (1977), «Янка Купала і Якуб Колас: пытанні светапогляду» (1982), «Пошук ісціннага быцця і чалавека: з гісторыі філасофіі і культуры Беларусі» (1992), «Станаўленне маральнай свядомасці: з гісторыі культуры Беларусі» (1997), «Ідэалогія: сутнасць, прызначэнне, магчымасці» (2001) і інш. У іх філосаф разглядае праблемы развіцця нацыянальнай самасвядомасці, пачатковы перыяд развіцця філасофскай думкі ў Беларусі, працэсы фарміравання рэвалюцыйнага дэмакратызму, светапогляды Я. Купалы і Я. Коласа, метадалогію гісторыка-філасофскіх праблем, перыядызацыю беларускай філасофскай думкі, яе прадмет, ідэйны змест, заканамернасці гістарычнага станаўлення эстэтычнай свядомасці, тыпалогію яе форм. Аналізуе тэндэнцыі развіцця філасофскай думкі Беларусі: пошук падстаў ісціннага, гуманістычнага быцця, сцвярджэнне духоўна-маральнай сутнасці і самакаштоўнасці чалавека, спасціжэнне месца і значэння індывіда ў гісторыі і грамадскім быцці [109].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Пытанні фарміравання і развіцця здольнасці чалавека да эстэтычнага ўспрымання і перажывання вывучае ***Вадзім Аляксеевіч Салееў*** (нар. 1939). Нарадзіўся будучы эстэтык у Ленінградзе. Вышэйшую адукацыю атрымаў у БДУ. Навукова-педагагічная дзейнасць была звязана з Беларускім політэхнічным інстытутам, Нацыянальным інстытутам адукацыі, Беларускай акадэміяй мастацтва і іншымі ВНУ. Доктарскую дысертацыю па філасофіі абараніў у 1992 г. Рэдагаваў часопісы «Асновы мастацтва», «Мастацтва».

Праблемы айчыннай і сусветнай эстэтыкі, эстэтычнага і мастацкага выхавання В. Салееў прааналізаваў у працах: «Сучасная эстэтыка Беларусі» (1979) [137], «Нацыянальная самасвядомасць і мастацкая культура» (1990), «Этнічная педагогіка і эстэтычнае развіццё асобы» (1994). Некалькі прац прысвечана аналізу мастацкай культуры Беларусі: «Мастацтва і яго ацэнка» (1977), «Этнічнае ў сістэме нацыянальнай мастацкай культуры» (1992). У В. Салеева маюцца працы па пытаннях славістыкі і беларускай культуры, філасофіі, мастацкай адукацыі, мастацкай крытыкі («Мова ў нацыянальнай культуры» (1992), «Этнічная педагогіка і эстэтычнае развіццё асобы» (1994) і інш.).

Філосаф з'яўляецца суаўтарам вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў ВНУ па эстэтыцы, этнапедагогіцы, этнапсіхалогіі.



Сістэму эстэтычных уздзеянняў, накіраваных на ўзбагачэнне свядомасці і пачуццяў суб'ектаў культуры даступнымі ім эстэтычнымі перажываннямі, распрацавала ***Ядвіга Дамінікаўна Грыгаровіч*** (1946–2011). Нарадзілася яна ў в. Даманова Бабруйскага раёна. Паралельна з вучобай у агульнаадукацыйнай школе наведвала дзіцячую музычную школу. Выдатна іграла на домры. Вышэйшую педагагічную адукацыю атрымала ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага. У Маскве абараніла кандыдацкую, а ў 2003 г. доктарскую дысертацыю, у якой прааналізавала эстэтычную накіраванасць асобы студэнта. Навукова-педагагічная дзейнасць Я. Грыгаровіч была звя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зана з Інстытутам адукацыі пры Міністэрстве адукацыі, Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў. Ва ўніверсітэце загадвала кафедрай, была прарэктарам, у апошнія 16 гадоў жыцця ўзначальвала яго.

Педагагічную дзейнасць спалучала з інтэнсіўнай навуковай працай. Вывучала дзейсныя шляхі развіцця эстэтычных поглядаў, густаў і пачуццяў, патрэбнасці, здольнасці будучых спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Свае погляды на эстэтычную вышэйшую адукацыю выказала ў манаграфіі «Эстэтычная накіраванасць асобы студэнта: педагагічны аспект» (2002) [42]. Пад эстэтычнай адукацыяй, на думку Я. Грыгаровіч, неабходна разумець не толькі выкладанне пэўных мастацкіх дысцыплін, а сістэматычнае развіццё органаў пачуццяў і творчых здольнасцей асобы студэнта, каб пашырыць магчымасці адчуваць прыгожае і ствараць яго. Гэта задача, па меркаванні аўтара манаграфіі, павінна вырашацца ў працэсе разнастайных відаў сацыякультурнай дзейнасці.

У рабоце прапанавана структура і дынаміка развіцця эстэтычнай накіраванасці пэўных суб’ектаў культуры (студэнтаў), прааналізаваны элементы і аспекты эстэтыка-выхаваўчай дзейнасці. Даследчыца ў якасці мэты гэтага віду дзейнасці вылучае адкрыццё для суб’ектаў культуры прыгожых і ўзвышаных бакоў жыцця, прыроды, чалавека, адносін людзей, выяўленне эстэтычных аспектаў рэчаіснасці.

Шэраг прац і артыкулаў Я. Грыгаровіч прысвечаны пытанням тэорыі культуры, псіхолага-педагагічнай сутнасці і спецыфікі сацыякультурнай дзейнасці, зместу, структуры і кірункаў удасканалення культуралагічнай адукацыі, фарміраванню сістэмы падрыхтоўкі кадраў культуры: «Падрыхтоўка кадраў культуры ў Рэспубліцы Беларусь: сучасны стан і перспектывы», сумесна са А. Смолікам і Л. Рагачовай (2001), «Прыкладная культуралогія», разам са А. Смолікам (2005) [41].

## 6.5. Інтэрпрэтацыя этнакультурных поглядаў асветнікаў Беларусі

Сістэмны аналіз этнакультурных поглядаў мысліцеляў-асветнікаў Беларусі эпохі Асветніцтва маецца ў працах ***Энгельса Канстанцінавіча Дарашэвіча***, які нарадзіўся ў 1931 г. Пасля

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заканчэння БДУ (1953) працаваў у Інстытуце філасофіі і права, Інстытуце сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Доктарскую дысертацыю па філасофіі абараніў у 1984 г.



На працягу многіх гадоў Э. Дарашэвіч займаўся даследаваннем гісторыі грамадскай думкі Беларусі. Гэтай праблеме філосаф прысвяціў некалькі прац: «Анёл Доўгірд – мысліцель эпохі Асветніцтва» (1967) [48], «Нарыс гісторыі эстэтычнай думкі Беларусі» (1972), разам з У. М. Конанам, «Асвета і педагагічная думка Беларусі» (1985), у суаўтарстве, «Філасофія эпохі Асветніцтва ў Беларусі» (1971).

Найбольш грунтоўна тэндэнцыі развіцця культуралагічных ідэй у Беларусі прааналізаваны ў «Нарысе гісторыі эстэтычнай думкі Беларусі». Сумесна з У. М. Конанам ён прасачыў эвалюцыю поглядаў беларускіх мысліцеляў за тысячагадовы перыяд. Аўтары вызначылі пяць асноўных этапаў у гісторыі станаўлення і развіцця айчыннай культуралагічнай думкі: X–XV стст.; канец XV – пачатак XVII ст.; XVII – першая палова XVIII ст.; другая палова XVIII – пачатак XIX ст.; XX ст. У нарысе даецца навуковае асэнсаванне характэрных рыс, якія ўласцівы кожнаму перыяду, раскрываюцца адметнасці беларускай грамадскай думкі, полілінгвістычны характар яе крыніц.

Э. Дарашэвіч з'яўляецца аўтарам шматлікіх артыкулаў па культуралогіі, філасофіі, фалькларыстыцы, педагогіцы, па праблемах фарміравання этнічнай свядомасці. Пад навуковым кіраўніцтвам вучонага некалькі сучасных маладых даследчыкаў абаранілі кандыдацкія дысертацыі па праблемах тэорыі і гісторыі культуры.

У кантэксце культуры эпохі Адраджэння філасофскую і культуралагічную думку айчынных мысліцеляў на працягу ўсёй навуковай дзейнасці даследаваў ***Сямён Аляксандравіч Падокшын*** (1931–2004). Культуролаг нарадзіўся ў Гомелі. У 1953 г. скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. М. Горкага. З 1960 г. працоўная і навуковая дзейнасць гісторыка-медыявіста была звязана з Інстытутам філасофіі і права Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У 1987 г. абараніў доктарскую дысертацыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

С. Падокшын з'яўляецца аўтарам многіх прац, у якіх утрымліваюцца сістэмныя веды па фарміраванні імпліцытных культуралагічных ведаў у Беларусі ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі: «Скарына і Будны: Нарыс філасофскіх поглядаў» (1974), «Францыск Скарына» (1981), «Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі. Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага» (1990) [129], «Унія. Дзяржаўнасць. Культура: Філасофска-гістарычны аналіз» (2000), «Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры» (2003), «Этычная думка і культура Беларусі XVI–XVII стст.» (2004) і інш.

У працах культуролага распрацаваны тэарэтыка-метадалагічныя праблемы станаўлення нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, вызначаны спецыфічныя рысы айчыннага Рэнесансу і гуманізму.

Дзясяткі навукова-тэарэтычных артыкулаў С. Падокшына прысвечаны актуальным праблемам культурнай дынамікі, духоўна-культурнага сінтэзу Усходу і Захаду, дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага суверэнітэту.



Глыбінёй навуковага аналізу, арыгінальнасцю вывадаў, наватарскімі падыходамі вызначаюцца працы ***Адама Восіпавіча Мальдзіса*** (нар. 1932). Нарадзіўся навуковец у в. Расолы Віленска-Трокскага павета, цяпер Астравецкі раён Гродзенскай вобласці. Пасля заканчэння БДУ (1956) працаваў у Інстытуце літаратуры імя Я. Купалы Акадэміі навук БССР. У 1987 г. абараніў доктарскую дысертацыю па літаратуразнаўстве. З 1990-х гг. узначальваў Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны. Цяпер працуе ў Інстытуце культуры Беларусі. З'яўляецца кіраўніком аддзела культуралогіі Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі.

Сярод разнастайных гуманітарных праблем, якія даследуе А.Мальдзіс, знаходзяцца і пытанні фарміравання гуманітарнай думкі ў Беларусі. Грунтоўна яны разгледжаны ў працы «Францыск Скарына як прыхільнік збліжэння і ўзаемаразумення людзей і народаў» (1988) [111]. Гісторыю культуралагічнай думкі распрацоўвае ў кантэксце станаўлення і развіцця беларускай літаратуры XVII–XIX стст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дыялог культур, лічыць А.Мальдзіс, з’яўляецца найважнейшай умовай узбагачэння нацыянальных культур. Гэту ідэю ён праводзіць у працах: «Творчае пабрацімства» (1966), «Падарожжа ў XIX ст.» (1969), «Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII ст.: Нарысы быту і звычаяў» (1982), «На скрыжаванні славянскіх традыцый» (1980) і інш. У іх прасочваюцца беларуска-літоўскія і беларуска-польскія культурныя ўзаемадачыненні.

Цыкл прац А. Мальдзіса прысвечаны распрацоўцы ідэі цэнтрычнасці беларускай культуры барока. Цэнтрызм у беларускай культуры мінулых вякоў, адзначае вучоны, па-рознаму выяўляўся ў пэўныя гістарычныя перыяды – «то як выразная рэальнасць, то як “падпольная” тэндэнцыя, што ледзь прабівалася скрозь “ускраіннасць”» [111, с. 6]. Землі Беларусі, лічыць А. Мальдзіс, былі цэнтрам, дзе сустракаліся заходняя (польская, чэшская, славацкая) і ўсходняя (руская) культуры. У дыялог з гэтымі культурамі ўступала і культура беларусаў, у выніку адбываўся пэўны культурны сінтэз. Сінтэтычны характар беларускай культуры XVII–XVIII стст. выразна праяўляецца ў айчыннай барочнай архітэктуры, выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, тэатры і літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Раздзел 7**

# СУЧАСНАЯ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ ШКОЛА БЕЛАРУСІ

## 7.1. Фундаментальныя даследаванні артэфактаў беларускай культуры

Айчынная культуралогія разам з філасофіяй выступае ў якасці аснаванняў гуманітарных навук. Яна дае новае, цэласнае бачанне сутнасці сучасных сацыяльна-культурных працэсаў, тэндэнцый культурнай дынамікі. Культуролагі беларускай школы прапанавалі новыя арыгінальныя трактоўкі айчыннай гісторыі, генезісу духоўнай і матэрыяльнай культуры, спецыфікі нацыянальнай самасвядомасці і менталітэту беларусаў, дэтэрмінантаў сацыякультурнай дэструкцыі і шляхоў яе пераадолення.

У Беларусі да канца 90-х гг. XX ст. аформіліся навуковыя культуралагічныя цэнтры, дзе спрабуюць асэнсаваць сацыяльныя і культурныя рэаліі XXI ст., тэарэтычныя праблемы культуры. Сёння нельга сцвярджаць, што існуе адзіная айчынная культуралогія. Тэорый і канцэпцый столькі, колькі буйных культуролагаў у тым ці іншым рэгіёне краіны, вакол якіх групіруюцца маладыя даследчыкі. Найбольш істотны ўклад у развіццё сучасных культуралагічных тэорый уносяць вучоныя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Інстытута культуры Беларусі, Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў з 1998 г. функцыянуюць аспірантура па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры» і савет па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Ва ўніверсітэце падрыхтаваны дзясяткі кандыдатаў і дактароў культуралогіі, якія працуюць у многіх ВНУ і акадэмічных інстытутах. Вучоныя ўніверсітэта займаюцца даследаваннем сацыядынамікі культуры, яе рухаючых грамадскіх фактараў, або сацыяльных механізмаў культуры. Ва ўніверсітэце падрыхтаваны і выдадзены шэраг прац, прысвечаных вывучэнню ролі духоўнай культуры ў рэгуляцыі розных сфер сацыяльнага быцця ва ўмовах сістэмнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трансфармацыі грамадства, дзейнасці сацыякультурных інстытутаў, якія забяспечваюць функцыянаванне культуры. Найбольш значныя з іх «Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме», «Сацыяльна-культурная дзейнасць у постчарнобыльскім соцыуме», «Дамінанта культуратворчай дзейнасці на мяжы стагоддзяў», «Этнапсіхалагічныя асновы культурагенезу», «Гісторыя і культура беларускіх татар», «Беларусы: ад “тутэйшых” – да нацыі», «Мультыкультуралізм як стратэгія ўзаемадзеяння этнакультурных груп» і інш.

Культуролагамі краіны завершаны даследаванні дынамікі і базавых кампанентаў каштоўнасных арыентацый ваеннаслужачых ва ўмовах трансфармацыі сацыякультурнага асяроддзя, станаўлення і развіцця кніжнай культуры як неад’емнай часткі нацыянальнай культуры, аксіялагічных і структурных асноў мастацкай культуры, пытанняў генезісу, тыпалогіі і механізмаў захавання традыцыйнай культуры, ролі і месца ў структуры культурнага арганізма этыкі і рэлігіі, іх узаемаадносін як сэнсаўтваральнага прынцыпу складу і стылю культуры. Цікавыя даследаванні культуры канкрэтных сацыяльных арганізмаў, існуючых у пэўных пrасторава-часавых рамках, а таксама культуры рэгіёнаў праводзяцца ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы. У гэтай ВНУ некалькі гадоў функцыянуе савет па абароне кандыдацкіх дысертацый па тэорыі і гісторыі культуры.

Сучасныя культуралагічныя даследаванні дазваляюць крытычна зірнуць на ўласную культуру і ўласцівы ёй тып чалавека, які нярэдка ўспрымаецца як непасрэдная дадзенасць. Сённяшні чалавек пачынае разумець, што культурная самабытнасць яго народа неаддзельна ад культурнай самабытнасці іншых народаў, што ўсе мы падначальваемся законам міжкультурнай камунікацыі.

### 7.1.1. Герменеўтыка культуры як метагістарычны тэкст

Новы кірунак у айчыннай культуралогіі – герменеўтыку культуры – распрацоўвае ***Ігар Вячаслававіч Марозаў*** (нар. 1954). Пасля заканчэння Беларускага політыхнічнага інстытута (1976), атрымаўшы кваліфікацыю архітэктара, працаваў у



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інстытуце «Белдзіпрадор», а з 1987 г. – выкладчыкам у Беларускай політэхнічнай акадэміі.

У гэты ж перыяд І. Марозаў праводзіць шэраг цікавых навуковых даследаванняў у галіне архітэктуры, па выніках якіх



яму прысуджаецца вучоная ступень кандыдата архітэктуры (1985). У наступныя гады прадметам навуковых інтарэсаў вучонага становяцца праблемы семіётыкі, граматычныя і стылістычныя заканамернасці мастацкай мовы дойлідства. За грунтоўныя даследаванні сутнасці архітэктурнай герменеўтыкі яму была прысуджана вучоная ступень доктара культуралогіі (1999).

І. Марозаў займае пасаду прафесара кафедры культуралогіі ў БДУ, рэдагуе часопіс «Архітэктура і будаўніцтва». Пэўны час працаваў на кафедры культуралогіі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў.

Навуковую і педагагічную дзейнасць культуролаг спалучае з эфектыўнай мастацкай творчасцю. Сумесна са скульптарамі А. Арцімовічам і У. Слабодчыкавым ён стварыў помнікі Рагнедзе і Ізяславу ў Заслаўі (1993), М. Танку ў в. Пількаўшчына Мядзельскага раёна (1997), князю Барысу ў Барысаве (2003), князю Уладзіміру Данскому-Храбраму ў г. Малаяраславец (Расія, 2003) і інш.

У фундаментальным даследаванні «Архітэктурная герменеўтыка» (1999) І. Марозаў прасочвае эвалюцыю сутнасці герменеўтыкі: ад майстэрства тлумачэння і перакладу старажытных тэкстаў да метадалагічнай асновы ўсіх гуманітарных навук. Герменеўтыка культуры, на думку аўтара манаграфіі, мае сэнс у якасці самабытнага метагістарычнага тэксту.

Шэраг навуковых прац І. Марозава прысвечаны пытанням тэорыі і філасофіі дойлідства: «Планета дарог» (1992), «Таямнічым шляхам Гермеса» (1994), «Архетыпы культуры: Асновы культуралогіі» (2001) і інш. [121].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 7.1.2. Уяўленне ідэі культуры як касмапланетарнага феномена



Навуковая дзейнасць ***Уладзіміра Фёдаравіча Мартынава***, які нарадзіўся ў Мінску ў 1953 г., канцэнтруецца вакол сутнасці і функцый мастацкай культуры, праблем касмізацыі свядомасці асобы на аснове культуратворчасці. У 1978 г. скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. М. Горкага. Пасля заканчэння аспірантуры працаваў там жа. У 1989 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Роля прыродных фактараў у фарміраванні і развіцці эстэтычнага пачуцця». З 2000 г. з'яўляўся загадчыкам кафедры філасофіі культуры ў БДУ. У гэтым жа годзе абараніў доктарскую дысертацыю «Прыгажосць як феномен культуры». Займаў пасаду прафесара, узначальваў кафедру культуралогіі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Цяпер працуе ў Інстытуце сучасных ведаў, загадвае кафедрай культуралогіі.

Педагагічная праца У. Мартынава спалучаецца з інтэнсіўнай навуковай дзейнасцю. Ён даследуе змест і формы культуры, універсальныя канцэпцыі культуратворчасці, аб'ектыўную перадумову якой складае гармонія. У фундаментальнай працы «Філасофія прыгажосці» (1999) культуролаг абгрунтаваў ідэю аб тым, што памкненне чалавека да абсалютнай гармоніі з'яўляецца архетыпам культуры і складае сутнасць шматпланавай творчай дзейнасці, якая прадуцыруе глабальныя формы духоўнага ўдасканалення (міфалогію, рэлігію, філасофію, мастацтва, мараль, права, навуку). У дадзенай манаграфіі праведзены таксама культуралагічны аналіз феномена прыгажосці. Культуролаг сцвярджае, што аб'ектыўную перадумову прыгажосці складае гармонія, якая ўяўляе сабой цэласнае, арганічнае ўвасабленне ўнікальных праяў усеагульнай адухоўленасці, рэпрэзентатыўнасць абсалютнага ў адносным, бязмежнага ў абмежаваным. Антынамічнасць чалавека, які заключае ў сабе супярэчлівасць фізічнага і духоўнага, фенаменальнага і наўменальнага як адноснага і абсалютнага, фрагментарнага і ўсеагульнага

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

стварае неабходную аснову для спасціжэння ўсёабдымнай гармоніі Светабудовы, якая ўспрымаецца як прыгажосць [113].

У вучэбных дапаможніках «Культуралогія. Тэорыя культуры», «Сусветная мастацкая культура» (2000), «Эстэтыка» (2003), эксперыментальных падручніках «Айчынная і сусветная мастацкая культура» (у суаўтарстве), «Асновы культуры» (у суаўтарстве), мностве артыкулаў разглядае культуру як касмапланетарны феномен, спецыфіку ўсходняга менталітэту, перспектывы духоўнай эвалюцыі чалавецтва.

### 7.1.3. Выяўленне этнічнай шматграннасці мастацкай культуры



Культуралагічныя даследаванні ***Уладзіміра Паўлавіча Скараходава*** (нар. 1939) прысвечаны разгляду праблем функцыянавання мастацкай культуры, мастацкай адукацыі і эстэтычнага выхавання моладзі, міжнароднага культурнага супрацоўніцтва, укаранення сучасных інфармацыйных тэхналогій у сферу культуры. Нарадзіўся культуролаг у г. Клімавічы Магілёўскай вобласці. У Бацвінаўскай сельскай сярэдняй школе скончыў 7 класаў.

У 1954 г. У. Скараходаў быў прыняты ў Магілёўскае музычнае вучылішча імя М. А. Рымскага-Корсакава, што на ўсё жыццё вызначыла ягоны лёс. Яшчэ будучы студэнтам, ён пачаў працаваць у аркестры Магілёўскага драматычнага тэатра, а на чацвёртым курсе стаў дырыжорам гэтага аркестра. Скончыўшы вучылішча, малады дырыжор у 1958 г. паступае ў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю, пасля заканчэння якой дыпламаванага музыканта накіравалі працаваць у сімфанічны аркестр Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета. З 1968 г. працуе выкладчыкам, намеснікам дырэктара, дырэктарам у Мінскім музычным вучылішчы імя М. І. Глінкі.

У 1977 г. У. Скараходава запрашаюць на працу ў Міністэрства культуры, дзе ён займае пасады намесніка начальніка Упраўлення вучэбных, навуковых устаноў і кадраў, начальніка ўпраўлення, намесніка міністра культуры. У 1982 г. ён паступае на вучобу ў Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Менавіта ў Маскве прыйшла ідэя напісання кандыдацкай дысертацыі, якую ён паспяхова абараніў у акадэміі ў 1989 г., атрымаўшы навуковую ступень кандыдата філасофскіх навук.

У 1991 г. У. Скараходаў узначаліў Беларускі інстытут праблем культуры, дзе ажыццяўлялася перападрыхтоўка спецыялістаў культуры і праводзілася актыўная навуковая праца па адраджэнні традыцыйнай народнай культуры, па стварэнні анталогіі «Традыцыйная мастацкая культура Беларусі». Дзякуючы навуковым экспедыцыям, супрацоўнікі інстытута сфарміравалі велізарны факталагічны архіў па культуры Беларусі. Тры гады (1998–2001) У. Скараходаў знаходзіўся на дыпламатычнай службе ў рангу саветніка па культуры ў пасольстве Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы.

Пасля дыпламатычнай працы ў 2001 г. У. Скараходаў вяртаецца ў Інстытут праблем культуры, дзе працуе да 2005 г. З гэтага часу яго навукова-педагагічная дзейнасць звязана з Беларускай дзяржаўнай акадэміяй музыкі, дзе ён з'яўляецца прафесарам кафедры драўляных духавых інструментаў.

Працуючы на разнастайных кіраўнічых пасадах, займаючыся педагагічнай дзейнасцю, У. Скараходаў працягвае навукова-даследчую работу. У 1993 г. яму было прысвоена вучонае званне дацэнта, а ў 1995 г. – прафесара. У 2006 г. ён абараніў доктарскую дысертацыю ў Дзяржаўным інстытуце мастацтвазнаўства ў Маскве па тэме «Мастацкая культура Беларусі ў працэсах грамадскіх трансфармацый (канец XX – пачатак XXI ст.)», за якую яму была прысуджана вучоная ступень доктара культуралогіі.

У навуковай працы У. Скараходава даецца культуралагічны аналіз маладаследаванай праблемы прагназавання і рэгулявання працэсаў далучэння насельніцтва да мастацкай культуры. На аснове стратэгічнага аналізу забяспечанасці насельніцтва Беларусі ўстановамі мастацкай культуры, а таксама іх наведвання, аўтарам выпрацавана і апрабавана канцэпцыя мэтавых паказчыкаў, якая дазваляе вызначаць прагнозы і распрацоўваць доўгатэрміновыя праграмы развіцця як інфраструктуры мастацкіх устаноў, так і асноўныя напрамкі іх далейшай дзейнасці. У працах выяўлены эфектыўныя шляхі актывізацыі работы ўстаноў мастацкай культуры, а таксама павышэння цікавасці насельніцтва да мастацкай культуры, выпрацаваны ас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ноўныя напрамкі эфектыўнага кіравання і планавання ў сферы мастацкай культуры [145].

Даследаванні У. Скараходава ўтрымліваюць грунтоўныя веды аб мастацкай культуры Беларусі і зменах, якія адбываюцца ў ёй на мяжы тысячагоддзяў. У працах маецца матэрыял, які дазваляе па-новаму ацэньваць культурную сітуацыю, якая склалася ў Беларусі, больш рацыянальна, абгрунтавана і ўсебакова планаваць культурнае будаўніцтва ў рэспубліцы ў XXI ст., вырашаць шэраг актуальных сацыякультурных праблем (мастацкая культура і рынак, глабалізацыя і захаванне нацыянальнай самабытнасці, нацыянальнае і этнічнае, культура і палітыка, культура і моладзь, культура і новыя тэхналогіі).

Культуролаг з'яўляецца аўтарам шэрагу прац, у якіх разглядаюцца разнастайныя праблемы развіцця мастацкай культуры: «Мастацкая культура ў дынаміцы сацыяльнага засваення» (1994), «Сацыядынаміка культуры сучаснай Беларусі» (2003), «Этнічная шматграннасць культуры сучаснай Беларусі» (2004), «Свободное время и культура», сумесна з І. І. Антановічам (2008). У яго шматлікіх навуковых артыкулах аналізуецца праблема асобы як суб'екта культуры і яе асноўных атрыбутаў: норм, ідэй, традыцый, каштоўнасцей, ведаў, арыентацый, вераванняў. Раскрываецца прырода творчай асобы, якая супрацьстаіць бездухоўнасці, амаральнасці. Вызначаюцца сэнс і значэнне паняцця «культуратворчасць».

### 7.1.4. Асэнсаванне праблем дынамікі беларускай культуры ў кантэксце гуманітарных і тэхнагенных катастроф



Змяненні, або мадыфікацыі пэўных рыс беларускай нацыянальнай культуры ў прасторы і часе, – аб'ект культуралагічных даследаванняў ***Аляксандра Іванавіча Смоліка***. Нарадзіўся будучы культуролаг у в. Каловічы Вілейскага раёна ў 1944 г. Пасля заканчэння Вілейскай агульнаадукацыйнай школы працаваў у рэдакцыі раённай газеты «Шлях перамогі». У 1964 г. паступіў на гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага, які скончыў у 1968 г. Вучыўся ў аспірантуры, абараніў кандыдацкую дысер-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тацыю (1972). Працаваў дацэнтам у згаданым інстытуце, дэканам факультэта даўніверсітэцкай падрыхтоўкі (1979–1992). З 1992 г. на працягу 15 гадоў з'яўляўся першым прарэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Арганізацыйна-педагагічную працу ўмела спалучаў з рознабаковай навуковай дзейнасцю, што дазволіла абараніць першую ў Беларусі доктарскую дысертацыю па тэорыі і гісторыі культуры (1999). З 2006 г. узначальваў кафедру гісторыі Беларусі і музеязнаўства, а з 2008 г. – кафедру культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

У манаграфіі «Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме» (1999) на аснове структурнага аналізу А. Смолікам вызначана сацыядынаміка сучаснай беларускай культуры. На погляд вучонага, у 1980-х гг. у беларускім грамадстве пачаліся буйнамаштабныя і доўгатэрміновыя працэсы дынамічных сацыяльна-культурных змен, выкліканыя неабходнасцю адаптацыі да знешніх фактараў і вырашэння ўнутраных праблем [153]. Мадэрнізацыйныя працэсы, якія адбываюцца сёння, уцягваюць беларускае грамадства ў сацыякультурную прастору заходніх краін у выніку хуткага развіцця камунікатыўных сувязей, дыфузных міжнацыянальных працэсаў, павелічэння міграцыі народаў, узаемапранікнення і зліцця культур. Да фактару макрамаштабнай сацыякультурнай дынамікі культуролаг адносіць негатыўныя наступствы тэхнагеннай катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. А. Смолік распрацаваў канцэпцыю рэабілітацыйна-катарсіснага ўздзеяння мастацтва на дэзадаптаваную асобу посткатастрофнага соцыуму.

Праца «Гісторыя і культура беларускіх татар» (2000; разам з І. Б. Канапацкім) прысвечана даследаванню працэсу разгортвання культуры беларусаў і татар у часе і прасторы ва ўзаемасувязі з сацыяльна-палітычнай арганізацыяй, сацыяльнымі ўзрушэннямі беларускага грамадства.

Побач з даследаваннем праблем фундаментальнай культуралогіі А. Смолік займаецца вывучэннем пэўных аспектаў прыкладной культуралогіі. Так, у суаўтарстве з Я. Д. Грыгаровіч ім падрыхтавана першая ў Беларусі комплексная праца «Прыкладная культуралогія» (2005) [41], дзе акрэслены праблемы тэорыі і методыкі інстытуцыянальных і пазаінстытуцыянальных узаемаадносін суб'ектаў культуры, формы і тэхналогіі фарміравання культуры асобы. Аўтары раскрываюць асновы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнай палітыкі, яе прынцыпы і мэты, аналізуюць функцыі сацыякультурных інстытутаў па засваенні культуры індывідам і рознымі сацыяльнымі групамі.

У цыкле навуковых прац і артыкулаў А. Смоліка ўсебакова разгледжана культуратворчая дзейнасць беларускіх мысліцеляў мінулых стагоддзяў («Культура Беларусі XI–XIX стст.», 1995 [149]). Ім вернута з імглы забыцця імя І. К. Кандрацьева, таленавітага беларускага паэта, празаіка, драматурга, гісторыка, перакладчыка, педагога (манаграфія «Божы дар Івана Кандрацьева», 2013 [148]). Асобныя артыкулы прысвечаны паказу шматграннай дзейнасці знакамітых беларускіх дзеячаў І. А. Гашкевіча, Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў, А. М. Янушкевіча і інш.

А. Смолік знаходзіўся ў вытокаў айчыннай культуралагічнай адукацыі, непасрэдна ўдзельнічаў у распрацоўцы адукацыйных стандартаў, вучэбных планаў і праграм для студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў па культуралагічных спецыяльнасцях і спецыялізацыях. Ім распрацаваны і выдадзены вучэбныя дапаможнікі для студэнтаў «Культуралогія: тэорыя культуры» (2008; разам з Л. К. Кухто) [151], «Культуралогія: гісторыя культуры» (2009; разам з Л. К. Кухто і А. А. Цобкалам) [150]. Пад навуковым кіраўніцтвам прафесара А. Смоліка беларускімі даследчыкамі абаронены магістарскія, кандыдацкія і доктарскія дысертацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 8

# ВЫВУЧЭННЕ ФЕНОМЕНАЎ КУЛЬТУРЫ НА СУМЕЖЖЫ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

## 8.1. Каляндарна-абрадавая культура беларусаў у навуковых даследаваннях

Праблемнае поле даследавання нацыянальнай і сусветнай культуры беларускімі вучонымі значна пашырылася. Разнастайнасць сучасных культуралагічных плыняў дае даследчыкам магчымасць прымяняць адпаведныя аб'екту вывучэння тэарэтыка-метадалагічныя падыходы. Таму да праблем культуры сёння звяртаюцца не толькі дактары і кандыдаты культуралогіі, але навукоўцы сумежных навуковых дысцыплін. Імі заяўлены канцэптуальныя прапановы па ўдасканаленні методыкі культуралагічных даследаванняў. За значны ўклад у развіццё беларускай культуралогіі шэрагу даследчыкаў прысвоены вучоныя званні прафесара культуралогіі.



Глыбокім вывучэннем агульных праблем фалькларыстыкі, фальклорных жанраў, сучаснага стану фальклору, узаемасувязей вусна-паэтычнай творчасці славян адметна навукова-даследчая дзейнасць прафесара культуралогіі ***Галіны Аляксандраўны Барташэвіч***. Нарадзілася яна ў Слуцку ў 1932 г. Пасля заканчэння БДУ (1956) працавала ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, з 1993 г. – у Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі. Доктарскую дысертацыю абараніла ў 1994 г.

Г. Барташэвіч на працягу навукова-даследчай дзейнасці займалася збіраннем, апісаннем і трансляцыяй твораў вусна-паэтычнай творчасці беларускага этнасу. Ёй сабрана і даследавана больш за 10 тыс. фальклорных твораў. Многія з іх увайшлі ў працы, якія былі апублікаваны ў 70–80-я гг. XX ст.: «Радзінная паэзія» (1971), «Дзіцячы фальклор», «Загадкі» (абедзве 1972),

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Чарадзейныя казкі» (у 2 ч., 1973–1978), «Жартоўныя песні» (1974), «Прыказкі і прымаўкі» (кн. 1, 1976), «Балады» (кн. 1, 1977), «Вяселле. Абрад» (1978), «Веснавыя песні», «Выслоўі» (абедзве 1979), «Вяселле. Песні» (кн. 1–3, 1980–1983), «Валачобныя песні» (1980), «Восеньскія і талочныя песні» (1981), «Легенды і паданні» (1983), «Купальскія і пятроўскія песні» (1985), «Пахаванні. Памінкі. Галашэнні» (1986), «Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя» (1985) [13].

Вывучэнне матэрыялаў, сабраных падчас экспедыцый, дазволіла культуролагу абгрунтаваць культ галоўнага язычніцкага бога Перуна ў веснавым абрадзе «Пахаванне стралы», што актывізавала збіральніцкую і даследчыцкую працу ў гэтым кірунку. Г. Барташэвіч дала навуковае тлумачэнне каляднай гульні «Жаніцьба Цярэшкі», сувязі яе з фалічным культам.

Параўнальнаму вывучэнню міжславянскіх сувязей беларускага фальклору прысвечаны манаграфія «Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя» (1985), раздзел «Жанравая спецыфіка каляндарна-абрадавай паэзіі ўсходніх славян» у калектыўнай працы «Узроўні агульнасці фальклору ўсходніх славян» (1993).

Культуролаг Г. Барташэвіч упершыню ў беларускай фалькларыстыцы апублікавала абагульняльную тэарэтычную працу па замовах «Магічнае слова: Вопыт даследавання светапогляднай і мастацкай асновы замоў» (1990). Яна стаяла ля вытокаў беларускай фалькларыстычнай школы дзіцячага фальклору. Упершыню паставіла даследаванне вусна-паэтычных твораў для дзяцей на навуковую аснову. У працах «Дзіцячы фальклор» (1972), «Фальклор і дзеці» (1994), «Фальклор у сістэме выхавання» (1995), «Дзіцячы фальклор: Жанравы склад, тэматыка, функцыі» (2004) распрацаваны прынцыпы, метады і асаблівасці вывучэння і апрацоўкі дзіцячага фальклору.

Г. Барташэвіч належыць шэраг прац па інкультурацыі асобы сродкамі фальклору. Яе працы па народнай педагогіцы грунтуюцца пераважна на беларускай вусна-паэтычнай творчасці («Фальклор у сістэме выхавання», 1995; «Агульначалавечыя і нацыянальныя каштоўнасці – аснова зместу выхавання гуманістычнай асобы», 1997 і інш.). Культуролаг з'яўляецца аўтарам праграмы «Этнапедагогіка беларусаў» (1996), навукова-папулярных зборнікаў «Бабуля так лячыла» (1992), «Ходзіць жораў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па таку» (1993), «Ішоў бай па сцяне» (1995) і інш. Для настаўнікаў ёю напісана навукова-метадычная праца пра народных інфарматараў-выканаўцаў, у якой разглядаюцца асаблівасці іх майстэрства.

Пытанні мастацкай калектыўнай творчай дзейнасці беларусаў узнімаюцца ў артыкулах Г. Барташэвіч, апублікаваных у перыядычным друку.

Такім чынам, навукова-даследчая дзейнасць прафесара культуралогіі Г. Барташэвіч спрыяла раскрыццю незвычайнага багацця беларускай народнай творчасці, укладу беларускага народа ў сусветную скарбніцу паэтычнай і музычнай культуры.

РЭПАЗІТОРЫЙ БрГУ

## 8.2. Этнаканфесіянальны аспект культуралагічных даследаванняў



Прызнаным даследчыкам гісторыі і культуры старавераў у Беларусі з'яўляецца прафесар культуралогіі ***Андрэй Аляксандравіч Гарбацкі***. Нарадзіўся ён у в. Віўнева Іванаўскага раёна ў 1956 г. Закончыў васьмігадовую школу, пасля якой паступіў вучыцца ў Брэсцкае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 27, дзе атрымаў спецыяльнасць чыгуначніка-рамонтніка. Пасля непрацяглай працы на чыгунцы быў прызваны ў армію, затым А. Гарбацкі паступае на гістарычны факультэт БДУ, які паспяхова заканчвае ў 1982 г.

Навукова-педагагічная дзейнасць культуролага звязана з Брэсцкім дзяржаўным педагагічным інстытутам імя А. С. Пушкіна, дзе ён працаваў на кафедрах культуралогіі, гісторыі культуры і рэлігіі. У 2003–2005 гг. быў прарэктарам па навуковай рабоце, першым прарэктарам Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Сёння з'яўляецца прафесарам кафедры гісторыі славянскіх народаў у Беластоцкім універсітэце. Педагагічную і адміністрацыйную працу А. Гарбацкі спалучаў з сістэматычным даследаваннем этнаканфесіянальнай сітуацыі ў Беларусі на розных этапах яе гісторыі. Этнаканфесіянальнай праблематыцы было прысвечана і кандыдацкае дысертацыйнае

даследаванне, па выніках якога ў 1988 г. А. Гарбацкаму была прысвоена вучоная ступень кандыдата гістарычных навук.

Падчас навучання ў дактарантуры Інстытута гісторыі НАН Беларусі даследчык займаўся распрацоўкай гісторыі стараверства ў Беларусі [33]. А. Гарбацкім былі вывучаны каштоўныя крыніцы – старадрукі, архіўныя дакументы, якія раскіданы па айчынных і замежных бібліятэках і архівах. Пад яго кіраўніцтвам наладжваліся выразныя палявыя гісторыка-этнаграфічныя экспедыцыі ў месцы пражывання стараввераў, пераважна ў раёнах Віцебскай вобласці. Вынікі даследаванняў былі выкарыстаны ў манаграфіі «Стараверства ў Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX ст.» (1999), шматлікіх артыкулах і паспяхова абароненай у 1999 г. доктарскай дысертацыі.

У працах «Старообрядчество на белорусских землях» (2004), «Старообрядческие храмы Беларуси» (2008) прафесар А. Гарбацкі акцэнтуе ўвагу на ключавых момантах канфесіянальнай гісторыі ўсходніх славян. Дзейнасць Літоўскай мітраполіі і праваслаўнай царквы на беларускіх землях у цэлым асвятляецца ва ўзаемасувязі з канфесіянальнымі, эканамічнымі, палітычнымі і грамадскімі працэсамі таго часу. Важным з’яўляецца абгрунтаванне прычын прыняцця хрысціянства на Русі і дзейнасці першых прыхільнікаў праваслаўя. Сярод актуальных пытанняў, якія разглядаюцца ў артыкулах вучонага, можна вылучыць пытанні адносін дзяржавы і царквы ў розныя гістарычныя перыяды, праблемы Рускай Замежнай Царквы і Катакомбнай Царквы. Аўтар выклікае чытача на дыскусію, але вельмі асцярожны ў ацэнках і высновах. У манаграфіях А. Гарбацкага адлюстравана сувязь гісторыі і сучаснасці, якая дазваляе асэнсаваць гісторыю хрысціянства з пункту гледжання духоўных, сацыяльна-палітычных і культуралагічных задач сучаснасці. Культуролаг справядліва адзначае, што станаўленне хрысціянскага вучэння і арганізацыя хрысціянскіх аб’яднанняў праходзілі ў складаных унутраных спрэчках, перарастаючы перыядычна ў вострую барацьбу. У працах закранаюцца змены ў дагматыцы і этычным вучэнні хрысціянства, якія паўплывалі на трансфармацыю арганізацыйных структур, фарміраванне самой Царквы. Падзеі пачатковага перыяду хрысціянства, як адзначае даследчык, з’яўляюцца прадметам вострай палемікі. Прафесар А. Гарбацкі акрэслівае асноўныя праблемныя моманты, адзначаючы, што па многіх пытаннях няма адзінага мерка-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вання, аднак устрымліваецца ад прыняцця якога-небудзь з бакоў, што адпавядае мэтам і задачам падобных выданняў.

У кола навуковых інтарэсаў А. Гарбацкага ўваходзяць пытанні гістарычнага краязнаўства, гісторыі асобных манастыроў. Пад агульным кіраўніцтвам вучонага аўтарскім калектывам выкладчыкаў Брэсцкага ўніверсітэта падрыхтавана і апублікавана калектыўная манаграфія «Гарады і раёны Берасцейшчыны: гісторыя і сучаснасць. Івацэвіцкі раён» (2010). Прадметам даследавання, вынікі якога выкладзены ў асобнай манаграфіі культуролага, з'яўляецца Чонкаўскі манастыр, заснаваны стараверамі ў 1775 г. на беразе рэк Сож і Чонкі каля Гомеля.

Сярод педагогаў беларускай вышэйшай школы дастаткова шырока вядомы вучэбныя дапаможнікі А. Гарбацкага: «Введение в историю религии» (2003), курс лекцый «Христианство» (у 2 ч., 2008–2010).

## 8.3. Аналіз акмеалагічных асноў інкультурацыі асобы



Кірунак навуковых даследаванняў прафесара культуралогіі ***Аляксея Сцяпанавіча Зубры*** (нар. 1935) – фарміраванне культуры асобы сучаснага грамадства. А. Зубра нарадзіўся ў в. Сярпутава Барысаўскага раёна. Вучыўся ў Барысаўскай сельскагаспадарчай школе, Хабараўскім артылерыйскім вучылішчы, на Цэнтральных артылерыйскіх афіцэрскіх курсах (Ленінград), у Ваеннай акадэміі (Масква), аспірантуры Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Т. Шаўчэнкі. Мае вучоныя ступені кандыдата філасофскіх навук, доктара педагагічных навук, званне прафесара культуралогіі. Працаваў наменнікам начальніка Львоўскага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча, дацэнтам кафедры філасофіі Мінскага інстытута культуры, загадчыкам кафедры менеджменту Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Сёння з'яўляецца прафесарам Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі.

У працах «Культура личности как духовная ценность», «Самосовершенствование – путь к успеху» (2011), «Формирование

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры личности» (2004) А. Зубра праводзіць ідэю неабходнасці гармоніі паміж думкамі, пачуццямі і дзеяннямі асобы, што падобна музыцы. Таму каштоўным у самаўдасканаленні асобы з'яўляецца фарміраванне высокага духу, чалавека высокай маральнай годнасці і памкненняў з пазіцыі «Я – канцэпцыя». Тут дух з'яўляецца любоўю да якасці, а воля да самаўдасканалення ва ўсіх сферах жыцця. Неабходна выпраўляць сваё жыццё ўвогуле, таму што любая сістэма пачынаецца з мэты. Чалавек павінен выкарыстоўваць матэрыяльнае для стварэння найлепшых умоў развіцця духоўнага патэнцыялу асобы [59].

А. Зубра прапанаваў асабістую акмеалагічную канцэпцыю, паводле якой чалавек уяўляе сабой непадзельную агульнасць фізічнага, псіхічнага, маральнага, эстэтычнага, інтэлектуальнага і прафесійнага. Чалавек – неад'емная частка Сусвету, Прыроды. Таму, калі будаваць сваё жыццё як патрэбнасць мець матэрыяльнае, не звяртаючы ўвагу на навакольнае асяроддзе, гэта можа прывесці да страты людзей. Час ад часу на Зямлі гінуць цывілізацыі, але, пачынаючы новы віток жыцця, людзі робяць тыя ж памылкі. Яшчэ антычны філосаф Фукідзід у V ст. да н. э. адзначаў, што людзі пачалі развівацца з мэтай мець матэрыяльнае і памнажаць яго. Па меркаванні прафесара А. Зубры, чалавек створаны, каб існаваць у трох вымярэннях: ментальным, астральным, фізічным – гэта значыць у сферах мыслення, пачуцця і дзеяння. Той, хто адмаўляе хаця б адзін з гэтых кірункаў, страчвае ўласную каштоўнасць, не можа развіваць уласную годнасць і здольнасці. Больш за тое, трэба ведаць, калі не звяртаеш увагі на адзін кірунак, то будзе сапсавана якасць астатніх. Калі адмаўляешся працаваць у фізічным плане, то спыніцца дзейнасць эмацыянальная і інтэлектуальная.

А. Зубра напісаў шэраг вучэбна-метадычных дапаможнікаў для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі: «Искусство успешно учиться. Культура умственного труда» (2011), «Этика и этикет государственной службы» (2011), «Акмеология профессионального становления руководителя» (2010). Прафесар – аўтар многіх навуковых артыкулаў, у якіх разглядаюцца пытанні інкультурацыі і сацыялізацыі асобы, культуры разумовай працы і кіравання сацыяльна-палітычнай і эканамічнай сферамі («Через управленческую культуру руководителя к устойчи-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вому развитию коллектива», 2007; «Образование взрослых: история, современность, перспективы развития», 2011 і інш.).

## 8.4. Сацыялагічны падыход да вывучэння беларускай культуры



Адметнасці трансфармацыйных працэсаў у сацыякультурнай сферы, месца і роля этнічных супольнасцей у культуратворчай дзейнасці суб'ектаў беларускай культуры – прадмет навуковых пошукаў прафесара культуралогіі ***Пятра Рыгоравіча Ігнатовіча***. Нарадзіўся П. Ігнатовіч у в. Цярэсіна Бярэзінскага раёна ў сялянскай сям'і ў 1937 г. Пасля заканчэння Ягадскай сямігадовай школы ў 1952 г. юнак працягваў адукацыю ў Мінскім педагагічным вучылішчы імя Н. К. Крупскай.

З 1956 г. пачынаецца яго самастойная навукова-педагагічная і грамадская дзейнасць. Тры гады П. Ігнатовіч настаўнічаў у сельскай школе Чэрвеньскага раёна, педагагічную працу спалучаў з грамадскай дзейнасцю. Пазней ён прызначаецца раённымі ўладамі на пасаду загадчыка аддзела культуры. Амаль дзесяць гадоў П. Ігнатовіч шчыраваў на ніве культуры, шмат зрабіў для ўмацавання матэрыяльнай базы ўстаноў культуры, пошуку таленавітых выканаўцаў-аматараў, вывучэння культурнай спадчыны. Працу спалучаў з вучобай на завочным аддзяленні гістарычнага факультэта БДУ, якое паспяхова закончыў у 1965 г.

У перыяд вучобы ва ўніверсітэце праявілася схільнасць да даследчай дзейнасці. У 1971 г. П. Ігнатовіч вытрымлівае конкурс і залічваецца ў дзённую аспірантуру Беларускага інстытута народнай гаспадаркі. Па выніках дысертацыйнага даследавання яму прысвойваецца вучоная ступень кандыдата гістарычных навук. Малады навуковец застаецца на педагагічнай працы ў гэтай ВНУ. З 1981 г. навукова-педагагічная дзейнасць П. Ігнатовіча звязана з Мінскім інстытутам культуры. Два дзясяткі гадоў ён з'яўляўся загадчыкам кафедраў рознага профілю. Зараз займае пасаду прафесара кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З развіццём беларускай прыкладной сацыялогіі П. Ігнатовіч праяўляе інтарэс да гэтай галіны гуманітарных ведаў. Вучоны ўваходзіць у шэраг сацыялагічных груп, якія даследуюць аспекты сацыякультурнага развіцця розных працоўных калектываў. Навукоўцы на чале з П. Ігнатовічам прапанавалі калектывам шэраг эфектыўных рэкамендацый па паляпшэнні маральна-псіхалагічнага клімату на прадпрыемствах, падборы кадраў. Вынікі навуковай дзейнасці былі абагульнены і апублікаваны. У 2001 г. за значныя дасягненні ў даследаванні дынамікі сацыякультурных працэсаў, якія адбываліся ў канцы XX ст. у беларускім грамадстве, П. Ігнатовічу было прысвоена вучонае званне прафесара культуралогіі.

П. Ігнатовіч умела спалучае навуковую і педагагічную дзейнасць. Пад яго навуковым кіраўніцтвам сфарміравалася плеяда беларускіх культуролагаў, якія працуюць у шэрагу ўстаноў вышэйшай адукацыі. Прафесар П. Ігнатовіч з'яўляецца аўтарам вучэбнага дапаможніка па сацыялогіі (2013), суаўтарам калектыўных манаграфій (напрыклад, «Этнічныя асновы культуры», 2001; разам з Ю. В. Чарняўскай), адным з рэдактараў навуковага зборніка «Гісторыка-культурная спадчына Камянеччыны» (2008) [61].

У перыядычным друку і ў зборніках навуковых прац ім апублікавана звыш 100 артыкулаў па праблемах сацыялогіі культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Р а з д з е л 9

# РОСТ НАВУКОВАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ ШКОЛЫ

## 9.1. Вызначэнне канцэптуальных асноў камунікатыўнай практыкі

Дасягненні беларускіх культуролагаў у галіне навукова-тэарэтычных і прыкладных даследаванняў нацыянальнай культуры, пашырэнне меж культуралагічнага праблемнага поля паўплывалі на выбар у якасці прадмета вывучэння каштоўнасцей, ідэй, значэнняў і ідэалаў іншых культур. Асаблівую цікавасць маладога пакалення беларускіх культуролагаў выклікаюць культуры краін Заходняй Еўропы і Расіі.

Беларуская культура на працягу гістарычнага шляху свайго развіцця адчувала ўплыў заходняй і ўсходняй культур, творча перапрацоўвала дасягненні суседніх цывілізацый, што служыла пабуджальным фактарам для актаў культурнай творчасці беларусаў. Адзначаючы ролю дыялогу культур, М. Бубер пісаў: «Калі культура не мае сваім цэнтрам жывы, пастаянна ўзнаўляльны працэс адносін, яна застывае, пераўтвараецца ў свет Яно, у які вельмі рэдка вулканічна прарываюцца вогненныя дзеянні асобных носьбітаў духу» [22, с. 27]. Ідэя дыялогу асабліва актуалізавалася ў нашу эпоху, калі развіццё цывілізацыі зрабіла немагчымым глабальнае выкарыстанне насілля для вырашэння супярэчнасцей быцця чалавецтва без пагрозы яго самазнішчэння. Выратаваць сусветную культуру можа толькі ўсведамленне неабходнасці сацыяльнага і культурнага адзінства. А дыялог культур з'яўляецца менавіта сродкам дасягнення гэтага адзінства.



Дынаміка камунікатыўных мадэляў у заходнееўрапейскай культуры на розных гістарычных этапах развіцця грамадства і іх абумоўленасць светапогляднымі дамінантамі пэўнай культуры знаходзяцца ў цэнтры ўвагі культуролага ***Валянціны Уладзіміраўны Валашок***. Нарадзілася яна ў г.п. Ветрына Полацкага раёна ў 1975 г. Вышэйшую гуманітарную адукацыю

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

атрымала ў БДУ, які закончыла ў 1997 г. Там жа працягвала вучыцца ў магістратуры. Аспірантуру пры Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы закончыла ў 2001 г., а дысертацыю абараніла ў 2003 г. За даследаванне «Камунікатыўныя мадэлі і іх дынаміка ў культуры» ёй была прысвоена вучоная ступень кандыдата культуралогіі. Працуе ў Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце на пасадзе дацэнта.

Кампаратыўны аналіз зместу базавых ментальных установак заходняга і ўсходняга тыпаў камунікатыўнай свядомасці і іх вызначальная роля ў фарміраванні камунікатыўных стратэгій, якія рэалізуюцца ў дадзеных тыпах культуры, даюцца ў працах «Мадэлі камунікацыі як формы арганізацыі сацыяльнага вопыту» (2001) [28], «Культура камунікацыі і камунікацыя культур» (2001). На думку В. Валашок, тэндэнцыі развіцця і мадэлі арганізацыі міжкультурных адносін дэтэрмінаваны канцэптуальнымі асновамі камунікатыўнай практыкі ўдзельнікаў узаемадзеяння. Названыя мадэлі на тым ці іншым гістарычным этапе адлюстроўваюць каштоўнасна-сэнсавыя ўстаноўкі іх удзельнікаў у адносінах да камунікатыўнага працэсу.

У навуковых артыкулах «Мова як форма сацыякультурнай камунікацыі» (1999), «Міжкультурная камунікацыя: традыцыі і навацыі» (2000) культуролаг выказвае думку, што мадэль камунікацыі, якая рэалізуецца чалавекам у практыцы сацыяльных, сацыяпрыродных і міжкультурных адносін, з'яўляецца выражэннем той ідэі, якая імпліцытна прысутнічае ў культурнай карціне свету.

Аналіз змястоўных камунікацый і інтэрпрэтацыя феномена камунікацыі, здзейсненыя В. Валашок у працах «Міжкультурны дыскурс: граніцы разумення» (2001) і «Гісторыя паўсядзённасці і камунікатыўная традыцыя», сведчаць аб «усходняй» накіраванасці вектара светапоглядных змен у свядомасці еўрапейскага чалавека, што перадаецца ў агульнасці асобных характарыстык традыцыйнай усходняй і постмадэрнісцкай мадэляў камунікацыі, а таксама ў актуалізацыі старажытнаўсходніх каштоўнасцей камунікацыі ў заходнееўрапейскай культуры на мяжы тысячагоддзяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Мадэлі функцыянавання міжкультурнага дыялогу, асаблівасці сіметрычных і асіметрычных дыялагічных працэсаў, якія адбываюцца ў культуры, выступаюць у якасці праблемнага поля ў працах ***Вячаслава Уладзіміравіча Сашчэкі***. Нарадзіўся культуролаг у Ліепаі (Латвія) у 1977 г. Вышэйшую адукацыю атрымаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, працягваў навучанне ў магістратуры, а ў 2001 г. паступіў у аспірантуру дадзенай УВА, якую закончыў у 2005 г. У 2006 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю і атрымаў вучоную ступень кандыдата культуралогіі. Працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў на пасадзе дацэнта кафедры тэатральнай творчасці.

Дынаміка макра- і мікрадыялагічных узаемадзеянняў беларускай культуры з заходнімі і ўсходнімі культурамі (польскай і рускай) у працэсе гістарычнага развіцця разгледжана культуролагам у дысертацыйным даследаванні «Дыялагічныя аснаванні беларускай культуры (культуралагічная рэканструкцыя)» (2006) і навуковых артыкулах «Дыялог культур і “Вобраз Іншага”» (2003), «Диалогические тенденции белорусской культуры периода Великого Княжества Литовского» (2003), «Предпосылки диалогизма: историко-культурный обзор» (2004) [139]. В. Сашчэка, зыходзячы з таго, што дыялог культур можа развівацца як у сіметрычных, так і асіметрычных інтэракцыях, прыходзіць да высновы, што беларуская культура ўжо на ранніх этапах культурагенезу імкнулася да сіметрычных адносін. Так, адметнымі рысамі культуры беларусаў у перыяд ВКЛ становяцца поліэтнічнасць, поліканфесіянальнасць і білінгвізм, якія грунтуюцца на агульнай камунікатыўнай талерантнасці.

У шэрагу навуковых артыкулаў В. Сашчэка аналізуе спецыфіку, тэндэнцыі і перспектывы дыялогу культур у перыяд глабалізацыі («Этнічны парадокс сучаснасці і дыялог культур» (2003), «Постсавецкі перыяд. Развіццё культуры Беларусі ў рэчышчы дыялогу культур» (2004), «Дыялог: да праблемы дыферэнцыяцыі» (2005) і інш.). Культуролаг адзначае, што з XIX ст. адбываецца нарастанне макрадыялагічнага патэнцыялу беларускай культуры. Развіццё макрадыялагічных тэндэнцый асабліва ўзмацнілася ў савецкі перыяд (XX ст.), што праяўля-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лася ў актыўных кантактах беларускай культуры з культурамі саюзных рэспублік і замежжа. На мікраўзроўні дыялагічныя адносіны ў XXI ст. ажыццяўляюцца з улікам полікультурнай паліткарэктнасці, з аднаго боку, і на аснове тытульнай (фонавай) культуры – з другога.



Пытанням полікультурнасці і поліэтнічнасці сучасных дзяржаў, стратэгіі мультыкультуралізму як магчымасці плённага адзінства людзей розных этнічных і канфесіянальных прыналежнасцей на добрасуседскіх падставах прысвечаны навуковыя працы кандыдата культуралогіі ***Алены Аляксандраўны Спірынай.*** Нарадзілася яна ў 1982 г. у Мінску. У 1999 г. скончыла СШ № 138, з адзнакай скончыла факультэт культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры па спецыяльнасці «сацыяльная педагогіка (выхаваўчая работа ва ўстановах сацыяльна-культурнай сферы)», у 2005 г. – з адзнакай магістратуру па спецыяльнасці «культуралогія» (прысвоена ступень магістра гуманітарных навук) гэтай жа УВА. З 2005 г. па 2008 г. вучылася ў аспірантуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, спецыяльнасць 24.00.01 Тэорыя і гісторыя культуры. У 2008 г. ёй прызначана стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь для аспірантаў, якія навучаюцца па вочнай форме ў дзяржаўных установах. З 2008 г. па 2012 г. апублікавала 42 навуковых артыкула ў матэрыялах навуковых і навукова-практычных канферэнцый.

У артыкулах «Культурная група: да праблемы канцэпту і структурна-функцыянальнай мадэлі», «Урокі мультыкультуралізму: аблічча талерантнасці», «Мультыкультуралізм як мадэль урэгулявання канфліктаў», «Плюралізм культурных груп як базісны прынцып мультыкультурнага грамадства: да праблемы тыпалогіі» разглядаюцца асноўныя напрамкі сучасных мультыкультурных стратэгій узаемадзеяння этнакультурных груп беларускай нацыі.

У артыкулах «Мультыкультурная ідэнтычнасць: сутнасць і тыпалогія», «Да пытання аб глабалізацыйных працэсах у сучаснай Беларусі», «Палітыка мультыкультуралізму: пазітыўныя і негатыўныя аспекты яе рэалізацыі» разглядаецца гісто-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыя супрацьстаяння светапоглядных парадыгм універсалізму і партыкулярызму, у рэчышчы якога ўзнікае сучасная ідэя мультыкультуралізму, даецца ацэнка кожнай з светапоглядных парадыгм на пэўным гістарычным этапе. Гэта, у сваю чаргу, дазваляе выявіць як пазітыўныя, так і негатыўныя іх аспекты, а таксама ўмовы для фарміравання дыскурсу мультыкультуралізму.

У артыкулах «Плюралізм этнакультурных груп як базісны прынцып мультыкультурнага грамадства: да праблемы тыпалогіі», «Узаемадзеянне рэлігійных каштоўнасна-сэнсавых установак этнакультурных груп на тэрыторыі сучаснай Беларусі», «Этнакультурная група як базіс сучаснай полікультурнай супольнасці: да праблемы дэфініцыі і тыпалогіі», «Культурная ідэнтычнасць: сутнасць, структура, тыпалогія» фармулюецца канцэпт «этнакультурная група» на аснове аналізу розных падыходаў (сацыяльнага, этнапсіхалагічнага, псіхалагічнага, культурна-антрапалагічнага), вылучаюцца асноўныя тыпы этнакультурных груп як суб’ектаў узаемадзеяння ў мультыкультурным грамадстве, аналізуецца кожны з тыпаў на прыкладах такіх груп, як рускія, кітайцы, беларусы, што дазваляе выявіць прычыны і характар іх інтэракцый з тытульным насельніцтвам.

У 2012 г. выйшла манаграфія «Мультыкультуралізм як стратэгія ўзаемадзеяння этнакультурных груп» [155], якая змяшчае новы фактагалічны і тэарэтычны матэрыял, які не разглядаўся ні ў беларускай, ні ў расійскай навуцы. У працы прадстаўлены канцэпцыі мультыкультуралізму замежных і беларускіх культуролагаў, а таксама тыпалогія і спецыфічныя асаблівасці мультыкультурных стратэгій узаемадзеяння груп; асэнсаваны аб’ектыўныя ўмовы і фактары палітыкі мультыкультуралізму з пункту гледжання дыялогу і талерантнага стаўлення да іншых культур. Выпрацаваны своеасаблівая іерархія міжгрупавых і міжэтнічных каштоўнасцей, комплексныя вучэбна-выхаваўчыя меры і забаўляльна-пазнавальныя мерапрыемствы з мэтай азнаямлення груп з культурай адзін аднаго для дасягнення талерантных адносін. Пры гэтым мультыкультуралізм прадугледжвае адзінства ў разнастайнасці; пашыраны змест паняццяў, звязаных з вывучэннем асаблівасцей этнакультурных груп, якія пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, што адлюстравана ў разглядзе сучаснай канцэпцыі мультыкультуралізму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да сферы інавацыйнай дзейнасці распрацавана аўтарская тыпалогія крытэрыяў, якая дазваляе вызначыць спецыфіку і асаблівасці канфліктуючых груп, магчымасць пошуку агульных аспектаў узаемадзеяння паміж этнакультурнымі групамі. У манаграфіі прапаноўваецца комплекс мер у мэтах яго развіцця: мультыкультурная адукацыя, маладзёжнае АРТ-узаемадзеянне, «hate speech»-забарона, СМІ-адлюстраванне, навукова-даследчы маніторынг.



Даследаваннямі генезісу, сутнасці і спецыфікі канфігурацыі традыцыйнай культуры ўсходнеславянскага памежжа, тэндэнцый яе развіцця ў сучасным грамадстве займаецца ***Генадзій Віктаравіч Вахтомаў***, які нарадзіўся ў г.п. Мір Карэліцкага раёна ў 1948 г. Вышэйшую адукацыю атрымаў у Гродзенскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя Янкі Купалы (1975). Пасля заканчэння працаваў настаўнікам, завучам і дырэктарам у школах Гродзеншчыны. У 1998 г. быў кіраўніком Мастацкага рэстаўрацыйнага прафесійна-тэхнічнага вучылішча ў Міры. У 2002 г. паступіў у аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Кандыдацкую дысертацыю абараніў у 2008 г., па выніках даследавання яму прысвоена вучоная ступень кандыдата культуралогіі. Навукова-педагагічная дзейнасць Г. Вахтомава была звязана з Беларускім эканамічным універсітэтам. Сёння вучоны займае пасаду навуковага супрацоўніка Інстытута эканомікі НАН Беларусі.

У працах «Канфігурацыя ўсходнеславянскай культуры (міфарэлігійны складнік)» (2003) і «Традыцыйная культура як фактар устойлівага развіцця ўсходнеславянскай супольнасці» (2005) [23] на матэрыялах Гомельска-Бранска-Чарнігаўскага рэгіёна культуролаг асэнсоўвае культурную канфігурацыю памежжа, якая ўяўляе складаную іерархічную сістэму, стратыфікаваную на субкультуры беларусаў, рускіх і ўкраінцаў. У працэсе культурагенезу, па меркаванні аўтара, канфігурацыя традыцыйнай культуры рэгіёна склалася ў гарманічную сістэму каштоўнасцей, сімвалаў, маральных норм, звычаяў, абрадаў, арнаментальных і тэхналагічных асаблівасцей народнай мастацкай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасці дынамікі канфігурацыі традыцыйнай культуры ўсходнеславянскага памежжа на сучасным этапе разглядаюцца Г. Вахтомавым у навуковых артыкулах «Фальклор і сучасная сацыякультурная сітуацыя ў беларуска-руска-ўкраінскім памежжы» (2004), «Цывілізацыйныя прыярытэты Беларусі ў памежным супрацоўніцтве» (2005), «Трансфармацыя культурных традыцый Гомельска-Бранска-Чарнігаўскага рэгіёна ў XX ст.» (2005), «Сацыякультурная дынаміка ўсходнеславянскага памежжа ва ўмовах постсавецкай трансфармацыі кан. XX – пач. XXI ст.» (2006). Спецыфіка сучаснай дынамікі канфігурацыі традыцыйнай культуры рэгіёна, на погляд даследчыка, абумоўлена распадам адзінай усходнеславянскай супольнасці, разбурэннем традыцыйнай этнасацыяльнай структуры ў выніку Чарнобыльскай тэхнагеннай катастрофы, генерацыяй пакаленняў і ўрбанізацыяй сельскага насельніцтва памежжа. У выніку гэтага сацыякультурнае развіццё рэгіёна характарызуецца супярэчлівымі тэндэнцыямі, да якіх Г. Вахтомаў адносіць: разбурэнне цэласнай сістэмы сфарміраваўшыхся эканамічных сувязей і духоўных каштоўнасцей сацыялістычнага грамадства; паступальны рух у бок кансерватызму і традыцыяналізму; зварот да духоўных кампанентаў традыцыйнай культуры і іх аўтэнтычных форм; актывізацыю адаптацыйных механізмаў культуры памежнага рэгіёна.



Дынаміку этнакультурных працэсаў памежжа даследуе культуролаг гродзенскай культуралагічнай школы ***Сяргей Уладзіміравіч Данскіх***, які нарадзіўся ў Шчучыне Гродзенскай вобласці ў 1971 г. У 1994 г. скончыў гістарычны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы па спецыяльнасці «гісторыя», вучыўся ў аспірантуры па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры». У 1999 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Праблемы культуры ў філасофіі В. В. Розанава» на саісканне вучонай ступені кандыдата культуралогіі. Навуковая і педагагічная дзейнасць яго непарыўна звязана з ГрДУ імя Янкі Купалы, дзе культуролаг працаваў з 1996 г., спачатку выкладчыкам, дацэнтам, намеснікам дэкана гуманітарнага факультэта, а з 2010 г. – дэканам факультэта турызму і сэрвісу.

Адміністрацыйна-педагагічную дзейнасць С. Данскіх спалучае з актыўнай даследчыцкай працай. Культуролаг апублікаваў звыш 110 навуковых і навукова-папулярных артыкулаў у тэарэтычных часопісах, зборніках матэрыялаў навукова-практычных канферэнцый.

Праблема, вакол якой сфакусіравана даследчая дзейнасць С. Данскіх, – фарміраванне і дэмаркацыя этнакультурных рэгіёнаў. Вынікі навуковых пошукаў у гэтым кірунку адлюстраваны ў працах: «Модели идентичности в условиях модернизации Пограничья Восточной Европы» (2006), «Беларусь в контексте современных исследований субцивилизационного развития» (2007), «Историко-культурное наследие как фактор регионального развития» (2007), «Региональные модели урбанизации и развитие национальной идентичности (пример Беларуси)» (2008) і інш.

Грунтоўна С. Данскіх асэнсаваны змены ў этнакультурным быцці грамадства, якія адбываюцца пад уздзеяннем глабальнага і дынамічнага свету. Гэтыя змены культуролаг абазначае як інтэрыярызацыю этнічных параметраў у сучасным свеце («Интериоризация этнических параметров и проблемы анализа духовной жизни общества», 2003). Па меркаванні даследчыка, найбольшы крызіс перажываюць фармальныя параметры, якія стагоддзямі лічыліся галоўнымі для вызначэння народаў: адзінства тэрыторыі, паходжанне мовы, наяўнасць нацыянальнай дзяржавы. На яго погляд, у такіх умовах ролю вызначэння этнасаў павінны адыгрываць суб’ектыўныя фактары, «унутраныя» параметры: агульнасць самасвядомасці, нацыянальны характар, этнічная ідэнтыфікацыя, архетып, менталітэт і г.д. С. Данскіх выказвае думку, што да абазначаных «унутраных» параметраў неабходна дадаць такую адзінку, як сацыяльны ідэал, які яшчэ не знайшоў адлюстравання ў практыцы культуралагічных даследаванняў. З яго дапамогай можна больш дакладна зафіксаваць важныя параметры этнасу як сукупнасць гнасеалагічных і аксіялагічных асаблівасцей народа з улікам культурна-гістарычнага вопыту.

С. Данскіх з’яўляецца адным з суаўтараў вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў УВА: «Мировая художественная культура» (2002; разам з У. Д. Разенфельдам і Н. А. Валковіч), «История мировой культуры» (2004; разам з У. Д. Разенфельдам, Н. Б. Жураўлёвай, Д. Я. Смаль, Г. М. Шчалбанінай).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ім распрацаваны і выдадзены курс лекцый па «Тэорыі культуры» (2003) і «Гісторыі культуры» (2005).

## 9.2. Рэканструкцыя культуралагічных поглядаў рускіх культурфілосафаў

Аб’ектам сістэмнага даследавання сучасных беларускіх культуролагаў сталі праблемы фарміравання і сутнасных характарыстык культурфіласофіі вядомых прадстаўнікой расійскай гуманітарнай навукі перыяду Сярэбранага века. Даследчыкі імкнуцца ўзнавіць і асэнсаваць культурныя традыцыі рускай духоўнасці, вытокі праваслаўнай культуры. Дадзеная праблема набывае значнасць у перыяд рэлігійнага рэнесансу, калі адраджаюцца даўно згубленыя маральныя вобразы і ідэі. Беларускія культуролагі лічаць, што ў гэтай сувязі безумоўны інтарэс маюць рэлігійныя канцэпцыі расійскіх мысліцеляў.



Асэнсаванню культуралагічных ідэй расійскага філосафа А. С. Хамякова прысвечаны навуковыя працы ***Наталлі Аляксандраўны Валковіч***.

У дысертацыйным даследаванні «Праблемы культуры ў філасофіі А. С. Хамякова» (2000), навуковых артыкулах «Гісторыя і культура ў асэнсаванні А. С. Хамякова» (1999), «Праблемы мастацкай культуры ў філасофскім асэнсаванні А. С. Хамякова» (2000) Н. Валковіч сведчыць: нягледзячы на тое, што філасофія мысліцеля не з’яўляецца завершанай сістэмай, яна можа быць разгледжана праз культуралагічныя погляды мысліцеля, у якіх выразна прарысоўваюцца рысы культуры фенатыпаў як сувязнага, структураўтваральнага пачатку.

У навуковых артыкулах «Сабornасць у філасофіі А. С. Хамякова» (1998), «Царква ў філасофскіх пабудовах А. С. Хамякова» (2000) Н. Валковіч прыходзіць да высновы, што ідэя сабornасці з’яўляецца адным з важнейшых сутнасных аспектаў культурфіласофіі А. С. Хамякова. Пры гэтым праяўленне сабornага пачатку, адзначае беларускі культуролаг, не абмяжоўваецца выключна рэлігіяй, а гарманічна зліваецца з усімі формамі культурнага развіцця соцыуму, фарміруючы цэласнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадства, уздзейнічае на развіццё асобы і закладвае асновы культурнай антрапалогіі.

На падставе аналізу філасофскіх інтуіцый мысліцеля («Філасофска-антрапалагічныя інтуіцыі А. С. Хамякова», 1999) даследчыца выказвае меркаванне аб тым, што духоўнае развіццё чалавецтва ўяўлялася філосафу як шматварыянтная рухомая сувязь двух тыпаў рэлігіі – «іранства» і «кушыцтва», у аснове якой А. С. Хамякоў змяшчае паняцце «веры» ў кантаўскай інтэрпрэтацыі. Тэзіс аб дынаміцы іх узаемаадносін набывае ў яго філасофіі характар метадалагічнага пастулата, паколькі падштурхоўвае да асэнсавання сітуацыі суіснавання, дыялогу культур, прыводзіць да разумення механізмаў, якія ствараюць спецыфічныя рысы этнасу і чалавечага быцця. На думку культуролага, антрапалогія А. С. Хамякова насіла тэістычны характар.



Рэлігійная канцэпцыя культуры рускага філосафа Паўла Фларэнскага ўсебакова прадстаўлена ў навуковых працах культуролага ***Інгі Уладзіміраўны Вараб'ёвай***. Нарадзілася даследчыца ў Мінску ў 1974 г. Закончыла БДУ (1991), там жа вучылася ў аспірантуры па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры». За дысертацыйнае даследаванне «Рэлігійныя аснаванні навукі і мастацтва ў канцэпцыі культуры П. А. Фларэнскага» ёй была прысвоена вучоная ступень кандыдата культуралогіі (2000). Педагагічная і навуковая дзейнасць І. Вараб'ёвай звязана з Беларускім дзяржаўным універсітэтам фізічнай культуры.

Погляды П. Фларэнскага на суадносіны і ўзаемадзеянне культуры і рэлігіі, у прыватнасці, навукі і рэлігіі, мастацтва і рэлігіі разглядаюцца І. Вараб'ёвай у навуковых артыкулах: «Рэлігійнае мастацтва вачыма П. А. Фларэнскага» (1997), «Фларэнскі аб суадносінах філасофіі і рэлігіі» (1998), «Рэлігійны ідэал культуры П. Фларэнскага» (1999), «Праблема культуры і рэлігіі ў канцэпцыі П. Фларэнскага» (1999), «Павел Фларэнскі» (1999) і інш.

У выніку аналізу філасофскай спадчыны багаслова І. Вараб'ёва прыходзіць да высновы, што філосаф быў перакананы ў паходжанні культуры з рэлігійнага культу і першапачатковым існаванні яе ў форме феўргіі – зыходнай дзейнасці чалавека, скіраванай на служэнне Богу. У працэсе сацыякультурнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і рэлігійнай эвалюцыі чалавецтва адбыўся распад адзінага рэлігійнага культу на больш дробныя, прыватныя культы мастацтва, навукі, маралі, палітыкі са сваім сэнсавым, сімвалічным, тэрміналагічным апаратам.

На думку І. Вараб'ёвай, філосаф лічыў, што ўсе рэаліі ў чалавечым успрыманні ўяўляюць толькі сімвалы гэтых з'яў. Навуковыя веды і мастацтва таксама маюць сімвалічны характар. Сімвалічнасць ведаў, напрыклад, праяўляецца ў тым, што навуковыя тэорыі толькі абазначаюць рэчаіснасць ці яе аб'екты, але не замяняюць яе. Сімвалічнасць мастацтва, па перакананні П. Фларэнскага, вынікае з таго, што адлюстраванне мастаком рэчаіснасці адначасова падобна і не падобна на арыгінал, таму што яно ўсяго толькі абазначае, падмяняе, але не стварае гэты арыгінал у рэальнасці [29].

У працах І. Вараб'ёвай паказаны шляхі пераадолення канфлікту паміж культурай і рэлігіяй. Філосаф лічыў, што адзіным сродкам зняцця супярэчнасці паміж імі з'яўляецца імкненне да сінтэтычнасці ў культуры. Культура павінна стаць мовай, якая аб'ядноўвае чалавецтва.



Цэласнае ўзнаўленне культуралагічных поглядаў прадстаўнікоў філасофскага крыла рускага сімвалізму з'яўляецца праблемным полем навуковых даследаванняў ***Юліі Васільеўны Аленьковай.*** Нарадзілася культуролаг у Магілёве ў 1969 г. Закончыла гістарычны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута імя А. А. Куляшова. Працавала настаўніцай у Магілёўскай гімназіі № 1, выкладчыкам Магілёўскага ўніверсітэта харчавання, сёння займае пасаду дацэнта кафедры філасофіі МДУ імя А. А. Куляшова.

Грунтоўнай навуковай дзейнасцю Ю. Аленькова пачала займацца падчас навучання ў аспірантуры Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы (1995–1999), дзе даследавала культуралагічную канцэпцыю рускага філасофскага сімвалізму першай чвэрці XX ст. Па выніках даследавання ў 2004 г. ёй была прысвоена вучоная ступень кандыдата культуралогіі. На аснове тэарэтычнага абагульнення твораў А. Белага, В. Іванава, П. Фларэнскага даследчыцай выяўлены асаблівасці вызначэння паняцця «культура», рэканструявана канцэпцыя культуры як памяці, сфармуляваны прынцыпы, на якіх ствараецца тыпало-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гія культуры. Сімвалісцкі прынцып «древесной культуры» Ю. Аленькова трактуе як антыпод рызаматычнай культуры постмадэрну. Культуролагам феномен жыццятворчасці разглядаецца як адзінства тэарэтычнай рэфлексіі і культурнай практыкі рускіх сімвалістаў [2].

Да кола навуковых праблем, якія даследуюцца Ю. Аленьковай, адносяцца пытанні філасофскай і рэлігійнай антрапалогіі, сутнасці чалавека ў кантэксце сучаснай масавай культуры. На думку вучонага, рэлігійная антрапалогія набліжаецца да культуралогіі, паколькі разуменне чалавека ў кантэксце рэлігійнай сістэмы з'яўляецца падмуркам таго ці іншага тыпу культуры. Культуролаг выказвае свае меркаванні адносна сучаснага гуманізму, які выступае ў двух відах – секулярны і рэлігійны. У працы «Жизнетворчество: лики человека творящего» (1999) аналізуюцца адрозненні і агульныя рысы хрысціянскай і секулярнай пазіцый у адносінах да гуманізму, які разглядаецца зыходзячы з дзвюх антрапалагічных парадыгм homo naturalis и homo transcendens.

Ю. Аленькова лічыць, што ў аснове антрапалогіі секулярнага гуманізму знаходзіцца ўяўленне аб чалавеку як носьбіту натуральных праў, з чаго вынікаюць і этычныя прынцыпы гуманізму, дзе на першы план пастаўлены каштоўнасці свабоды, а маральныя нормы зводзяцца да чалавечых інтарэсаў, жаданняў і патрэб. З пункту ж гледжання рэлігійнай антрапалогіі этычныя прынцыпы не могуць выводзіцца з чалавечага розуму і натуральных праў, паколькі яны ўкаранёны ў Вышэйшай рэальнасці, сферы Божага. Аднак па шэрагу пытанняў, сцвярджае культуролаг, пазіцыі сучасных свецкіх і рэлігійных гуманістаў падобны. Так, яны асуджаюць насілле, тэрор, у пэўных выпадках маюцца аднолькавыя ацэнкі абортаў і эўтаназіі як недапушчальных механізмаў умешвання ў жыццё і смерць і інш.

Абазначаныя і іншыя праблемы сучаснай тэорыі культуры разглядаюцца Ю. Аленьковай у працах «“Физики – лирики” русского символизма: Павел Флоренский и Андрей Белый» (1998), «Проблема культуры в русском символизме первой четверти XX века» (1999), «Русский философский символизм и западноевропейская философия» (2010).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 9.3. Тыпалагізацыя хрысціянскіх канцэпцый культуры

Наша краіна з’яўляецца прыкладам эфектыўнага дыялогу розных рэлігійных канфесій, што ў сваю чаргу пазітыўна ўплывае на ўстойлівае развіццё беларускага грамадства. Суадносіны рэлігіі і культуры заўсёды знаходзіліся ў цэнтры ўвагі культуролагаў. Інтэрпрэтуючы ўзаемадзеянні рэлігіі і культуры, Р. Нібур сцвярджаў, што нельга аддзяліць віды культурнай дзейнасці чалавека ад дару божага, што яны магчымы толькі, калі ёсць дар божы [124, с. 102]. Абапіраючыся на канцэптуальны падыход Р. Нібура, беларускія культуролагі ставяць задачу паказаць узаемасувязь трансфармацый рацыянальнасці і развіцця хрысціянскіх канцэпцый культуры.



Так, выяўленне дэтэрмінацыі развіцця названай канцэпцыі з’яўляецца прадметам навуковых даследаванняў ***Ганны Сцяпанаўны Мартысевіч*** (нар. 1983). У навуковых артыкулах аўтара «Эволюция идеи диалогизма в теологии протестантизма XX – начала XXI в.» (2009), «“Предыдеи” концепции культуры Второго Ватиканского собора и их современная рецепция» (2010), «Христианские концепции культуры второй половины XX – начала XXI в.» (2011) [114] і інш. адзначаецца, што ў другой палове XX ст. у хрысціянскіх канцэпцыях культуры назіраецца імкненне знайсці баланс паміж пракультурным і антыкультурным падыходамі да культуры. На мяжы XX і XXI стст. гэта тэндэнцыя замацоўваецца на ўзроўні афіцыйных пастаноў Рымска-каталіцкай царквы, а таксама ў фарміраванні альтэрнатыўных ёй канцэпцый культуры. Да іх Г. Мартысевіч адносіць праект «сусветнага этасу» Г. Кюнга, сімвалічную інтэрпрэтацыю культуры Д. дэ Трасі. У XXI ст., адзначае аўтар артыкулаў, у хрысціянскіх канцэпцыях культура пачынае трактавацца як стыль жыцця, а функцыя Царквы абмяжоўваецца барацьбой з культурнымі ідэалагемамі.

Значную ўвагу ў даследаваннях Г. Мартысевіч надае праблеме тыпалагізацыі хрысціянскіх канцэпцый культуры. Крытэрыі, на падставе якіх тыпалагізуюцца канцэпцыі культуры, разглядаюцца ў артыкулах «Экзистенциализация католической теологии XX века на примере трактовки феномена человека в философии неотомизма» (2005), «Идея диалогизма в католи-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

ческой теологии в контексте неклассической и постнеклассической культуры» (2007), «Религии и миф: демифологизация религии в теологии протестантизма XX–XXI вв.» (2007) і інш. У гэтых працах выдзелены наступныя крытэрыі: змест цэнтральных катэгорый, якія ўтрымліваюцца ў канцэпцыях; суадносіны культуры і прыроды; суадносіны культуры і сферы сакральнага; цэласнасць вобраза культуры; сацыяльная апасродкаванасць культуры.

Арыгінальнымі з'яўляюцца разважанні культуролага пра сутнасць і змест рацыянальнасці, якая выразна праяўляецца ў рэлігійна-дыялагічным падыходзе да культуры. Так, у артыкулах «Идеи диалогизма в теологии протестантизма конца XX – начала XXI в.» (2007), «Эволюция типов рациональности христианских концепций культуры второй половины XX – начала XXI в.» (2011) адзначаецца, што адкрытая форма рацыянальнасці перадаецца ў шэрагу прэзумпцый (увага да альтэрнатыўных карцін свету; адыход ад еўрацэнтрызму; увага да культурнага кантэксту і інш.). Постнекласічны тып рацыянальнасці характарызуецца, па меркаванні даследчыцы, адыходам ад разумення культуры як монакультуры і ўзрастаннем плюральнага яе разумення. Сучасны тып рацыянальнасці праяўляецца ў паслядоўнай тэматызацыі дыялагічных, а пазней полілагічных узаемасувязей паміж культурамі, паміж культурай і рэлігіяй, у пераходзе ад крытыкі тэорыі лінейнага дэтэрмінізму да развіцця неадэтэрміністкага падыходу да пытання аб культурнай дынаміцы.



Культуралагічны аспект маральных катэгорый дабра і зла ў рэлігійным светаадчуванні разглядаецца ў навуковых працах кандыдата культуралогіі ***Ігара Леанідавіча Когана***, які нарадзіўся ў Мінску ў 1966 г. Вышэйшую адукацыю ён атрымаў у Беларускім інстытуце фізічнай культуры, які закончыў у 1989 г. Працаваў трэнерам-выкладчыкам, намеснікам дырэктара ў спартыўным таварыстве «Спартак», фізкультурна-аздараўленчым каапераціве «Савет», кансультантам па рэкламе ў АТ «Гандлёвы дом Рыга», намеснікам дырэктара АТ «Рэканструкцыя і развіццё».

Асаблівасцямі рэлігійнага ўспрымання свету суб’ектамі культуры І. Коган зацікавіўся ў студэнцтве. Інтарэс да рэлігійнага спасціжэння свету ўзмацніўся ў 1990-я гг., у перыяд так званага рэлігійнага рэнесансу. Свае меркаванні па праблемах рэлігійнай этыкі культуролаг выказаў у манаграфіі «На все ли воля Божья?» (1997). Аўтар акрэсліў формы адносін чалавека да рэчаіснасці і выказаў думку, што станаўленне і развіццё маральных уяўленняў людзей неабходна шукаць у рэлігійным успрыманні.

Рэлігійнай прыродзе дабра і зла І. Коган прысвяціў кандыдацкую дысертацыю, якую абараніў у 1999 г. і атрымаў за яе вучоную ступень кандыдата культуралогіі. Асноўнай праблемай, якая разглядаецца ім у працы «Моральные категории добра и зла в религиозном мировосприятии (культурологический аспект)» (1999), з’яўляецца спецыфіка сэнсавага напаўнення маральных катэгорый у рэлігійным светапоглядзе. Культуролаг лічыць, што маральная свядомасць эфектыўна ўплывае на паводзіны суб’ектаў культуры пры ўмове наяўнасці абсалютных крытэрыяў, адносна якіх маральны імператыў набывае аўтарытэтны і абавязковы характар. Абсалютны крытэрый уласцівы, на думку даследчыка, толькі рэлігійнаму светаадчуванню і рэлігійнай свядомасці, якія выражаюцца ў паняцці абсалютнага Бога.

У гэтай і іншых працах («Смысл творчества» (1997), «Святые братья Кирилл и Мефодий (к вопросу о национальной идее)» (1998), «Культура Беларуси: идеал и иллюзия») І. Коган прытрымліваецца думкі, што рэлігійная прырода дабра і зла, ад паняццяў «добра» і «дрэнна» да паняццяў сакральнага адзінства і нізкага эгаізму, з’яўляецца асновай пабудовы кожнай этычнай сістэмы. Этыка ж, якая асэнсавала сваю рэлігійную прыроду і раскрыла сэнс восевых катэгорый дабра і зла, становіцца дзейсным цэнтрам культурнага арганізма. Таму культура, сцвярджае І. Коган, знаходзіцца ў межах, якія вызначае рэлігійная этыка, і звязана з культурнай традыцыяй народа.

У апошні час навуковыя пошукі І. Когана звернуты да пытанняў працэсаў узнікнення і функцыянавання культуры. Сістэмны аналіз культурагенезу ажыццёўлены культуролагам у манаграфіі «Этнопсихологические основания культурогенеза» (2001) [76]. Эвалюцыя культуры разглядаецца аўтарам ва ўзаемасувязі з этнагенезам і асвятляецца як з пазіцый сістэмна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

га аналізу, так і пры дапамозе тэорыі інфармацыі і сінергетыкі. Асаблівая ўвага ў манаграфіі надаецца паказу ролі этнапсіхалагічных канстант і іх дынамікі ў адзіным і шматгранным працэсе этнакультурагенезу. І. Коган рэканструяваў шэраг трывалых палажэнняў культуралогіі, этнапсіхалогіі, сацыялогіі культуры, што дазволіла яму ўвесці ў навуковы ўжытак і абгрунтаваць легітымнасць новых паняццяў – «купідо» і «энергетычны баланс». Пад купідо даследчык разумее энергію несвядомага альбо свядомага руху да відавых, радавых ці ўсеагульных мэт. Энергетычны баланс, па І. Когану – сукупнасць энергіі купідо, выяўленай у форме традыцыі і ў форме ідэалаў і ідэальных мэт.



Культурна-асветніцкая дзейнасць беларускіх каталіцкіх святароў першай паловы ХХ ст. знаходзіцца ў поле зроку культуролага ***Івана Іванавіча Трацяка***, які нарадзіўся ў в. Труханава Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці ў 1956 г. У 1985 г. ён скончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы. Працаваў настаўнікам у школах Смаргонскага, Ашмянскага і Гродзенскага раёнаў. З 1991 г. – на кафедры беларускай культуры Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сёння займае пасаду дацэнта кафедры беларускай культуры і рэгіянальнага турызму ГрДУ імя Янкі Купалы і ўзначальвае навучальна-даследчы сектар этнічнага турызму пры факультэце турызму і сэрвісу.

І. Трацяк плённа займаецца навукова-даследчай працай. У 1997 г. ён завочна скончыў аспірантуру пры кафедры беларускай культуры ГрДУ імя Янкі Купалы па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры». У 2000 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на ступень кандыдата культуралогіі па тэме «Культурна-асветніцкая дзейнасць беларускіх каталіцкіх святароў (пачатак ХХ ст. – 1939 г.)», у якой даводзілася, што дзейнасць і творчасць беларускіх каталіцкіх святароў – своеасаблівы сацыякультурны феномен, адзін з варыянтаў пошуку шляхоў развіцця беларускага грамадства на фундаменце хрысціянскай маралі, беларускай культурнай спадчыны і нацыянальна-незалежніцкай канцэпцыі будаўніцтва дзяржаўнасці.

У працах «Беларускія святары Гарадзеншчыны» (1994), «Царкоўная Унія ў ацэнцы беларускіх каталіцкіх святароў (20–30-х гг. ХХ ст.)» (1996), «Беларускае духавенства (пач. ХХ ст. –



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1930-я гады» (1999) [163] культуролаг з пазіцый ідэацыянізму аналізуе сацыякультурную дэтэрмінацыю этнаканфесіянальнага руху ў Беларусі. Па яго меркаванні, характэрнай асаблівасцю рэлігійнага становішча была поліканфесіянальнасць, перш за ўсё супрацьстаянне праваслаўя і каталіцтва. Функцыянаванне шматлікіх культурна-грамадскіх і палітычных арганізацый выклікала разнастайнасць ідэй, якія істотна ўплывалі на культурны працэс, узбагачалі інварыянтнасць мадэляў развіцця нацыянальнай культуры альбо абмяжоўвалі культурна-нацыянальны дынамізм.

Выяўленне перыядаў станаўлення і развіцця этнічнай ідэнтыфікацыі беларускага каталіцкага духавенства разглядаецца І. Трацяком у навуковых артыкулах «Роля беларускіх святароў у адраджэнні роднай мовы» (1993), «Белоруссия: религия и общество в прошлом и настоящем» (1996), «Рэлігійны сэнс нацыянальнага» (1998). Вучоны выдзяляе чатыры перыяды: перыяд самавызначэння (пач. XX ст. – 1910 г.), культурна-асветніцкіх гурткоў (1909–1917), арганізацыйны (1917–1921), дзейнасці ва ўмовах польскай улады (1921–1939).

Культурнай сацыялізацыі беларускага каталіцкага духавенства прысвечаны і іншыя працы І. Трацяка («Роля беларускіх святароў у адраджэнні нацыянальнай культуры» (1993), «Ільдэфонс Бабіч – пісьменнік, святар, тэолаг» (1999), «Нацыянальная ідэя ў інтэрпрэтацыі беларускіх каталіцкіх святароў» (1999). У іх культуролаг прыходзіць да высновы, што ў першай палове XX ст. беларускае каталіцкае духавенства з’ўлялася ўплывовай арганізаванай сілай са сваёй праграмай дзейнасці і садзейнічала выпрацоўцы канцэпцыі развіцця нацыянальнай культуры і беларускага культурна-грамадскага руху. Святарамі быў прапанаваны альтэрнатыўны, духоўна-эвалюцыйны метад пераўтварэння грамадства праз паглыбленае развіццё культуры, навукі, асветы.

І. Трацяк з’ўляецца аўтарам шматлікіх прац па пытаннях гісторыі беларускай культуры, гісторыі рэлігіі, канфесіянальнага руху і хрысціянскай культуры ў Беларусі. Ім распрацаваны вучэбныя дапаможнікі «Біблія ў кантэксце беларускай культуры» (2003), «Гісторыя беларускай культуры» (2004).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 9.4. Культурная спадчына Беларусі як аб'ект культуралагічнага даследавання

Рэалізацыя дзяржаўных праектаў і праграм сацыяльна-культурнага развіцця немагчыма без глыбокага навуковага даследавання гісторыі, спадчыны і традыцый беларускага народа. Сістэмная цэласнасць і аўтэнтычнасць, разнастайнасць рэгіянальных і лакальных асаблівасцей, архаічнасць многіх элементаў і форм традыцыйнай культуры дазваляюць народу падтрымліваць сваю культурную ідэнтычнасць. Таму захаванне і выкарыстанне аб'ектаў культурнай спадчыны – адна з прыярытэтных задач дзяржавы і грамадскасці. Сваю місію айчынныя культуролагі бачаць у распрацоўцы эфектыўных, адпавядаючых сучасным умовам тэарэтычных канцэпцый, скіраваных на ўкараненне ў сацыяльную практыку традыцыйных каштоўнасцей.



Выяўленню шляхоў захавання і развіцця самабытнасці беларускай нацыянальнай культуры ў кантэксце супярэчнасцей сучаснай глабалізацыі прысвечана большасць навуковых прац культуролага ***Андрэя Эдуардавіча Салікава.*** Нарадзіўся ў 1977 г. у Віцебску. Вучыўся ў Гомельскім каледжы мастацтваў, у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, які закончыў у 2001 г. Тут атрымаў ступень магістра гуманітарных навук (2002) і закончыў аспірантуру па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры» (2005), кандыдацкую дысертацыю абараніў у 2010 г. Працаваў выкладчыкам і канцэртмайстрам у дзіцячай харэаграфічнай школе-студыі Беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі», намеснікам дырэктара, выкладчыкам і канцэртмайстрам у дзіцячай харэаграфічнай школе № 2 г. Мінска, старшым выкладчыкам у Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы. У дадзены момант займае пасаду дацэнта Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі работнікаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.

А. Салікаў працягвае даследаваць спецыфіку функцыянавання айчыннай культуры ў кантэксце сусветнай глабальнай культуры. У шэрагу яго навуковых артыкулаў («Национальная культура в условиях глобализации», 2004 [138]; «Проблема со-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хранения самобытности национальной культуры Беларуси в эпоху глобализации», 2005; «Белорусская национальная культура перед вызовом глобализации», 2006 і інш.) адзначаецца, што беларуская культура сутыкаецца з супярэчлівасцю і амбівалентнасцю наступстваў глабалізацыі. Па меркаванні культуролага, базавыя каштоўнасці адчуваюць моцны ўплыў нацыянальна неафарбаваных, этнічна нявыражаных глабальных аксіясеміятычных сістэм, што ўскладняе працэсы нацыянальна арыентаванага тэкстаўтварэння, паслабляе пазіцыі нацыянальных аксіялагічных і семіятычных структур, абвастрае негатыўныя аспекты ў сацыякультурнай дынаміцы.

Адначасова культуролаг заўважае, што ў трансляцыйным сектары ўзаемадзеянне беларускай культуры з глабальнымі культурнымі плынямі адбываецца не толькі ў форме канфлікту паміж аўтэнтычнымі нацыянальнымі і глабальнымі тэкстамі культуры, а і ў форме ўзаемаўзбагачэння і ўзаемадапаўнення («Национально-культурная идентичность субъекта в век глобализации», 2006; «Современная культура в локальном и глобальном измерениях», 2007; «Безопасность национальной культуры в условиях глобальных интеграционных процессов», 2008).

У працах «Белорусская культура в глобальном информационном пространстве: проблемы и перспективы развития» (2007), «Государственное регулирование сферы культуры Республики Беларусь в условиях глобализации» (2008), «Социокультурная адаптация студенческой молодежи в условиях глобализации» (2009) А. Салікаў вылучае: адэкватнае выкарыстанне комплексу пратэкцыяніцкіх мер, накіраваных на абарону нацыянальных вытворцаў прадукцыі культурнага зместу; фарміраванне ў суб'ектаў культуры патрэбнасці ў традыцыйных і класічных формах, высокага прафесіяналізму творцаў культуры; зварот да багатага духоўнага вопыту беларускага народа; падрыхтоўку інавацыйна кампетэнтных суб'ектаў, здольных да творчага пераасэнсавання сучасных рэалій. Такім чынам, абапіраючыся на метад тыпалагічнага аналізу, культуролаг вызначае шляхі захавання і развіцця самабытнасці беларускай культуры.



Важнейшыя феномены этнакультуралагічнай тэорыі на працягу шэрагу гадоў распрацоўваюцца культуролагам ***Юліяй Вісарыёнаўнай Чарняўскай.*** Нарадзілася ў 1962 г. у Мін-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ску. Закончыла філалагічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна (1984). Выкладала рускую мову і літаратуру ў сярэдніх агульнаадукацыйных і прафесійна-тэхнічных навучальных установах Мінска і Львова, нейкі час працавала метадыстам у мінскім кінатэатры «Перамога», у сталічным Альтэрнатыўным тэатры педагогам па эстэтыцы. З 1990 г. Ю. Чарняўская пачынае сістэматычна займацца навукова-педагагічнай дзейнасцю. Спачатку спрабуе сябе ў якасці выкладчыка гуманітарных дысцыплін у Мінскім педагагічным інстытуце замежных моў, а з 1997 г. яе дзейнасць звязана з Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў. У 2002 г. Ю. Чарняўская абараніла кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры». Комплексная праца – манаграфія «Асоба і культура» (2003) – уяўляе сабой міждысцыплінарнае даследаванне шырокага кола пытанняў быцця асобы. Разглядаюцца праблемы пазнання, дзейнасці, каштоўнасна-сэнсавых арыентацый сучаснага чалавека. Спыняецца культуролаг таксама на трактоўцы экзістэнцыяльных феноменаў існавання асобы – веры, любві, смерці ў іх гісторыка-культурнай дынаміцы і культурна-антрапалагічным асвятленні.

Сучасны дыскурс, які звязаны з праблемамі ўзаемадзеяння культур і этнічных супольнасцей, аналізуецца Ю. Чарняўскай у манаграфіі «Этнічная культуралогія: канцэпты, падыходы, гіпотэзы» (2010). У працы прадстаўлены аўтарскі падыход да феноменаў этнічнай культуры – «мяккі канструктывізм», у святле якога разглядаюцца цэнтральныя феномены этнакультуралогіі – этнас, карціна свету, семіясфера этнічнай культуры, этнічнасць у сістэме ідэнтыфікацыі чалавека, этас культуры і інш.

З пазіцый сучаснай культуралогіі і сацыяльнай псіхалогіі аналізуе Ю.Чарняўская ментальнасць «традыцыйных» беларусаў у манаграфіях «Беларусы: ад “тутэйшых” – да нацыі» (2010), «Белорус: штрихи к автопортрету. Этнический самообраз белоруса в сказках» (2006) [175]. Аўтар даследуе дынаміку ментальнасці ў перыяд ад старажытнасці да пачатку XXI ст. Змены ў ментальнасці прасочваюцца на матэрыялах народных казак.

Пераважныя кірункі навуковых росшукаў – этнакультуралогія, семіётыка культуры, культура паўсядзённасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Праблемы вывучэння і выкарыстання культурнай спадчыны сучасным пакаленнем беларусаў даследуе ***Аляксандр Аляксандравіч Суша*** (нар. 1982). Працаваў у Беларускім інстытуце праблем культуры на пасадзе метадыста, бібліёграфам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. У 2005 г. паступіў у аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры», якую закончыў у 2008 г. Абараніў кандыдацкае дысертацыйнае даследаванне «Культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі ў кантэксце дыхатаміі "Усход – Захад"». Займае пасаду намесніка дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Асаблівасці ўзаемадзеяння ўсходніх і заходніх уплываў у працэсе фарміравання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы аналізуюцца культуролагам у шэрагу навуковых артыкулаў («Уплыў уніі на этнічную самасвядомасць беларусаў», 2005; «Уніяцкія храмы і манастыры Полацка», 2005; «Царкоўнаславянская мова ва ўжытку ўніяцкай царквы», 2005; «Дыялог "Усход – Захад" у гісторыі хрысціянства ў Беларусі», 2006 [157] і інш.). У іх аўтар паказвае: у выніку сінтэзу ўсходніх і заходніх традыцый і навацый культуратворчая дзейнасць ва ўніяцкім асяроддзі суправаджалася стварэннем новых форм, што значна абумовіла самабытны і непаўторны характар культурнай спадчыны.

Важным кірункам навукова-даследчай і практычнай дзейнасці А. Сушы з'яўляецца выяўленне дэструктыўных фактараў, якія прывялі да пэўных страт у стане спадчыны грэка-каталіцкай царквы. У артыкулах «Праблемы захавання помнікаў культавага дойлідства Гомельшчыны» (2004), «Лёс культурных каштоўнасцей Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны: праблемы вяртання» (2004), «Праблемы ідэнтыфікацыі і ўліку кніжнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі» (2006), «Лёс культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі: новыя знаходкі ў львоўскіх зборах» (2009) і інш. культуролаг выказвае думку, што асноўнай прычынай страты значнай часткі спадчыны грэка-каталіцкай царквы і немагчымасць яе поўнай інтэграцыі ў сістэму каштоўнасцей і сферу ўжытку ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

новых гістарычных умовах былі разбуральныя фактары, да якіх даследчык адносіць войны, паводкі, пажары, вываз культурных каштоўнасцей за мяжу. Праўда, на яго думку, яны ўсе разам нанеслі менш значныя страты, чым спыненне існавання царквы.

У кола цяперашніх навуковых інтарэсаў А. Сушы ўваходзяць пытанні кніжнай культуры, яе аксіясфера і семіясфера. У шэрагу артыкулаў («Праблемы ідэнтыфікацыі і ўліку кніжнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы», 2006; «Выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій для папулярызацыі літаратурнай і моўнай спадчыны Беларусі», 2008; «Книжкова спадщина Ігнатія Кульчинського», 2008 і інш.) аўтар праводзіць думку, што кніга па-ранейшаму застаецца адным з асноўных рэсурсаў устойлівага развіцця грамадства.

А. Суша з'яўляецца адным са складальнікаў выданняў «Кніга Беларусі, 1517–1917: зводны каталог» (2006), «Шэдэўры літаратурнай спадчыны Беларусі» (2007), «Даведнік па Беларусі для імператарскай асобы («Топографическия примечании на знатнейшия места путешествия Ея Императорскаго Величества в Белорусския Наместничества. 1780»)» (2007), «Рымскія выданні Ігната Кульчынскага» (2007).



Духоўную культуру беларускіх магнатаў як цэласную структуру, якую складалі філасофска-светапоглядны, рэлігійны, інтэлектуальны, маральны, прававы, мастацкі кампаненты, даследуе культуролаг ***Святлана Аляксандраўна Пацыенка***. Нарадзілася ў 1978 г. у Мінску. Закончыла Беларускі гуманітарны ліцэй пры Беларускім гуманітарным культурна-адукацыйным цэнтры і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. У 2000 г. паступіла ў аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры». У 2011 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме «Дынаміка духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння».

Функцыі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння аналізуюцца ў шэрагу навуковых артыкулаў С. Пацыенкі («Лад жыцця жыхароў агульнадзяржаўных замкаў у Вялікім Княстве Літоўскім», 2002; «Особенности формирования

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

духовной культуры магнатов Белорусского Понемонья, 2010). Культуролаг сцвярджае, што прызначэннем замкавай культуры з'яўлялася стварэнне, успрыманне, інтэрпрэтацыя, захаванне і трансляцыя духоўных узораў і каштоўнасцей рознымі пакаленнямі буйных свецкіх землеўладальнікаў высакароднага паходжання.

У працах «Асаблівасці развіцця культуры вышэйшага саслоўя ў Вялікім Княстве Літоўскім (2002), «Асноўныя механізмы дынамікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння» (2011) разглядаюцца характэрныя рысы духоўнай культуры магнатаў. Імі, на погляд даследчыцы, з'яўляліся свецкасць (як апазіцыя рэлігійнаму светапогляду), публічнасць (наданне падзеям прыватнага жыцця характару публічных акцый), дэманстратыўнасць (культуратворчая дзейнасць з мэтай праслаўлення сябе і свайго роду), мемарыяльнасць (успрыманне гісторыі як каштоўнасці, імкненне захаваць памяць пра сябе), высокая ступень маральнай адказнасці (усведамленне асабістай адказнасці за выкананне грамадскага абавязку).

Значная колькасць навуковых артыкулаў С. Пацыенкі тычыцца асноўных механізмаў дынамікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння («Беларускія замкі як асяродак сярэдневяковай культуры», 2003; «Культура прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя Вялікага Княства Літоўскага ў кантэксце еўрапейскай культуры эпохі Адраджэння», 2005; «Арыстакратычная культура на беларускіх землях», 2009 [131] і інш.). Асноўнымі яе механізмамі, на думку культуролага, з'яўляліся традыцыі і навацыі. Зварот да традыцыі спрыяў актывізацыі стабілізацыйных працэсаў у культуры. Узнікненне або запазычанне новых культурных узораў выклікала інварыянтнасць культуры магнатаў, разнастайнасць яе праяўленняў. Інтэнсіўнасць міжкультурных кантактаў, аўтаматызм прымянення навацый, іх спалучэнне з традыцыямі садзейнічалі дынамічнаму развіццю духоўнай культуры магнатаў Панямоння.

Навукова-даследчая работа С. Пацыенкі звязана таксама з распрацоўкай тэхналогій выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ў сучаснай турыстычнай дзейнасці Беларусі («Магнацкая культура як аснова анімацыйных праграм у культурным турызме Рэспублікі Беларусь», 2010).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Асаблівасці функцыянавання традыцый і навацый у сучаснай беларускай культуры прадмет росшукаў культуролага ***Наталлі Яўгенаўны Шалупенкі***. Нарадзілася ў 1969 г. у г. Чэрвені Мінскай вобласці. Вучылася на бібліятэчным факультэце Мінскага інстытута культуры, які закончыла ў 1990 г. Працавала выхавацелем у дзіцячым садзе, бібліятэкарам, метадыстам аддзела культуры ў г. Чэрвені. У 1999 г. паступіла ў аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры». З 2002 г. працуе ва ўніверсітэце выкладчыкам культуралагічных дысцыплін, на сёння займае пасаду дэкана факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва. Дысертацыю абараніла ў 2005 г. Мае вучоную ступень кандыдата культуралогіі.

Месца і ролю культурных традыцый і навацый, асаблівасці іх узаемадзеяння ў сучасным беларускім грамадстве Н. Шалупенка паказала ў дысертацыйным даследаванні «Сучасная духоўная культура Беларусі: узаемадзеянне традыцый і навацый» і навуковых артыкулах: «Роля традыцый у сучаснай беларускай духоўнай культуры» (1999), «Беларускія нацыянальныя традыцыі: асаблівасці станаўлення і развіцця» (2003), «Інавацыйная сацыякультурная дзейнасць у кантэксце інтэграцыйных працэсаў» (2003). Па меркаванні культуролага, асаблівасць сацыядынамікі беларускай культуры на сучасным этапе развіцця вызначаецца ўстойлівасцю традыцыйнага поля культуры. Традыцыя як форма пераемнасці культуры забяспечвае захаванне, перадачу, узнаўленне і назапашванне дамінантных нацыянальных каштоўнасцей. Навацыі, якія выконваюць функцыю ўзбагачэння культуры, імкнуцца да таго, каб стаць сацыякультурным эталонам, агульнапрынятым у сістэме культуры.

Узроўні функцыянавання беларускай культуры прааналізаваны ў артыкулах «Традыцыі ў культуры» (2002), «Нацыянальныя традыцыі і выхаванне асобы» (2003), «Рэгіянальныя аспекты развіцця культуры Беларусі на сучасным этапе» (2004) [177]. Паводле Н. Шалупенкі, бытаванне культуры беларусаў адбываецца на двух узроўнях: агульнанацыянальным і рэгіянальным.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Выяўленню вытокаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Еўразіі ад неалітычных часоў да зацвярджэння ў ёй сусветных рэлігій, адлюстраваных у міфах, занатаваных у тэкстах яе архаічных і руральных (вясковых) суполак, прысвечаны шэраг прац ***Вячаслава Віктаравіча Калацэя***. Нарадзіўся ў 1971 г. у Камянцы Брэсцкай вобласці. Вучыўся ў Брэсцкім музычным вучылішчы, затым у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, які закончыў у 1996 г. У гэтым жа годзе паступіў у аспірантуру ўніверсітэта па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры». Абараніў дысертацыю на саісканне вучонай ступені кандыдата культуралогіі. Навукова-педагагічная дзейнасць культуролага ўвесь час звязана з універсітэтам.

Культуралагічны аналіз міфаў асобных еўразійскіх супольнасцей, што склаліся ў часы фарміравання базавай структуры сучаснай этнічнай карты кантынента, утрымліваецца ў манаграфіі В. Калацэя «Параўнальная міфалогія» (2009). Аўтар прыходзіць да высновы, што міфалогія, рэпрэзентаваная ў этыялагічных тэкстах руральных асяродкаў, генетычна звязана хутчэй са стараеўрапейскімі, чым з індаеўрапейскімі міфалагічнымі сістэмамі. На думку культуролага, у спадчыне вуснай традыцыі беларусаў у выглядзе міфарытуалаў рэпрэзентаваны дзве асноўныя групы міфаў, якія ляжаць у аснове ўніверсальнай структуры міфалогіі: цэнтральная група міфаў і група міфаў з ключавым месцам у сістэме. Цэнтральная група міфаў, лічыць даследчык, мае падкрэслена касмалагічны характар. У ёй асвятляюцца з'яўленне Сусвету, характар яго існавання і акалічнасці магчымага знікнення. Міфы, якія ўтвараюць гэту групу, – антрапаганічныя, касмаганічныя, эсхаталагічныя. Да групы міфаў з ключавым месцам у сістэме культуролаг адносіць міфы пра культурных герояў (культуртрэгераў), якія падзяляюцца на міфы пра татэмных продкаў і блізнечныя міфы. Асобныя пытанні этыялагічнага дыскурсу разглядаюцца В. Калацэем у артыкулах «Раннетрадыцыйная класіка песень Беларускага Паазер'я і Паўднёвай Аўкштайтыі» (1997), «Ля вытокаў культуры. Міфалогія Беларусі: досвед структурнага аналізу» (2001), «Метад "уключанага назірання" ў дыдактыцы творчых ВНУ» (2011) [66].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Даследаваннем ролі сімвалічных структур у станаўленні, фарміраванні і развіцці нацыянальнай мастацкай карціны свету і вызначэнні ўплыву на нацыянальную культуру на працягу многіх гадоў займаецца ***Людміла Сяргееўна Кажухоўская***. Нарадзілася ў 1964 г. у Оршы Віцебскай вобласці. Закончыла Аршанскае педагагічнае вучылішча (1984) і Калінінскі дзяржаўны ўніверсітэт (1989). Да 1995 г. працавала арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай работы, выкладчыкам англійскай мовы і сусветнай і айчыннай культуры ў СШ № 16 г. Орша. У 1995 г. паступіла ў аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры». Пасля заканчэння аспірантуры працавала ў Адукацыйным цэнтры «Дыялог» на пасадзе выкладчыка-метадыста. З 2002 г. навукова-педагагічная дзейнасць звязана з Рэспубліканскім інстытутам вышэйшай школы. Дысертацыю абараніла ў 2003 г. Мае вучоную ступень кандыдата культуралогіі.

Навуковая дзейнасць Л. Кажухоўскай скіравана на праблему нацыянальнай мастацкай карціны свету і яе базісных сімвалаў. У сваёй манаграфіі «Базісныя сімвалы беларускай мастацкай карціны свету» (2002) [64], навуковых артыкулах «Базавыя сімвалы нацыянальна-мастацкай карціны свету як першаэлемент беларускага менталітэту» (1999), «Асаблівасці функцыянавання базавых сімвалаў у нацыянальнай мастацкай карціне свету» (2001), «Базавыя сімвалы як асноўны канструкт нацыянальна-мастацкай карціны свету» (2001) і інш. культуролаг паказала, што базісныя сімвалы ўзнікаюць на аснове архетыпаў культуры, першапачатковае ўвасабленне якіх у сімвалы адбываецца ў архаічнай культуры, потым яны робяцца спадчынай наступных тыпаў культуры, дзе ўжо ўтвараюць адзіную сістэму. Базісныя сімвалы нацыянальных і нацыянальных мастацкіх карцін свету, у адрозненне ад функцыянальных канструктаў навуковых карцін свету, на погляд даследчыцы, арыентаваны на ўзнаўленне суб’ектыўнага сэнсу сімвалізуемых аб’ектаў і фактаў рэчаіснасці. Яны суб’ектыўна афарбаваны і адлюстроўваюць рэчаіснасць саму па сабе не праз аб’ектыўныя характарыстыкі, а праз свае суб’ектыўныя адносіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У артыкулах «Міфалагічныя вытокі мастацкага сімвала» (1999), «Базавыя сімвалы мастацкай карціны свету беларусаў у творчасці Адама Міцкевіча» (2000) зрабіла апісанне базавых сімвалаў мастацкай карціны свету, акрэсліла асаблівасці іх функцыянавання ў міфалогіі, фальклоры і прафесійнай літаратуры.



Праблемы кніжнай культуры Беларусі адносяцца да прадмета даследаванняў ***Юліі Генадзьеўны Болатавай***. Нарадзілася ў 1972 г. у Мінску. Вышэйшую адукацыю атрымала ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Працавала ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. У 1996 г. паступіла ў аспірантуру ўніверсітэта па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры» і ў 1999 г. абараніла дысертацыю («Кніга як сацыякультурны феномен у кантэксце сучаснай беларускай культуры») на саіскание вучонай ступені кандыдата культуралогіі. Выкладала культуралагічныя дысцыпліны ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, з 2008 г. займае пасаду дацэнта ў Інстытуце сучасных ведаў імя А. М. Шырокава.

У навуковых артыкулах «Кніга ў постпісьмовай культуры» (1999), «Кніга паміж мінулым і будучым» (1999), «Кніга ў сям'і» (1999) [21] на аснове сістэмнага аналізу сучаснага стану беларускай кніжнай культуры Ю. Болатава вызначыла пазітыўныя і негатыўныя фактары, якія ўплываюць на сацыядынаміку кніжнай культуры. На погляд культуролага, садзейнічае развіццю кніжнай культуры рост агульнага кніжнага патоку, пашырэнне выдавецкай базы, адраджэнне прыватнага кнігагандлю, удасканаленне форм кнігі, рэарганізацыя бібліятэк з улікам сучасных патрабаванняў. Стрымлівае яе развіццё скарачэнне выпуску кніжнай прадукцыі дзяржаўнымі выдавецтвамі, зніжэнне інтарэсу да выданняў на беларускай мове і інш.

Феномен віртуальнай кнігі разглядаецца Ю. Болатавай у артыкуле «Да пытання аб візуалізацыі кніжнай культуры» (1999). Віртуальная кніга трактуецца як складнік агульнасусветнай электроннай культуры, а шырокае яе распаўсюджванне звязваецца з інфармацыйна-камп'ютарным выбухам і развіццём тэлекамунікацый. Электронная кніга ператварылася ў крыніцу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыі, сродак камунікацыі, модны спосаб баўлення вольнага часу.

Апошнім часам увага Ю. Болатавай сканцэнтравана на пытаннях фарміравання прафесійнай культуры спецыяліста-культуролага. Яна лічыць, што развіццё прафесійнай культуры спецыяліста-культуролага немагчыма без звароту да праблемы інтэлігентнасці. Таму аналізуе сутнасць паняццяў «інтэлігенцыя», «класічная інтэлігенцыя», «савецкая інтэлігенцыя», «інтэлігенцыя сучаснага тыпу», «інтэлігентнасць».

## 9.5. Эксплікацыя сацыяльнага механізма працэсу інкультурацыі на фарміраванне асобы

Сістэмная трансфармацыя беларускага грамадства аказвае ўплыў на карэкціроўку каштоўнасных арыентацый суб’ектаў культуры, матываў іх паводзін і ідэалаў. Каштоўнасці непасрэдна звязаны з іх самаактуалізацыяй і самарэалізацыяй. Яны яскрава выражаюць актыўную жыццёвую пазіцыю, якая часам нават уплывае на змяненне каштоўнасных прыярытэтаў усяго соцыуму. Як вядома, сістэму каштоўнасцей, жыццёвых пазіцый, узораў паводзін, норм, спосабаў дзейнасці фарміруе дамінантная культура.

Працэсы інкультурацыі і сацыялізацыі асобы дазваляюць устанавіць карэляцыю паміж чалавекам, яго патрэбнасцямі, жаданнямі, інтарэсамі, эмацыянальна-пачуццёвым светам, культурай і цывілізацыяй. М. С. Каган сцвярджае, што каштоўнасці ў наш час працягваюць існаваць у паўсядзённай свядомасці, забяспечваючы духоўную арыентацыю і рэгуляцыю прадметнай дзейнасці людзей і іх стасункаў. У сувязі з гэтым беларускія культуролагі лічаць сваім абавязкам вывучэнне шматгранных працэсаў інкультурацыі і сацыялізацыі асобы.



Выяўленню сутнасці, асноўных форм і сацыякультурных дэтэрмінантаў самаактуалізацыі асобы ў тэхнагенным грамадстве прысвечаны кандыдацкае дысертацыйнае даследаванне і большасць навуковых артыкулаў ***Ірыны Мікалаеўны Варановіч*** (нар. 1981). У навуковых артыкулах «Духовно-мировоззренческие предпосылки концепции самоактуализации» (2007), «Содержание концепта “само-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актуализация личности”» (2008), «Формы самоактуализации личности» (2010), «Уровни самоактуализации личности в культуре техногенного общества» (2011) І. Варановіч сцвярджае, што патрэбнасць асобы ў самаактуалізацыі з’яўляецца фундаментальнай асновай яе дзейнасці, сістэмаўтваральнай інтэнцыяй культуры, якая вызначае сэнс агульначалавечага быцця, прадукуе базавыя культурныя формы, уводзіць чалавека ў сацыяльнае і духоўнае вымярэнне свету, выяўляе каштоўнасна-сэнсавыя кантэксты жыцця. Культуролаг вылучае тры аспекты самаактуалізацыі: інкультурацыйны, дзейнасна-ўтылітарны і асобасна-крэатыўны. На думку даследчыцы, яны спрыяюць раскрыццю шматграннасці асобы як суб’екта культуры, з аднаго боку, а з другога – паказваюць на наяўнасць з’явы квазі-самаактуалізацыі, якая ўяўляе дэструктыўную або рэпрадуктыўную формы існавання чалавека, што дэтэрмінуюцца нярэдка эканамічнай, палітычнай сітуацыяй у свеце, а таксама нежаданнем чалавека ісці па шляху духоўнага асобаснага ўдасканалення.

Формы самаактуалізацыі асобы аналізуюцца І. Варановіч у артыкулах «Гуманитарное образование и его роль в самоактуализации личности» (2009) [30], «Инкультурация и креативная самоактуализация: взаимосвязь и взаимообусловленность» (2011), «Креативная самоактуализация личности как составляющая процесса инкультурации личности» (2011), «Философско-культурологическое осмысление феномена самоактуализации личности» (2012). У іх разглядаюцца крэатыўная, рэпрадуктыўная, адыктыўная і дэструктыўная формы, а таксама іх узроўні.



Культураўтваральныя асновы фарміравання эстэтычнай культуры малодшых школьнікаў у працэсе інтэграванай мастацкай дзейнасці даследуе ***Таццяна Вадзімаўна Карнажыцкая***. Нарадзілася ў 1965 г. у Мінску. Вышэйшую адукацыю атрымала ў Мінскім інстытуце культуры, які закончыла ў 1991 г. Працавала музычным кіраўніком у шэрагу дзіцячых садкоў і настаўніцай у СШ № 63 г. Мінска. У 1997 г. паступіла ў аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. У 2000 г. абараніла дысертацыю на саісканне вучонай ступені кандыдата куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туралогіі. Навукова-педагагічная дзейнасць звязана з Беларускім эканамічным універсітэтам і Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў.

У кандыдацкай дысертацыі «Фарміраванне эстэтычнай культуры малодшых школьнікаў у працэсе інтэграванай мастацкай дзейнасці як культураўтваральны фактар», артыкулах «Творчасць – стымул навучання. Школьны тэатр як частка адукацыйна-выхаваўчага працэсу» (2000) [69], «Каб сумелі нашы дзеці захаваць культуру продкаў» (2000), «Аб неабходнасці культуралагічнага погляду на праблему адукацыі як культурнага развіцця дзяцей» (2000) культуролаг разглядае асноўныя характарыстыкі працэсу фарміравання эстэтычнай культуры школьнікаў. Па яе меркаванні, імі з'яўляюцца: эмацыянальны водгук на ўспрымаемыя з'явы навакольнага свету, яго працягласць і імкненне да паўтарэння; здольнасць увасобіць сваё разуменне рэчаіснасці ў мастацкім вобразе; магчымасць асэнсаванага «пераводу» аб'екта, які ўвасоблены ў мастацкім вобразе сродкамі аднаго віду мастацтва, у мастацкі вобраз іншага віду мастацтва; разнастайнасць спектра магчымых форм і сродкаў перадачы з'явы, якая ўспрымаецца ў інтэграванай мастацкай дзейнасці.

Т. Карнажыцкая з'яўляецца аўтарам вучэбных дапаможнікаў.



Адметныя асаблівасці прафесійнай адукацыі спецыялістаў сацыякультурнай сферы даследуе ***Аляксандр Іванавіч Сцепанцоў*** (нар. 1947).

Станаўленне сацыякультурнай прафесійнай адукацыі і яе дынаміку А. Сцепанцоў прааналізаваў у дысертацыйным даследаванні «Бесперапынная адукацыя спецыялістаў у сферы культуры» і шэрагу артыкулаў: «Мастацкая адукацыя і рынак» (2000), «Кадры – творцы мастацкай культуры» (2001), «Аб становішчы з кадрамі ў галіне культуры» (2002), «Сістэма бесперапыннай адукацыі ў галіне культуры» (2004) [158], «Гістарычныя вехі станаўлення кадравай сістэмы культуры» (2008) і інш. На погляд культуролага, сацыякультурная прафесійная адукацыя мае шэраг адметнасцей: неабходнасць ранняга прафесійнага адбору моладзі, выяўленне іх прыродных здольнасцей і паслядоў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нае прырашчэнне іх прафесіяналізму; развіццё здольнасцей асэнсавання заканамернасцей культуратворчасці; набыццё арганізацыйных уменняў у рэалізацыі духоўна-эўрыстычных, інтэлектуальных, мастацка-творчых патэнцый чалавека.

Сутнасці кадравай палітыкі дзяржавы ў сацыякультурнай сферы прысвечаны артыкулы А. Сцепанцова «Праграмна-мэтавы падыход да рашэння кадравых праблем галіны культуры» (2004), «Дзяржаўная падтрымка таленавітай моладзі» (2004), «Кадры культуры як суб’ект сацыякультурнага ўзнаўлення грамадства» (2005) і інш. У іх культуролаг адзначае, што ў сістэме сацыяльна-эканамічнай палітыкі дзяржавы культура з’яўляецца важнейшым фактарам фарміравання і ўдасканалення «чалавечага капіталу», прызначанага садзейнічаць стварэнню новай, устойлівай структуры маральна-духоўных і сацыяльна-этычных каштоўнасцей грамадства. Дзяржаўная палітыка ў сферы культуры скіравана на стварэнне ўмоў для развіцця і ўмацавання інфраструктуры галіны, забеспячэнне доступу грамадзян да культурных каштоўнасцей. Адным з кірункаў гэтай палітыкі з’яўляецца ўдасканаленне прафесійнай адукацыі.



Сацыякультурныя дэтэрмінанты і іх уплыў на працэс фарміравання асобы вайскоўца даследуюцца культуролагам ***Аляксандрам Анатольевічам Касперуком.*** Нарадзіўся ў 1963 г. у г. Асіповічы Магілёўскай вобласці. Пасля заканчэння Ленінградскага вышэйшага палітычнага вучылішча (1984) знаходзіўся на вайсковай службе. У 2001 г. узначаліў аддзел планавання і забеспячэння навуковых даследаванняў у Інстытуце нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. У гэтым жа годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры».

У дысертацыйным даследаванні «Сацыякультурныя дэтэрмінанты фарміравання асобы вайскоўца ў сучасных умовах» (2001) [72] і навуковых артыкулах «Каштоўнасці культуры ў вайсковым выхаваўчым працэсе і вайсковай службе сучаснай моладзі» (2000), «Роля культуры ў развіцці сістэмы воінскіх каштоўнасцей абаронцаў Айчыны» (2001) А. Каспярук сцвярджае, што каштоўнасныя арыентацыі вайскоўцаў тэрміновай службы і маладых афіцэраў на вайсковую службу ў многім



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэтэрмінаваны сацыяльна-культурнымі фактарамі. Імі, на погляд культуролага, з’яўляюцца: наяўнасць разнаполюсных ацэнак неабходнасці і значнасці вайсковай службы афіцыйнымі інстытутамі, з аднаго боку, а з другога – нефармальнымі арганізацыямі, замежнымі СМІ; значная трансфармацыя каштоўнасных арыентацый моладзі са сферы калектыўных інтарэсаў у сферу асабістых; дыферэнцыяцыя патрэбнасцей і інтарэсаў у армейскай моладзі з улікам выбару маладымі людзьмі розных культурных запатрабаванняў.

Культуролаг вывучаў таксама формы ўзаемадзеяння паміж вайсковай субкультурай і грамадствам: «Аб узаемаадносінах сект і царквы, арміі, грамадства і дзяржавы» (1997), «Вайсковая служба і праваслаўныя традыцыі» (1998), «Маю гонар – Айчыне служыць» (2000). Ён вызначаў наступныя кропкі іх узаемадзеяння: пашырэнне дыялогу, адкрытасці з боку армейскіх структур і кантролю з боку грамадства; грамадзянскі давер і ўвага да праблем арміі; паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў вайскоўцаў; дэмакратызацыя ваенна-службовых адносін і стварэнне належных умоў для ўсебаковага развіцця асобы; змяненне гендарнай структуры ваеннай арганізацыі за кошт павелічэння колькасці вайскоўцаў-жанчын.

А. Каспярук працягвае асэнсоўваць праблемы ўзнаўлення, захавання і развіцця культурных каштоўнасцей у асяроддзі моладзі, ролі культуры ў фарміраванні духоўна-маральнага аблічча свету вайскоўца.



Аб’ектам культуралагічных даследаванняў ***Сяргея Леанідавіча Вілейкі*** з’яўляецца змест і структура культурнай палітыкі ва Узброеных Сілах нашай краіны. Нарадзіўся ў 1959 г. у Мінску. Пасля заканчэння Маскоўскага вышэйшага агульнавайсковага каманднага вучылішча (1981) займаў розныя камандныя пасады ў шэрагу вайсковых падраздзяленняў. З 1992 г. выкладаў сацыяльныя дысцыпліны ў Мінскім вышэйшым ваенным камандным вучылішчы і Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь. Апошнім часам узначальвае кафедру культуралогіі ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы.

У дысертацыйным даследаванні «Асаблівасці культурнай палітыкі ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь ва ўмовах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іх рэфармавання» (2000) [24] і навуковых артыкулах «Палітычная культура ваеннаслужачых» (1998), «Фарміраванне беларускай ідэі – адна з мэт культурнай палітыкі» (1999) ім вызначана сутнасць культурнай палітыкі ў вайсковай сферы. На думку даследчыка, гэта дзейнасць кіраўніцтва Узброеных Сіл краіны і спецыяльных інстытутаў, якія рэгулююць культурныя працэсы, забяспечваюць аптымальны ўзровень развіцця духоўнага жыцця ваеннаслужачых у інтарэсах павышэння баяздольнасці вайсковых падраздзяленняў і ўсебаковага развіцця асобы.

У працах С. Вілейкі «Музыка ў жыцці арміі і ўмовы яе эфектыўнага выкарыстання ў выхаванні вайскоўцаў» (1998), «Гуманітарызацыя ваеннай адукацыі – адзін з асноўных шляхоў удасканалення прафесіянальнай падрыхтоўкі афіцэраў» (1999) акрэслены фактары, якія садзейнічаюць удасканаленню культурнай палітыкі ў беларускім войску: умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы вайсковых культурна-асветных структур; забеспячэнне вайсковых сацыякультурных інстытутаў высокакваліфікаванымі кадрамі; гуманітарызацыя сістэмы ваеннай адукацыі; кампетэнтнае кіраўніцтва сацыякультурнай дзейнасцю ў вайсковай сферы.

С. Вілейка распрацаваў вучэбны дапаможнік «Культурная палітыка ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь» (2000).



Дынаміку і базавыя кампаненты каштоўнасных арыентацый ваеннаслужачых-пагранічнікаў ва ўмовах трансфармацыі сацыякультурнай сферы даследавала ***Тамара Іванаўна Якавук***. Нарадзілася ў 1954 г. у Брэсце. Сярэднюю спецыяльную адукацыю атрымала ў Брэсцкім музычным вучылішчы, працягвала адукацыю ў Брэсцкім педагагічным інстытуце (1981). Больш за дзесяць гадоў працавала піянерважатай, выхавацелем, настаўніцай у шэрагу школ Брэстчыны. З 1992 г. выкладае польскую мову і некаторыя сацыягуманітарныя дысцыпліны ў Брэсцкім педагагічным універсітэце імя А. С. Пушкіна. Дысертацыю на саісканне вучонай ступені кандыдата культуралогіі абараніла ў 1999 г.

У дысертацыі «Сацыякультурная абумоўленасць каштоўнасных арыентацый ваеннаслужачых Пагранічных войск Рэспублікі Беларусь», навуковых артыкулах «Аб уплыве інфармацыі на кіраванне маральна-псіхалагічным станам ваенна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

служачых» (1998), «Культурна-маральныя арыентацыі моладзі» (1999), «Ценностные ориентации военнослужащих Пограничных войск Республики Беларусь» (1999) [183] Т. Якавук на падставе аксіялагічнага падыходу вызначыла асноўныя тэндэнцыі дынамікі каштоўнасных арыентацый вайскоўцаў на прыкладзе пагранічных падраздзяленняў нашай краіны. Паказала, што ў каштоўнаснай структуры вайскоўцаў у 80–90-я гг. XX ст. адбыліся фундаментальныя змены. У іх каштоўнаснай арыентацыі ўзніклі супярэчлівыя вузлы, якія абумоўліваюць паводзіны пагранічнікаў. У выніку, на погляд даследчыцы, жыццёвыя ўстаноўкі маладых вайскоўцаў паступова аддаляюцца ад ідэалаў і духоўных каштоўнасцей, якія сфарміраваліся ў працэсе атамізацыі і ананімізацыі беларускага грамадства, і змяшчаюцца ў бок каштоўнасцей меркантыльных. Каштоўнаснае «ядро» ў свядомасці вайскоўцаў-пагранічнікаў складаюць у асноўным вітальныя каштоўнасці: здароў’е, сям’я, сяброўства, дзеці, стасункі і інш.

Т. Якавук у артыкулах, прысвечаных структуры і дынаміцы жыццёвых арыентацый беларускай моладзі (1999), умовам і магчымасцям фарміравання каштоўнасных арыентацый, якія садзейнічаюць выкананню службовага абавязку па ахове Дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь (1999), сфармулявала шэраг навукова абгрунтаваных прапаноў, накіраваных на пераадоленне негатыўных тэндэнцый у духоўнай сферы вайскоўцаў. Па яе меркаванні, неабходна змяніць падыходы да падбору кадраў вайскоўцаў кантрактнай службы; распрацаваць і ўкараніць у падраздзяленнях інфармацыйныя сістэмы; уключыць у курс дзяржаўна-прававой падрыхтоўкі цыкл гуманітарных дысцыплін і інш.

Сённяшні навуковы інтарэс Т. Якавук сканцэнтраваны вакол пытанняў сацыялогіі культуры.

## 9.6. Культуралагічнае абгрунтаванне сацыякультурнай значнасці мастацкай творчасці

Айчынная культуралогія на пачатку другога дзесяцігоддзя XXI ст. прадастаўляе даследчыкам метадалагічныя падыходы да разумення шэрагу праблем, якія да гэтага часу не атрымалі глыбокага асэнсавання. Так, выкарыстоўваючы метады герменеўтыкі, інтэртэкстуальнасці, постструктуралізму, фенамена-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

логіі, магчыма ажыццяўляць культуралагічны аналіз мастацкіх тэкстаў, якія ўтрымліваюць глыбінныя пласты культуры, што сягаюць у старажытнасць, а таксама сугучны ідэям сучаснасці. М. М. Бахцін у працы «Эстетика словесного творчества» падкрэсліваў, што «литература – неотрывная часть культуры, ее нельзя понять вне целостного контекста всей культуры данной эпохи» [17, с. 329]. Сапраўды, літаратурны твор, як і творы музычнага, выяўленчага мастацтва, з'яўляецца своеасаблівай формай гісторыка-культурнага працэсу, кожны раз узнаўляемай зноў у свядомасці чытача, дзе яго «прачытанне» ёсць адказ культуры, выяўляючай, актуалізуючай індывідуальныя і ўсеагульныя рысы. Тэксты мастацтва ўзаемазвязаны з бясконцай тканінай культуры, яны з'яўляюцца яе памяццю, прытым памятаюць не толькі культуру мінулага і цяперашнюю, але і прадбачаць культуру будучага. Таму класічныя тэксты, на наш погляд, з'яўляюцца важным сродкам выяўлення быцця, апрадмечвання яго. Класіка дае суб'ектам культуры адкрыццё трансцэндэнтнага. Беларускае мастацтва – гэта значная частка культурнай спадчыны нашага народа, адна са складнікаў духоўнага багацця, скарбніца дум, памкненняў і маральна-этычных каштоўнасцей беларусаў. Яе даследаванне ў культуралагічным кантэксце, мяркуем, дапаможа змяніць існуючы да сённяшняга часу стратны для навукі жорсткі падзел праблемнага поля мастацкай культуры паміж гуманітарнымі навукамі і аб'яднаць разрозненыя намаганні культуролагаў, мастацтвазнаўцаў, сацыёлагаў, філосафаў, псіхолагаў у пошуках глыбінных заканамернасцей самаактуалізацыі асобы побач з выяўленнем асаблівасцей бытавання мастацкай творчасці ў сацыякультурнай прасторы.



Тэарэтыка-культуралагічны аналіз музычнай творчасці як з'явы культуры – непасрэдны прадмет навуковых даследаванняў культуролага ***Ірыны Міхайлаўны Шумскай.*** Нарадзілася ў 1976 г. у Мінску. Навучалася ў мінскай гімназіі № 1, вышэйшую адукацыю атрымала ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. У гэты ж час супрацоўнічала з шэрагам айчынных перыядычных выданняў у якасці карэспандэнта. Скончыла аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры». У 2002 г. абараніла дысертацыю на саісканне вучонай ступені кандыдата культуралогіі. Падтрымлівае навуковыя кантакты з навукоўцамі Варшаўскага і Ягелонскага ўніверсітэтаў.

У манаграфіі «Музыка ў кантэксце беларуска-польскага міжкультурнага ўзаемадзеяння» (2011), навуковых артыкулах «Музыка і фрактальная дынаміка ў кантэксце сусветнай гармоніі» (1999), «Роля рацыянальных і ірацыянальных механізмаў у творчым працэсе» (2000), «Дыялектыка ўзаемадзеяння сацыяльнай дынамікі і музычнай культуры» (2001) [181] даецца тэарэтычнае абгрунтаванне характару эвалюцыі музычнай творчасці і ступені яе ўзаемасувязі з сацыякультурнай дынамікай. Культуролаг сцвярджае, што развіццё музычнай творчасці і эстэтычных уяўленняў аб ёй носіць нелінейны характар і звязаны з дынамікай грамадскага жыцця, зменай сацыякультурных цыклаў і светапоглядных парадыгм. У музычных творах знаходзяць сімвалічнае адлюстраванне не толькі індывідуальныя перажыванні, творчыя арыентацыі і сацыякультурны вопыт кампазітара, але і стылявыя асаблівасці, якія дамінуюць у перыяд стварэння музычнага твора.

Тэарэтычную значнасць маюць навуковыя артыкулы І. Шумскай, дзе аналізуюцца фактары, якія абумоўліваюць творчае развіццё асобы музыканта («Актывізацыя творчага мыслення як неабходная ўмова прафесійнага станаўлення асобы», 1998; «Аб ролі творчай асобы ў сістэме калектыўнага ўзаемадзеяння», 1998; «Да праблемы развіцця асобы ў працэсе творчай дзейнасці», 1998). Культуролаг да важнейшых фактараў адносіць: спадчыннасць, уздзеянне навакольнага асяроддзя, уласныя намаганні і здольнасці творцы, асаблівае ўспрыманне музыкантам архетыповых форм культуры.

У пазнейшых працах І. Шумская акцэнтуе ўвагу на пытаннях развіцця нацыянальнай музычнай культуры ў кантэксце глабалізацыі, станаўлення этнакультурнай ідэнтычнасці беларусаў на сучасным этапе, міжкультурнай камунікацыі ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне. Таксама займаецца і творчай практычнай дзейнасцю: арганізуе літаратурна-музычныя імпрэзы, піша музыказнаўчыя артыкулы, стварае кнігі паэзіі і прозы, робіць мастацкія пераклады, удзельнічае ў міжнародных фестывалях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Тэарэтычнаму асэнсаванню культуралагічных інтэнцый у творчай спадчыне У. Караткевіча прысвечана навуковая дзейнасць ***Паўла Казіміравіча Банцэвіча***. Нарадзіўся ў 1971 г. у г. Ліда Гродзенскай вобласці. Закончыў філалагічны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (1994). Навукова-педагагічная дзейнасць звязана з Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэтам.

Першая спроба разгледзець мастацкі і публіцыстычны тэкст праз прызму культуралагічных падыходаў была зроблена П. Банцэвічам у кандыдацкай дысертацыі па тэме «Культуралагічная інтэнцыя ў творчасці Уладзіміра Караткевіча», якую ён абараніў у 2004 г. Даследчык зыходзіў з меркавання, што творчая спадчына пісьменніка ёсць сукупнасць ідэй і вобразаў культуры, выпрацаваных у працэсе літаратурнай дзейнасці. Абапіраючыся на філалагічную герменеўтыку, ён вылучыў у тэкстах літаратурных твораў пісьменніка комплекс каштоўнасных арыентацый, якія актуалізуюць праблематыку нацыянальнай культуры і акрэсліваюць прыярытэты яе развіцця на сучасным этапе.

У манаграфіі «Творчасць Уладзіміра Караткевіча ў кантэксце культуралогіі» (2007) [12] яе аўтар паглыбіў палажэнні дысертацыйнага даследавання і выявіў змешчаныя ў духоўным тэзаўрусе пісьменніка вобразы, сімвалы, ідэі і праекты, якія рэпрэзентуюцца ў рэтраспектыўнай і перспектыўнай культурна-нацыянальнай прасторы і маюць непасрэдныя адносіны да глыбокага пазнання асаблівасцей традыцый і перспектыў беларускай культуры. На погляд культуролага, аксіялагічны змест тэарэтычных канструкцый У. Караткевіча дэтэрмінуецца яго імкненнем асэнсаваць гістарычны шлях беларускай нацыі, патрэбай ліквідаваць устойлівы стэрэатып яе «сялянскасці», пошукам ідэальнага самавобраза, што ў комплексе вызначае мэты і перспектывы айчыннай культуралогіі.

У шэрагу артыкулаў («Нацыянальныя і агульначалавечыя каштоўнасці ў празаічных творах У. Караткевіча (па матэрыялах школьнай праграмы)», 1999; «Асветніцкія ідэі ў рамане У. Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім”», 2000; «Раман У. Караткевіча “Хрыстос прызямліўся ў Гародні” (погляд асветніка на гісторыю і культуру» і інш.) П. Банцэвіч аналізуе

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

дамінанту эпістэмалагічных уяўленняў пісьменніка і прыходзіць да высновы, што ёй з'яўляецца комплекс каштоўнасных арыентацый і рэгулятараў. У якасці базавых называе нацыянальную самасвядомасць, узвышэнне беларускай мовы, выхаванне моладзі праз трывалыя веды, фальклор і мастацтва, дэманстрацыйнае зацвярджэнне культурных каштоўнасцей, актыўна-дзейсны патрыятызм, асэнсаванне нацыянальнай культуры ў славянскім і еўрапейскім культурным кантэксце.

Цыкл навуковых артыкулаў П. Банцэвіча прысвечаны даследаванню асветніцкіх інтэнцый, рэпрэзентаваных у творчасці У. Караткевіча («Асветніцкая функцыя этнаграфічнага матэрыялу ў творах У. Караткевіча», 2000; «Асветніцтва як тыпалагічная рыса беларускай культуры», 2003; «Дзейнасць У. Караткевіча ў кантэксце асветніцкай плыні», 2003 і інш.). Іх аўтар пераконвае, што пісьменнік унёс значны ўклад у асэнсаванне паняцця «асветніцтва» як універсальнай культуралагічнай катэгорыі.



Характэрныя рысы нацыянальнага менталітэту беларусаў на працягу некалькіх апошніх гадоў даследуе ***Таісія Фёдараўна Сухоцкая***. Нарадзілася ў 1968 г. у в. Стукалы Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці. Вышэйшую педагагічную адукацыю атрымала ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага, які закончыла ў 1992 г. Наступныя тры гады працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў СШ № 31 г. Гродна. У 1995 г. паступіла ў аспірантуру Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры». Абараніла кандыдацкую дысертацыю ў 2002 г. Мае вучоную ступень кандыдата культуралогіі і вучонае званне дацэнта культуралогіі. З 1997 г. выкладае ва ўніверсітэце культуралагічныя дысцыпліны.

У праблемнае поле даследаванняў Т. Сухоцкай уваходзяць пытанні гісторыка-культурнага працэсу, тыпалогіі ўтапічнага мыслення, стылю культуры, семантыкі яе нацыянальнага складніка. Найбольш грунтоўна культуролаг прааналізавала працэс фарміравання інтэграванай жанравай формы ўтапічнага мыслення (антыўтопіі) у беларускай культуры. У навуковых артыкулах даследчыца адзначае, што беларуская ўтопія і ан-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тыўтопія сталі формай паглыбленага філасофскага спасціжэння сутнасці эпохі, сродкам фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. Станаўленне і развіццё гэтай ідэальнай канструкцыі, змест якой складае інтэнцыя да ўдасканалення грамадства ў адпаведнасці з пэўнай сістэмай каштоўнасцей, адбываецца ў ХХ ст. Сутнасцю антыўтопіі, па меркаванні Т. Сухоцкай, з'яўляецца адлюстраванне ў мастацкай літаратуры хібаў у пабудове грамадства паводле нейкага ідэальнага праекта, паказ разрыву паміж абвешчаным ідэалам і яго рэальным увасабленнем.

Значную ўвагу Т. Сухоцкая звяртае на пытанні, звязаныя з функцыямі ўтопіі. Яна сцвярджае, што змест і парадыгма нацыянальнага стылю ў канцы ХІХ – пачатку ХХ ст. абумоўлены найперш ашчаджальным, ахоўным тыпам утапічнага мыслення, скіраванага на захаванне архетыпных асноў народнай культуры, сцвярджэнне радасці зямнога існавання, непрыняцце праяў крайняга рэвалюцыянарызму. Ахоўная інтэнцыя з'яўляецца вызначальнай. Абавязковая рэфлексія і рэпрэзентацыя сумарнага культурнага тэксту павінны ажыццяўляцца сродкамі роднай мовы, а не іншанацыянальнай. Новае пакаленне беларускага этнасу мае магчымасць убачыць праз прызму нацыянальнай культуры сэнс чалавечага жыцця, перспектывы самарэалізацыі ў духоўнай і сацыяльнай прасторы. Актыўнае выкарыстанне беларускіх сюжэтаў, вобразаў, традыцыйнай эстэтычнай сістэмы сёння не зводзіцца да простага механічнага пераймання. Яно ажыццяўляецца як іх актуалізацыя. Жывая народная традыцыя ўзнімае на новы ўзровень не толькі мастацкую інтэрпрэтацыю кананічных сюжэтаў, але і арыгінальную аўтарскую творчасць. Традыцыйная народная культура з характэрным для яе віталізмам, карнавалізаваным мысленнем выконвала ахоўную функцыю ў мастацтве, засцерагаючы яго ад праяў крайняга суб'ектывізму і нігілізму. Дарэчы, культуролаг лічыць, што і асноўнай рысай нацыянальнага менталітэту з'яўляецца кансерватыўна-ахоўны (ашчаджальны) тып утапічнага мыслення [156].

Асобныя навуковыя артыкулы Т. Сухоцкай прысвечаны праблеме стылю культуры, які яна трактуе як спосаб жыццядзеяння крэатыўных сэнсаў, сканцэнтраваных у структуры нацыянальнага тэксту і вербальнай сістэме яго кодаў. Вербальную культуру нацыі культуролаг разглядае як індыкатар сацыяльнага і культурнага развіцця грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Аб’ектам культуралагічнага аналізу ***Вольгі Фёдараўны Таланцавай*** з’яўляецца касцюм як культурны тэкст. Нарадзілася ў 1950 г. у г. Каменны Брод Чапаеўскага раёна Куйбышаўскай вобласці. Вышэйшую мастацтвазнаўчую адукацыю атрымала ў Інстытуце жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І. Рэпіна (1979). Пасля заканчэння інстытута працавала ў Рэспубліканскім доме мадэлей у якасці мастацтвазнаўца, у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР, Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы, Навукова-даследчым інстытуце Міністэрства адукацыі БССР. Цяперашнім часам займае пасаду старшага навуковага супрацоўніка Нацыянальнага інстытута адукацыі Рэспублікі Беларусь. У 2006 г. В. Таланцава абараніла дысертацыю на саісканне вучонай ступені кандыдата культуралогіі.

У дысертацыйным даследаванні і навуковых артыкулах «Трансфармацыя форм касцюма як выражэнне разнастайнасці свету асобы ў культуры» (2002), «Касцюм – першае асяроддзе пражывання чалавека» (2002) В. Таланцава выявіла семіётыку касцюма, якая складаецца з розных семіятычных узроўняў. Па яе меркаванні, семіётыка касцюма можа быць прадстаўлена: як цэласны знак; як сістэма знакаў; як сістэма сінтагматычных адносін; як сістэма парадыгматычных адносін. Пры мадыфікацыі альбо поўнай змене семіятычных прыкмет касцюма яго інварыянтная семіятычная структура застаецца нязменнай. Пры гэтым яна набывае тыпалагічную своеасаблівасць у розных культурных цэласнасцях у адпаведнасці з новымі культурнымі кодамі.

Адрозненні касцюма як візуальнага тэксту ад іншых тэкстаў культуры аналізуюцца В. Таланцавай у навуковых працах «Касцюм як мастацкі сімвал у выяўленчым мастацтве» (2004) [159], «Касцюм як сцэнічны вобраз у мастацтве тэатра» (2004). На погляд культуролага, касцюм рэпрэзентатыўны, наглядны, адкрыты для прачытання, яго інфармацыя імгненна прачытваецца рэцыпіентамі. Адначасова аўтар заўважае, што, у адрозненне ад вербальнай формы, інфармацыя, якая перадаецца праз касцюм, менш сістэматычная і рацыянальная, менш стабільная і аднанакіравана.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У працах В. Таланцавай разглядаюцца тыпы знакаў касцюма (знакі-сігналы, знакі-штампы, знакі-сімптомы, індэксальна-канвенцыянальныя знакі, іканічныя знакі, ізаморфныя, сімвалічныя і інш.). Шмат увагі звяртаецца на раскрыццё функцый касцюма. Культуролаг лічыць, што касцюм рэпрэзентуе гістарычныя тыпы культуры, выступае ў якасці сімвалічнай формы культуры. Касцюм у культурна-гульнявой прасторы выконвае функцыю нематываванага, умоўнага, г.зн. канвенцыянальнага, знака.

Галіной даследаванняў В. Таланцавай з'яўляецца музей як крэатыўная прастора культуры («Мастацкі музей у сістэме адукацыі», 1997; «Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь», 2001; «Музей як семіясфера культуры», 2005 і інш.). Ёй распрацаваны і апублікаваны эксперыментальны падручнік па выяўленчым мастацтве для сярэдняй школы «Мастацтва бачыць свет» (1998), пад яе рэдакцыяй надрукаваны эксперыментальны падручнік для сярэдняй школы «Чалавек і нацыянальнае архітэктурнае, прадметнае, колеравае асяроддзе» (2000; разам з Т. В. Габрусь, Я. М. Сахутам).



У рамках юнгіянскага аналізу даследаваннем этнакультурных архетыпаў займаецца ***Алена Уладзіміраўна Свечнікава.*** Нарадзілася ў 1973 г. у Маскве ў сям'і ваеннаслужачага. Сярэднюю адукацыю атрымала ў Літве, прафесіянальна-тэхнічную ў Расіі. Працавала чарцёжніцай і мастаком-афарміцелем у Вільнюскім вышэйшым ваенным камандным вучылішчы, настаўніцай малявання ў Гудагайскай сярэдняй школе Гродзенскай вобласці, метадыстам РНМЦ Астравецкага раёна. У 2002 г. закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, там жа вучылася ў аспірантуры па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры». У 2012 г. за даследаванне «Універсальныя і этнакультурныя архетыпы ў сучаснай беларускай антыўтопіі» атрымала вучоную ступень кандыдата культуралогіі. Выкладае ва ўніверсітэце шэраг культуралагічных дысцыплін.

У навуковых артыкулах «Архетыпічная структура тэксту» (2009) [140], «Беларуская антыўтопія: культурны кантэкст» (2010) антыўтопія разглядаецца ёю як тэксты культуры, а ўніверсальныя і этнакультурныя архетыпы ў антыўтопіях – як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канцэнтраванае выражэнне беларускай культурнай парадыгмы. Яна аналізуе сімволіку, матывы антыўтопій А. Адамовіча, В. Гігевіча, А. Макаёнка, Э. Скобелева, А. Шчуцкага, дэманструючы, што беларуская антыўтопія абапіраецца на апакаліптычную схему, біблейскія матывы, міфалагемы, сімволіку. Выкарыстоўваючы псіхааналітычную канцэпцыю К.-Г. Юнга, культуролаг выявіла «архетыпічную матрыцу» міфацэнтрычнага мастацкага тэксту, яго архетыпічнага каркаса, які адлюстроўвае сувязь тэксту з фальклорна-міфалагічнай асновай і з працэсам індывідуацыі асобы. Аўтару ўдалося даказаць існаванне архетыпічнай чатырохчасткавай структуры (норма, гармонія – парушэнне нормы, гармоніі – узмацненне дысгармоніі – знаходжанне гармоніі, узнаўленне нормы) ва ўсіх антыўтопіях беларускіх аўтараў. Параўнальны аналіз тэкстаў, сцвярджае А. Свечнікава, паказаў, што аналагічная архетыпічная матрыца шырока распаўсюджана ў сусветнай культуры. Культуролаг пераконвае, што архетыпічная матрыца звязана з імкненнем аўтара ўбачыць гармонію ў навакольным свеце, знайсці сэнс жыцця і цэласнасць.

У навуковым артыкуле «Ожидание апокалипсиса» аўтар вызначае шэраг тэм, якія характэрны для беларускай антыўтопіі: пошук духоўных арыенціраў, праблема мовы, зварот да традыцый і спецыфічныя яе рысы: рэтраспектыўнасць, андрацэнтрычнасць, міфалагічнасць, патрыярхальныя ўстаноўкі.

У працах «Философские истоки абсурдизма. Пьеса С. Беккета “В ожидании Годо”» (2003), «Архетипические образы в киноантиутопии» (2011) А. Свечнікава выяўляе істотныя рысы, якія аб’ядноўваюць літаратурную і кінаматаграфічную антыўтопію, знаходзіць універсальныя архетыпы ў кінаўтопіі Ф. Ланга, вызначае ў ёй ролю біблейскіх міфалагем і сімвалаў. Антыўтопія як светапогляд разглядаецца культуролагам у якасці шырокамаштабнай з’явы, якая ахоплівае кінамастацтва, мультыплікацыю, тэатр, літаратуру, камп’ютарныя гульні. Прапанаваная А. Свечнікавай методыка выяўлення архетыпічнай структуры тэксту можа выкарыстоўвацца ў філалагічных даследаваннях (як методыка аналізу мастацкага тэксту) і ў культуралагічных (як методыка аналізу архетыпічнай структуры наратыву ў сувязі з яго архетыпічнымі асновамі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Культурна-антрапалагічны змест мастацкіх і публіцыстычных твораў Якуба Коласа раскрывае ў сваіх працах ***Вольга Іванаўна Вярбіцкая***. Нарадзілася ў 1971 г. у г. Маладзечна. Закончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка. У 2012 г. паспяхова завяршыла навучанне ў аспірантуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры».

Дысертацыйнае даследаванне і значная колькасць навуковых артыкулаў В. Вярбіцкай прысвечаны выяўленню культуралагічнага дыскурсу ў творчай спадчыне Я. Коласа. У працах «Культуралагічная інтэнцыя творчай спадчыны Якуба Коласа» (2010) [31], «Увасабленне народнай культуры беларусаў у творчасці Якуба Коласа» (2009), «Мнеманічная аксіялогія культуры ў творчай спадчыне Якуба Коласа» (2012) яна паказвае, што коласаўскія творы прасякнуты этнічным каштоўнасным зместам, духоўным здароў’ем. Пісьменнік імкнуўся асэнсаваць вытокі беларускай культуры, спасцігнуць яе самабытны характар, сутнасць этнанацыянальнага духу, месца і ролю розных суб’ектаў культуры ў грамадскім працэсе. Мастацкія тэксты напоўнены сэнсавымі аб’ектамі, дзе перасякаюцца разнастайныя культурныя сэнсы, рухаюцца праз іх. Многія творы Я. Коласа ўключаны ў цэлую сістэму культурных каардынат, яны як бы сатканы з мноства ведаў аб культуры. Гэтая сапраўды рэфлексійная дзейнасць пісьменніка, адзначае В. Вярбіцкая, пераўтварылася ў своеасабліва выказаныя паэтам культуралагічныя ідэі, паняцці, сімвалы. І менавіта ў гэтым сэнсе творчасць Я. Коласа прасякнута культуратворчымі і культуралагічнымі інтэнцыямі, якія набываюць форму мастацка-вобразнага спасціжэння культуры, арыентуюцца на звышпачуццёвы пачатак пазнання, уключаючы сюды асабістае разуменне, уласную пазіцыю.

У артыкулах «Аперцэпцыя сацыялізацыі асобы Якубам Коласам: культуралагічны аспект» (2011), «Каштоўнасці сацыяльных субкультур у творчай спадчыне Якуба Коласа» (2011), «Увасабленне архетыпавага вобраза музыкі ў творчасці Якуба Коласа» (2011) даследчыца пераконвае, што для Я. Коласа характэрна асаблівае прадчуванне сутнасных працэсаў, феноменаў і з’яў культуры наогул і беларускай у прыватнасці. Імкнен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не абудзіць нацыянальны дух і веру народа ў сябе як ствральніка і транслятара высокай духоўнай культуры з'яўляецца той рэфлексійна-пачуццёвай прасторай, вакол якой фарміруецца этнанацыянальны масіў дыскурсу пісьменніка. Менавіта таму, прыходзіць да высновы аўтар, выяўленне культуралагічнага па сваёй сутнасці дыскурсу ў творчай спадчыне Я. Коласа і яго грунтоўны аналіз становяцца адной з актуальных праблем тэорыі і гісторыі культуры.

Такім чынам, культуралагічная інтэрпрэтацыя мастацкіх тэкстаў В. Вярбіцкай, П. Банцэвічам, А. Свечнікавай, А. Смолікам, Т. Сухоцкай, В. Таланцавай, І. Шумскай і інш. паслужылі асновай для ўзнікнення новага кірунку ў беларускай культуралогіі – фенаменалогіі мастацкай творчасці.

## 9.7. Адлюстраванне працэсаў субкультурызацыі грамадства ў тэорыі культуры

Грамадства складаецца з сацыяльна-класавых, прафесійных, дэмаграфічных і этнічных страт, якія ў культуралогіі прынята называць субкультурнымі супольнасцямі. Ва ўмовах сацыяльнай трансфармацыі сучаснага беларускага грамадства побач са старымі адыходзячымі сацыяльнымі групамі сацыялістычнай сістэмы фарміруюцца новыя субкультурныя ўтварэнні: прадпрымальнікаў, менеджараў, банкіраў, фермераў, маргінальных груп і інш. Названыя сацыякультурныя страты, утвораныя па пэўных блізкіх знешніх прыкметах, у адносінах псіхалогіі іх членаў вельмі неаднародныя. Іх суб'ектам не заўсёды ўласціва аднолькавае светаўспрыманне, вылучаюцца спецыфічныя феномены, якія замацоўваюцца ў асобных рысах паводзін, узаемаадносін з навакольным светам. Такога роду феномены ў культуралогіі прынята абазначаць паняццем «субкультура» – яно фіксуе аўтаномію дадзенай з'явы.

У замежнай і айчыннай культуралогіі да цяперашняга часу няма адзінай думкі адносна разумення гэтай катэгорыі. Так, па меркаванні вядомага амерыканскага сацыёлага Н. Смелзера, субкультурай з'яўляецца любая сістэма норм і каштоўнасцей, якая вылучае групу з вялікай супольнасці [147].

Падобнай думкі прытрымліваюцца расійскія і айчынныя навукоўцы, якія вызначаюць субкультуру як адасобленую сферу жыццядзейнасці чалавека, адметную пэўнай спецыфічнай сістэмай каштоўнасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Субкультура як дынамічны сегмент дамінантнай культуры – прадмет даследаванняў культуролага ***Сяргея Уладзіміравіча Масленчанкі.*** Нарадзіўся ў 1978 г. у г. Асіповічы Магілёўскай вобласці. Вышэйшую адукацыю атрымаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце, які закончыў у 2000 г. Увесь час працуе ў розных структурных падраздзяленнях Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Кандыдацкую дысертацыю абараніў у 2008 г.

Абапіраючыся на камунікатыўна-дзейнасны падыход, С. Масленчанка ў манаграфіі «Субкультура і камунікацыі» (2003) [115] прааналізаваў фактары субкультурызацыі беларускага грамадства. Сярод іх у якасці важнейшых культуролаг вылучае сацыяльна-эканамічны фактар і міжкультурныя запазычанні. Значны раздзел манаграфіі прысвечаны тыпалогіі субкультур моладзі. Даследчык выдзяляе рамантыка-эскапісцкія, геданістычна-забаўляльныя, анарха-нігілістычныя-экстрэмісцкія тыпы субкультур.

Прадметам навуковага інтарэсу культуролага з’яўляецца субкультура хакераў («Масавая камунікацыя і свабода», 2002; «Сацыякультурны аналіз субкультуры хакераў», 2002; «Субкультура хакераў як сегмент культуры», 2003 і інш.). Дадзеную субкультуру ён разглядае як вынік эвалюцыі тэхнічных культур. На думку культуролага, працэсы змены тэхнічных культур стварылі падмурак для развіцця як субкультуры хакераў, так і новых сродкаў камунікацыі – Інтэрнэта, які выступае «сацыяльным быццём» хакераў. У навуковых артыкулах аўтар акрэсліў этапы развіцця хакерскай субкультуры, яе каштоўнасці, лад жыцця і мадэлі паводзін.



Рэканструкцыю асноўных канцэптуальных падыходаў у даследаванні развіцця субкультуры беларускіх студэнтаў у гістарычнай рэтраспектыве ажыццявіла культуролаг ***Вольга Леанідаўна Гуцько.*** Нарадзілася ў 1978 г. у Мінску. Навучалася ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, які закончыла ў 2002 г. з прысуджэннем акадэмічнай ступені магістра гуманітарных навук. У гэтым жа годзе паступіла ў аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры». У 2010 г. абараніла дысертацыю на саісканне вучонай ступені кандыдата культуралогіі па тэме «Студэнцкая субкультура Беларусі як адлюстраванне трансфармацыі грамадства». З 2004 г. працуе на кафедры рэжысуры абрадаў і свят. Выкладае спецыяльныя дысцыпліны «Рэжысура свят», «Моўнае дзеянне ў святе», «Гісторыя свят» і інш.

У навуковых артыкулах «Структурные модели социокультурных ориентаций студенческой молодежи Беларуси» (2003), «Проявление этнонациональных характеристик в молодежной субкультуре» (2003), «Адлюстраванне сэнсу жыцця ў студэнцкай субкультуры» (2004) паказала ўзаемасувязь сацыяльна-эканамічных, маральных змен у грамадстве перыяду сістэмнай трансфармацыі і іх уздзеянне на студэнцкую субкультуру Беларусі. Пад уплывам сацыякультурных фактараў, па меркаванні В. Гуцько, адбываецца актывізацыя сацыяльна-палітычных каштоўнасцей студэнцтва, ідэнтыфікацыі з сацыякультурным асяроддзем, дзейнасці ініцыятыўных студэнцкіх аб'яднанняў, арганізацыі і правядзення студэнцкіх культурна-масавых мерапрыемстваў.

Этапы станаўлення і развіцця студэнцкай субкультуры разглядаюцца культуролагам у артыкулах «Студенческая субкультура в Виленском университете конца XVIII – начала XIX века» (2004), «Студэнцкія аб'яднанні Мінска: гісторыя і асаблівасці развіцця» (2007). На погляд В. Гуцько, у гісторыі айчыннай субкультуры студэнтаў магчыма вылучыць канфесіянальны, канфрантацыйны, палярызаваны, кансалідаваны, плюралістычны перыяды развіцця.

Навуковыя працы В. Гуцько («Структурные модели социокультурных ориентаций студенческой молодежи Беларуси», 2003 [170]; «Картина мира современной студенческой молодежи Беларуси», 2006 і інш.) маюць не толькі тэарэтычную значнасць, але і практычную накіраванасць. Мадэлі жыццёвай стратэгіі студэнцкай моладзі (мемарыяльная, актуальная, прагнастычная), якія выявіла даследчыца, дазваляюць розным сацыяльным інстытутам ранжыраваць сацыяльна-палітычныя перакананні, прыярытэты на каштоўнасці і дзейнасць студэнцтва.

У коле навуковых інтарэсаў В. Гуцько знаходзяцца таксама пытанні святочнай культуры беларусаў. У перыядычным друку і зборніках матэрыялаў навукова-тэарэтычных канферэнцый па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтай праблеме маецца ўжо некалькі яе цікавых артыкулаў (напрыклад, «Святы ў студэнцкай культуры», 2008).



Праблемным полем культуралагічных даследаванняў ***Тацыяны Леанардаўны Ойстрах-Дзямідавай*** з'яўляецца дзіцячая субкультура і мастацкая творчасць дзяцей. Нарадзілася ў 1959 г. у Мінску, вышэйшую адукацыю атрымала ў Мінскім педагагічным інстытуце замежных моў, які закончыла ў 1981 г. Працавала ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка, Нацыянальным інстытуце гуманітарных навук пры Беларускім дзяржаўным універсітэце і завочна вучылася ў аспірантуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры» (2005). Абараніла дысертацыю на саісканне вучонай ступені кандыдата культуралогіі (даследаванне «Мастацкая творчасць як кампанент дзіцячай субкультуры»). Працуе на пасадзе дацэнта на кафедры культуралогіі і міжнароднага турызму ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце.

У манаграфіі «Детская художественная культура Беларуси» (2004), шматлікіх навуковых артыкулах («Генезис детского художественного творчества и его влияние на развитие личности», 2010; «Поддержка государством и общественными организациями развития детской художественной культуры Беларуси», 2004; «Роль искусства в формировании личности», 2009 і інш.) Т. Ойстрах-Дзямідава разглядае феномен сучаснай дзіцячай субкультуры. Дзіцячую мастацкую творчасць трактуе як сутнасны кампанент дзіцячай субкультуры. Культуролагам прааналізавана біясацыякультурная прырода мастацкай творчасці дзяцей і выяўлены яе асаблівасці, доказна акрэслена дзіцячая субкультура як падсістэма культуры грамадства, раскрыты механізм узаемадзеяння дзіцячай субкультуры з духоўным жыццём грамадства.

Працы «Духовная культура и личность» (2008), «Нравственный мир семьи – духовное здоровье нации» (2011) прысвечаны вывучэнню шматвектарнага працэсу інстытуцыялізацыі дзіцячай мастацкай творчасці, выяўленню крытэрыяў дыферэнцыяцыі яе відаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Педагогам краіны вядомы вучэбныя дапаможнікі Т. Ойстрах-Дзямідавай па гісторыі мастацкай культуры: «Мировая художественная культура: материалы для учителя МХК» (2001), «Мировая художественная культура, конец XIX–XX век» (2007) [126]. Аб’ёмны культуралагічны і мастацтвазнаўчы матэрыял, які змешчаны ў дапаможніках, дазваляе асэнсаваць і прааналізаваць шляхі развіцця сусветнага і айчыннага мастацтва.

Высновы і рэкамендацыі, якія даюцца культуролагам у разнажанравых працах, накіраваны на больш мэтанакіраваны падыход да арганізацыі ўсёй сістэмы мастацкай адукацыі і выхавання, пошуку таленавітых дзяцей, іх дыферэнцыраванага навучання.



Прадметам даследавання ***Аляксандра Міхайлавіча Мясаедава*** (нар. 1979) з’яўляецца фарміраванне і сутнасць субкультуры медыцынскай супольнасці, яе выражаныя спецыфіка, мэта і задачы.

У сваім дысертацыйным даследаванні «Медыцынская субкультура: спецыфіка, структура, дынаміка» (2013) аўтар паказвае, што аб’ектам урачэбнай дзейнасці з’яўляецца пацыент – чалавек у яго бія-псіха-сацыяльнай цэласнасці. Таму сутнаснымі асаблівасцямі медыцынскай субкультуры выступаюць прафесіяналізм медыцынскага супрацоўніка і яго прафесійная культура.

У навуковых артыкулах «Асаблівасці прафесійнай дзейнасці ўрача, яго паводзін і зносін: падыходы і аснова спецыфікацыі» (2008), «Прафесійная культура ўрача і аксіялогія крайніх меж чалавечага існавання» (2009), «Ценностные ориентации студентов-медиков в сфере будущей профессиональной деятельности» (2011) і інш. А. Мясаедаў паказвае, што медыцынская субкультура ўяўляе сабой сістэмнае, дынамічнае ўтварэнне, адносна самастойную падсістэму культуры, асновай якой з’яўляецца ўрачэбная прафесійная дзейнасць і якая ўключае ў сябе суб’ект дзейнасці, яго каштоўнасную свядомасць, веды і ідэалы, сацыяльна-калегіяльныя адносіны, асобасна-псіхалагічныя якасці ўрача, культуру прафесійных паводзін, што вынікаюць з агульначалавечых каштоўнасцей і прафесійных традыцый, а таксама спецыяльныя інстытуты.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У артыкулах «Аксіясфера субкультуры ўрача» (2010), «Культурно-досуговая деятельность в субкультуре врача» (2011) аналізуецца своеасаблівасць медыцынскай субкультуры. На погляд аўтара, яна заключаецца ў карпаратыўнасці, што праяўляецца ў «закрытасці» медыцынскай супольнасці ад усіх сацыяльных груп, якія не адносяцца да сферы аховы здароўя. Субкультура разглядаемай супольнасці мае сваю сімвалічную атрыбутыку, рытуалы, міфалагемы-перакананні, сленг, у ёй адсутнічаюць лакальныя субкультурныя групы. У параўнанні з іншымі спецыялістамі, сцвярджае аўтар, медыкі маюць высокі статус і прэстыж у грамадстве і аказваюць уплыў на пацыентаў.

Аналіз культуралагічных даследаванняў беларускіх культуролагаў сведчыць, што ў айчыннай навуцы аб культуры сфарміравалася галіна, якая акцэнтуе ўвагу на выяўленні месца і ролі субкультурных утварэнняў у беларускім грамадстве.

## 9.8. Аналіз дэтэрмінантаў крызісу культуры беларускімі культуролагамі

Сацыякультурнае жыццё сучаснага беларускага грамадства характарызуецца складанымі працэсамі ўзаемадзеяння з імкліва зменлівым светам. Унутраныя сацыяльныя, эканамічныя і палітычныя працэсы адбываюцца на фоне абвастрэння культурных, цывілізацыйных, геапалітычных супярэчнасцей, якія набываюць глабальны маштаб. У гэтых умовах нярэдка ўзнікаюць энтрапійныя тэндэнцыі ў сацыякультурных працэсах, што выяўляецца ў разбурэнні структураванай сістэмы каштоўнасных арыентацый, форм сацыякультурнай арганізацыі і рэгуляцыі жыццядзейнасці людзей, культурных інстытутаў, ідэалогіі, маралі.

Менавіта таму шэраг беларускіх культуролагаў імкнецца асэнсаваць працэсы сацыякультурнай дэструкцыі, выявіць яе тэндэнцыі і прапанаваць навукова апрабаваныя рэкамендацыі па мінімізацыі яе негатыўнага ўплыву на грамадства. Дадзеная праблема грунтоўна даследуецца Л. К. Кухто, Д. А. Смолікам, Э. А. Усоўскай і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Аб’ектам навуковых даследаванняў культуролага ***Эліны Аркадзьеўны Усоўскай*** (нар. 1969) з’яўляецца постмадэрнісцкі тып сучаснай культуры. Закончыла гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1992). Пасля заканчэння працавала ў СШ № 163 г. Мінска і адначасова вучылася ў аспірантуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры». Кандыдацкую дысертацыю абараніла ў 2000 г. Да 2005 г. працавала на кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Апошнім часам займае пасаду дацэнта кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Прыярытэтным кірункам навуковай дзейнасці Э. Усоўскай з’яўляюцца парадыгмы постмадэрнізму культуры XX ст. На думку культуролага, постмадэрнізм уяўляе сабой комплекс светапоглядных установак, якія адметны прызнаннем мноства спосабаў і форм развіцця свету, крытычным мысленнем, адсутнасцю адзінага падыходу і фіксаванага пункту гледжання, бясконцасцю падыходаў і камбінацый, адмаўленнем прынцыпу бінарных апазіцый. У працах «Стылістычны плюралізм у мастацтве постмадэрнізму» (1997), «Асоба аўтара ў постмадэрнісцкай культуры» (1999) [165] аўтар сцвярджае, што прынцыпам, які аб’ядноўвае розныя версіі постмадэрнізму, з’яўляецца пазіцыя радыкальнага плюралізму каштоўнасцей, норм, ідэалаў культуры.

У манаграфіі «Парадигма постмодернизма» (2006) Э. Усоўская разглядае светапоглядную аснову прыхільнікаў постмадэрнізму, лічыць: іх светапогляду ўласціва крытычная свядомасць, якая па сваёй прыродзе антысістэматычна і цытатна. Асаблівасці свядомасці выступаюць элементам-асновай стылістычнага мноства постмадэрнісцкай мастацкай культуры. Да аксіялагічных асноў мноства Э. Усоўская адносіць сумесныя альбо падзяляемыя каштоўнасці, якія выконваюць камунікатыўную функцыю, карэкцiруюць мноства самых разнастайных каштоўнасцей тых ці іншых культур.

Э. Усоўская з’яўляецца аўтарам навуковых артыкулаў па пытаннях патэрнаў беларускай культуры, тэндэнцый развіцця

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сусветнай культуры XX ст. («Уровни межкультурного диалога и взаимодействие польской и белорусской культур», 2010; «Социально-политические процессы рубежа XX–XXI вв. и проблема межкультурного диалога», 2010; «Постсовременность как современность и ее черты», 2011 і інш.).

Культуролагам распрацавана і выдадзена некалькі арыгінальных вучэбных дапаможнікаў: «Постмодернизм» (2006), «Культурно-антропологические школы США» (2009).



Даследаваннем дэтэрмінантаў, сутнасных прыкмет і тэндэнцый сацыякультурнай дэструкцыі ў перыяд сістэмнай трансфармацыі беларускага грамадства займаецца культуролаг ***Дзяніс Аляксандравіч Смолік.*** Нарадзіўся ў 1973 г. у Мінску. Вышэйшую адукацыю атрымаў у Мінскім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка, Люблінскім універсітэце (Польшча). Працаваў ва Упраўленні справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У 2005 г. паступіў у аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры», якую закончыў у 2007 г. з абаронай дысертацыі на саісканне вучонай ступені кандыдата культуралогіі.

Аплікацыю выяўленай тэарэтычнай схемы дэструкцыі на даследуемую сацыякультурную супольнасць, вызначэнне этапаў, тэндэнцый сацыякультурнай дэструкцыі і механізмаў яе пераадолення культуролаг ажыццявіў у кандыдацкай дысертацыі «Сацыякультурная дэструкцыя ў трансфарміруючымся беларускім грамадстве (1985–1995)» і навуковых працах «Дэструкцыя як базавы канцэпт культуры» (2003), «Дэструктыўныя механізмы культуры: псіхааналітычны аспект» (2004) [154], «Разнастайнасць культуры ў перыяд грамадскіх трансфармацый» (2004). Даследчык паказаў, што ў 80-х гг. XX ст. у беларускім грамадстве склаліся перадумовы развіцця дэструктыўных працэсаў у сацыякультурнай сферы. На погляд Д. Смоліка, размыванне функцыянальнай цэласнасці і збалансаванасці сацыякультурнай сістэмы выклікана сацыяльным крызісам; рэзкімі зменамі ў агульным ладзе сацыякультурнай арганізацыі і рэгуляцыі калектыўных форм жыццядзейнасці людзей; дэградацыяй існуючых і своечасова не мадэрнізаваных інстытутаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыякультурнага кіравання; аўтарытарна вызначаным парадкам рэалізацыі з'яў і працэсаў культуры адпаведна дамінуючай ідэалогіі.

Даследчыкам уведзены ўпершыню ў навуковы ўжытак паняцце «сацыякультурная дэструкцыя». Яе змест, па меркаванні культуролага, складаюць разбурэнне і дэмантаж функцыянуючых інстытутаў; дэфармацыя падсістэмы каштоўнасных арыентацый, традыцыйнай маралі; дэідэалагізацыя грамадскага жыцця; зніжэнне ўзроўню структураванасці, складанасці і поліфункцыянальнасці культурнага комплексу беларускага грамадства; выхад значнай часткі суб'ектаў з зоны дзеяння рэгуляцыі свядомасці і паводзін з дапамогай дамінантнай культурнай сістэмы.

Д. Смолік распрацоўвае таксама тэарэтычныя пытанні субкультуралізацыі сучаснага беларускага грамадства («Деформация половозрастной структуры населения Беларуси на рубеже столетий», 2003; «Детская субкультура: определение и содержание», 2003 і інш.). Маргінальнаму полю культуры прысвечаны навуковы артыкул «Маргинальное поле искусства трансформирующегося общества», 2005; «"Массовая литература" как часть обыденной культуры», 2006). Не абыходзіць увагай культуролаг праблемы традыцыйнай культуры беларусаў («Праблемы захавання аўтэнтычных форм традыцыйнай мастацкай культуры», 2004; «Народная святочная культура і яе ўвасабленне ў паэме Якуба Коласа "Новая зямля"», 2008 і інш.).



З пазіцый структурна-функцыянальнага падыходу даследуюцца сутнасць і характар сацыякультурных і дэмаграфічных працэсаў у Беларусі ***Людмілай Канстанцінаўнай Кухто***. Нарадзілася ў 1972 г. у в. Пятровічы Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці. Пасля заканчэння Мінскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка працавала настаўніцай у Пятровіцкай СШ, вучылася ў аспірантуры педагагічнага ўніверсітэта і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. У 2003 г. абараніла дысертацыю на саіскание вучонай ступені кандыдата культуралогіі. Навуковая і педагагічная дзейнасць звязана з Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У дысертацыйным даследаванні «Сацыякультурная рэгуляцыя дэмаграфічных паводзін суб'ектаў постчарнобыльскага рэгіёна» (2003) [96], навуковых артыкулах «Дэмаграфічная трансфармацыя на тэрыторыі Беларусі за 10 гадоў пасля чарнобыльскай катастрофы» (1996), «Працоўныя рэсурсы: тэрытарыяльнае размеркаванне» (1997), «Сацыякультурны і адміністратыўна-прававы аспекты дэмаграфічных працэсаў» (2002) Л. Кухто грунтоўна прааналізаваны сацыякультурныя фактары, якія садзейнічаюць фарміраванню ладу жыцця, стэрэатыпаў і норм дэмаграфічных паводзін насельніцтва чарнобыльскага рэгіёна. Культуролаг паказвае, што духоўны і эмацыянальны стан грамадства аказвае значны ўплыў на дынаміку дэмаграфічных працэсаў і гэта выяўляецца ў паводзінах, прыняцці рашэнняў у сферы шлюбу, сям'і, нараджэння дзяцей, выбары прафесіі, месцажыхарства і інш. Папярэджанне дэмаграфічнай катастрофы лічыць магчымым пры выкарыстанні супольнасцю не толькі эканамічных, адміністратыўна-прававых механізмаў, але і культурна абумоўленых метадаў, якія садзейнічаюць фарміраванню актыўнай мадэлі дэмаграфічных паводзін насельніцтва.

Шэраг прац Л. Кухто прысвечаны аналізу метадаў і форм сацыякультурнай рэгуляцыі дэмаграфічных паводзін суб'ектаў посткатастрофнага соцыуму («Сучасныя міграцыйныя перамяшчэнні і неабходнасць іх уліку падчас перапісу насельніцтва», 1996; «Аналіз і ацэнка працарэсурсных магчымасцей Рэспублікі Беларусь», 1996; «Працоўныя рэсурсы: тэрытарыяльныя размеркаванні», 1997; «Сацыякультурная характарыстыка суб'ектаў постчарнобыльскага соцыуму», 2002 і інш.). У іх аўтар прыходзіць да высновы, што рэгулятыўную функцыю могуць выконваць розныя сацыякультурныя інстытуты шляхам выпрацоўкі ў насельніцтва норм і стандартаў дэмаграфічных паводзін, фарміравання каштоўнасцей і ідэалаў, якія пазітыўна ўплываюць на працэс узнаўлення насельніцтва ў неабходнай колькасці і якасці для арганізацыі грамадскай дзейнасці.

Апошнім часам Л. Кухто паглыблена вывучае праблемы ўплыву масавай культуры на духоўную сферу сучаснага беларускага грамадства.

Яна з'яўляецца суаўтарам вучэбных дапаможнікаў «Культуралогія: тэорыя культуры» (2008), «Культуралогія: гісторыя культуры» (2009).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 9.9. Станаўленне музейнай культуралогіі

У сацыяльна-культурнай прасторы Беларусі сваёй адметнасцю вылучаюцца музеі, задачамі якіх з'яўляюцца вывучэнне і асэнсаванне гісторыі, культуры ў мэтах развіцця інтэлектуальных, маральных і творчых магчымасцей чалавека, далучэння яго да нацыянальнай і агульначалавечай культур. У канцы ХХ – пачатку ХХІ ст. назіраўся нават пэўны рост дзяржаўнай музейнай сеткі, якая за апошнія гады папоўнілася шэрагам новых устаноў. Найбольш актыўна працэс музеефікацыі адбываўся ў першыя постсавецкія гады. Пасля гэты працэс быў запаволены, але зараз ён мае досыць стабільны характар. Істотна актывізавалася экспазіцыйна-выставачная работа. Супрацоўнікі музеяў займаюцца таксама зборам і папаўненнем калекцый, навукова-даследчай работай, паляпшэннем умоў захавання музейных рэчаў, выхаваўчай і папулярызатарскай дзейнасцю. Нават з улікам складаных сацыяльна-эканамічных абставін можна зазначыць, што пераважная большасць музеяў не згарнула асноўных напрамкаў сваёй работы.

Культуролагамі музей разглядаецца як своеасаблівы культурны феномен грамадства і кампанент прасторы соцыуму. Сацыяльна-культурная сутнасць музея заключаецца ў тым, што аснову ўсёй яго дзейнасці складаюць помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры, якія ён выяўляе, збірае, захоўвае, даследуе і рэпрэзентуе. Сістэмаўтваральным фактарам музейнага асяроддзя служыць культура, што складае змест культуралагічнага падыходу. Менавіта таму ў сучаснай айчыннай культуралогіі музей з'яўляецца аб'ектам спецыяльных культуралагічных даследаванняў.



Унікальнасць і самабытнасць культурнай прасторы Полацка даследуе ***Тамара Аляксандраўна Джумантаева***. Нарадзілася ў 1959 г. у Полацку. Закончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. М. Горкага па спецыяльнасці «гісторыя і замежная мова» (1983). У 1993 г. атрымала вышэйшую музеязнаўчую адукацыю ў Санкт-Пецярбургскай дзяржаўнай акадэміі культуры. Два гады працавала настаўніцай гісторыі і англійскай мовы ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ветрынскай (Полацкі раён) сярэдняй школе, затым – у Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку: спачатку на пасадзе загадчыцы экскурсійнага аддзела, потым – навукова-рэстаўрацыйнага, а з 1991 г. – намесніка дырэктара па навуковай рабоце.

Праца ў музеі садзейнічала навукова-даследчай дзейнасці Т. Джумантаевай. Усведамленне ўніверсальнасці і агульначалавечай значнасці культурнай спадчыны Полацкага рэгіёна, сфарміраванай у выніку шматвяковай палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культуратворчай дзейнасці беларускага народа, прывяло яе да навуковага аналізу артэфактаў, якія маюць сусветнае значэнне (Сафійскі сабор, Вялікі пасад, комплекс фрэскавага роспісу Спаса-Праабражэнскай царквы XII ст., Полацкае Евангелле XII ст., стыхіра св. Ефрасінні Полацкай, кніжны збор Сімяона Полацкага і інш.). У навуковых часопісах з’яўляецца шэраг яе арыгінальных артыкулаў («Партрэт Эльжбеты Агінскай Пузыны з фондаў Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка», 2001; «Да пытання аб асваенні Інтэрнэта музеямі Полацка», 2002; «Предметы литургического обихода и личного благочестия XI–XIII веков в музейном собрании Национального Полоцкого историко-культурного музея-заповедника», 2005 і інш.). Артыкулы былі заўважаны, і даследчыцы прапанавалі навучанне ў аспірантуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб’ектаў»; абараніла дысертацыю на саісканне вучонай ступені кандыдата культуралогіі (2011) [46].

У працах культуролага («Канцэпцыя і стратэгія захавання культурнай спадчыны Полацка», 2008; «Музеефікацыя гісторыка-культурных помнікаў як частка працэсу адраджэння і захавання спадчыны», 2011; «К вопросу о музеефикации уникальной исторической территории города», 2009 і інш.) грунтоўна прааналізаваны асаблівасці полацкай культурнай прасторы. Імі, на думку даследчыцы, з’яўляюцца: яе аўтэнтычнасць, разнастайнасць і адносна добрая захаванасць.

З пазіцый сучасных культуралагічных канцэпцый Т. Джумантаевай прааналізавана сутнасць музея ў кантэксце культурнай прасторы гістарычнага горада, дзе захаванне і рэпрэзентацыя аб’ектаў унікальнай культурнай спадчыны становіц-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ца асноватворнай функцыяй музея. У яе працах («Музейный предмет и его свойства», 1992; «Музейные традиции Полоцка и перспективы развития музея-заповедника», 2007; «Музеефікацыя гісторыка-культурных помнікаў як частка працэсу адраджэння і захавання спадчыны», 2011 і інш.) адзначаецца, што з цягам часу музеі горада становяцца складнікамі рэгіянальных культурных працэсаў, а музейная сетка горада вылучаецца ў самастойны культурна-гаспадарчы комплекс. У прыватнасці, музеі Полацка, сцвярджае культуролаг, заўсёды з'яўляліся пэўнымі сацыякультурнымі інстытутамі, гарантамі забеспячэння аховы гісторыка-культурнай спадчыны горада, цэнтрамі гуманітарных навуковых даследаванняў і важнымі асветнымі ўстановамі. У працах прасочваецца гісторыя музеефікацыі Полацкай культурнай прасторы, у якой Т. Джумантаева вылучае пяць этапаў, у кожнага з іх – адметныя рысы ў музейнай дзейнасці, якія трансфармаваліся ў агульнакультурныя традыцыі.

Значная ўвага ў працах культуролага («Да пытання аб музейных традыцыях Полацка. Музей езуіцкага калегіума XVIII–XIX стст. Музеі навучальных устаноў XIX ст.», 1999; «Краязнаўчы музей Полацка (пач. XX ст. –70-я гг. XX ст.)», 2000; «Музейные традиции Полоцка и феномен городского музея», 2005 і інш.) надаецца дзейнасці канкрэтных суб'ектаў культуры, значнасці іх унёску ў стварэнне музеяў і развіццё музейнай справы ў Полацку.

Даследаванне працэсу музеефікацыі культурна-гістарычнай прасторы Полацка з улікам спецыфікі рэгіянальнай культурнай спадчыны дазволіла Т. Джумантаевай выпрацаваць інавацыйную функцыянальную мадэль развіцця музея-запаведніка, якая пакладзена ў аснову аўтарскай стратэгіі захавання культурнай спадчыны гістарычнага горада. Паводле яе, аб'ектам музеефікацыі можа стаць увесь гістарычны цэнтр горада. Але адкрыццё новых аб'ектаў на тэрыторыі музея-запаведніка (у тым ліку і шэрагу музеяў), лічыць культуролаг, павінна адбывацца з улікам мінімізацыі шкоднай нагрузкі (амартызацыі), што, у сваю чаргу, вымушае да стварэння спецыяльнай мадэлі культурнага турызму, неабходнасці культуралагічнага погляду на праблему.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Асэнсаваннем экспазіцыйнай прасторы беларускіх музеяў як месца для рэпрэзентацыі артэфактаў культурнай спадчыны беларускага народа займаецца культуролаг ***Яўгенія Леанідаўна Краснова***, якая нарадзілася ў Віцебску ў 1983 г. Вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці «музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры» атрымала ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава, які закончыла ў 2006 г. У перыяд з 2006 г. па 2010 г. вучылася ў магістратуры і аспірантуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў». У 2012 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю. Мае вучоную ступень кандыдата культуралогіі. Працоўная дзейнасць звязана з Віцебскім абласным краязнаўчым музеем і Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў.

Камунікатыўны патэнцыял экспазіцыйнага асяроддзя і семіятычны змест музейнай экспазіцыі раскрыла Я. Краснова ў дысертацыйным даследаванні «Сучасная экспазіцыйная прастора музеяў Беларусі: камунікатыўны аспект» (2011) [83], навуковых артыкулах «Музейны прадмет у семіятычнай прасторы экспазіцыі» (2009), «Музейная экспазіцыя як знакавая і інфармацыйна-камунікатыўная сістэма» (2010), «Музейная экспазіцыя ў сістэме камунікацый» (2011) і інш. Па меркаванні культуролага, у сучаснай музеязнаўчай практыцы пачала надавацца значная ўвага знакава-сімвалічнаму напаўненню экспазіцый, дзе ў ролі знакаў выступаюць як экспанаты, так і розныя элементы мастацка-дэкаратыўнага афармлення. Паводле Я. Красновай, выкарыстанне знакава-сімвалічнай інфармацыі садзейнічае раскрыццю камунікатыўных магчымасцей экспазіцый, надае ім прывабны выгляд, робіць цікавымі і даступнымі для шырокага кола музейнай аўдыторыі.

У артыкулах «Выкарыстанне фотаматэрыялаў для арганізацыі адукацыйнай прасторы музейнай экспазіцыі» (2005), «Мастацкая інсталяцыя як эксперыментальны феномен культуры XX ст.» (2007), «Эвалюцыя канцэптуальных падыходаў у арганізацыі музейнага экспазіцыйнага асяроддзя» (2010), «Мастацтва музейнай экспазіцыі: сучасныя тэндэнцыі і падыходы»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(2010) Я. Краснова прыйшла да высновы, што адным з найбольш перспектыўных сродкаў пашырэння камунікатыўнага патэнцыялу музейнай экспазіцыі з’яўляецца музейная інсталяцыя, якая ўяўляе спецыфічную музейную форму выразнасці.



Эвалюцыю зместу сацыякультурнай дзейнасці літаратурных музеяў нашай краіны даследуе культуролаг ***Ірына Генадзьеўна Лупашка***, якая нарадзілася ў Клецку ў 1977 г. Цікавасць да музея як неад’емнай часткі сацыяльна-культурнай прасторы соцыуму прывяла яе ў 1994 г. у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, дзе даследчыца грунтоўна вывучала формы і метады музейнай справы. Пасля заканчэння ўніверсітэта прадоўжыла адукацыю ў аспірантуры па спецыяльнасці «музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб’ектаў». Тэмай дысертацыі І. Лупашкі стала праблема функцыянавання літаратурных музеяў у кантэксце сучасных сацыякультурных працэсаў. За грунтоўнае даследаванне ў 2013 г. ёй прысвоена вучоная ступень кандыдата культуралогіі.

У дысертацыі і артыкулах «Сацыяльныя функцыі літаратурнага музея» (2003), «Асноўныя тэндэнцыі культурна-адукацыйнай дзейнасці беларускіх літаратурных музеяў на сучасным этапе» (2011), «Рэгіянальныя музеі як культурныя і турыстычныя цэнтры: на прыкладзе рэгіянальных філіялаў літаратурных музеяў» (2010) і інш. разглядаюцца мадыфікацыйныя працэсы, якія адбываюцца ў беларускіх музеях пад уплывам культурных запатрабаванняў сучаснага грамадства. Аўтар артыкулаў прыходзіць да высновы, што дзейнасць сучасных музеяў характарызуецца ўзмацненнем увагі да культурнай спадчыны, што праяўляецца ў шырокім паказе гісторыка-літаратурных працэсаў праз увядзенне ў экспазіцыю элементаў гістарычнага, этнакультурнага і краязнаўчага характару [104].

Прадметам увагі культуролага з’яўляецца таксама музейная камунікацыя. У артыкулах «Музей і школа» (2004), «Камунікатыўная роля музея як захавальніка духоўнай спадчыны» (2007) аналізуецца спецыфіка культурна-камунікатыўнай функцыі літаратурных музеяў, якая заключаецца, на думку даследчыцы, у пераходзе ад манаграфічнага паказу жыцця і творчасці пісь-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

менніка да больш шырокага адлюстравання культурна-гістарычнага кантэксту эпохі, звязанай з яго культуратворчасцю.

І. Лупашка ў апошні час стала цікавіцца таксама праблемамі грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі ў працэсе інкультурацыі, у якім музеям належыць значная роля.

Такім чынам, на падставе выкладзенага можна сцвярджаць, што ў Беларусі пачынае фарміравацца новая галіна культуралагічных навуковых ведаў, якая, на наш погляд, акрэсліваецца як музейная культуралогія. У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў адкрыта магістратура і аспірантура па гэтым кірунку, а ў савеце па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый разглядаюцца навуковыя працы на прадмет прысваення вучоных ступеняў кандыдата культуралогіі. Спадзяёмся, што праз пэўны час складзецца самастойная навуковая школа па гэтай галіне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

У якасці важнейшай атрыбутыўнай прыкметы крэатыўнай навуковай эліты на інфармацыйна-кагнітыўным узроўні звычайна вызначаецца наяўнасць істотных дасягненняў у галіне назапашвання новых ведаў, якія прызнаюцца навуковай супольнасцю. За апошнія два дзесяцігоддзі беларускімі культуролагамі падрыхтаваны і апублікаваны грунтоўныя манаграфічныя працы, у якіх адлюстраваны асноўныя вынікі культуралагічных даследаванняў. Культуралогія як навуковая і вучэбная дысцыпліна заняла трывалае месца ў сістэме гуманітарных ведаў. Яе вывучаюць у многіх установах вышэйшай адукацыі. Расійскімі і беларускімі навукоўцамі выдадзена нямала падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, вучэбна-метадычных комплексаў, аўтары якіх знаёмяць студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў з разнастайнасцю культурных феноменаў.

Сярод расійскіх аўтараў неабходна адзначыць П. С. Гурэвіча, якому належыць серыя вучэбнай літаратуры па тэорыі і гісторыі культуры («Культурология», 1966, 1997, 1998, 1999, 2001) [44], А. І. Арнольдава «Введение в культурологию» (1993) [3], «Культурология» пад рэдакцыяй А. А. Радугіна (1998) [91], В. М. Розіна «Введение в культурологию» (1997) [133], «Культурология» (2003) [134], А. С. Карміна «Основы культурологии. Морфология культуры» (1997) [68], «История культурологии» пад рэдакцыяй А. П. Агурцова (2006) [62], Б. С. Ерасава «Социальная культурология» (1997) [53] і інш.

У гэты ж час пачынаецца работа па стварэнні вучэбна-метадычнай літаратуры па тэорыі і гісторыі культуры беларускімі культуролагамі. Першы вучэбны дапаможнік па культуралогіі ў Беларусі распрацаваў і выдаў пачынальнік фундаментальных даследаванняў па культуры М. І. Крукоўскі. У рабоце «Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію» (2000) [88] выкладаюцца агульнатэарэтычныя прынцыпы і палажэнні культуралогіі, якія адлюстроўваюць заканамернасці, што дзейнічаюць на агульначалавечым і рэгіянальным узроўнях, у тым ліку і ў беларускай культуры. Дапаможнік з'яўляецца беларус-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кім ад пачатку да канца. Ён напісаны на беларускай мове, прасякнуты беларускім духам.

На работу М. І. Крукоўскага арыентаваліся і аўтары пазнейшай вучэбна-метадычнай літаратуры па культуралогіі. У 2007 г. выйшла ў свет праца «Культуралогія: тэорыя культуры», рэкамендаваная Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў УВА [151]. Яе аўтары, Л. К. Кухто і А. І. Смолік, разглядаюць пытанні сутнасці, статусу і функцый культуралогіі, яе генезісу і гістарычнай эвалюцыі, аналізуюць метадалагічныя асновы навукі аб культуры. Тэксты дапаможніка падмацоўваюцца ілюстрацыйным матэрыялам, які пераважна дэманструе артэфакты беларускай культуры. На старонках падручніка змешчана шмат выяў заснавальнікаў беларускай і замежнай культуралогіі. У электроннай версіі, акрамя відэарада, маюцца гукарад, мультымедыйныя матэрыялы.

Названыя культуролагі ў суаўтарстве з А. А. Цобкалам стварылі дапаможнік «Культуралогія: гісторыя культуры» (2009), які дапушчаны Міністэрствам адукацыі ў якасці вучэбнага для студэнтаў УВА [150]. У ім аўтары раскрываюць гістарычныя тыпы культуры, прынцыпы і крытэрыі тыпалагізацыі культур, высвятляюць агульныя рысы розных тыпаў і відаў культур, вылучаюць непаўторныя, адметныя асаблівасці кожнай культуры. Культурагенез падаецца ў кантэксце беларускай культуры.

Метадалагічныя праблемы і эўрыстычны патэнцыял культуралогіі як філасофіі культуры раскрываюцца І. Я. Левяшом у курсе лекцый «Культурология» (1998) [97]. Аўтар канцэнтруе ўвагу не столькі ў рэтраспектыве, колькі ў кантэксце сучаснай сацыякультурнай сітуацыі і прагназавання эвалюцыі культуры і цывілізацыі. У цэнтры іх – нацыянальнае і рэгіянальнае вымярэнні, сутнасць і роля хрысціянскай культуры, «восевае» супрацьстаянне «Захад–Усход» і глабальная праблематыка канфлікту сучаснай культуры і цывілізацыі.

Глыбокія і арыгінальныя веды па асновах культуралогіі ўтрымліваюцца ў вучэбным дапаможніку «Основы культурологии. Архетипы культуры» (2001) [121]. Яго аўтар І. В. Марозаў ажыццяўляе інтэрпрэтацыю першасімвалаў, архетыпаў у рэлігіях, міфалогіі, мастацтве, паўсядзённым жыцці розных цывілізацый і эпох. Стыль выкладання падштурхоўвае студэнтаў да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уласных развaжанняў і творчых пошукаў у вырашэнні складаных праблем культуры.

У вучэбным дапаможніку «Культурология. Теория культуры» (2008) [112] У. Ф. Мартынаў разглядае спецыфіку структурнага функцыянавання культуры. Значная частка дапаможніка адведзена параўнальнаму аналізу культурна-гістарычнай дынамікі, аналізу фундаментальных супярэчнасцей і парадоксаў развіцця тэхнагеннай цывілізацыі, перспектыў сацыякультурнай эвалюцыі чалавецтва.

Характарыстыка асноўных рэлігійных традыцый ва ўзаемадзеянні з культурай прадстаўлена ў вучэбна-метадычным дапаможніку «Культуралогія», аўтарам якога з’яўляецца В. Р. Языковіч [182]. У працы раскрываюцца пытанні тэарэтычнай культуралогіі і гістарычнай тыпалогіі культур, паказаны формы і тэндэнцыі развіцця сусветнай мастацкай культуры. Адзін раздзел прысвечаны станаўленню і развіццю беларускай культуры.

Фарміраванню ўяўленняў аб культуры як найвышэйшай каштоўнасці спрыяе вучэбна-метадычны комплекс «Культурология. Эстетика» (пад рэдакцыяй Т. І. Глушаковай, 2008) [93]. Аўтары ў адпаведнасці з праблемна-храналагічным прынцыпам выкладання знаёмяць студэнтаў з гісторыяй культуралагічнай думкі, катэгарыяльным апаратам дадзенай галіны ведаў, раскрываюць сутнасць асноўных праблем сучаснай культуралогіі.

Варта адзначыць калектыўную працу «Культурология: теория и история культуры» (2004) пад агульнай рэдакцыяй І. Я. Шыршова [92]. У ёй выкладаюцца асноўныя тэмы культуралагічнай дысцыпліны, раскрываюцца змест і ўзаемасувязь паняццяў, аналізуюцца тыпы і віды культуры і цывілізацыі. У дапаможніку акрэсліваюцца этапы, тэндэнцыі станаўлення і развіцця культур першабытнага грамадства, старажытных цывілізацый Усходу, краін Заходняй Еўропы, Расіі, Беларусі.

Вялікі тэарэтыка-практычны матэрыял сістэматызаваны ў вучэбна-метадычным дапаможніку «История и теория мировой культуры» (2010), аўтарам-складальнікам якога з’яўляецца І. В. Казакова [65]. У ім асвятляецца гістарычны працэс развіцця культур ад першабытнага грамадства да сучаснай глабальнай культуры. Адметнасцю дапаможніка з’яўляецца наяўнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у ім матэрыялу, які ілюструе дасягненні суб'ектаў кожнага гістарычнага тыпу культуры ў галіне мастацтва.

У перыяд сістэмнай мадэрнізацыі беларускага грамадства ўзрастае роля культуралогіі як навукі, што вывучае, плануе і распрацоўвае методыку мэтанакіраванага прагназавання, кіравання працэсамі фарміравання індывіда і яго пераўтварэння з чалавека разумнага, што валодае тэхналогіяй вытворчасці, у чалавека творчага, які паўсядзённа ўвасабляе высокія крытэрыі культуры ва ўсіх сферах жыццядзейнасці. Вывучэнне і фарміраванне прынцыпаў і тэхналогій мэтанакіраванага рэгулявання культурнымі працэсамі, арганізацыя дзейнасці асобы ў сферы культуры складаюць змест спецыяльнай галіны навуковага пазнання – прыкладной культуралогіі.

У сувязі з гэтым паўстала неабходнасць стварэння падручніка для студэнтаў шэрагу культуралагічных спецыяльнасцей. Як мы адзначалі, падручнікаў па фундаментальнай культуралогіі расійскімі і замежнымі навукоўцамі напісана вялікая колькасць, а вось па прыкладной культуралогіі на постсавецкай прасторы іх наогул не існавала. Я. Д. Грыгаровіч і А. І. Смолік паставілі перад сабой задачу распрацаваць такі вучэбны дапаможнік, які быў надрукаваны ў 2005 г. [41]. На яго старонках асэнсоўваюцца спецыфіка функцыянавання культуры ў грамадстве, сацыякультурныя працэсы, якія адбываюцца ў розных сацыяльных групах, супольнасцях, а таксама характарызуюць унутраны свет асобы. Асаблівую ўвагу звяртаюць аўтары вучэбнага дапаможніка на праблемы тэорыі і методыкі інстытуцыянальных і пазаінстытуцыянальных узаемадзеянняў суб'ектаў культуры, формы і тэхналогіі фарміравання культуры асобы.

Такім чынам, ёсць усе падставы канстатаваць, што ў Беларусі створана даволі трывалае вучэбна-метадычнае забеспячэнне засваення асноў фундаментальнай і прыкладной культуралогіі. А наяўнасць высокакваліфікаваных навуковых, педагагічных кадраў, грунтоўных навуковых прац, вучэбных праграм, разнастайнай дыдактычнай літаратуры па культуралогіі дазваляе з упэўненасцю сцвярджаць аб існаванні беларускай культуралагічнай школы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам : дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

2. *Аленькова, Ю. В.* Символизм и модерн в России : культурологические аспекты изучения русской культуры конца XIX – начала XX века в курсе МХК / Ю. В. Аленькова // Асновы мастацтва. – 1999. – № 3. – С. 53–65.

3. *Арнольдов, А. И.* Введение в культурологию : учеб. пособие / А. И. Арнольдов. – М. : Нар. акад. культуры и общечеловеч. ценностей, 1993. – 350 с.

4. Аскерка Сцяпан // Мысліцелі і асветнікі Беларусі, X–XIX стагоддзі : энцыкл. давед. / склад. Г. А. Маслыка ; гал. рэд. Б. І. Сачанка. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 173–174.

5. *Бабосов, Е. М.* Катастрофы : социологический анализ / Е. М. Бабосов. – Минск : Навука і тэхніка, 1995. – 472 с.

6. *Бабосов, Е. М.* Социальные аспекты научно-технической революции / Е. М. Бабосов. – Минск : Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1976. – 480 с.

7. *Бабосов, Е. М.* Человек на пороге рынка : социальные ожидания населения / Е. М. Бабосов. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 174 с.

8. *Багановская, Н. М.* Культурология : учеб. пособие / Н. М. Багановская. – М. : Дашков и К, 2004. – 300 с.

9. *Багушэвіч, Ф.* Мая хата / Ф. Багушэвіч // Літаратура Беларусі XIX стагоддзя : анталогія / уклад.: К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч ; навук. рэд. А. В. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – С. 703–704.

10. *Багушэвіч, Ф.* Прадмова да кнігі «Дудка беларуская» / Ф. Багушэвіч // Літаратура Беларусі XIX стагоддзя : анталогія / уклад.: К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч ; навук. рэд. А. В. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – С. 698–699.

11. *Багушэвіч, Ф.* Смык беларускі // Творы : вершы, паэмы, апавяданні, артыкулы, лісты / Ф. Багушэвіч ; уклад., прадм. Я. Янушкевіча ; камент. У. Содаля, Я. Янушкевіча ; маст. Г. Хінка-Янушкевіч. – Мінск : Мастац. літ., 1991. – С. 65–93.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12. Банцэвіч, П. К.* Творчасць Уладзіміра Караткевіча ў кантэксце культуралогіі / П. К. Банцэвіч. – Гродна : ГДАУ, 2007. – 310 с.

*13. Барташэвіч, Г. А.* Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя / Г. А. Барташэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 182 с.

*14. Баршчэўскі, Ян.* Курганы Паўночнае Беларусі / Ян Баршчэўскі // Літаратура Беларусі XIX стагоддзя : анталогія / уклад.: К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч ; навук. рэд. А. В. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – С. 142–148.

*15. Барысенка, В.* Францішак Багушэвіч і праблема рэалізму ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя / В. Барысенка. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1957. – 365 с.

*16. Батвіннік, М. Б.* Цяпінскі (Амельяновіч) Васіль Мікалаевіч / М. Б. Батвіннік // Мысліцелі і асветнікі Беларусі, X–XIX стагоддзі : энцыкл. давед. / склад. Г. А. Маслыка ; гал. рэд. Б. І. Сачанка. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 154–156.

*17. Бахтин, М. М.* Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин. – М. : Искусство, 1979. – 423 с.

*18. Библер, В. С.* Культура. Диалог культур (опыт определения) / В. С. Библер // Вопросы философии. – 1989. – № 6. – С. 30–39.

*19. Бирало, А. А.* Философия и общественная мысль в Беларуси и Литве в конце XVII – середине XVIII в. / А. А. Бирало. – Минск : Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1971. – 180 с.

*20. Богданович, М.* Белорусское возрождение / М. Богданович // Украинская жизнь. – 1915. – № 12. – С. 17–21.

*21. Болотова, Ю. Г.* Книга в семье / Ю. Г. Болотова // Пачатковае навучанне. Сям'я, дзіцячы сад, школа. – 1999. – № 5. – С. 107–110.

*22. Бубер, М.* Я и Ты / М. Бубер ; пер. с нем. В. В. Рынкевича // Два образа веры : пер. с нем. / М. Бубер ; под ред. П. С. Гуревича, С. Я. Левит, С. В. Перова. – М. : Республика, 1995. – С. 16–92.

*23. Вахтомаў, Г. В.* Традыцыйная культура як фактар устойлівага развіцця ўсходнеславянскай супольнасці / Г. В. Вахтомаў // Доклады НАН Беларуси. – 2005. – Т. 49, № 2. – С. 121–124.

*24. Вилейко, С. Л.* Особенности культурной политики в Вооруженных Силах Республики Беларусь в условиях рефор-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мирования : автореф. дис. … канд. культурологии : 24.00.01 / С. Л. Вилейко ; Белорус. ун-т культуры. – Минск, 2000. – 20 с.

*25. Виндельбанд, В.* Философия культуры и трансцендентальный идеализм / В. Виндельбанд // Культурология, XX век : антология / гл. ред. и сост. С. Я. Левит. – М. : Юристъ, 1995. – 703 с. – (Лики культуры).

*26. Виппер, Р. Ю.* История Средних веков : курс лекций / Р. Ю. Виппер. – СПб. : СМИОПресс ; Минск : Асар, 2001. – 381 с.

*27. Волан, А.* О государе и его личных добродетелях / А. Волан // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В. В. Дубровский [и др.] ; [сост. и подгот. текстов С. А. Подокшина]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 46–53.

*28. Волошок, В. В.* Модели коммуникации как формы организации социального опыта / В. В. Волошок // Вестн. Могилев. гос. ун-та им. А. А. Кулешова. – 2001. – № 1. – С. 12–16.

*29. Воробьева, И. В.* Религиозный идеал культуры П. Флоренского / И. В. Воробьева // Вестн. БГУ. – 1999. – № 1. – С. 22–25.

*30. Воронович, И. Н.* Гуманитарное образование и его роль в самоактуализации личности / И. Н. Воронович // Весн. Брэсц. дзярж. ун-та. – 2009. – № 1 (36). – С. 83–89.

*31. Вярбіцкая, В.* Культуралагічная інтэнцыя творчай спадчыны Якуба Коласа / В. Вярбіцкая // Роднае слова. – 2010. – № 11. – С. 95–99.

*32. Вярбіцкая, В.* Этнакультурная інтэнцыянальнасць у творчай спадчыне Якуба Коласа : аўтарэф. дыс. … канд. культуралогіі : 24.00.01 / В. Вярбіцкая ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2013. – 23 с.

*33. Гарбацкі, А. А.* Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX ст. / А. А. Гарбацкі. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 1999. – 200 с.

*34.* Гартны Цішка // Беларускія пісьменнікі : біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы АН Рэспублікі Беларусь, Беларус. энцыкл. ; пад рэд. А. В. Мальдзіса ; рэдкал.: І. Э. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – Т. 2 : Івашын – Кучар. – С. 128–138.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*35. Гарэцкі, М.* Гісторыя беларускай літаратуры / М. Гарэцкі ; уклад. і падрыхт. тэксту Т. С. Голуб. – Мінск : Мастац. літ., 1992. – 479 с.

*36. Гердер, И. Г.* Идеи к философии истории человечества / И. Г. Гердер. – М. : Наука, 1977. – 705 с. – (Памятники исторической мысли).

*37.* Гісторыя Сярэдніх вякоў : у 2 ч. / В. А. Фядосік [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2002. – Ч. 2. – 267 с.

*38. Гончаров, И. А.* Фрегат «Паллада» / И. А. Гончаров // Собр. соч. : в 8 т. – М. : Худож. лит., 1978. – Т. 3. – 526 с.

*39. Гошкевич, И. А.* О корнях японского языка / И. А. Гошкевич. – Вильно : Тип. Иосифа Завадского, 1899. – 109 с.

*40. Гришин, В. А.* Субкультура и ее проявление в молодежной среде. Общественные самодеятельные движения : проблемы и перспективы / В. А. Гришин. – М. : Политиздат, 1990. – 271 с.

*41. Грыгаровіч, Я. Д.* Прыкладная культуралогія : вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці «культуралогія» ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 216 с.

*42. Грыгаровіч, Я. Д.* Эстэтычная накіраванасць асобы студэнта : педагагічны аспект / Я. Д. Грыгаровіч. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2002. – 403 с.

*43. Гузанов, В.* Одиссей с Белой Руси / В. Гузанов. – Минск : Беларусь, 1969. – 291 с.

*44. Гуревич, П. С.* Культурология : элементарный курс : учеб. пособие / П. С. Гуревич. – М. : Гардарики, 2001. – 336 с.

*45. Давідовіч, А.* Жылуновіч Зміцер Хведаравіч / А. Давідовіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 1996. – Т. 3. – С. 382–383.

*46. Джумантаева, Т. А.* Музеефікацыя культурнай прасторы Полацка : традыцыі і інавацыі : аўтарэф. дыс. … канд. культуралогіі : 24.00.03 / Т. А. Джумантаева ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2011. – 24 с.

*47. Добшевич, Б.* Взгляды новых философов / Б. Добшевич // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В. В. Дубровский [и др.] ; [сост. и подгот.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

текстов С. А. Подокшина]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 250–269.

*48. Дорошевич, Э. К.* Аниол Довгирд – мыслитель эпохи Просвещения / Э. К. Дорошевич. – Минск : Наука и техника, 1967. – 156 с.

*49. Дубянецкі, Э. С.* Культуралогія : энцыкл. давед. / Э. С. Дубянецкі ; маст. А. А. Глекаў. – Мінск : БелЭн, 2003. – 384 с. : іл.

*50. Дюби, Ж.* Европа в Средние века / Жорж Дюби ; пер. с фр. В. Колесникова. – Смоленск : Полиграмма ; Минск : Алфавит, 1994. – 319 с.

*51. Дюби, Ж.* Средние века : от Гут Капета до Жанны д'Арк (987–1460) / Жорж Дюби ; пер. с фр. Г. А. Абрамова, В. А. Павлова. – М. : Междунар. отношения, 2000. – 414 с.

*52. Ельскі, А.* Выбранае / А. Ельскі ; уклад. Н. Мазоўка, У. Казберук [і інш.]. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2004. – 496 с.

*53. Ерасов, Б. С.* Социальная культурология : пособие для студентов высш. учеб. заведений. – 2-е изд., испр. и доп. / Б. С. Ерасов. – М. : Аспект Пресс, 1997. – 591 с.

*54. Еремин, И. П.* Литературное наследие Кирилла Туровского / И. П. Еремин // Труды Отдела древнерусской литературы. – М. ; Л. : Изд-во АН СССР, 1955. – Т. 11. – С. 342–367 ; 1956. – Т. 12. – С. 340–361 ; 1957. – Т. 13. – С. 406–426 ; 1958. – Т. 15. – С. 331–348.

55. Житие преподобной Евфросинии, игумении Полоцкой / примеч. Г. Н. Шейкина. – Минск : Братство в честь Святого Архистратига Михаила в г. Минске, 2004. – 39 с.

56. Жыццё Адольфа Янушкевіча і яго лісты з кіргізскіх стэпаў / пер. з пол. мовы і камент. Г. Суднік-Матусэвіч. – Мінск : Медисонт, 2008. – Т. 1. Радзінна-прыяцельскі дар. – 203 с. : партр., факс.

*57. Залусский, Л.* Общая философия / Л. Залусский // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В. В. Дубровский [и др.] ; [сост. и подгот. текстов С. А. Подокшина]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 93–107.

*58. Зан, Т.* Прамова на першай маёўцы прамяністых 6.V.1820 / Томаш Зан // Літаратура Беларусі XIX стагоддзя : анталогія / уклад.: К.А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч ; навук. рэд. А. В. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – С. 223–225.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*59. Зубра, А. С.* Формирование культуры личности / А. С. Зубра. – Минск : Высш. шк., 2004. – 206 с.

*60.* Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии : избранные произведения XVI – начала XIX в. / Акад. наук Белорус. ССР, Ин-т философии ; [под общ. ред. В. А. Сербента, В. М. Пузикова, П. Д. Пузикова]. – Минск : Изд-во АН БССР, 1962. – 524 с. – Библиогр. : с. 486–501 и в подстроч. примеч.

*61.* Историко-культурное наследие Каменетчины = Гісторыка-культурная спадчына Камянеччыны : сб. науч. докл. / под общ. ред. П. Г. Игнатовича. – Минск : Четыре четверти, 2008. – 190 с. : ил.

*62.* История культурологии / С. С. Неретина [и др.] ; под ред. А. П. Огурцова. – М. : Гардарики, 2006. – 384 с.

*63.* История Средних веков. Европа / А. Н. Бадак [и др.]. – Минск : Харвест, 2007. – 285 с.

*64. Кажухоўская, Л. С.* Базісныя сімвалы беларускай мастацкай карціны свету / Л. С. Кажухоўская. – Мінск : РІВШ БДУ, 2002. – 102 с.

*65. Казакова, И. В.* Теория культуры : учеб.-метод. пособие / авт.-сост. И. В. Казакова. – Минск : Зорны Верасок, 2010. – 664 с.

*66. Калацэй, В.* Метад «уключанага назірання» ў дыдактыцы творчых ВНУ / В. Калацэй // Аўтэнтычны фальклор : праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзельнікаў V Міжнар. навук. канф., Мінск, 29 крас. – 1 мая 2011 г. / БДУКМ ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2011. – С. 118–120.

*67. Камінскі, М.* Доўнар-Запольскі Мітрафан Віктаравіч / М. Камінскі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 1996. – Т. 3. – С. 272–273.

*68. Кармин, А. С.* Основы культурологии. Морфология культуры / А. С. Кармин. – М. : Лань, 1997. – 512 с.

*69. Карнажыцкая, Т. В.* Творчасць – стымул навучання. Школьны тэатр як частка адукацыйна-выхаваўчага працэсу / Т. В. Карнажыцкая // Народная асвета. – 2000. – № 6. – С. 27–31 ; № 7. – С. 51–55.

*70. Кароткая, Т. М.* Багдановіч Адам Ягоравіч / Т. М. Кароткая // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 1993. – Т. 1. – С. 270.

71. *Карский, Е. Ф.* Белорусы : в 3 т. / Е. Ф. Карский ; прадм.: В. М. Курцова, А. У. Унучак, І. У. Чаквін ; уступ. арт. М. Г. Булахаў ; рэд. савет : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2006. – Т. 1 : Введение в изучение языка и народной словесности. – 652, [2] с. – (Помнікі гістарычнай думкі Беларусі).

72. *Касперук, А А.* Социокультурные детерминанты формирования личности военнослужащего в современных условиях : автореф. дис. … канд. культурологии : 24.00.01 / А. А. Касперук ; Белорус. гос. ун-т культуры. – Минск, 2001. – 19 с.

73. *Киркор, А. К.* Просвещение и народное творчество в Литве / А. К. Киркор // Живописная Россия. Литовское и Белорусское Полесье. – Репр. изд. 1882 г. (Санкт-Петербург). – Минск : БелЭн, 1993. – С. 97–136.

74. *Кірыла Тураўскі.* Кірылы манаха вельмі карыснае павучанне / Кірыла Тураўскі // Мысліцелі і асветнікі Беларусі, X–XIX стагоддзі : энцыкл. давед. / склад. Г. А. Маслыка ; гал. рэд. Б. І. Сачанка. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 627.

75. *Коган, И. Л.* Гендерная культурология : культура пола и «пол» культуры / И. Л. Коган. – Минск : Ковчег, 2003. – 336 с.

76. *Коган, И. Л.* Этнопсихологические основания культурогенеза / И. Л. Коган. – Минск : Ин-т соврем. знаний, 2001. – 270 с.

77. *Колас, Я.* Збор твораў: у 14 т. / Якуб Колас. – Мінск : Мастац. літ., 1976. – Т. 11 : Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы 1917–1946 гг. – 424 с.

78. *Колас, Я.* Збор твораў : у 14 т. / Якуб Колас. – Мінск : Мастац. літ., 1976. – Т. 12 : Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы 1947–1956 гг. – 528 с.

79. *Конан, У.* Антон Луцкевіч : філасофія і эстэтыка нацыянальнага Адраджэння / У. Конан // Голас Радзімы. – 1994. – 10 сак. – 7 крас.

80. *Конисский, Г.* Рациональная философия, или Логика / Г. Конисский // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В. В. Дубровский [и др.] ; [сост. и подгот. текстов С. А. Подокшина]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 277–289.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*81. Конон, В.* Очерк истории эстетической мысли Белоруссии / В. Конон. – М. : Искусство, 1972. – 320 с.

*82. Кравченко, А. И.* Культурология : учебник / А. И. Кравченко ; Моск. гос. ун-т им. М. В. Ломоносова. – М. : Проспект : ТК Велби, 2007. – 285 с.

*83. Краснова, Е. Л.* Современное экспозиционное пространство музеев Беларуси : коммуникативный аспект : автореф. дис. … канд. культурологии : 24.00.03 / Е. Л. Краснова ; Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2011. – 23 с.

*84. Кристева, Ю.* Бахтин, слово, диалог и роман / Ю. Кристева // Диалог. Карнавал. Хронотоп. – 1993. – № 4. – С. 6–7.

*85. Кристева, Ю.* Разрушение поэтики / Ю. Кристева ; пер. с фр. Г. К. Косикова // Михаил Бахтин : pro et contra. Творчество и наследие М. М. Бахтина в контексте мировой культуры : антология : в 2 т. / сост. и коммент. К. Г. Исупова. – СПб. : РХГИ, 2002. – Т. 2. – С. 7–32. – (Русский путь).

*86. Кронер, Р.* Самоосуществление духа. Пролегомены к философии культуры / Р. Кронер // Культурология, XX век : антология / гл. ред. и сост. С. Я. Левит. – М. : Юристъ, 1995. – С. 256–280. – (Лики культуры).

*87. Кроче, Б.* Антология сочинений по философии / Б. Кроче. – М. : Intrada, 2000. – 160 с.

*88. Крукоўскі, М. І.* Філасофія культуры : уводзіны ў тэарэтычную культуралогію : вучэб. дапам. / М. І. Крукоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 2000. – 192 с.

*89. Крюковский, Н. И.* Homo pulcher. Человек прекрасный : очерк теоретической эстетики человека / Н. И. Крюковский. – Минск : Изд-во БГУ, 1983. – 303 с.

*90. Крюковский, Н. И.* Кибернетика и законы красоты / Н. И. Крюковский. – Минск : Изд-во БГУ, 1997. – 256 с.

*91.* Культурология : курс лекций : учеб. пособие / сост. и отв. ред. А. А. Радугин. – М. : Центр, 1998. – 304 с.

*92.* Культурология: теория и история культуры : учеб. пособие / И. Е. Ширшов [и др.] ; под общ. ред. И. Е. Ширшова. – Минск : БГЭУ, 2004. – 543 с.

*93.* Культурология. Эстетика : учеб.-метод. комплекс для студентов дневной и заочной форм обучения / Т. И. Глушакова [и др.]. – Минск : Изд-во МИУ, 2008. – 224 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*94. Купала, Я.* П’есы. Публіцыстыка. Янка Купала пра сябе / Я. Купала ; [уклад. і прадмовы Н. Гілевіча]. – Мінск : Кніга, 2002. – 527 с.

*95. Купчин, Н. С.* Философские взгляды Маймона / Н. С. Купчин // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии : избранные произведения XVI – начала XIX в. – Минск : Изд-во АН БССР, 1962. – С. 366–376.

*96. Кухто, Л. К.* Социокультурная регуляция демографического поведения субъектов постчернобыльского региона : автореф. дис. … канд. культурологии: 24.00.01 / Л. К. Кухто ; Белорус. гос. ун-т культуры. – Минск, 2003 . – 21 с.

*97. Левяш, И. Я.* Культурология : курс лекций / И. Я. Левяш. – Минск : ТетраСистемс, 1998. – 544 с.

*98. Лиотар, Ж. Ф.* Состояние постмодерна / Ж. Ф. Лиотар. – СПб. : Алетейя, 1998. – 159 с.

*99.* Літаратура Беларусі XIX стагоддзя : анталогія / уклад. : К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч ; навук. рэд. А. В. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 861 с.

*100. Лойка, А.* Адам Міцкевіч і беларуская літаратура / А. Лойка. – Мінск : Выд-ва Белдзяржуніверсітэта, 1959. – 132 с.

*101. Лосский, Н.* Условия абсолютного добра / Н. Лосский. – М. : Политиздат, 1991. – 368 с.

*102. Лукашенко, А. Г.* Выступление Президента Респ. Беларусь А. Г. Лукашенко на церемонии возложения венков к монументу Победы / А. Г. Лукашенко // Информ. бюллетень Администрации Президента Респ. Беларусь. – 2010. – № 8 (171). – С. 2–4.

*103. Лукашенко, А. Г.* Экономическая политика белорусского государства : лекция Президента Респ. Беларусь в Белорус. гос. экон. ун-те, Минск, 29 нояб. 2002 г. / А. Г. Лукашенко. – Минск : БГЭУ, 2002. – 23 с.

*104. Лупашка, І. Г.* Асноўныя тэндэнцыі культурна-адукацыйнай дзейнасці беларускіх літаратурных музеяў на сучасным этапе / І. Г. Лупашка // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2011. – № 1. – С. 154–160.

*105. Луцкевіч, А.* За дваццаць пяць гадоў (1903–1928) : успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый: Беларуская рэвалюцыйная грамада, Беларуская сацыялістычная грамада / А. Луцкевіч ; паслясл. А. М. Сідарэвіча. – Мінск : БелСЭ, 1991. – 64 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*106. Лучына, Я.* Роднай старонцы / Янка Лучына // Літаратура Беларусі XIX стагоддзя : анталогія / уклад.: К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч ; навук. рэд. А. В. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – С. 807–808.

*107. Лыщинский, К.* Фрагменты из трактата «О несуществовании Бога» / К. Лыщинский // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В. В. Дубровский [и др.] ; [сост. и подгот. текстов С. А. Подокшина]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 189–190.

*108. Майман, С.* Спроба трансцэндэнтальнай філасофіі / Саламон Майман // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии : избранные произведения XVI – начала XIX в. – Минск : Изд-во АН БССР, 1962. – С. 391–393.

*109. Майхрович, А. С.* Поиск истинного бытия и человека : из истории философии и культуры Беларуси / А. С. Майхрович. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 245 с.

*110. Майхровіч, А. С.* Янка Лучына : жыццё і творчасць / А. С. Майхровіч. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1952. – 123 с.

*111. Мальдзіс, А. І.* Францыск Скарына як прыхільнік збліжэння і ўзаемаразумення людзей і народаў : [даклады X Міжнар. з'езда славістаў] / А. І. Мальдзіс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 34 с.

*112. Мартынов, В. Ф.* Культурология. Теория культуры : учеб. пособие / В. Ф. Мартынов. – Минск : АСАР, 2008. – 848 с.

*113. Мартынов, В. Ф.* Философия красоты / В. Ф. Мартынов. – Минск : ТетраСистемс, 1999. – 336 с.

*114. Мартысевич, А. С.* Христианские концепции культуры второй половины XX – начала XXI века / А. С. Мартысевич // Гісторыя і грамадазнаўства. – 2011. – № 3. – С. 3–9.

*115. Масленченко, С. В.* Субкультура и коммуникации / С. В. Масленченко. – Минск : Ин-т радиологии, 2003. – 90 с.

*116. Маслоу, А.* Новые рубежи человеческой природы / А. Маслоу. – М. : Смысл, 1999. – 424 с.

*117. Матсумота, Д.* Психология и культура / Д. Матсумота. – СПб. : Питер, 2003. – 429 с.

*118. Мид, М.* Культура и мир детства / М. Мид // Избранные произведения / М. Мид. – М. : Наука, 1998. – 429 с.

*119. Міцкевіч, А.* Пра Беларусь і беларускую мову / А. Міцкевіч // Літаратура Беларусі XIX стагоддзя : анталогія / уклад.:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч ; навук. рэд. А. В. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – С. 291–292.
*120. Морозов, И. В.* Архитектурная герменевтика / И. В. Морозов. – Минск : Пето, 1999. – 264 с.
*121. Морозов, И.* Основы культурологии. Архетипы культуры / И. Морозов. – Минск : ТетраСистемс, 2001. – 608 с.
*122.* Мысліцелі і асветнікі Беларусі, X–XIX стагоддзі : энцыкл. давед. / склад. Г. А. Маслыка ; гал. рэд. Б. І. Сачанка. – Мінск : БелЭн, 1995. – 671 с. : іл.
*123. Нарбут, К.* Логика, или Наука о размышлении и рассуждении, благодаря которой всякий сможет во всем достигать истины и остерегаться заблуждений / К. Нарбут // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В. В. Дубровский [и др.] ; [сост. и подгот. текстов С. А. Подокшина]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 293–304.
*124. Нибур, Х. Р.* Христос и культура / Х. Р. Нибур. – М. : Директ-Лидия, 2007. – 475 с.
*125. Никифоровский, Н. Я.* Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н. Я. Никифоровский. – Витебск : Тип. А. Кушкова, 1897. – 307, 26 с.
*126. Ойстрах-Демидова, Т. Л.* Мировая художественная культура, конец XIX – XX век : в 4 ч. / Т. Л. Ойстрах-Демидова. – М. : 5 за знания, 2007. – Ч. 1–2. – 144 с.
*127. Ортега-и-Гассет, Х.* Восстание масс / Х. Ортега-и-Гассет // Вопросы философии. – 1989. – № 3. – С. 119–154 ; № 4. – С. 114–155.
*128. Падокшын, С. А.* Беларуская думка ў кантэксце гісторыі культуры / С. А. Падокшын ; [навук. рэд. А. С. Майхровіч] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 315 с.
*129. Падокшын, С. А.* Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі. Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага / С. А. Падокшын. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 285 с.
*130.* Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В. В. Дубровский [и др.] ; [сост. и подгот. текстов С. А. Подокшина]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 318 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*131. Пацыенка, С. А.* Арыстакратычная культура на беларускіх землях / С. А. Пацыенка // Роднае слова. – 2009. – № 3. – С. 107–111 ; № 4. – С. 89–93.

*132. Риккерт, Г.* Науки о природе и науки о культуре / Г. Риккерт // Культурология, XX век : антология / гл. ред. и сост. С. Я. Левит. – М. : Юристъ, 1995. – С. 69–103. – (Лики культуры).

*133. Розин, В. М.* Введение в культурологию : учеб. для высш. шк. / В. М. Розин. – М. : Форум : Инфра-М, 1997. – 219 с.

*134. Розин, В. М.* Культурология : учебник / В. М. Розин. – 2-е изд., перараб. и доп. – М. : Гардарики, 2003. – 462 с.

*135. Романов, Е. Р.* Белорусский сборник 1–2 : Песни, пословицы, загадки / Е. Р. Романов. – Киев : Тип. С. В. Кульженко, 1885. – 468 с.

*136. Савіч, Ф.* Успаміны / Ф. Савіч // Літаратура Беларусі XIX стагоддзя : анталогія / уклад.: К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч ; навук. рэд. А. В. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – С. 502–506.

*137. Салееў, В. А.* Сучасная эстэтыка Беларусі / В. А. Салееў. – Мінск : Выш. шк., 1979. – 232 с.

*138. Саликов, А. Э.* Национальная культура в условиях глобализации / А. Э. Саликов // Вестн. молодеж. науч. о-ва. – 2004. – № 3. – С. 56–58.

*139. Сащеко, В. В.* Предпосылки диалогизма : историко-культурный обзор / В. В. Сащеко // Вестн. молодеж. науч. о-ва. – 2004. – № 4. – С. 74–76.

*140. Свечнікава, А. У.* Архетыпічная структура тэксту / А. У. Свечнікава // Вес. БДПУ. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2009. – № 4. – С. 97–102. – (Культуралогія). – Бібліягр.: с. 101 (20 назв.).

*141. Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

*142. Сідарэвіч, А.* Луцкевіч Антон Іванавіч / А. Сідарэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 1997. – Т. 4. – С. 402–403.

*143. Силичев, Д. А.* Культурология : учеб. пособие для вузов / Д. А. Силичев. – М. : Приориздат, 2004. – 352 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*144. Симеон Полоцкий*. Обед душевный / Симеон Полоцкий // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В. В. Дубровский [и др.] ; [сост. и подгот. текстов С. А. Подокшина]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 166–173.

*145. Скараходаў, У. П.* Сацыядынаміка культуры сучаснай Беларусі / У. П. Скараходаў. – Мінск : БелДІПК, 2003. – 343 с.

*146. Скарына, Ф.* Прадмовы і пасляслоўі / Францыск Скарына ; Акад. навук БССР, Ін-т літ. імя Янкі Купалы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 237 с.

*147. Смелзер, Н. Дж.* Социология / Н. Дж. Смелзер // Социс. – 1990. – № 12. – С. 119–137.

*148. Смолік, А. І.* Божы дар Івана Кандрацьева / А. І. Смолік ; Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 260 с. – (Культурны імідж Беларусі).

*149. Смолік, А. І.* Культура Беларусі XI–XIX стст. : навук. давед. / А. І. Смолік. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1995. – 182 с.

*150. Смолік, А. І.* Культуралогія : гісторыя культуры : вучэб. дапам. / А. І. Смолік, Л. К. Кухто, А. А. Цобкала. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 311 с.

*151. Смолік, А. І.* Культуралогія: тэорыя культуры : вучэб. дапам. / А. І. Смолік, Л. К. Кухто. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

*152. Смолік, А. І.* Прадмова / А.І. Смолік // Другія Тышкевіцкія чытанні (г. Лагойск, 15 кастр. 2009 г.) : матэрыялы чытанняў / рэдкал. : А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – С. 4–7.

*153. Смолік, А. І.* Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме / А. І. Смолік. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. – 247 с.

*154. Смолик, Д. А.* Деструктивные механизмы культуры : психоаналитический аспект / Д. А. Смолик // Весн. Гродзен. дзярж. ун-та імя Янкі Купалы. Сер. гуманіт. навук. – 2004. – № 2. – С. 60–63.

*155. Спирина, Е. А.* Мультикультурализм как стратегия взаимодействия этнокультурных групп / Е. А. Спирина. – Минск : РИВШ, 2012. – 224 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*156. Сухоцкая, Т. Ф.* Сімвалы беларускай антыўтопіі / Т. Ф. Сухоцкая // Праблемныя напрамкі развіцця мастацкай творчасці і вербальнай культуры нацыі : матэрыялы Міжнар. навук. канф., 20–21 лістап. 2003 г. / рэдкал. : А. І. Лугоўскі [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2004. – С. 167–169.

*157. Суша, А. А.* Дыялог «Усход – Захад» у гісторыі хрысціянства ў Беларусі / А. А. Суша // Религия и общество: актуальные проблемы современного религиоведения : сб. науч. трудов / под общ. ред. В. В. Старостенко. – Могилев : МГУ им. А. Кулешова, 2006. – С. 258–261.

*158. Сцепанцоў, А. І.* Сістэма бесперапыннай адукацыі ў галіне культуры / А. І. Сцепанцоў // Мастацкая адукацыя і культура. – 2004. – № 3. – С. 13–19.

*159. Таланцева, О. Ф.* Костюм как художественный символ в изобразительном искусстве / О. Ф. Таланцева // Мастацкая адукацыя і культура. – 2004. – № 4. – С. 27–31.

*160.* Творения святаго отца нашего Кирилла епископа Туровскаго с предварительным очерком истории Турова и туровской епархии до XIII века / изд. Преосвященного Евгения [(Шерешилова)] епископа Минского и Туровского (ныне Астраханского и Енотаевскаго). – Киев : в тип. Киево-Печерской Лавры, 1880. – [4], CII, 296 с.

*161. Тейяр де Шарден, П.* Феномен человека / П. Тейяр де Шарден. – М. : Наука, 1997. – 419 с.

*162. Тиллих, П.* Избранное. Теология культуры / П. Тиллих. – М. : Юристъ, 1995. – 479 с.

*163. Трацяк, Я.* Беларускае духавенства (пачатак ХХ ст. – 1930-я гады) / Я. Трацяк // Беларускі гістарычны часопіс. – 1999. – № 2. – С. 41–48.

*164. Уайт, А. Л.* Наука о культуре / А. Лесли Уайт // Антология исследований культуры. – СПб. : Университетская книга, 1997. – Т. 1 : Интерпретация культуры. – С. 141–156.

*165. Усоўская, Э. А.* Асоба аўтара ў постмадэрніцкай культуры / Э. А. Усоўская // Культура Беларусі. Навуковы пошук моладзі : матэрыялы канф. аспірантаў, 14 мая 1997 г., г. Мінск / Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1999. – Вып. 2. – С. 143–148.

*166. Фатыхава, Г.* Лёсік Язэп Юр'евіч / Г. Фатыхава // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 1997. – Т. 4. – С. 359–360.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

167. *Фихте, И. Г.* Несколько лекций о назначении ученого ; Назначение человека ; Основные черты современной эпохи : сборник : пер. с нем. / И. Г. Фихте. – Минск : Попурри, 1998. – 472 с.

168. *Хантингтон, С.* Столкновение цивилизаций / С. Хантингтон. – М. : АСТ, 2003. – 605 с.

169. *Хёйзинга, Й.* Осень Средневековья : исследование форм жизненного уклада и форм мышления в XIV и XV вв. во Франции и Нидерландах / Йохан Хёйзинга ; сост. и пер. с [нидерл.] Д. С. Сильвестров. – М. : Айрис-Пресс, 2002. – 537 с.

170. *Хмурчик, О. Л.* Структурные модели социокультурных ориентаций студенческой молодежи Беларуси / О. Л. Хмурчик // Прырода, чалавек, культура : праблемы гармоніі : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 25–26 сак. 2003 г. / рэдкал.: М. А. Бяспалая, І. Л. Коган, А. І. Смолік ; Беларус. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2003. – С. 447–450.

171. *Цвірка, К.* Дарогамі Т. Зана / К. Цвірка // Полымя. – 1992. – № 5. – С. 159–172 ; № 6. – С. 148–165.

172. *Цукерман, А. Я.* Бенедикт Добшевич (1722 – ок. 1794) / А. Я. Цукерман // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В. В. Дубровский [и др.] ; [сост. и подгот. текстов С. А. Подокшина]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 247–273.

173. *Цьвікевіч, А.* «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. / А. Цьвікевіч ; паслясл. А. Ліса. – 2-е выд. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.

174. *Чернышова, Л. А.* Лука Залусский / Л. А. Чернышова // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В. В. Дубровский [и др.] ; [сост. и подгот. текстов С. А. Подокшина]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 91–109.

175. *Чернявская, Ю. В.* Белорус : штрихи к автопортрету. Этнический самообраз белоруса в сказках / Ю. В. Чернявская. – Минск : Четыре четверти, 2006. – 244 с.

176. *Шадурский, С.* Философские положения по общей физике / С. Шадурский // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В. В. Дубровский [и др.] ; [сост. и подгот. текстов С. А. Подокшина]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 230–242.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

177. *Шелупенко, Н. Е.* Региональные аспекты развития культуры Беларуси на современном этапе / Н. Е. Шелупенко // Весн. Беларус. дзярж. ін-та праблем культуры. – 2004. – № 1. – С. 140–142.

178. *Шпенглер, О.* Закат Европы : очерки морфологии мировой истории : в 2 т. / О. Шпенглер ; пер. с нем. Н. Ф. Гарелин ; коммент.: Ю. П. Бубенков, А. П. Дубнов ; худож. М. В. Драко. – Минск : Попурри, 1998. – Т. 1 : Образ и действительность. – 684 с.

179. *Шпенглер, О.* Закат Европы : очерки морфологии мировой истории : в 2 т. / О. Шпенглер. – Минск : Попурри, 1999. – Т. 2 : Всемирно-исторические перспективы. – 720 с.

180. *Шпилевский, П. М.* Путешествие по Полесью и Белорусскому краю / П. М. Шпилевский ; [предисл., текстолог. подгот., примеч. и коммент. С. А. Кузняевой]. – Минск : Полымя, 1992. – 251 с. – (Литературные памятники Белоруссии).

181. *Шумская, І. М.* Дыялектыка ўзаемадзеяння сацыяльнай дынамікі і музычнай культуры / І. М. Шумская // Вес. Акад. навук. Сер. гуманіт. навук. – 2001. – № 3. – С. 33–35.

182. *Языкович, В. Р.* Культурология : учеб.-метод. пособие / В. Р. Языкович. – Минск : РИВШ, 2010. – 364 с.

183. *Яковук, Т. И.* Ценностные ориентации военнослужащих Пограничных войск Республики Беларусь / Т. И. Яковук // Социология. – 1999. – № 2. – С. 89–92.

184. *Fedarowski, M.* Lud bialoruski na Rusi Litewskiej : materyaly do etnografii slowenskiej w latach 1877–1893 / przez Michala Fedarowskego. – Krakow : Wydawnictwo Komisii antropologiczsnej Akademii umiejetnisci, 1902. – 564 c.

185. Kundelikter men hattar nemese Qazaq dalsyna zasalgan sajahat turaly zazbalar (на казахском языке) / Muqas Sarsekeev. – Almaty Zalyn [USSR (to 1991)], 1979. – 269 p.

186. *Tyskewicz, K. Hr.* Wilija i jej brzegi. Pod wzgledem hydrograficznym, historycznym, archeologicznym i etnograficznym / Konstanty Hr. Tyskewicz. – Drezno : Drukiem i Nakladem J. I. Kraszewskiego, 1871. – 362 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Навуковае выданне*

**Смолік** Аляксандр Іванавіч

# Беларуская культуралогія: гісторыя і сучаснасць

Рэдактары А. І. Гутарава, В. В. Каташвілі,
В. М. Сакалова, І. В. Смяян
Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая
Дызайн вокладкі А. К. Ляховіч

Падпісана ў друк 10.11.2014. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 16,04. Ул.-выд. арк. 13,82. Тыраж 300 экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ